Голубеў В. Ф.

# Гісторыя Беларусі
## ад заканчэння Другой сусветнай вайны да перыяду будаўніцтва незалежнай дзяржавы (1945–2016 гг.)

Мінск

2016

Рэцэнзенты:

*Ю. М. Бохан*, доктар гістарычных навук;
*А. Б. Доўнар*, кандыдат гістарычных навук;
*Ю. Л. Казакоў*, кандыдат гістарычных навук.

# РАЗДЗЕЛ 1.
# БЕЛАРУСЬ У ПЕРЫЯД ПАСЛЯВАЕННАГА АДНАЎЛЕННЯ (1945–1955 гг.)

1. *Вынікі Другой сусветнай вайны для Беларусі: тэрытарыяльныя, эканамічныя і людскія страты.*
2. *Пасляваеннае аднаўленне прамысловасці. Крыніцы гаспадарчага аднаўлення.*
3. *Аграрная палітыка ў 1945–1955 гг. Калектывізацыя ў заходніх абласцях Беларусі.*
4. *Сацыяльная палітыка, грамадска-палітычнае жыццё і культура.*
5. *Беларусь на міжнароднай арэне.*

**1. *Вынікі Другой сусветнай вайны для Беларусі: тэрытарыяльныя, эканамічныя і людскія страты.*** Усяго за гады Вялікай Айчыннай вайны, паводле афіцыйных звестак, Беларусь страціла больш за 2,7 млн. чалавек. На прымусовую працу ў Германію былі вывезены 380 тыс. беларусаў (у тым ліку 24 тыс. дзяцей), з якіх вярнулася на Радзіму менш за 120 тыс. Загінуў амаль кожны трэці жыхар Беларусі.

Вайна зруйнавала гаспадарку Беларусі – краіна страціла больш за палову свайго нацыянальнага багацця. З 270 гарадоў Беларусі было разрабавана і спалена 209, практычна ў руіны ператварыўся Мінск: у горадзе засталіся неразбуранымі толькі каля 70 будынкаў (Дом Ураду, тэатр оперы і балета, Дом Чырвонай Арміі, галоўны корпус Акадэміі навук і некаторыя інш.). Трэцяя частка насельніцтва краіны засталася без прытулку, людзі прыстасоўвалі пад жытло разбураныя памяшканні, жылі ў зямлянках. Паводле агульнага ўзроўню развіцця Беларусь вярнулася да 1928 г.: было знішчана каля 10 тыс. прадпрыемстваў (85 % даваеннай колькасці), практычна цалкам разбураны электрастанцыі (засталося 4 % даваенных



*Мінск пасляваенны.*

энергетычных магутнасцяў), пацярпелі чыгуначны (наступствы ў тым ліку і «рэйкавай вайны»), водны і аўтамабільны транспарт.

Асабліва моцна падупала сельская гаспадарка: было разбурана 9200 вёсак, з якіх 627 спалены разам з жыхарамі. У параўнанні з даваенным часам адчувальна зменшылася колькасць свойскай жывёлы: коней – на 61 %, буйной рагатай жывёлы – на 69 %, свіней – на 89 %. Такія страты тлумачыліся не столькі правядзеннем на тэрыторыі Беларусі ваенных дзеянняў, колькі трохгадовым існаваннем жорсткага акупацыйнага рэжыму, які абапіраўся на генацыд, рабаванне, вываз каштоўнасцей у Германію і г. д. Не хапала тавараў першаснага спажывання, лёгкая прамысловасць практычна не развівалася. Да 1947 г. захоўвалася картачная сістэма на прадукты харчавання і на так званыя прадметы шырокага спажывання – адзенне, тканіну, посуд, іншыя гаспадарчыя тавары.

У выніку вайны ў чарговы раз паменшылася тэрыторыя Беларусі. На працягу 1944–1950 гг. савецкім урадам былі адабраны ад Беларусі і далучаны да Польшчы Беластоцкая вобласць і шэраг раёнаў Брэсцкай і Гродзенскай абласцей.

**2. *Пасляваеннае аднаўленне прамысловасці.*** Па меры вызвалення Беларусі паступова адбывалася аднаўленне эканомікі рэспублікі: ужо ўвосень 1943 г. адбудова гаспадаркі пачалася ў вызваленай частцы Гомельскай вобласці, а са жніўня 1944 г. – на ўсёй тэрыторыі Беларусі.



*Мінск пасляваенны. Плошча Якуба Коласа.*

Асноўнымі праблемамі, якія трэба было вырашыць у эканамічнай сферы адразу пасля вайны, былі наступныя: ліквідацыя пасляваенных разбурэнняў, аднаўленне гаспадарчага патэнцыялу і былых эканамічных сувязяў, перавод эканомікі на мірныя рэйкі (канверсія), забеспячэнне умоваў гаспадарчага развіцця і пошук рэсурсаў для паляпшэння жыцця насельніцтва.

На вырашэнне гэтых задач быў накіраваны пяцігадовы план развіцця эканомікі (1946–1950 гг.). Змест гэтага плана прадугледжваў не толькі адраджэнне эканомікі, але развіццё ў першую чаргу цяжкай прамысловасці, у параўнанні з лёгкай. Асабліва высокімі тэмпамі развівалася машынабудаванне і электраэнергетыка. Паколькі прыярытэт аддаваўся аднаўленню цяжкай прамысловасці, з эвакуацыі былі вернуты некаторыя прамысловыя прадпрыемствы, якія былі вывезены з Беларусі перад наступленнем немцаў. Але значная частка такіх прадпрыемстваў засталася ўсё ж на тэрыторыі Расіі. Цяжкасці ў працэсе пасляваеннага аднаўлення прамысловасці ствараў недахоп сродкаў вытворчасці і кваліфікаванай рабочай сілы.

Асабліва хуткімі тэмпамі ў пасляваенны перыяд развіваўся чыгуначны транспарт. Асноўныя лініі былі адноўлены яшчэ ў час завяршэння вайны за некалькі дзён. Так, ужо 10 ліпеня 1944 г. цягнікі прымаў Мінск, 11 ліпеня – Маладзечна, 19 ліпеня – Ліда. Да лютага 1945 г. у эксплуатацыю было здадзена больш за10 000 км чыгуначных пуцей, каля 2000 чыгуначных мастоў. Энергетыка Бе-



*Мінск пасляваенны.*
*Прывакзальная плошча.*

ларусі ў 1945 г. была аднаўлена на 50 % ад даваеннага ўзроўню. Працаёмістыя работы паступова механізаваліся, узрастала прадукцыйнасць працы. У Мінску пачалася падрыхтоўка да будаўніцтва аўтамабільнага, трактарнага, веласіпеднага заводаў, у Гродзенскай вобласці – першага ў Беларусі цукровага завода.

У 1946 г. сваю прадукцыю выдавалі станкабудаўнічы завод у Бабруйску, веласіпедны ў Мінску, а да канца пяцігодкі ўжо працавалі Мінскі трактарны завод, завод «Гомсельмаш», Мінскі аўтамабільны завод.

У 1949 г. Беларусь здолела дасягнуць даваеннага ўзроўню, а ў 1950 г. перавысіць яго.

Пасляваеннаму адраджэнню эканомікі Беларусі спрыялі наступныя фактары: 1. Перавод беларускіх прадпрыемстваў ад вытворчасці ваеннай прадукцыі на выпуск прамысловай прадукцыі і тавараў народнага спажывання; 2. Выдзяленне сродкаў на адбудову эканомікі з саюзнага цэнтра, дапамога саюзных рэспублік: у Беларусь былі накіраваны значныя бюджэтныя датацыі, будаўнічыя матэрыялы, станкі і абсталяванне, а таксама сыравіна – метал, вугаль, нафта; 3. Дапамога па лініі Арганізацыі Аб’яднаных Нацый: у 1945–1947 гг. Беларусь атрымала 142 тыс. тон грузаў на суму 61 млн. долараў (прадукты харчавання, адзенне, абутак, лекі, абсталяванне); 4. БССР, у адпаведнасці з міжнароднымі дамоўленасцямі, атрымала таксама значную частку германскіх *рэпарацый,* якія часткова кампенсавалі страты ад вайны.

Акрамя таго, важным фактарам, дзякуючы якому народная

гаспадарка Беларусі ўздымалася з руін, была самаадданая праца і энтузіязм простых людзей. Пры гэтым у арганізацыі працы нічога не змянілася, усе аднаўленчыя работы па-ранейшаму здзяйсняліся камандна-адміністрацыйнымі метадамі, існавала жорсткая дысцыпліна, а план для прадпрыемстваў даводзіўся зверху.

У прамысловасці больш хуткімі тэмпамі адраджалася машынабудаванне. На студзень 1946 г. было адноўлена 5900 буйных, сярэдніх і дробных прадпрыемстваў (яны выпускалі 20 % даваеннага аб'ёму валовай прадукцыі), з іх 196 – машынабудаўнічыя прадпрыемствы (давалі 38 % даваеннага аб'ёму валовай прадукцыі ўжо ў 1945 г.). Разам з тым вельмі марудна адраджалася лёгкая прамысловасць. Напрыклад, на пачатак 1946 г. вытворчасць прадукцыі лёгкай прамысловасці складала толькі 12,8 % (а тэкстыльнай толькі 3 %) ад узроўню 1940 г.

Вядучымі галінамі эканомікі Беларусі сталі машынабудаванне і металаапрацоўка. Больш актыўна пачала развівацца і лёгкая прамысловасць: пачалі працаваць дыванова-плюшавы камбінат і шаўкаткацкая фабрыкаў Віцебску, Мінскі і Гродзенскі тонкасуконныя камбінаты. Але лёгкая прамысловасць усё ж развівалася недастаткова высокімі тэмпамі: агульны аб'ём яе прадукцыі ў 1950 г. склаў толькі 74 % да ўзроўню 1940 г., тады як агульны аб'ём прадукцыі цяжкой прамысловасці перавысіў у 1950 г. узровень 1940 г. амаль у два разы.

У асноўным эканоміка БССР была адноўлена да 1950 г., аднак узровень яе развіцця не дасягнуў узроўню развіцця тых рэгіёнаў СССР, дзе цяжкая прамысловасць не перапыняла сваёй дзейнасці нават у гады вайны.

Пасляваенная мадэрнізацыя эканомікі Беларусі ў цэлым завяршылася на працягу пятай пяцігодкі (1951–1955 гг.). Беларусь ператварылася ў індустрыяльна-аграрную дзяржаву з магутнай цяжкай прамысловасцю. Пачалі працаваць аўтамабільны, трактарны і веласіпедны заводы ў Мінску. Пступова пераадольвалася адставанне ў развіцці лёгкай і харчовай прамысловасці. Хуткімі тэмпамі развівалася энергетыка, хімічная і дрэваапрацоўчая галіны прамысловасці.

**3.** ***Аграрная палітыка ў 1945–1953 гг. Калектывізацыя ў заходніх абласцях Беларусі.*** Сельская гаспадарка Беларусі таксама вельмі пацярпела ад вайны. Былі разрабаваныя 10 тысяч калгасаў, 92 саўгасы, разбураны ўсе машына-трактарныя станцыі (МТС). У Германію было вывезена шмат маёмасці, жывёлы. У выніку цалкам была знішчана грамадская жывёлагадоўля.

Аграрны сектар эканомікі аднаўляўся больш марудна, чым прамысловасць. Галоўнымі прычынамі гэтага былі невялікія аб'емы дапамогі з боку дзяржавы, малая механізацыя вытворчасці, недахоп рабочых рук, а таксама слабая зацікаўленасць сельскіх жыхароў у аднаўленні калгасаў і калгаснай сістэмы.

Першыя сельскагаспадарчыя работы ў калгасах пачаліся ў Віцебскай, Магілёўскай і Палескай абласцях ужо ў 1945 г. Да вясны 1945 г. 95 % даваенных калгасаў і саўгасаў былі адноўлены, працавала 3000 МТС. Памеры пасяўных плошчаў вясной 1945 г. склалі 73,8 % ад даваенных. У 1945 г. быў атрыманы вельмі нізкі ўраджай збожжа – менш паловы ад даваеннага.

Нягледзячы на тое, што вытворчасць у прыватных гаспадарках была больш прадукцыйнай, чым у калектыўных, пасляваенная аграрная палітыка СССР у адносінах да беларускіх зямель не змянілася – аднаўляліся калгасы, а ў заходніх абласцях Беларусі паскоранымі тэмпамі праводзілася калектывізацыя. Рашэнне аб аднаўленні калгасаў было выклікана не эканамічнымі разлікамі, а палітычнымі меркаваннямі, паколькі вядзенне сялянамі індывідуальнай гаспадаркі не ўпісвалася ў сацыялістычную сістэму, што не прадугледжвала прыватнай уласнасці. Сялянская гаспадарка ўладамі разглядалася як дапаможная, другарадная, у параўнанні з калектыўнай, калгасна-саўгаснай.

Калгасы не толькі аднаўлялі, сістэма імкнулася ўцісनуць калгасы, як гаспадарчыя адзінкі і людзей, якія ў іх працавалі, у вызначаныя камуністычнымі ўладамі рамкі. 19 верасня 1946 г. выйшла пастанова Савета Міністраў і ЦК УКП(б) «Аб мерах па ліквідацыі парушэнняў Статута сельскагаспадарчай арцелі ў калгасах». У сапраўднасці ўлады, прыняўшы гэтую пастанову, арганізавалі барацьбу супраць прысядзібных надзелаў сельскіх жыхароў. Справа

ў тым, што ў галодныя пасляваенныя гады людзі ратаваліся тым, што апрацоўвалі для сябе невялікія ўчасткі зямлі, вырошчвалі там тое, што маглі і, па-сутнасці, выжывалі дзякуючы гэтаму. Улады заявілі, што такія дзеянні людзей з'яўляюцца захопам, масавым раскраданнем грамадскіх земель. Былі ўстаноўлены больш за 200 тысяч фактаў такога як быццам «захопу», зямлю ў людзей адабралі на карысць калгасаў, многіх пакаралі. Такім чынам, людзям не давалі магчымасці нават самім выратаваць сябе і свае сем'і, усе павінны былі залежаць ад волі камуністычнай партыі і прызначаных ёй уладаў.

Першы час пасля заканчэння вайны грошай на развіццё вёскі дзяржава амаль не выдзяляла, але для калгасаў ўсё роўна ўсталёўвалі завышаныя планы нарыхтовак сельскагаспадарчай прадукцыі. Паступова дапамога калгасам стала павялічвалася: у 1949 г. калгасы атрымалі 9692 тыс. тон харчовага і насеннага зерня, 122 тыс. коней, іншую жывёлу, а таксама 648,8 млн. рублёў крэдыту – у 2,5 разы больш, чым за 8 перадваенных гадоў.

Але становішча сялян заставалася вельмі цяжкім. Калгаснікам практычна не плацілі за выкананую працу, закупачныя цэны на прадукцыю сельскай гаспадаркі былі вельмі нізкімі, а планы дзяржаўных паставак высокімі. У адносінах да калгаснікаў дзейнічалі сацыяльныя нормы даваеннага часу: яны былі абмежаваны ў свабодзе перамяшчэння, паколькі не мелі пашпартоў; на іх не распаўсюджвалася аплата бальнічных лістоў і выплата пенсій. Па-сутнасці, у адносінах да сельскага насельніцтва ў арганізацыі працы ўжываўся прынцып пазаэканамічнага прымусу, характэрны для феадальнага грамадства.

Сялян працягвалі абмяжоўваць у карыстанні нават невялікімі прысядзібнымі надзеламі. Кожная сялянская гаспадарка была абавязана пастаўляць дзяржаве ў якасці падатку за прысядзібны ўчастак мяса, малако, яйкі, воўну, іншую сельскагаспадарчую прадукцыю па нізкіх цэнах, якія не апраўдвалі выдаткаў на яе вытворчасць. Сяляне абкладаліся дадатковымі падаткамі, сярод якіх былі нават падаткі на пладовыя дрэвы, ягадныя кусты і ўвогуле на вырашчаную прадукцыю. У маштабах краіны, як і ў часы калектывізацыі,




*Плакат 1952 г.*

ішло пераразмеркаванне сродкаў з сельскай гаспадаркі на развіццё цяжкай прамысловасці.

Каб запужаць сельскае насельніцтва, прымусіць працаваць без аплаты, уладамі ўжываліся разнастайныя рэпрэсіўныя меры. Так, 2 чэрвеня 1948 г. быў прыняты Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета ССР «Аб высяленні ў аддаленыя раёны асоб, якія злосна ўхіляюцца ад працоўнай дзейнасці ў сельскай гаспадарцы і вядуць антыграмадскі, паразітычны лад жыцця». Паводле гэтага Указу па рашэнні агульных сходаў калгаснікаў тых, хто дрэнна працаваў, маглі выслаць за межы БССР, нават у Сібір ці на Далёкі Усход на тэрмін да 8 гадоў.

Аднак прымусовыя меры давалі няшмат карысці, і прадугледжаныя дзяржавай для сельскай гаспадаркі паказчыкі жыхары вёскі выконваць не здолелі. Каб выправіць становішча, у 1953 г. уладамі былі павышаны нарыхтоўчыя цэны на сельскагаспадарчую прадукцыю ў сярэднім у 2–5,5 разы. З калгаснікаў спісваліся нядоімкі па сельгаспадатку, дазвалялася павялічыць прысядзібныя ўчасткі. Крыху ўзрасла колькасць грашовых сродкаў, якія дзяржава выдаткоўвала на развіццё сельскай гаспадаркі. Але гэтыя касметычныя меры не маглі прывесці да рэальных станоўчых зрухаў у аграрным сектары эканомікі. Слабая матэрыяльная зацікаўленасць калгаснікаў у выніках сваёй працы, прымусовыя метады кіравання гаспадаркай былі галоўнай прычынай упадку аграрнай вытворчасці. Планы на развіццё сельскай гаспадаркі ў Беларусі выкананы не былі.

***Асаблівасці аграрнай палітыкі ў заходніх абласцях Беларусі.*** Адначасова з аднаўленнем калгасна-саўгаснай сістэмы там, дзе яна існавала да вайны, пачалася калектывізацыя на землях, уз'яднаных з БССР у 1939 г. На пачатак 1947 г. у Заходняй Беларусі было адноўлена і арганізавана 133 калгасы (0,56 % сялянскіх гаспадарак). У лютым 1949 г. на XIX з'ездзе КП(б)Б было запатрабавана хутчэй завяршыць калектывізацыю ў заходніх абласцях і яна пачала насіць

адкрыта прымусовы характар. У студзені 1950 г. ў Заходняй Беларусі пры МТС былі створаны палітычныя аддзелы, якія займаліся справамі калектывізацыі, і да канца 1950 г. тут былі арганізаваны 6054 калгасы, якія кантралявалі 85 % пасяўной плошчы.

Адначасова былі ліквідаваны заможныя (кулацкія) гаспадаркі, выселены хутары, узмоцнены эканамічны націск на аднаасобнікаў – тых, хто нават пад прымусам адмаўляўся ісці ў калгасы. У 1952 г. з Заходняй Беларусі былі высланыя ў Казахстан і Сібір 8953 «кулацкія сям'і». У выніку, калектывізацыя ў Заходняй Беларусі ў асноўным была завершаная да канца 1952 г.

Прымусовая палітыка перабудовы сельскай гаспадаркі на сацыялістычны лад выклікала ў сялян заходнебеларускай вёскі нязгоду і супрацьдзеянне. Гэта выяўлялася ва ўцёках, утойванні жывёлы ў лясах, нанясенні шкоды калгаснай гаспадарцы, далучэнні сялян да дзейнасці розных антысавецкіх фарміраванняў і інш. Савецкая ўлада ў адказ узмацняла рэпрэсіі супраць не згодных з яе палітыкай. Прымусовы характар правядзення калектывізацыі ў Заходняй Беларусі выклікаў масавыя пратэсты насельніцтва і, як вынік, узмацненне рэпрэсій.

Такім чынам, калектывізацыя заходнебеларускай вёскі праходзіла паводле таго самага сцэнарыю і тымі ж прымусовымі метадамі, як і на ўсходзе Беларусі ў канцы 1920–1930-х гг. Асноўны ўдар прыйшоўся на сялян-сераднякоў, значную групу руплівага і працавітага сялянства.

Увогуле, аграрная палітыка ў БССР у пасляваенны перыяд вызначалася падпарадкаванасцю сельскагаспадарчай галіны эканомікі інтарэсам развіцця прамысловасці.

**4. *Сацыяльная палітыка, грамадска-палітычнае жыццё і культура.*** Пасля перамогі над фашызмам ніякіх дэмакратычных зменаў у краіне не адбылося. У БССР, як і ва ўсім Савецкім Саюзе, захавалася таталітарная сістэма, вядучую ролю ў якой адыгрывала камуністычная партыя. Больш за тое, на дзяржаўным узроўні пачалося «закручванне гаек», якое было скіравана на захаванне ў нязменным выглядзе старой сістэмы грамадскіх адносін. Рабілася

гэта, паводле досведу 1930-х гг., двума спосабамі: праз узмацненне ідэалагічнай апрацоўкі свядомасці людзей і з прымяненнем рэпрэсій супраць іншадумцаў.

У 1947 г. адбыліся выбары ў Вярхоўны Савет БССР, а ў 1948 г. – у мясцовыя саветы, але па-ранейшаму гэтыя выбары былі безальтэрнатыўнымі. У бюлетэнь уносілася толькі адно прозвішча загадзя праверанага, «патрэбнага» ўладам чалавека. Функцыя падбору і расстаноўкі кадраў ускладалася на партыйныя камітэты. Асаблівая ўвага кіроўнымі органамі надавалася Заходняй Беларусі, дзе фарсіраванымі тэмпамі праводзіліся мерапрыемствы з мэтай уніфікацыі грамадска-палітычнага, эканамічнага і культурнага жыцця на гэтых землях з астатняй тэрыторыяй БССР. Гэты працэс атрымаў назву *саветызацыі*.

У дзяржаўным апараце СССР адносіны да Беларусі былі падазронымі з прычыны трохгадовага існавання на гэтых землях нямецкага акупацыйнага рэжыму. Людзі, якіх Чырвоная армія не змагла абараніць і якія не па сваёй волі апынуліся на акупаванай тэрыторыі, апынуліся вінаватымі ў гэтым перад камуністычнымі ўладамі. У спецыяльных анкетах, якія ў СССР запаўнялі ўсе, хто афармляўся на працу, было пытанне «Ці знаходзіліся Вы ці Вашы родзічы на акупаванай тэрыторыі?». Станоўчы адказ на гэтае пытанне не спрыяў чалавеку ў заняцці той ці іншай пасады, пры паступленні на вучобу і інш. Такім чынам, пасля вайны практычна ўсё насельніцтва Беларусі апынулася пад падазрэннем у савецкай улады.

На кіроўныя пасады ў БССР мясцовыя камуністы не прызначаліся, вышэйшае начальства прысылалася з Масквы. На пасаду першага сакратара ЦК КП(б)Б да 1956 г. ні разу не быў прызначаны беларус. Жорсткая партыйная цэнтралізацыя, недапушчэнне альтэрнатыўнай думкі вызначалі сутнасць грамадска-палітычнага жыцця ў пасляваеннай Беларусі.

Саветы на практыцы не з'яўляліся паўнаўладнымі органамі ўлады, бо знаходзіліся пад поўным кантролем партыйнага апарату. Нават Вярхоўны Савет БССР як вышэйшы прадстаўнічы і заканадаўчы орган улады дзейнічаў намінальна – ён толькі зацвярджаў рашэнні, якія прымаліся ў ЦК КП(б)Б.

Нягледзячы на перамогу ў вайне, масавыя рэпрэсіі не спыніліся, а наадварот, распачаліся з новай сілай. У лік рэпрэсаваных траплялі:

1) *рэпатрыянты* (ваеннапалонныя і насельніцтва, прымусова вывезенае на работу ў Германію);

2) насельніцтва, якое падчас вайны знаходзілася на акупаваных тэрыторыях;

3) людзі, якія тым ці іншым чынам супрацоўнічалі з немцамі ці проста працавалі на нейкіх пасадах у часы акупацыі;

4) дзеячы культуры, навукі, якія праўдзіва адлюстроўвалі ваенныя падзеі ці ролю партыі і кіраўніцтва ў перамозе і пасляваеннай адбудове, а не пераходзілі на пазіцыі так званага *«сацыялістычнага рэалізму»*;

5) тыя, хто адкрыта выказваў сумненне ў правільнасці палітыкі, якую праводзіла камуністычная партыя;

6) людзі, якія выказваліся за незалежнасць Беларусі і інш.

У стомленым вайной грамадстве зноў усталявалася атмасфера страху і падазронасці. Падазрэнні ў здрадзе тычыліся нават партызан і падпольшчыкаў, як, напрыклад, у адносінах да удзельнікаў мінскага антыфашысцкага падполля. Фізічна і маральна былі зломлены рэпатрыянты, якія, зведаўшы цяжкасці фашысцкага палону і нявольніцкай працы, на радзіме трапілі ў лік ворагаў і ў пераважнай большасці апынуліся ў засценках ГУЛАГу.




*Савецкі плакат*

Праўдай было і тое, што многія франтавікі – салдаты і афіцэры, якія напрыканцы вайны пабывалі ў еўрапейскіх краінах,

убачылі рэальны ўзровень грамадскага і сацыяльнага жыцця іх насельніцтва, што дало многім з іх падставы для пераасэнсавання шмат якіх бакоў савецкай рэчаіснасці. Вядома, што ў пасляваеннай Беларусі існавала некалькі падпольных арганізацый, якія ставілі на мэце абарону нацыянальных правоў і свабод беларусаў, барацьбу за захаванне і развіццё беларускай культуры, мовы і гісторыі, імкненне да пабудовы беларускай дзяржаўнасці.

Найбольш радыкальна паводзіла сябе моладзь, асабліва навучэнцы і студэнты. Так, вядома, што ўвесну 1946 г. у Слоніме была створана моладзевая падпольная арганізацыя «Чайка». Падпольныя групы з'явіліся ў Баранавіцкім настаўніцкім інстытуце, на Брэсцкім чыгуначным вузле, у Жыровіцкім сельскагаспадарчым тэхнікуме, Ганцавіцкім педагагічным вучылішчы. Але савецкія спецслужбы раскрылі гэтыя арганізацыі, і ўлетку 1947 г. іх удзельнікі былі арыштаваны. Яны абвінавачваліся ў тым, што «праводзілі антысавецкую нацыяналістычную прапаганду, рыхтавалі кадры для правядзення тэрарыстычных актаў, збіралі зброю, распаўсюджвалі нацыяналістычную літаратуру». Справы арыштаваных разглядалі некалькі закрытых ваенных трыбуналаў у Баранавічах і Мінску, удзельнікі падпольных арганізацый былі пакараны.

Вядома таксама, што падпольная беларуская патрыятычная арганізацыя існавала ў 1946 г. у Глыбоцкім педагагічным вучылішчы (*«Саюз беларускіх патрыётаў»* – СБП). Трыбуналам Беларускай ваеннай акругі ў чэрвені 1947 года былі асуджаны 33 ўдзельнікі СБП, яны былі пазбаўлены волі ад 5 да 25 гадоў. Былі падобныя арганізацыі і ў Мінску, а таксама на тэрыторыі Маладзечанскай і Пінскай абласцей, яны насілі назву *«Свабодная Беларусь»*.

Прыведзеныя факты сведчаць аб новых настроях беларускай моладзі пасля вайны, аб жаданні рэформаў і зменаў у грамадска-палітычным жыцці. Ідэя неабходнасці пераменаў у грамадска-палітычным жыцці вітала і сярод прадстаўнікоў вышэйшых партыйных і савецкіх структур.

Трэба мець на ўвазе, што такіх нацыянальных арганізацый і груп магло быць значна больш. Мы ж сёння ведаем толькі пра тыя, якія былі раскрытыя савецкімі карнымі органамі.

Рэпрэсіі ў першыя пасляваенныя гады нарасталі па ўсім Савецкім Саюзе, у тым ліку і ў Беларусі. Пачалася «чыстка» і вышэйшых эшалонаў улады. У 1949 г. была сфабрыкавана *«ленінградская справа»*, паводле якой было рэпрэсавана больш за 200 партыйных і савецкіх работнікаў; некаторыя з іх былі прыгавораныя да найвышэйшай меры пакарання. Былі расстраляныя сакратар ЦК УКП(б) А. А. Кузняцоў, старшыня Дзяржплана СССР М. А. Вазнясенскі і інш.

Вядома, што за 1946–1953 гг. у Беларусі па палітычных матывах да крымінальнай адказнасці ў Беларусі было прыцягнута каля 50 чалавек.

Галоўным арганізатарам рэпрэсій на тэрыторыі пасляваеннай Беларусі стаў міністр дзяржаўнай бяспекі Беларускай ССР *Л. Ф. Цанава*. Паводле падлікаў гісторыкаў, у першы год знаходжання Цанавы на пасадзе наркама ўнутраных спраў БССР у Беларусі па палітычных матывах было арыштавана 27 тыс. чалавек. Людзей абвінавачвалі ў шпіянажы, нацыяналізме і контррэвалюцыйнай дзейнасці.

Ідэалогія пасляваеннага сталінізму характарызавалася крайнім дагматызмам, абсалютнай непрымірымасцю да любых поглядаў, якія адрозніваліся ад афіцыйнага пункту гледжання. Адсюль выцякаў галоўны пастулат сталінскай ідэалогіі – весці актыўную барацьбу супраць іншадумства і плюралізму думак. З гэтай мэ-



*Дэманстрацыя працоўных у Мінску, пачатак 1950-х.*

тай была спланавана сістэма палітычных кампаній, якія навязвалі жорсткія ідэалагічныя стэрэатыпы, выключалі з жыцця агульначалавечыя каштоўнасці, падаўлялі нацыянальную самасвядомасць народа, абмяжоўвалі міжнародныя кантакты інтэлігенцыі.

Пасляваенны перыяд быў вельмі цяжкім для культуры. Яна была пад жорсткім ідэалагічным уціскам, у аснову якога быў пакладзены *прынцып партыйнасці* – строгага выканання партыйных загадаў і ўсхвалення камуністычнай ідэі. Галоўнымі тэмамі ў літаратуры, музыцы і мастацтве былі тэмы сталініяны, вайны, кіроўнай ролі камуністычнай партыі ў пераможнай вайне і адбудове грамадства. Тыя прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі, якія раней арыштоўваліся па палітычных матывах, лічыліся нядобранадзейнымі і былі паўторна рэпрэсаваныя. Так, пасля вайны ўжо трэці раз былі арыштаваны і высланы з Беларусі вядомы вучоны-гісторык *Мікалай Улашчык* і паэт *Уладзімір Дубоўка*. Паўторна былі рэпрэсаваны пісьменнікі *Сяргей Грахоўскі*, *Барыс Мікуліч* і інш.

З вялікімі цяжкасцямі сутыкнулася адукацыйная сістэма, матэрыяльная база якой была амаль цалкам знішчана за гады вайны: былі зруйнаваны будынкі школ, не было падручнікаў, паперы, не хапала настаўнікаў. Разам з тым, ужо ў 1949 г. была ўведзена ўсеагульная абавязковая сямігадовая адукацыя, а ў 1950 г. колькасць пабудаваных школ перавысіла даваенную лічбу. У 1950–1951 навучальным годзе школьная сетка ў рэспубліцы перавысіла даваенную. Але колькасць вучняў была меншай, чым у перадваенныя гады, што было выразным адлюстраваннем чалавечых страт у вайне.

Ствараліся ўмовы вучобы для тых, хто працаваў на вытворчасці і ў сельскай гаспадарцы: адкрываліся вячэрнія школы рабочай і сельскай моладзі. У заходніх абласцях Беларусі вялася праца па ліквідацыі непісьменнасці – грамаце было навучана больш за 370 тыс. непісьменных і звыш 500 тыс. малапісьменных.

Узнаўлялася дзейнасць вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў (варта ўзгадаць, што падчас вайны ў эвакуацыі працавалі толькі Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт і Мінскі медыцынскі інстытут), аднаўлялася матэрыяльная база

ВНУ, тэхнікумаў, навуковых устаноў. Ужо ў 1944 г. у Беларусі аднавілі сваю дзейнасць Беларускі політэхнічны інстытут, БДУ і Мінскі медыцынскі інстытут. У 1944–1945 гг. зноў пачаліся заняткі ў Беларускім інстытуце народнай гаспадаркі. У 1945 г. быў створаны Беларускі тэатральны інстытут (у 1953 г. перайменаваны ў тэатральна-мастацкі). У 1948 г. адкрыўся Мінскі педагагічны інстытут замежных моў.

У 1945 г. з 25 даваенных ВНУ працавала 22, а ў 1950–1951 навучальным годзе ў Беларусі дзейнічала ўжо 29 ВНУ, у якіх займалася на 10 тыс. студэнтаў больш, чым перад вайной. Для аднаўлення народнай гаспадаркі не хапала інжынерных кадраў, таму ў першай палове 1950-х гг. для іх падрыхтоўкі былі адкрыты новыя ВНУ: Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут, Беларускі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту ў Гомелі, Беларускі інстытут механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі ў Мінску, а таксама Брэсцкі, Мазырскі і Полацкі педагагічныя інстытуты. У выніку выпуск спецыялістаў з ВНУ у 1955 г. перавысіў даваенны амаль у 2,5 разы.

Разам з тым, было і шмат недахопаў. Амаль палова школ працавала ў дзве змены. Пачалося рэзкае скарачэнне беларускіх школ як у гарадах, так і ў сельскай мясцовасці. У сувязі з тым, што выкладанне ў ВНУ, педагагічных інстытутах і тэхнікумах вялося на рускай мове, пачаў адчувацца недахоп беларускамоўных выкладчыкаў. Нават у беларускіх школах многія прадметы выкладаліся па-руску. Колькасць рускамоўных школ і прадметаў пастаянна ўзрастала за кошт беларускамоўных. Як у школах, так і ў ВНУ надавалася недастаткова ўвагі вывучэнню нацыянальнай гісторыі. Гісторыя Беларусі свядома падмянялася гісторыяй Расіі пад выглядам «гісторыі СССР». Станоўча ацэньваліся толькі тыя гістарычныя асобы, якія нешта зрабілі на карысць Расіі ці СССР. Існаванне беларускай нацыі па-за межамі гэтых дзяржаўных утварэнняў выкладалася коратка і з пункту гледжання расійскай гістарыяграфіі. Усё беларускае, нацыянальнае падавалася як менш важнае, часам нават шкоднае, у параўнанні з тым, што адбывалася ў гісторыі Расіі. Гэта вяло да фарміравання ў навучэнцаў нацыянальнага нігілізму, пагарды да гісторыі і культуры свайго народа. З улікам таго, што

ўсе дзяржаўныя і партыйныя ўстановы працавалі на рускай мове, многія бацькі і дзеці выбіралі мовай навучання тую, на якой можна было зрабіць кар'еру.

Прыкметна хуткімі тэмпамі развівалася матэрыяльна-тэхнічная база навукі. У 1944 г. аднавіла сваю дзейнасць Акадэмія навук БССР. У яе складзе ствараліся новыя навукова-даследчыя інстытуты: механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі, філасофіі і права, фізіка-тэхнічны, энергетыкі, фізікі і матэматыкі і інш. Калі ў 1945 г. дзейнічала 8 акадэмічных інстытутаў, то ў пачатку 1950-х іх налічвалася 20. У развіццё Акадэміі навук у пасляваенныя гады значны ўклад зрабіў яе прэзідэнт *Васіль Купрэвіч*.

Значная ўвага была нададзена вывучэнню біялогіі і сельскагаспадарчых навук. У Інстытуце гісторыі ішла праца па падрыхтоўцы двухтомнай «Гісторыі Беларускай ССР», пачалі праводзіцца археалагічныя раскопкі старажытных беларускіх гарадоў, выяўляцца і брацца пад дзяржаўную ахову іншыя помнікі археалогіі, гісторыі і культуры Беларусі.

Дасягненні навукі ў пасляваенны перыяд пачалі паступова ўкараняцца ў вытворчасць. У 1951 г. Дзяржаўную прэмію СССР атрымаў доктар сельскагаспадарчых навук *П. І. Альсмік* – за вывядзенне і ўкараненне ў вытворчасць высокапрадукцыйных гатункаў бульбы; у 1952 г. доктар геолага-мінералагічных навук *Г. В. Багамолаў* – за разведку і адкрыццё Старобінскага радовішча калійных соляў. Былі дасягненні і ў іншых галінах навукі. Разам з тым мелася і шмат праблем: найперш гэта ўмяшальніцтва партыйных чыноўнікаў у сферу навукі, адміністрацыйныя метады кіравання навукай, грубы ідэалагічны дыктат. Партыйныя ідэолагі «кіравалі» даследаваннямі ў галіне гісторыі і культуры, філасофіі, мовазнаўства, генетыкі і інш.

Вядома, што прэзідэнт АН БССР В. Ф. Купрэвіч прыклаў шмат намаганняў для аднаўлення даследаванняў у галіне генетыкі. Аднак адміністрацыйныя метады кіравання навукай паўплывалі на прызнанне неперспектыўнымі такіх навуковых кірункаў, як генетыка і кібернетыка. Партыйнае кіраўніцтва ўгледзела паклёп на савецкіх вучоных у навуковай публікацыі ў амерыканскім часопісе вядома-

га вучонага-генетыка і селекцыянера, прэзідэнта Акадэміі навук БССР у 1947 г. *А. Р. Жэбрака*, дзе ён крытыкаваў антынавуковыя погляды саюзнага «самавука-акадэміка» Т. Дз. Лысенкі. Сам артыкул А. Р. Жэбрака быў названы антыпатрыятычнай акцыяй.

***Літаратура***. У 1945 г. у складзе Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР налічвалася ўсяго 47 чалавек. Пераход да мірнага жыцця спрыяў таму, што ў літаратуру прыйшлі новыя таленты. Ужо ў 1950 г. Саюз пісьменнікаў налічваў каля 120 чалавек. У гэты час сваю знакамітую трылогію «На ростанях» завяршыў адзін са стваральнікаў новай беларускай літаратуры *Якуб Колас*. Сярод новых беларускіх літаратараў з'явіліся прозвішчы *Івана Мележа*, *Івана Шамякіна*, *Андрэя Макаёнка*, *Янкі Брыля*. Перашкодай у творчасці было тое, што ад пісьменнікаў патрабавалі прытрымлівацца ў сваёй творчай дзейнасці ўжо згаданага метаду сацыялістычнага рэалізму і прынцыпу партыйнасці – кіравацца ідэалогіяй і указаннямі камуністычнай партыі, зыходзіць з партыйных прадвызначэнняў.

Беларуская літаратура пасляваенных гадоў была прысвечана пераважна тэме вайны. Так, ваенным падзеям былі прысвечаны раманы «Млечны Шлях» Кузьмы Чорнага, «Векапомныя дні» Міхася Лынькова, «Глыбокая плынь» Шамякіна, «Мінскі напрамак» Мележа. Узбагачалася і беларуская паэзія, асноўнай тэмай тут таксама была перамога ў вайне і пасляваенная адбудова народнай гаспадаркі. Вядомасцю карысталіся беларускія паэты *Пятрусь Броўка*, *Максім Танк*, *Пімен Панчанка*, *Аркадзь Куляшоў* і інш.

***Тэатр. Драматургія. Музычнае мастацтва.*** Пасля вайны пачалося адраджэнне беларускага тэатра, развіццё беларускай драматургіі. На радзіму вярнуліся тэатры, якія знаходзіліся ў эвакуацыі. Распачалі сваю дзейнасць тэатральныя калектывы, што спынілі працу ў сувязі з вайной. Ужо ў сезоне 1944–1945 гг. у Беларусі працавала 12 тэатраў. Пры тэатрах імя Янкі Купалы і імя Якуба Коласа былі створаны студыі для падрыхтоўкі акцёраў. Рэпертуар тэатраў у гэты час складалі лепшыя спектаклі мінулых гадоў і спектаклі ваеннага часу. Ставіліся п'есы «Канстанцін Заслонаў» Аркадзя Маўзона, «Брэсцкая крэпасць» Кастуся Губарэвіча.

Ідэалагічны дыктат не змог перашкодзіць дзейнасці такіх вы-

датных актораў, як *Глеб Глебаў*, *Барыс Платонаў*, *Лідзія Ржэцкая*, *Стэфанія Станюта* і інш. Буйной мастацкай з’явай стала сатырычная камедыя *Андрэя Макаёнка* «Выбачайце, калі ласка!», у якой крытыкаваліся недахопы тагачаснага жыцця на вёсцы. Дзяржаўны тэатр оперы і балета БССР у 1945 г. распачаў працу над операй *Яўгена Цікоцкага* «Алеся» («Дзяўчына з Палесся»), дзе выканаўцай галоўнай ролі была вядомая беларуская спявачка *Ларыса Александроўская*. У 1940–1950-я гг. ставіліся оперы «Надзея Дурава» *Анатоля Багатырова* і «Кастусь Каліноўскі» *Дзмітрыя Лукаса*.

Беларускі ансамбль песні і танца быў пераўтвораны ў Дзяржаўную харавую капэлу БССР на чале з *Рыгорам Шырмай*. Дзейнічаў Дзяржаўны народны аркестр БССР пад кіраўніцтвам *Іосіфа Жыновіча*. У 1952 г. быў створаны Дзяржаўны акадэмічны народны хор БССР на чале з *Генадзем Цітовічам*. Творчая дзейнасць беларускіх кампазітараў характарызавалася непарыўнай сувяззю з народным мастацтвам. Не абыходзілі яны і тэму Вялікай Айчыннай вайны, задач пабудовы сацыялістычнага грамадства, ролі партыі ў гэтых працэсах. Часта творцы вымушаны былі пісаць на гэтыя тэмы, баючыся рэпрэсій і даючы сабе мажлівасць займацца іншымі, сапраўды мастацкімі, праблемамі. Тым больш, што рэпрэсіі ў дачыненні да творцаў звычайна звязвалі з нацыянальнымі пытаннямі, з беларускай мовай, традыцыямі і г. д. Так, былі нападкі на оперу Я. Цікоцкага «Алеся», быў рэпрэсаваны міністр асветы БССР *П. В. Саевіч*, які выказаўся за больш шырокае ўжыванне беларускай мовы.

***Выяўленчае мастацтва. Архітэктура і скульптура.*** У меншай ступені закрануў ідэалагічны дыктат выяўленчае мастацтва. У духу часу тут таксама пераважала героіка-патрыятычная тэматыка, у першую чаргу тэма партызанскай барацьбы. Шырокую вядомасць атрымалі карціны «Парад беларускіх партызан у 1944 г. у Мінску» *Яўгена Зайцава*, «Абарона Брэсцкай крэпасці» *Івана Ахрэмчыка*, «Мінск. 3 ліпеня 1944 года» *Валянціна Волкава* і інш.

Пры аднаўленні Мінска ярка праявіла сябе беларуская архітэктурная школа, у якой у гэты час назіраліся выразныя праявы

фундаменталізму. Гэта яскрава праявілася ў кампазіцыі Прывакзальнай плошчы ў г. Мінску, Праспекта незалежнасці, будынках Галоўпаштамта, Палаца культуры Белсаўпрафу і інш. Актыўна пачалі працаваць у сферы ваенна-патрыятычнай тэматыкі скульптар *Заір Азгур*, архітэктары *Анатоль Воінаў*, *Уладзімір Кароль* і інш.

Такім чынам, пры пераходзе да мірнага жыцця БССР сутыкнулася з вялікімі цяжкасцямі. Яны былі абумоўлены панесенымі падчас вайны стратамі і ўзмацненнем таталітарнага рэжыму, якому былі падпарадкаваны эканоміка, культура, грамадска-палітычнае жыццё ў краіне. Аднаўленне гаспадаркі Беларусі адбывалася дзякуючы, у першую чаргу, працоўнаму подзвігу народа.

**5.** ***Беларусь на міжнароднай арэне.*** Міжнародна-палітычны статус Беларусі значна ўзрос пасля таго, як яна ў 1945 г. у шэрагу іншых краін выступіла ў якасці дзяржавы-заснавальніцы Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Беларусь выйшла на міжнародную арэну ў якасці суб'екта міжнароднага права, фармальна самастойнага члена міжнароднай супольнасці. 30 жніўня 1945 г. Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР ратыфікаваў Статут ААН. Удзел дэлегацыі Беларусі ў працы сесій Генеральнай Асамблеі ААН істотна падвысіў міжнародны аўтарытэт Беларусі, яе пазнавальнасць у свеце. Нягледзячы на тое, што БССР не была поўнасцю самастойнай у прыняцці рашэнняў, а выступала выключна ў падтрымку прапаноў Савецкага Саюза, удзел Беларусі ў важнейшай міжнароднай арганізацыі, безумоўна, садзейнічаў развіццю кантактаў і сувязяў з рознымі краінамі, набыццю міжнароднага вопыту.

У 1946 г. дэлегацыя Беларусі ўдзельнічала ў працы Парыжскай мірнай канферэнцыі. У лютым 1947 г. БССР падпісала мірны дагавор з Балгарыяй, Італіяй, Румыніяй, Венгрыяй і Фінляндыяй. Урад Беларусі заключыў пагадненне з Адміністрацыяй дапамогі і аднаўлення ААН, якая была створана міжнароднай супольнасцю для дапамогі краінам, якія найбольш пацярпелі ў вайне. У выніку да канца 1947 г. Беларусь атрымала абсталявання і тавараў на 61 млн. долараў. З гэтай сумы 23,5 млн. долараў былі накіраваны на аднаўленне прамысловасці і сельскай гаспадаркі.

Згодна з падпісаным 16 жніўня 1945 г. паміж СССР і Польшчай дагаворам аб дзяржаўнай граніцы,Польшчы перадаваліся 17 раёнаў Беластоцкай вобласці БССР разам з Беластокам і 3 раёны Брэсцкай вобласці, дзе пражывала значная колькасць палякаў.

У 1946 г. падчас удакладнення дзяржаўнай граніцы СССР і Польшчай са складу Гродзенскага раёна на карысць апошняй былі перададзены вёскі Клімаўка, Мінкаўцы, Номікі, Такі, Толчы, Шымакі, а са складу Сапоцкінскага раёна – вёскі Тадоркаўцы і Хварасцяны. Пасля гэтага граніца паміж Польшчай і Беларуссю не змянялася.

***Міжнароднае становішча***. У 1949 г. у Савецкім Саюзе была створана атамная бомба і, такім чынам,ліквідавана манаполія ЗША ў галіне ядзернай зброі. Пачалася *«халодная вайна»* – ваенна-палітычная канфрантацыя груп дзяржаў, у першую чаргу СССР і ЗША. Паміж імі не адбывалася адкрытых ваенных сутыкненняў, але вялося назапашванне ядзернай зброі (*гонка ўзбраенняў*), ствараліся ваенна-палітычныя блокі і саюзы (1949 г. – *НАТО*, 1955 г. – *Варшаўскі дагавор*). Не ўступаючы ў адкрытае ўзброенае супрацьстаянне, СССР і ЗША разам са сваімі саюзнікамі ўдзельнічалі ў лакальных войнах і канфліктах.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Арганізацыя Аб'яднаных Нацый (ААН)*** – міжнародная арганізацыя, заснаваная ў 1945 г. для падтрымання і ўмацавання міжнароднага міру і бяспекі, развіцця супрацоўніцтва паміж дзяржавамі. Цяпер у ААН уваходзяць 192 дзяржавы.

***Касмапалітызм*** – светапогляд, прадстаўнікі якога не лічаць сябе прыналежнымі да якой-небудзь нацыянальнасці ці краіны, а прызнаюць сваёй Айчынай увесь свет, спавядаюць ідэю сусветнага грамадзянства. Па-сутнасці, гэта ідэалогія, якая адмаўляе дзяржаўны і нацыянальны суверэнітэт і прапаведуе адмаўленне ад нацыянальных традыцый, нацыянальнай культуры, патрыятызму.

***Ідэалогія*** – сістэма поглядаў, у якой усведамляюцца і ацэньваюцца адносіны людзей да рэчаіснасці і адзін да аднаго, якая выказвае інтарэсы розных сацыяльных груп, палітычных і нацыянальных супольнасцяў.

***Канверсія*** – перавод прадпрыемстваў, якія выпускалі ваенную прадукцыю, на вытворчасць мірнай прадукцыі.

***Пасляваеннае аднаўленне*** – перыяд развіцця, звязаны з пераадоленнем наступстваў разбурэнняў, нанесеных у гады вайны.

***Рэпарацыі*** (лац. reparatio – аднаўленне) – поўная ці частковая кампенсацыя, выплата дзяржавай, якая распачала вайну, грашовай або іншага віду кампенсацыі тым дзяржавам, якія пацярпелі ад агрэсіі.

***Рээвакуацыя*** – вяртанне ў месцы першапачатковага знаходжання людзей, прадпрыемстваў, маёмасці, якія былі вывезены ў сувязі з ваеннымі дзеяннямі, стыхійнымі бедствамі і інш.

***Саветызацыя*** – уніфікацыя грамадска-палітычнага, эканамічнага і культурнага жыцця ў Заходняй Беларусі ў пасляваенны перыяд з астатняй тэрыторыяй БССР.

***Сацыялістычны рэалізм*** – мастацкі метад, які патрабаваў адлюстравання ў літаратуры і мастацтве тых рэалій жыцця («праўдзівае і гістарычна-канкрэтнае адлюстраванне рэчаіснасці»), якія былі звязаныя з пабудовай сацыялізму ў СССР. Гэты некрытычны метад навязваўся творцам ідэолагамі пануючай камуністычнай партыі.

***Прынцып партыйнасці*** – строгае выкананне дзеячамі культуры і мастацтва партыйных загадаў і ўсхваленне камуністычнай ідэі.

***Светапогляд*** – сістэма поглядаў чалавека на свет (прыроду, людзей, грамадства), якія выяўляюць яго асабістыя адносіны да навакольнай рэчаіснасці.

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***26 чэрвеня 1945 г.*** – заснаванне ААН.

***2 верасня 1945 г.*** – капітуляцыя Японіі. Заканчэнне Другой сусветнай вайны.

**1946 г.** – па прапанове БССР Генеральная Асамблея ААН прыняла рэзалюцыю «Аб выдачы і пакаранні ваенных злачынцаў».

***Кастрычнік 1947 г.*** – на Мінскім аўтамабільным заводзе выпушчаны першыя самазвалы МАЗ-205.

***14 снежня 1947 г.*** – апублікавана пастанова Савета Міністраў СССР аб правядзенні ў СССР грашовай рэформы і адмене картачнай

сістэмы забеспячэння насельніцтва харчовымі і прамысловымі таварамі.

***1947 г.*** – выйшла паэма Якуба Коласа «Рыбакова хата», за якую ён атрымаў Дзяржаўную прэмію СССР.

***1949 г.*** – эканоміка Беларусі дасягнула даваеннага ўзроўню, а ў 1950 г. перавысіла яго.

***4 лістапада 1950 г.*** – на Мінскім трактарным заводзе пачаты серыйны выпуск трактароў КД-35.

**1950 г.** – завяршылася калектывізацыя ў заходніх абласцях Беларусі.

***1951 г.*** – у сувязі з уваходжаннем БССР у склад ААН быў зацверджаны Дзяржаўны сцяг БССР.

***1951 г.*** – адмена ў школах БССР абавязковага экзамену па беларускай мове.

***19 верасня 1952 г.*** – у г. Мінску адкрылася першая тралейбусная лінія

## ЛІТАРАТУРА


1. *Адамушка У. І.* Палітычныя рэпрэсіі 20–50-х гадоў на Беларусі. Мн: Беларусь, 1994.
2. *Басюк І. А.* Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі. Гродна, 2011.
3. *Вішнеўскі А. Ф.* Палітыка-прававы рэжым савецкай дзяржавы (1917–1953 гг.). Мінск, 2003.
4. *Галубовіч В. І.* і інш. Эканамічная гісторыя Беларусі: вучэбны дапаможнік. Мн.: Экаперспектыва, 1999.
5. *Грузіцкі Ю. Л.* Грашовая рэформа 1947 г., яе перадумовы і вынікі // З гісторыі эканамічных рэформаў на Беларусі. Вып. 2. Мн., 1999.
6. *Белязо А. П.* Беларуская вёска ў пасляваенныя гады (1945–1950 гг.). Мн.: Выд-ва БДУ, 1974.
7. *Касцюк М. П.* Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі. Мн.: Экаперспектыва, 2000.
8. *Лыч Л., Навіцкі У.* Гісторыя культуры Беларусі. Мн.: Экаперспектыва, 1996.
9. *Марченко И. Е.* Промышленность и рабочий класс Советской Бе-

лоруссии в годы восстановления и развития народного хозяйства (1943–1950 гг.). Мн.: Академия наук БССР, 1968.

10. *Снапковский В. Е.* Белорусская ССР в ООН (1945–1985 гг.). Мн.: Навука і тэхніка, 1985.
11. *Снапкоўскі У. Е.* Знешнепалітычная дзейнасць Беларусі. 1944–1953 гг. Мн.: Беларуская навука, 1997.
12. *Шыбека З.* Нарыс гісторыі Беларусі (1795–2002). Мн.: Энцыклапедыкс, 2003.

# РАЗДЗЕЛ 2.
# БЕЛАРУСЬ Ў ЧАСЫ ПАЛІТЫЧНАЙ «АДЛІГІ» І НАВУКОВА-ТЭХНІЧНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ (1953–1964 гг.).

*1. Змены ў грамадска-палітычным жыцці.*
*2. Сацыяльна-эканамічнае развіццё ў 1953–1964 гг.*
*3. Лібералізацыя ў сферы культуры.*
*4. Знешняя палітыка. Міжнароднае становішча Беларусі.*

**1.** ***Змены ў грамадска-палітычным жыцці.*** Пасля смерці *І. В. Сталіна*, што здарылася 5 сакавіка 1953 г.,унутрыпалітычнае становішча ў краіне пачало паступова змяняцца. У Савецкім Саюзе адбываліся змены, якія непасрэдна ўплывалі на Беларусь. Пасаду старшыні Савета Міністраў СССР заняў *Г. М. Малянкоў*, а першым сакратаром ЦК КПСС у верасні 1953 г. быў абраны *М. С. Хрушчоў*. На жнівеньскай (1953 г.) сесіі Вярхоўнага Савета СССР Г. М. Малянкоў выступіў з абгрунтаваннем эканамічнай палітыкі новага палітычнага кіраўніцтва краіны па сацыяльнай пераарыентацыі народнай гаспадаркі. Адначасова з высокімі тэмпамі развіцця цяжкай прамысловасці планавалася больш хутка развіваць вытворчасць тавараў народнага спажывання; павялічваць капіталаўкладанні ў сельскую гаспадарку; правесці зніжэнне цэн. У Дзяржаўным бюджэце СССР на 1953 г. былі прадугледжаны вялікія датацыі на вытворчасць тавараў народнага спажывання. Для падтрымкі сельскай гаспадаркі прадугледжвалася павысіць нарыхтоўчыя цэны ў некалькі разоў. Спісваліся нядоімкі з калгасаў і калгаснікаў па сяльгаспадатку за папярэднія гады, адначасова яго памеры зніжаліся, а з 1958 г. ён быў адменены. Была ўмацавана матэрыяльна-тэхнічная база, павялічаны капіталаўкладанні на патрэбы вёскі.

Прымаліся меры па скарачэнні адміністрацыйнага апарату, па змяншэнні валакіты і бюракратызму. У 1953 г. у Беларускай ССР была праведзена рэарганізацыя цэнтральнага апарату, у выніку якой зменшылася колькасць міністэрстваў і ведамстваў. У 1954 г. у Беларусі было скарочана 5 абласцей, прайшло ўзбуйненне сельскіх саветаў. За 1954–1955 гг. штат адміністрацыйнага апарату БССР скараціўся на 10 тысяч чалавек.



*М.С. Хрушчоў*

Былі крыху пашыраны паўнамоцтвы саюзных рэспублік. Да 1957 г. заканадаўчая дзейнасць Вярхоўнага Савета БССР была абмежавана законамі па народнагаспадарчых планах, дзяржаўным бюджэце рэспублікі, а таксама па зацвярджэнні ўказаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета рэспублікі. У 1957 г. быў прыняты Закон аб размежаванні кампетэнцыі Вярхоўнага Савета СССР і Вярхоўных Саветаў саюзных рэспублік у праватворчай дзейнасці. Згодна з Законам 1957 г. у артыкул 19 Канстытуцыі Беларускай ССР былі ўнесены змены, паводле якіх да кампетэнцыі БССР былі аднесены: вызначэнне абласнога дзялення тэрыторыі БССР, кіраўніцтва дарожным будаўніцтвам, транспартам, прадпрыемствамі сувязі рэспубліканскага значэння, а таксама прыняцце заканадаўства аб судовым ладзе, судаводстве, грамадзянскае і крымінальнае заканадаўства. Але, па вялікім рахунку, гэта былі толькі касметычныя праўкі. Саюзнае заканадаўства было вышэй за рэспубліканскае, Вярхоўны Савет БССР, па сутнасці, толькі дубляваў законы, прынятыя ў Маскве: нават Канстытуцыя Беларусі павінна была ва ўсім адпавядаць саюзнай.

М. С. Хрушчоў адразу пасля абрання першым сакратаром ЦК КПСС паказаў сябе прыхільнікам рэформаў, менавіта з гэтага часу пачаўся перыяд адноснай лібералізацыі. *Лібералізацыя* за-

кранула практычна ўсе сферы жыцця грамадства – палітычную, эканамічную, сацыяльную, духоўную. Наймацней грамадства ўскалыхнулі выкрыццё культу асобы І. В. Сталіна і пачатак рэабілітацыі ахвяр палітычных рэпрэсій.

У лютым 1956 г. адбыўся XX з'езд КПСС, у апошні дзень працы якога, 25 лютага, М. С. Хрушчоў на закрытым пасяджэнні выступіў з дакладам «Аб кульце асобы і яго наступствах». Вынясенне гэтага даклада на з'езд стала перамогай над сталіністамі ў кіраўніцтве СССР – пачалася *дэсталінізацыя* краіны. Дэсталінізацыя, пачатая лібералізацыя, а таксама курс на правядзенне палітыкі рэформаў і аздараўленне ўнутрыпалітычнага становішча станоўча ўспрымаліся грамадствам. Па ініцыятыве М. С. Хрушчова быў ліквідаваны ГУЛАГ, шырокія маштабы набыла *рэабілітацыя* ахвяр сталінскіх рэпрэсій. З гэтай прычыны перыяд кіравання М. С. Хрушчова (1953–1964 гг.) у гісторыі атрымаў назву *«адлігі»*.

Адліга – часовае пацяпленне ўзімку: так і хрушчоўскія рэформы былі скіраваныя не на ліквідацыю савецкай таталітарнай сістэмы, а толькі на яе змякчэнне (адлігу). Аднак трэба прызнаць, што ў часы «хрушчоўскай палітычнай адлігі», хоць і не поўна, але на практыцы былі рэалізаваны некаторыя дэмакратычныя ідэі таго часу. Паступова аднаўляўся парадак, паводле якога грамадзяне маглі быць пазбаўлены волі толькі ў адпаведнасці з рашэннем суда. 27 сакавіка 1953 г. быў прыняты Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР «Аб амністыі», паводле якога пачалася кампанія па перагляду спраў і вызваленню вязняў.

Але сумненняў ў мэтазгоднасці самой савецкай сістэмы сярод яе кіраўніцтва не ўзнікала. Як і раней, захоўвалася аднапартыйная сістэма, і таму магчымасці для поўнай дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця заставаліся абмежаванымі. Асуджэнне культу асобы Сталіна не пацягнула за сабой адхілення ад улады яго паплечнікаў. Асновы бальшавіцкай таталітарнай сістэмы пад сумнеў не ставіліся. Следам за абвяшчэннем на XXI (1959 г.) і XXII (1961 г.) з'ездах КПСС курса на разгорнутае будаўніцтва камунізму адбывалася ўзмацненне дыктатуры партыйных органаў у грамадскім жыцці. Партыйныя арганізацыі ствараліся на

кожным прадпрыемстве, у кожным калгасе і саўгасе. Камсамол, прафсаюзы, іншыя грамадскія аб'яднанні заставаліся неад'емнай часткай адміністрацыйна-таталітарнай сістэмы кіравання Беларуссю, створанай пры Сталіне. Прывілеі партыйнага апарату нават пашырыліся.



*К. Т. Мазураў*

Тым часам адбыліся пэўныя змены і ў Беларусі. У 1956 г. першым сакратаром ЦК КПБ быў абраны К Т. Мазураў – першы беларус, які заняў найвышэйшую партыйную пасаду ў БССР. Але, як і раней, у краіне,што называлася савецкай, у Канстытуцыі якой абвяшчалася, што ўся ўлада ў БССР належыць саветам дэпутатаў працоўных, якія складаюць палітычную аснову рэспублікі, гэтыя саветы ўлады практычна не мелі. Саветы дзейнічалі пад непасрэдным кіраўніцтвам камуністычнай партыі, выконвалі яе распараджэнні. Улада ў СССР фактычна належала КПСС, а не Вярхоўнаму Савету, хоць гэта і не было прапісана ні ў Канстытуцыі СССР, ні ў Канстытуцыі БССР. Камуністы дзяржаўную ўладу фактычна ўзурпавалі і, пакрытыкаваўшы сябе за сталінізм, па-ранейшаму захоўвалі камуністычную таталітарную сістэму.

Улады БССР падтрымалі палітычны курс лібералізацыі грамадства. Пры той сістэме па-іншаму было нельга. Беларускія камуністы заўсёды выконвалі тыя загады, якія ішлі з Масквы, нават калі ім гэта не падабалася. У 1956–1961 гг. Вярхоўным судом БССР было разгледжана звыш за 30 тыс. справаў, па якіх было рэабілітавана каля 40 тыс. нявінна асуджаных жыхароў Беларусі. Яшчэ каля 20 тыс. чалавек былі рэабілітаваныя трыбуналам Беларускай вайсковай акругі. Аднак пасля 1961 г. па негалосным указанні ЦК КПСС рэабілітацыя практычна прыпынілася і аднавілася толькі ў другой палове 1980-х гг., у часы перабудовы.

Ёсць звесткі, што вышэйзгаданы першы сакратар ЦК КПБ К. Т. Мазураў адразу пасля свайго прызначэння на высокую пасаду нават паспрабаваў праводзіць абмежаваную палітыку беларусізацыі, але яму хутка далі зразумець, што гэтага рабіць не трэба. Беларусаў у дзяржаўным апараце было не больш за дзве трэці, і яны займалі пераважна другарадныя пасады.

Павялічылася роля прафесійных саюзаў, у сферу дзейнасці якіх у гэты перыяд былі перададзены сацыяльнае забеспячэнне насельніцтва і санаторна-курортныя ўстановы. Даволі ўплывовай у тагачаснай грамадска-палітычнай сістэме арганізацыяй быў камсамол (Ленінскі камуністычны саюз моладзі, УЛКСМ). Гэта была створаная КПСС моладзевая структура, якая праводзіла значную работу найперш па ідэалагічным, пракамуністычным выхаванні моладзі. Прафсаюзы ў той час з’яўляліся практычна дзяржаўнай структурай і адпавядалі лозунгу «Прафсаюзы – школа камунізму!», камсамол быў моладзевай структурай КПСС. Іншым, непадкантрольным партыі і дзяржаве, грамадскім арганізацыям існаваць было папросту немагчыма. Вельмі выразна гэта выяўлялася, напрыклад, у дзяржаўнай канфесійнай палітыцы. Хоць у Канстытуцыі прысутнічала палажэнне аб свабодзе сумлення, у краіне праводзіла рэпрэсіўная ў адносінах да ўсіх канфесій палітыка. Так, на падставе пастановы ЦК КПБ ад 28 ліпеня 1954 г. «Аб стане і мерах паляпшэння навукова-атэістычнай прапаганды ў рэспубліцы» былі зачынены сотні храмаў усіх канфесій, а таксама духоўныя навучальныя ўстановы.

Такім чынам, нягледзячы на пэўную дэмакратызацыю грамадства ў гады палітычнай адлігі 1953–1964 гг., арганізацыя ўлады ў СССР і БССР не змянілася: ва ўсіх сферах жыцця панавала камуністычная партыя і камуністычная ідэалогія, а саветы так і не сталі паўнавартаснымі органамі ўлады. Пры гэтым працягвалася ўмацаванне таталітарнага аднапартыйнага рэжыму.

***2. Сацыяльна-эканамічнае развіццё ў 1953–1964 гг.*** Выбар новага палітычнага курса патрабаваў зменаў і ў эканамічных арыенцірах. Паколькі палітычна кіраўніцтва не ставіла пад сумненне



*Круглая плошча ў Мінску яшчэ без манумента Перамогі.*

існаванне камандна-адміністрацыйнай сістэмы, то размова ішла толькі пра пэўнае яе рэфармаванне.

У другой палове 1950-х гг. у свеце набірала моц навукова-тэхнічная рэвалюцыя (НТР), якая прадугледжвала хуткае ўкараненне дасягненняў навукі ў вытворчы працэс. У Савецкім Саюзе перавага ў развіцці надавалася машынабудаванню, хімічнай і нафтахімічнай прамысловасці, энергетыцы. У другой палове 1950-х – першай палове 1960-х гг. у БССР была пастаўлена задача апераджальнага развіцця машынабудавання. У выніку, у нашай краіне быў пабудаваны шэраг прамысловых прадпрыемстваў, заснаваных на збольшага перадавых тэхналогіях: першы ў СССР завод вылічальных машын і завод аўтаматычных ліній у Мінску, Беларускі аўтамабільны завод кар’ерных самазвалаў («БелАЗ») у Жодзіне, заводы халадзільнікаў, маторны, электратэхнічны, гадзіннікавы ў Мінску і інш.

Другім важнейшым кірункам развіцця эканомікі Беларусі ў гэты час стала развіццё хімічнай прамысловасці. Былі пабудаваны калійны камбінат у Салігорску, Полацкі нафтаперапрацоўчы камбінат, Светлагорскі завод штучнага валакна, азотна-тукавы завод у Гродне і суперфасфатны завод у Гомелі. У 1964 г. была здабыта



*Першы самазвал, які сышоў з канвеера «БелАЗа», 1958 г.*

першая прамысловая нафта ў раёне Рэчыцы. У 1965 г. выпуск прадукцыі хімічнай і нафтахімічнай прамысловасці ў Беларусі павялічыўся ў параўнанні з 1950 г. у 27 разоў.

У 1957 г. была праведзена рэформа кіравання эканомікай. Вярхоўны Савет СССР прыняў Закон аб ліквідацыі агульнасаюзных прамысловых міністэрстваў (міністэрства электрастанцый, абароннае, авіяцыйнае, судабудаўнічае, радыётэхнічнае, хімічнае заставаліся). Замест міністэрстваў, якія былі створаныя паводле галіновага прынцыпу, уводзіліся *саветы народнай гаспадаркі* (саўнаргасы), у падмурак якіх быў пакладзены тэрытарыяльны прынцып кіравання ўсёй эканомікай – прамысловасцю і сельскай гаспадаркай.

У межах БССР быў створаны адзіны *саўнаргас БССР*. Лічылася, што гэта прывядзе да змяншэння бюракратычнага апарату і будзе садзейнічаць лепшаму выкарыстанню мясцовых рэсурсаў. У выніку рэформы ў пэўнай ступені паскорылася развіццё мясцовай і лёгкай прамысловасці, але ўскладнілася развіццё цяжкай. Саўнаргасы праіснавалі да 1965 г., пасля чаго ўлады зноў вярнуліся да галіновага прынцыпу гаспадарчага кіравання.

З мэтай паляпшэння становішча ў аграрным сектары эканомікі былі павялічаны закупачныя цэны на прадукцыю сельскай гаспадаркі, уводзілася аплата працы калгаснікаў, з 1956 г. пачалі выплачваць пенсіі па старасці і інваліднасці. Упершыню пераразмеркаванне дзяржаўнага бюджэту адбывалася на карысць сельскай гаспадаркі. Да непасрэднага ўдзелу ў сельскагаспадарчай вытворчасці прыцягваліся прамысловыя, навуковыя і навучальныя ўстановы.

У 1954 г. дзеля павелічэння аб’ёмаў вытворчасці збожжа пача-

лося асваенне цалінных зямель у Казахстане. У асваенні цаліны ўдзельнічала каля 180 тыс. беларусаў, прамысловасць БССР павялічыла выпуск сельскагаспадарчых машын для забеспячэння цалінных саўгасаў.

Каб надаць калгасам большую гаспадарчую самастойнасць, у 1958 г. было прынята рашэнне аб рэарганізацыі МТС і продажы іх тэхнікі ва ўласнасць калгасам. Для аблягчэння гэтай працэдуры калгасам спісваліся запазычанасці мінулых гадоў за работу МТС.

***Вынікі эканамічнага развіцця.*** У другой палове 1950-х гг. у БССР адбыўся адчувальны рост вытворчасці цяжкай прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Аднак, нягледзячы на разгортванне навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, рост эканамічных паказчыкаў па-ранейшаму дасягаўся пераважна за кошт ужывання экстэнсіўных метадаў гаспадарання. Акрамя таго, панаванне каманднa-адміністрацыйных метадаў у эканоміцы не прынесла чаканага эфекту ад праведзеных рэформ. Прыярытэт у развіцці індустрыі прывёў да значнага адставання лёгкай прамысловасці Беларусі і пагаршэння забеспячэння насельніцтва прадукцыяй масавага попыту. З 1962 г. адбываецца зніжэнне ўсіх паказчыкаў прамысловай вытворчасці, асноўнай прычынай якога стала вычарпанне экстэнсіўных шляхоў развіцця.

У сельскай гаспадарцы ў 1953–1958 гг. вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі павялічвалася. Гэтаму спрыяла, па-першае, стымуляванне сельскагаспадарчай вытворчасці з боку дзяржавы, павышэнне закупачных цэнаў на прадукцыю калгасаў і саўгасаў; па-другое – спрацавала зніжэнне падатковага ціску на аднаасобныя гаспадаркі, прадукцыя якіх таксама шырока пачала паступаць на рынак.

Але ў канцы 1950-х – пачатку 1960-х гг. становішча ў сельскай гаспадарцы таксама пагоршылася. Гэта тлумачылася некалькімі прычынамі:

• ліквідацыяй МТС і немагчымасцю калгасаў хутка купіць сельскагаспадарчую тэхніку і абслугоўваць яе, што прывяло да росту запазычанасці з боку калгасаў дзяржаве;

• пошукам новых зямель для вырошчвання сельскагаспадарчых культур, што суправаджалася на тэрыторыі БССР меліярацыяй

Палесся, заворваннем лугоў і пашаў. Гэта, у сваю чаргу, прывяло да парушэння экалагічнай раўнавагі і скарачэння пагалоўя жывёлы. У выніку былі вычарпаныя магчымасці нарошчвання жывёлагадоўчай прадукцыі шляхам росту пагалоўя;

• шырокімі пасевамі такіх зернебабовых культур, як кукуруза і гарох, пры адначасовым скарачэнні пасеваў пшаніцы і грэчкі. Адсутнасць неабходнай рэкультывацыі і севазвароту адмоўна адбілася на ўраджайнасці глебы.

Было відавочна, што выкананне запланаваных паказчыкаў VI пяцігодкі знаходзіцца пад пагрозай зрыву. Каб выйсці з складанага становішча, у апараце кіравання ўзнікла рашэнне: замяніць пяцігадовы план 1956–1960 гг. сямігадовым планам, ужо на 1959–1965 гг. Па сутнасці, пралікі ў выкананні пяцігодкі перакрываліся новым планам на сямігодку.

У кастрычніку 1961 г. на XXII з’ездзе КПСС была прынятая праграма пабудовы камунізму, якую планавалася ажыццявіць падчас жыцця аднаго пакалення – да пачатку 1980-х гг. Гэтая праграма была складзена без уліку аб’ектыўных законаў развіцця грамадства і эканомікі і, папраўдзе, ўяўляла сабою набор палітычных і ідэалагічных лозунгаў. У рабоце і рашэннях XXII з’езду адбіліся ўсе супярэчнасці часу кіравання М. С. Хрушчова: з аднаго боку, працэсы дэсталінізацыі і рэальныя дасягненні ў эканоміцы, а з другога – утапічныя планы пабудовы камунізму і ўзмацненне культу асобы самога Хрушчова. Усё гэта адбывалася на фоне напружанасці міжнароднага становішча.

У краіне не хапала прадукцыі сельскай гаспадаркі прадукцыі, найперш прадуктаў харчавання. На адсутнасць мяса на рынку паўлывала распачатая пасля 1961 г. барацьба па ліквідацыі ці абмежаванні колькасці жывёлы ў прыватных гаспадарках (сялянам забаранялася мець коней, абмяжоўвалася колькасць кароў і свіней у гаспадарцы, бо яны, як быццам, з’ядалі траву і іншы фураж, які мог дастацца калгасна-саўгаснай жывёле). Барацьба гэтая ішла пад лозунгам пераходу да камунізму, пры якім месца для прыватных гаспадарак не павінна быць.

У выніку фарсіраванай і авантурыстычнай палітыкі па пабудо-




*Сямігодка вялікага тварэння, савецкі плакат, 1959 г.*

ве камунізму людзі яшчэ мацней пачалі адчуваць недахоп тавараў масавага попыту і прадуктаў харчавання. Гэта выклікала натуральнае незадавальненне з боку насельніцтва. У прамысловасці і сельскай гаспадарцы патрэбныя былі эфектыўныя рэформы, якія б падтрымаў народ.

1962–1964 гг. характарызаваліся значным пагаршэннем становішча ўнутры краіны. Павелічэнне бюракратычнага апарату, замаруджванне тэмпаў росту прамысловасці, хлебны крызіс 1963 г., як вынік неразумнага выкарыстоўвання цалінных зямель, рост рознічных цэн на прадукцыю прамысловасці і сельскай гаспадаркі – усё гэта прывяло да пагаршэння дабрабыту насельніцтва, страты М. С. Хрушчовым асабістага аўтарытэту і з’явілася адной з прычын адхілення яго ад улады.

Пры гэтым усё было зусім не адназначна. У 1950–1960 гг. істотна змянілася жыццё людзей у лепшы бок. Гэтаму спрыяла дэсталінізацыя і адносная дэмакратызацыя грамадства. Напачатку адзначаўся значны прамысловы рост і павышэнне дабрабыту люд-

зей, асабліва ў сферы будаўніцтва, матэрыяльнага забеспячэння рабочых і, найбольш, калгаснікаў.

У 1964 г. упершыню дзяржаўнае пенсійнае забеспячэнне было распаўсюджана і на калгаснікаў. Беларусь стала развітой прымысловай краінай. Усё больш насельніцтва станавілася жыхарамі гарадоў. Раслі і пашыраліся не толькі даўно вядомыя гарадскія паселішчы – узнікалі новыя прамысловыя гарады (Салігорск, Светлагорск, Наваполацк). У Беларусі ішлі працэсы ўрбанізацыі.

Недахопы найбольш пачалі праяўляцца з прычыны непрадуманасці палітыкі «пабудовы камунізму», змагання паміж сабой кансерватыўнай і адносна дэмакратычнай груповак у кіраўніцтве КПСС. У выніку, у кастрычніку 1964 г. М. С. Хрушчоў быў адхілены ад сваёй пасады. Да ўлады прыйшлі прадстаўнікі кансерватыўнай часткі КПСС.

**3. *Лібералізацыя ў сферы культуры.*** Працэсы лібералізацыі грамадства знайшлі сваё адлюстраванне ў культуры. Аслабленне адміністрацыйнага дыктату, крытыка культу асобы, рэабілітацыя ахвяр рэпрэсій прывялі да шырокай дыскусіі аб ролі і месцы інтэлігенцыі ў грамадстве, аб праве на асабісты падыход пры асвятленні падзей рэчаіснасці.

Важная роля ў гэтым належала літаратуры. Галоўнай для пісьменнікаў Беларусі па-ранейшаму заставалася тэма вайны. Існаванне прынцыпу партыйнасці ставіла літаратараў у пэўныя рамкі, але менавіта ў гэты час з'явіліся першыя творы, у якіх быў не толькі быў паказаны гераізм савецкіх людзей у гады вайны, але і псіхалогія чалавека на вайне, яго ўнутраны свет і перажыванні.

Першымі з беларускіх пісьменнікаў па-новаму пачалі пісаць пра вайну *Васіль Быкаў*, *Алесь Адамовіч*, *Янка Брыль*. Яшчэ адным папулярным жанрам літаратуры пастпова рабіўся гістарычны. Тут па-сапраўднаму пачаў раскрывацца талент *Уладзіміра Караткевіча*.

Аслабленне таталітарызму станоўча паўплывала і на развіццё іншых напрамкаў беларускай культуры – тэатральнага мастацтва, музыкі, выяўленчага мастацтва, спрыяла развіццю адукацыі. У 1958 г. была ўведзена абавязковая 8-гадовая адукацыя, ствараліся прафесійна-тэхнічныя вучылішчы, да 99 % павялічылася колькасць пісьмен-

нага насельніцтва. Разам з тым, уніфікацыя адукацыйнай сістэмы ў межах усяго Савецкага Саюза вяла да абмежавання нацыянальных асаблівасцяў і скарачэння сфераў ужывання беларускай мовы.

З другой паловы 1950-х гг. пачаўся новы віток *русіфікацыі*. На святкаванні 40-годдзя БССР у 1959 г. у Мінску першы сакратар ЦК КПСС М. С. Хрушчоў заявіў: «Чым мы ўсе хутчэй будзем размаўляць на рускай мове, тым хутчэй пабудуем камунізм».

Прыдумка камуністычных ідэолагаў аб зліцці нацый, прычым толькі ў СССР, неўзабаве была замацаваная ў праграме КПСС, прынятай на XXII з'ездзе КПСС у 1961 г. Там было заяўлена, што развіццё «нацыянальных адносін у СССР характарызуецца далейшым збліжэннем нацый і дасягненнем іх поўнага адзінства». А праз дзесяць гадоў, на XXIV з'ездзе КПСС (1971 г.), ужо сцвярджалася, што ў СССР узнікла новая гістарычная супольнасць людзей – *савецкі народ*. Для тэарэтычнай распрацоўкі паняцця «савецкі народ» былі падключаны многія навуковыя ўстановы, вучоныя. Усё




*«Адзіным шэрагам – да камунізму!» Савецкі плакат 1960-х.*

рабілася для таго, каб паказаць, быццам у Савецкім Саюзе нацый ужо няма, што ўсе, хто пражываў у СССР пад кіраўніцтвам КПСС, ператварыліся ў нейкіх «савецкіх людзей», якія не памятаюць свайго паходжання і жадаюць размаўляць толькі на рускай мове.

Рэалізуючы партыйныя пастановы, у Беларускай ССР пачалі масавы перавод народнай адукацыі на рускую мову. У навуковых працах таго часу атрымаў шырокае распаўсюджванне тэзіс аб пераадольванні беларускіх нацыянальных адметнасцяў і развіцці інтэрнацыянальных, агульных рысаў і характарыстык.

У 1962 г. дзеля эканоміі сродкаў шэраг дзвюхмоўных газет і часопісаў цалкам былі пераведзены на рускую мову. Большасць праграм на радыё і тэлебачанні таксамі транслявалася па-руску.

Такія падыходы да нацыянальнага пытання не маглі не выклікаць незадавальнення сярод нацыянальнай інтэлігенцыі, студэнцтва, прадстаўнікоў іншых сацыяльных груп беларускага грамадства. 14 снежня 1957 г. у газеце «Літаратура і мастацтва» быў надрукаваны артыкул студэнта БДУ *Барыса Сачанкі* «Шанаваць родную мову», скіраваны супраць русіфікацыі. Будучы вядомы пісьменнік Беларусі прапаноўваў ва ўсіх школах перавесці выкладанне з рускай на беларускую мову. У 1957–1958 гг. рэпрэсіі зведалі рэдакцыя газэты і ўсе, хто падтрымаў артыкул Б. Сачанкі сваімі пісьмамі ці меў да яго дачыненне. Супрацоўнікаў рэдакцыі звольнілі, а ўсіх, хто ім спачуваў, узялі на ўлік у КДБ.

У 1968 г. адбыліся стыхійныя акцыі пратэсту студэнтаў беларускага аддзялення філалагічнага факультэта БДУ супраць рашэння рэктарата аб пераводзе выкладання грамадскіх дысцыплін (гісторыі КПСС, марксісцка-ленінскай філасофіі, палітэканоміі і навуковага камунізму) на рускую мову. У 1974 г. група вучоных Акадэміі навук БССР, выступіла супраць русіфікацыі беларускага насельніцтва, фальсіфікацыі гісторыі Беларусі, за адраджэнне яе культуры.

**4.** ***Знешняя палітыка. Міжнароднае становішча Беларусі.*** Пасля стварэння двух ваенна-палітычных блокаў *НАТО* (1949 г.) і *арганізацыі Варшаўскага дагавору* (1955 г.) супрацьстаянне паміж СССР і ЗША і іх саюзнікамі абвастрылася. Супрацьстаянне

асабліва ўзмацнілася ў гады кіравання М. С. Хрушчова. Адбыліся два ваенна-палітычныя крызісы: жнівень 1961 г. – *Берлінскі крызіс*, кастрычнік 1962 г. – *Карыбскі крызіс*, падчас якіх свет апынуўся перад пагрозай ядзернай вайны. Усведамленне ўрадамі Злучаных Штатаў Амерыкі і Савецкага Саюза ўсіх магчымых наступстваў вайны з прымяненнем ядзернай зброі ўсё ж прывяло ў выніку да мірнага ўрэгулявання праблем.

Разам з тым, менавіта ў гэты час некалькі ўмацаваўся міжнародны аўтарытэт Беларусі. З сярэдзіны 1950-х гг. пашырыліся міжнародныя кантакты Беларусі. Калі адразу пасля вайны асноўныя гандлёвыя і культурныя кантакты БССР былі з Польшчай, то ў 1950-я яны пашырыліся на ГДР, ЧССР, НРБ, некаторыя заходнееўрапейскія дзяржавы. У 1953 г. у БССР было створана ўпраўленне па замежным турызме.

У 1954 г. Беларусь стала пастаянным членам ЮНЕСКА (спецыялізаванай арганізацыі ААН па пытаннях адукацыі, навукі і культуры) і Міжнароднай арганізацыі працы (МАП), у 1957 г. – МАГАТЭ (Міжнароднае агенцтва па атамнай энергіі). Беларуская дэлегацыя штогод удзельнічала ў працы Генеральных Асамблей ААН.




*Амерыканская карыкатура на Карыбскі крызіс. 1962 г.*

У сакавіку 1958 г. было адчынена пастаяннае прадстаўніцтва Беларусі пры ААН, а ў 1961 г. – пры ЮНЕСКА. Гэта садзейнічала пашырэнню ўдзелу Беларусі ў вырашэнні міжнародных праблем і дало магчымасць прапагандаваць на ўзроўні ААН палітыку, культуру і дасягненні Беларусі.

Міжнародная палітыка БССР ішла ў рэчышчы агульнасаюзнай знешнепалітычнай дзейнасці. На міжнароднай арэне Беларусь падтрымлівала ўсе ініцыятывы і пагадненні СССР. Так, калі ў 1963 г. у Маскве быў падпісаны Дагавор аб забароне выпрабаванняў ядзернай зброі ў трох сферах: атмасферы, космасе, пад вадой, то Беларусь адна з першых падпісала і ратыфікавала яго.

Увогуле пазіцыя Беларусі ў адносінах да ядзернай зброі заўсёды была прынцыповай. Так, БССР прымала ўдзел у распрацоўцы і прыняцці ў 1968 г. на сесіі ААН Дагавора аб нераспаўсюджанні ядзернай зброі,паводле якога ўсе няядзерныя дзяржавы давалі абавязацельства не вырабляць, не размяшчаць і не выкарыстоўваць ядзернай зброі. У 1990 г. Беларусь абвясціла свой статус як бяз'ядзернай дзяржавы і адмовілася ад ядзернай зброі, якая знаходзілася на яе тэрыторыі. Статус Беларусі як бяз'ядзернай дзяржавы замацаваны ў яе Канстытуцыі.

З 1957 г. некаторыя гаспадарчыя і культурныя пытанні перадаваліся з саюзнага ведамства на разгляд саветам міністраў саюзных рэспублік.

Крыху змянілася тэрыторыя Беларусі: у 1961 і 1964 гг. да БССР былі зноў далучаныя невялікія тэрыторыі Смаленскай вобласці РСФСР, чаго патрабавала беларускае насельніцтва Смаленшчыны.

Беларусь у пасляваенныя гады замацавалася на міжнароднай арэне, стала больш вядомай і пазнавальнай краінай. Аднак трэба прызнаць, што міжнародная дзейнасць БССР была моцна абмежавана маскоўскім цэнтрам, знешнепалітычная дзейнасць насіла ў большасці несамастойны характар.

Такім чынам, нягледзячы на спробы лібералізацыі грамадска-палітычнага жыцця ў СССР у 1956–1964 гг., у краіне працягвала існаваць каманднa-адміністрацыйная сістэма. Палітычны рэжым у Савецкім Саюзе паслясталінскага перыяду вызначаец-

ца спецыялістамі як *таталітарны*, заснаваны на бясспрэчным падпарадкаванні ўладзе. Вызначальнай асновай у грамадскім развіцці станавілася ўласная пазіцыя (воля) кіроўнай асобы, што атрымала назву *валюнтарызму*.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Адліга (хрушчоўская адліга)*** – неафіцыйнае абазначэнне перыяду ў гісторыі СССР пасля смерці І. В. Сталіна (сярэдзіна 1950-х – пачатак 1960-х гг.). Характарызаваўся паслабленнем таталітарнай улады, з'яўленнем некаторай свабоды слова, адноснай дэмакратызацыяй грамадскага-палітычнага і жыцця, большай свабодай творчай дзейнасці. Назва звязаная са знаходжаннем на пасадзе Першага сакратара ЦК КПСС М. С. Хрушчова.

***Арганізацыя Варшаўскага дагавора (Варшаўскі дагавор)*** – Дагавор аб дружбе, супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе ад 14 мая 1955 г. – дакумент, які аформіў стварэнне ваеннага саюза еўрапейскіх сацыялістычных дзяржаў пры вядучай ролі Савецкага Саюза – Арганізацыі Варшаўскага дагавора (АВД). Заключэнне АВД аб'яўлялася як мера ў адказ на стварэнне НАТА. Страціў юрыдычную сілу з 1 ліпеня 1991 г.

***Атэізм*** – адмаўленне існавання Бога, нявер'е, бязбожжа. У Савецкім Саюзе так называлася палітыка барацьбы супраць канфесій.

***Валюнтарызм*** – (*ад лац. voluntas – воля*) – палітычны напрамак, пры якім воля кіроўнай асобы лічыцца вызначальнай асновай грамадскага развіцця.

***Дэсталінізацыя*** – палітыка ў СССР, накіраваная на пераадоленне наступстваў культу асобы І. В. Сталіна. Звязаная найперш з дэмакратызацыяй грамадска-палітычнага жыцця і рэабілітацыяй нявінна пацярпелых ад палітычных рэпрэсій.

***Культ асобы*** – узвялічванне ролі аднаго чалавека ў жыцці дзяржавы, прыпісванне яму вызначальнага ўплыву на ход гістарычных падзей.

***Лібералізацыя*** (*ад лац. liberalis – вольны*) – паслабленне дзяржаўнага кантролю над рознымі відамі дзейнасці як і ў галіне эканомікі, так і ў сферы грамадскага жыцця.

***Навукова-тэхнічная рэвалюцыя*** **(НТР)** – укараненне навейшых дасягненняў навукі і тэхнікі ў вытворчасць, якаснае пераўтварэнне прадукцыйных сіл на аснове навуковых дасягненняў.

***НАТА, Арганізацыя Паўночнаатлантычнага дагавора, (англ. North Atlantic Treaty Organization, NATO)*** – Заснавана 4 красавіка 1949 г. для абароны Еўропы ад савецкага ўплыву. Цяпер у НАТА ўваходзяць 28 краін. Галоўная мэта – забяспечыць стрымліванне любой формы агрэсіі ў дачыненні да тэрыторыі любой дзяржавы-члена НАТА ці абарону ад такой агрэсіі.

***Рэабілітацыя*** – аднаўленне ў правах асуджанай асобы з прычыны адсутнасці ў яе дзеяннях складу злачынства.

***Рэпрэсіі*** – меры пакарання, незаконныя судовыя і пазасудовыя пераследаванні, што ўжываліся камуністычнымі ўладамі супраць уласных грамадзян.

***Рэформа*** – пераўтварэнне, змена, перабудова асобных кірункаў у эканоміцы ці грамадскім жыцці пры захаванні асноў існуючага дзяржаўнага ладу.

***Саветы народнай гаспадаркі (саўнаргасы)*** – дзяржаўныя органы тэрытарыяльнага кіравання народнай гаспадаркай СССР, якія існавалі ў 1957–1965 гг.

«***Халодная вайна***» – тэрмін, якім абазначаецца перыяд ваенна-палітычнай канфрантацыі дзяржаў супрацьлеглых сістэм, калі адкрытых ваенных сутыкненняў не адбываецца, але вядзецца гонка ўзбраенняў, ужываюцца спробы эканамічнага націску, арганізуюцца ваенна-палітычныя блокі і саюзы; ваенна-палітычная канфрантацыя груп дзяржаў пасля Другой сусветнай вайны, у першую чаргу СССР і ЗША.

***Цаліна*** – неапрацаваныя, дагэтуль не ўключаныя ў гаспадарчае абарачэнне землі сельскагаспадарчага прызначэння.

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***5 сакавіка 1953 г.*** – смерць І. В. Сталіна.

***Верасень 1953 г.*** – М. С. Хрушчоў абраны Першым сакратаром КПСС.

***1953–1964 гг.*** – першыя спробы дэсталінізацыі грамадства, палітыка

лібералізацыі грамадска-палітычнага жыцця ў СССР, якая атрымала назву *«адліга»*.

***Сакавік 1954 г.*** – пачатак удзелу Беларускай ССР у асваенні цаліны.

***Люты 1956 г.*** – XX з'езд КПСС і пачатак дэсталінізацыі грамадства.

***12 мая 1954 г.*** – уступленне Беларускай ССР у арганізацыю ААН па пытаннях адукацыі, навукі і культуры (ЮНЕСКА).

***4 ліпеня 1954 г.*** – адкрыццё ў г. Мінску манумента Перамогі – помніка воінам Чырвонай Арміі і партызанам, якія загінулі ў баях за вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (архітэктары Г. Заборскі і У. Кароль, скульптары З. Азгур, А. Бембель, А. Глебаў, С. Селіханаў).

***1955 г.*** – стварэнне Арганізацыі Варшаўскага дагавора.

***1955 г.*** – зацвярджэнне Дзяржаўнага гімна БССР (музыка Нестара Сакалоўскага, словы Міхася Клімковіча).

***14–25 лютага 1956 г.*** – XX з'езд КПСС – асуджэнне культу асобы Сталіна, ліквідацыя ГУЛАГу, пачатак рэабілітацыі ахвяр сталінскіх рэпрэсій.

***1956 – 1964 гг.*** – знаходжанне на пасадзе першага сакратара ЦК КПСС М. С. Хрушчова.

***1956–1965 гг.*** – знаходжанне на пасадзе першага сакратара ЦК КПБ К. Т. Мазурава – першага беларуса, прызначанага кіраўніком КПБ.

***1956 г.*** – упершыню пачалі прызначацца калгаснікам пенсіі па старасці і інваліднасці.

***1957 г.*** – рэформа кіравання эканомікай – ліквідацыя міністэрстваў і стварэнне саўнаргасаў (саветаў народнай гаспадаркі), створаных паводле галіновага прынцыпу).

***Май 1957 г.*** – пастанова Савета Міністраў БССР аб удакладненнях і частковых зменах беларускага правапісу.

***5 лістапада 1958 г.*** – выпуск першага аўтамабіля «БелАЗ» (г. Жодзіна).

***Кастрычнік 1961 г.*** – на XXII з'ездзе КПСС была прынятая праграма пабудовы камунізму ў СССР да пачатку 1980-х гг.

***1964 г.*** – закон «Аб пенсіях і дапамозе членам калгасаў».

# ЛІТАРАТУРА

1. *Аксютин Ю. В., Волобуев О. В.* XX съезд КПСС: новации и догмы. Москва: Политиздат, 1991.
2. Боль сквозь годы: свидетельства жертв политических репрессий в 1930–1950 годах. / Сост.Станишевский В. Мн.: Конфидо, 2004.
3. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. у 2 кн. Кн. 2. / М. У. Смяховіч [і інш.]. Мн.: Беларуская навука, 2012.
4. *Гиоргиадзе З. И., Геращенко Л. Ф.* Белоруссия за десять пятилеток. – Мн.: Наука и техника, 1982.
5. *Сасим А. М.* Советская экономическая система (1953 – 1964): попытки реформирования. Мн.: БГЭУ, 2001.
6. *Лыч Л. М.* Міжнацыянальныя дачыненні на Беларусі (верасень 1943 – кастрычнік 1964 г.). Мн.: Галіяфы,2009.
7. *Мядзведзеў Р.* М. С. Хрушчоў. Палітычны партрэт. Мн.: Беларусь, 1989.
8. *Разуваева Н. Н.* Супярэчнасці і цяжкасці сацыяльна-эканамічнага развіцця СССР у 1961 –1985 гг. // Старонкі гісторыі савецкага грамадства: Факты, праблемы, людзі. Мн.: Народная асвета, 1990.
9. *Шыбека З.* Нарыс гісторыі Беларусі (1795 – 2002). Мн.: Энцыклапедыкс, 2003.

# РАЗДЗЕЛ 3.
# ЭКАНАМІЧНАЕ, ПАЛІТЫЧНАЕ І КУЛЬТУРНАЕ РАЗВІЦЦЁ БССР У 1965–1985 гг.

1. *Змена палітычнага курса. Пераход ад лібералізму да кансерватызму.*
2. *Эканамічная рэформа А. М. Касыгіна 1965 г.: сутнасць, асаблівасці правядзення ў БССР.*
3. *Наспяванне крызісу. Палітычны і эканамічны «застой».*
4. *Сельская гаспадарка ў 1965–1985 гг.*
5. *Культурна-нацыянальнае жыццё. Адукацыя.*

**1.** ***Змена палітычнага курса. Пераход ад лібералізму да кансерватызму.*** У 1964 г. М. С. Хрушчоў быў вызвалены ад усіх партыйных і дзяржаўных пасад. Рэформы, правядзенне якіх ён ініцыяваў, радыкальна незмянілі сітуацыю ў СССР і БССР. Пры ўсіх размовах, што тады вяліся пра дэмакратыю, у краіне пераважалі ранейшыя метады кіравання – адміністраванне, выкананне партыйных рашэнняў, недапушчэнне прыватнай уласнасці, шматпартыйнасці, рэальных правоў і свабод людзей. У эканоміцы панавала дзяржаўная і саўгасная форма гаспадарання.

Генеральным сакратаром ЦК КПСС стаў *Л. І. Брэжнеў* (1964–1982 гг.), Старшынёй Савета Міністраў СССР – *А. М. Касыгін*. Перыяд кіравання Л. І. Брэжнева атрымаў назву *«эпохі застою»* і характарызаваўся пераходам ад адноснай лібералізацыі грамадства, якая пачалася пры М. С. Хрушчове, да кансервацыі сфарміраванай у папярэднія дзесяцігоддзі эканамічнай і грамадска-палітычнай мадэляў, да яшчэ большага ўмацавання адміністрацыйна-камандных метадаў кіравання. З прыходам да ўлады Брэжнева спынілася палітычная рэабілітацыя, адбылося амаль поўнае зліццё дзяржаўнага апарату з партыйным. У грамадска-палітычным жыцці пачала праводзіцца палітыка яшчэ большага ўзмацненне ролі камуні-



*Л. І. Брэжнеў*

стычнай партыі ў жыцці дзяржавы і грамадства; з'явілася так званая *наменклатура* – партыйная эліта, у руках якой засяродзілася ўся паўната ўлады ў краіне.

Пануючая роля КПСС была зафіксавана ў Канстытуцыі СССР 1977 г. У артыкулах 6 Канстытуцыі СССР 1977 г. і Канстытуцыі БССР 1978 г. указвалася, што «Кіруючай і накіроўваючай сілай савецкага грамадства, ядром яго палітычнай сістэмы, дзяржаўных і грамадскіх арганізацый з'яўляецца Камуністычная партыя Савецкага Саюза». У Канстытуцыі Беларускай ССР 1978 г. (чацвёртая Канстытуцыя БССР), як і ў саюзнай Канстытуцыі, было заяўлена, што ў БССР пабудавана сацыялістычнае грамадства (замест абяцанай КПСС пабудовы ў 1980 г. камунізму). Канстытуцыя СССР 1977 г. вызначыла аднапартыйную палітычную сістэму савецкага грамадства: дзяржава, КПСС, грамадскія арганізацыі і працоўныя калектывы. Суверэнітэт БССР быў другасным у адносінах да суверэнітэту СССР. Вярхоўным органам дзяржаўнай улады ў Беларусі,паводле Канстытуцыі 1978 г., з'яўляўся Вярхоўны Савет БССР, вышэйшым выканаўчым і распарадчым органам – Савет Міністраў БССР.

**2. *Эканамічная рэформа А. М. Касыгіна 1965 г.: сутнасць, асаблівасці правядзення ў БССР.*** Разам з тым, у кіраўніцтве СССР яшчэ заставаліся людзі, якія разумелі неабходнасць перабудовы гаспадарчага жыцця ў адпаведнасці з законамі эканамічнай навукі і патрабаваннямі часу. Групу такіх эканамістаў узначаліў старшыня Савета Міністраў СССР А. М. Касыгін. Рэформа, якая пачалася ў 1965 г., атрымала назву «*рэформа Касыгіна*».

Асноўнай *прычынай* правядзення рэформы з'ўлялася адста-

ванне тэхнічнага ўзроўню эканомікі ад дасягненняў навукі і тэхнікі. *Сутнасць рэформы* заключалася ў наступным:

• ліквідацыя саўнаргасаў і замена іх міністэрствамі; вяртанне ў асноўным да галіновага прынцыпу кіравання прамысловасцю;

• скарачэнне планавых паказчыкаў, якія даводзіліся да прадпрыемстваў;

• стварэнне на прадпрыемствах фондаў матэрыяльнага стымулявання;

• фінансаванне прамысловага будаўніцтва не за кошт датацый, а праз крэдытаванне;

• павышэнне закупачных цэн на прадукцыю сельскай гаспадаркі;

• забеспячэнне аграрнага сектара эканомікі сельскагаспадарчай тэхнікай;

• увядзенне гаспадарчага разліку.

Пасля ліквідацыі саўнаргаса ў Беларусі быў створаны шэраг саюзна-рэспубліканскіх і рэспубліканскіх міністэрстваў. Агульнасаюзным міністэрствам было перададзена кіраванне найбольш важнымі галінамі прамысловасці Беларусі – хімічнай, нафтахімічнай, радыёэлектроннай, машынабудаваннем і некаторымі іншымі. На рэспубліканскія міністэрствы было ўскладзена кіраванне мясцовай прамысловасцю, якая аб’ядноўвала розныя галіны вытворчасці.

Пры ажыццяўленні рэформы ў БССР па-ранейшаму перавага аддавалася цяжкай прамысловасці, якая ўсё больш пачынала працаваць на абслугоўванне *ваенна-прамысловага комплексу* (ВПК). Рэформа не ўлічвала мясцовых асаблівасцяў. Дзеля павелічэння плошчы ворыўных зямель у рэспубліцы актывізавалася меліярацыя, што абвастрыла экалагічныя праблемы беларускага Палесся.

Адным з важных напрамкаў рэформы стала паляпшэнне сістэмы аплаты працы, арыентаванай на матэрыяльнае стымуляванне работнікаў за кошт выкарыстання часткі даходаў прадпрыемства, а таксама ў адпаведнасці з агульнымі вынікамі працы: прадпрыемствам дазвалялася за кошт прыбытку ствараць фонды эканамічнага стымулявання працоўных.

Першым у Беларусі на новую сістэму планавання і эканамічнага стымулявання перайшоў з 1 студзеня 1966 г. Гомельскі шклозавод,

а да канца года – яшчэ восем прадпрыемстваў. Да 1970 г. у асноўным завяршыўся пераход прамысловасці БССР на новую сістэму планавання і эканамічнага стымулявання.

Разам з тым, даволі вялікая колькасць беларускіх прадпрыемстваў пераводзілася ў падпарадкаванне саюзна-рэспубліканскіх прадпрыемстваў і ведамстваў. У 1970 г. у такім падпарадкаванні знаходзілася больш як палова (56,4 %) беларускіх прадпрыемстваў. Быў рэзка зніжаны патэнцыял прадпрыемстваў, якія засталіся ў падпарадкаванні беларускіх міністэрстваў.

Паступова ўсё большую частку прыбыткаў прадпрыемстваў пачалі забіраць у бюджэт, што падрывала саму ідэю гаспадарчага разліку. На загад зверху сталі ўстанаўлівацца памеры фондаў заработнай платы, якія нельга было перавышаць. Такім чынам, узмоцненым адміністраваннем дыскрэдытаваліся многія палажэнні рэформы. Як мы бачым, рэформа прадугледжвала ўвядзенне толькі некаторых элементаў рынкавай эканомікі, не закранаючы асноў каманднa-адміністрацыйнай сістэмы кіравання. Таму рэформа не прынесла істотных вынікаў і да пачатку 1970-х гг. паступова згортвалася: на практыцы немагчыма было сумясціць несумяшчальнае – адначасова пашырыць правы прадпрыемстваў і ўзмацніць цэнтралізаванае кіраванне імі.



*Вытворчасць «Палімір-Нафтан» у г. Наваполацку*

У 1970-я – пачатку 1980-х гг. прамысловасць БССР развівалася пераважна *экстэнсіўным шляхам*. За гэты перыяд у рэспубліцы пачалі працаваць 186 новых прадпрыемстваў, на шмат якіх заводах адбывалася мадэрнізацыя асноўных фондаў. Тэмпы развіцця прамысловай вытворчасці ў БССР былі дастаткова высокімі. Развіваліся машынабудаванне, металаапрацоўка, хімічная пра-

мысловасць, павялічвалася вага тэкстыльнай вытворчасці. Аднак хуткі рост індустрыі, у першую чаргу хімічнай прамысловасці, вёў да значнага пагаршэння экалагічнай сітуацыі ў краіне.

Некаторыя станоўчыя зрухі ў эканоміцы СССР, якія адбыліся адразу пасля адстаўкі М. С. Хрушчова, тлумачыліся, між іншым, высокімі коштамі на нафту, якія трымаліся на міжнародным рынку ў другой палове 1960-х – 1970-х гг. У Беларусі былі адкрыты ўласныя радовішчы нафты ў Рэчыцкім басейне. Продаж «чорнага золата» за мяжу дазваляў савецкаму кіраўніцтву пераразмяркоўваць нафтадолары ў розныя галіны эканомікі. Беларусы прымалі актыўны ўдзел у «будоўлі стагоддзя» – *Байкала-Амурскай магістралі* (БАМ).

Становішча ў сельскай гаспадарцы ў адзначаны час вызначала стварэнне *аграпрамысловага комплексу* (АПК), задачай якога было аб’яднанне ў адзіную структуру галін народнай гаспадаркі, якія забяспечвалі вытворчасць прадуктаў харчавання і прамысловых вырабаў з сельскагаспадарчай сыравіны, а таксама рэалізацыю іх спажыўцам. Умацоўвалася матэрыяльна-тэхнічная база калгасаў. Да пачатку 1980-х гг. сельская гаспадарка Беларусі набыла дастаткова выразны кірунак спецыялізацыі па мясамалочнай жывёлагадоўлі.

Аднак вельмі часта сродкі, якія выдаткоўвала дзяржава на развіццё сельскай гаспадаркі, ва ўмовах каманднай эканомікі размяркоўваліся ў стратныя калгасы, дзе і знікалі, не прыносячы прыбытку. Негатыўнымі момантамі ў арганізацыі працы ў калгасах па-ранейшаму заставаліся адчужэнне калгаснікаў ад зямлі




*Плакат мастака Заборава, 1970.*

і вынікаў сваёй працы і адсутнасць матэрыяльнага заахвочвання. Гэта прыводзіла да павелічэння сабекошту сельскагаспадарчай прадукцыі і абвастрэння крызісных з'яваў у сельскай гаспадарцы. Паменшылася вытворчасць прадуктаў харчавання, што выклікала іх востры недахоп і вымусіла ўрад СССР прыняць у 1982 г. «Харчовую праграму». Але і гэтая праграма не выратавала сітуацыі. Для забеспячэння насельніцтва СССР павялічыў імпарт прадуктаў харчавання і прамысловых тавараў першай неабходнасці.

**3.** ***Наспяванне крызісу. Палітычны і эканамічны «застой».*** Грамадска-палітычнае жыццё ***ў*** краіне праходзіла, як і раней, пад дыктатам КПСС. Усё працоўнае насельніцтва было аб'яднана ў прафесійныя саюзы (*школы камунізму*), павялічылася колькасць членаў партыі. Асаблівая ўвага надавалася працы з моладдзю, якая са школьнага ўзросту праходзіла ідэалагічную апрацоўку. Дзеці паступова станавіліся *акцябратамі, піянерамі і камсамольцамі.*

Ужо ў канцы 1960-х г. стала відавочна, што праграма пабудовы камунізму, прынятая на XXII з'ездзе КПСС, не можа быць выканана. Л. Брэжнеў у 1967 г. абвясціў аб пабудове ў СССР *развітога сацыялізму* (нібыта неабходнага этапу на шляху да пабудовы камунізму). У гэты перыяд у краіне набіралі моц працэсы, супрацьлеглыя адноснай лібералізацыі часоў «адлігі». У літаратуры і мастацтве ўсё больш дамінаваў *прынцып партыйнасці.* Насельніцтву ўнушалася вера ў бязгрэшнасць і беспамылковасць партыі, яе лідара і ўвогуле кіраўніцтва краіны. Тыя хто не пагаджаўся з гэтым і людзі, якія хоць нечым не дагадзілі рэжыму, абвяшчаліся «адшчапенцамі». За мяжой іх пачалі называць *дысідэнтамі.*

У 1971 г. на XXIV з'ездзе КПСС Л. І. Брэжнеў заявіў аб узнікненні ў Савецкім Саюзе новай супольнасці людзей – *«савецкага народа».* Пад гэтым тэрмінам разумеліся грамадзяне СССР, людзі, якія прытрымліваліся камуністычнага светапогляду і фактычна адмаўляліся ад сваіх нацыянальных адметнасцяў. Мовай міжнацыянальных адносін, паводле Канстытуцыі СССР, 1977 г. аб'яўлялася руская. Найбольшую актыўнасць у «стварэнні» савецкага народа праявіла кіраўніцтва Беларускай ССР.



*П. М. Машэраў.*

У 1965–1980 гг. пасаду першага сакратара ЦК КПБ займаў *П. М. Машэраў*. Пад яго кіраўніцтвам рэспубліка заняла адно з вядучых месцаў у СССР па развіцці гаспадаркі і ўзроўні дабрабыту насельніцтва. Але негатыўныя з’явы нарасталі і ў дзейнасці партыйна-дзяржаўных структур Беларусі. Так, існаваў татальны кантроль за сродкамі інфармацыі, друкам, культурным жыццём. Аднак людзі знаходзілі шляхі для абмену думкамі і ідэямі: напрыклад, праз выпуск самавыдавецкай літаратуры, распаўсюджванне інфармацыйных лістоў, асабістыя кантакты, сустрэчы. Камітэт дзяржаўнай бяспекі (КДБ) разам з партыйнымі арганізацыямі імкнуўся рабіць усё, каб выкарчаваць з грамадска-палітычнага жыцця «*іншадумства*».

***Прамысловасць Беларусі ў 1970-я – першай палове 1980-х гг.*** Пасля згортвання «рэформы Касыгіна» пошукі спосабаў рэфармавання народнай гаспадаркі спыніліся. Напачатку сітуацыя не была вострай і крытычнай, значная частка экстэнсіўных фактараў развіцця (найперш высокія кошты на нафту, магчымасць пастаянна пашыраць плошчы ворыўных зямель з дапамогай распрацоўкі цаліны ці правядзення меліярацыі і інш.) працягвалі дзейнічаць, і таму да сярэдзіны 1970-х гг. захоўвалася эканамічная стабільнасць і нават назіраўся пэўны рост экономікі. Такая сітуацыя (кансервацыя існуючага эканамічнага і палітычнага становішча, недапушчэнне радыкальных зменаў у экономіцы і палітычным жыцці) задавальняла кіраўніцтва СССР. Якраз неправядзенне зменаў і выклікала «*застой*».

У Беларусі, як ужо адзначалася, эканамічная сітуацыя была ў пачатку 1970-х гг. крыху лепшай, чым у іншых рэспубліках СССР. Але

з другой паловы 1970-х гг. усе асноўныя паказчыкі вытворчасці пачалі зніжацца. Нягледзячы на тое, што апераджальнымі тэмпамі расла вытворчасць прадукцыі тых галін прамысловасці, якія вызначалі навукова-тэхнічны прагрэс (прыродабудаўніцтва, электронная і радыётэхнічная прамысловасць, вытворчасць сродкаў сувязі і інш.), у сярэдзіне 1980-х гг. у Беларусі таксама было заўважана падзенне росту прадукцыйнасці працы і, вельмі хутка, пачаў адчувацца недахоп тавараў штодзённага карыстання, прадуктаў харчавання і інш. Прамысловасць, звязаная з ВПК, выпускала ваенную прадукцыю, на якую ішлі вялікія бюджэтныя сродкі, якіх у краіне і так не хапала. Узнік *дэфіцыт* (недахоп) тавараў першай неабходнасці – у тым ліку мыла і пральнага парашку, некаторых відаў адзення. У продажы амаль адсутнічалі мясныя прадукты, масла, алей і іншыя прадукты харчавання. Усё гэта выклікала недавер насельніцтва да палітыкі, якую праводзілі ўлады.

Беларускаму кіраўніцтву не ўдалося ажыццявіць *інтэнсіўны шлях развіцця* эканомікі ў адной асобна ўзятай рэспубліцы. У прамысловую вытворчасць СССР уцягваліся новыя тэрыторыі, прадпрыемствы, рабочыя рукі, і гаспадарка Беларусі не магла выйсці з гэтага экстэнсіўнага працэсу. Больш за тое, кіраўніцтва СССР часта свядома звязвала прамысловую вытворчасць саюзных рэспублік паміж сабой у тым ліку і для таго, каб паменшыць для іх магчымасці самастойнага развіцця.

У Беларусі на спажывецкі рынак уплывала і тое, што значна ўзмацніліся тэндэнцыі *ўрбанізацыі*, усё больш людзей перасялялася ў гарады, дзе ўзровень жыцця, у параўнанні з вёскай, быў значна вышэйшы. 25 студзеня 1972 г. было абвешчана, што ў сталіцы Беларусі Мінску нарадзіўся мільённы жыхар. Калі ў 1966 г. у БССР жыхары гарадоў складалі 39 % (3,3 млн. чалавек) ад агульнай колькасці насельніцтва, то ў 1985 г. – 62 % (6,2 млн. чалавек). Натуральна, што гэта яшчэ больш паўплывала на дэстабілізацыю спажывецкага рынку.

Усё гэта сведчыла пра тое, што меліся пралікі ў ажыццяўленні эканамічнай палітыкі. Толькі дзяржаўная форма ўласнасці на сродкі вытворчасці ў спалучэнні з празмерным камандна-адміністрацыйным кіраваннем, штучным абмежаваннем памераў

аплаты працы працоўных і прымяненнем размеркавальнай сістэмы спажывання паказалі не толькі сваю недзеяздольнасць, але і непрыманне такой палітыкі грамадствам. Апроч таго, гэта ўсё спалучалася з нежаданнем, а то і бояззю састарэлага кіраўніцтва КПСС да правядзення хоць якіх рэформаў.

Разам з тым, у Беларусі ішло пераабсталяванне некаторых прадпрыемстваў, будаўніцтва новых. Развіваліся энергетычны комплекс, транспарт. У 1964 г. пачалося будаўніцтва Лукомльскай ДРЭС, побач з электрастанцыяй вырас горад Новалукомль. Былі пабудаваныя Жлобінская фабрыка штучнага футра, завод каляровых тэлевізараў у Віцебску, Бабруйскі шынны камбінат, Жлобінскі металургічны і Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод і інш. 30 чэрвеня 1984 г. адбылося адкрыццё першай лініі Мінскага метрапалітэна.

Неабходна падкрэсліць, што перыяд, названы «застоем», характарызаваўся шэрагам супярэчнасцяў у эканамічным, палітычным і культурным жыцці грамадства. Зліццё партыйнага апарату з дзяржаўным павялічыла колькасць бюракратыі і стварыла адарваную ад грамадства партыйную наменклатуру. Ажыццяўлялася партыйнае кіраўніцтва эканомікай, калі пяцігадовыя планы прымаліся на з’ездах КПСС, а выконваць іх павінны былі ўсе. На кожным заводзе існавалі партыйныя групы, якія сачылі за выкананнем лозунга *«Планы партыі – планы народа!»*.

Падкрэслім яшчэ раз, што даволі высокі ўзровень развіцця навукі і значныя бюджэтныя сродкі былі пастаўлены на службу ваенна-прамысловаму комплексу і асваенню космасу. У той жа час, асартымент тавараў народнага спажывання быў вельмі вузкі і пераважна невысокай якасці. У сельскай гаспадарцы, нягледзячы на некаторае паляпшэнне дабрабыту вяскоўцаў, адміністрацыйная сістэма кіравання захавала калектыўную форму гаспадарання і не дапусціла прыватнага землекарыстання. Павялічвалася колькасць стратных калгасаў, абвастрыліся экалагічныя праблемы. Побач з гэтым узмацніліся цэнзура і ідэалагічны ўціск. Гэта было сведчаннем таго, што каманднa-адміністрацыйная сістэма ў СССР вычарпала магчымасці экстэнсіўнага развіцця і паступова вяла краіну ў бок глыбокага эканамічнага і палітычнага крызісу.

Вялікай памылкай савецкага кіраўніцтва было ўвядзенне савецкага вайсковага кантынгенту ў Афганістан (9 снежня 1981 г.). За 10 гадоў вайны савецкія войскі страцілі там 15 тысяч чалавек, з іх ліку каля 800 чалавек паходзілі з Беларусі.

У лістападзе 1982 г. памёр Л. І. Брэжнеў. Спробы генеральных сакратароў ЦК КПСС *Ю. У. Андропава* (знаходзіўся на пасадзе ў 1982–1984 гг.) і *К. У. Чарненкі* (1984–1985 гг.) утрымаць СССР у былых рамках кантролю з боку КДБ і КПСС не далі станоўчых вынікаў. Было відавочна, што касметычнае рэфармаванне камандна-адміністрацыйнай сістэмы не зможа палепшыць найперш эканамічную сітуацыю ў краіне, таму неабходны карэнныя рэформы.

Сутнасць *савецкага таталітарызму* ў другой палове XX ст. характарызавалася тым, што ён хаваўся за вонкавай законнасцю, існаваннем даволі дэмакратычных канстытуцый, асноўныя палажэнні якіх не выконваліся. Пад размовы аб узмацненні ролі партыйных арганізацый у жыцці краіны ішло ўмацаванне пазіцый партапаратнай улады, якая рабіла спробы пераходу да прамога кіраўніцтва эканомікай і іншымі сферамі жыцця грамадства. Адбор на ўсе кіроўныя пасады ажыццяўляўся вузкім колам асоб. У адпаведнасці з Канстытуцыяй існавалі выбары ў органы ўлады – саветы розных узроўняў. Але праводзіліся гэтыя выбары такім чынам, што толькі зацвярджалі тое, што прадвызначалася зверху. Выбары былі безальтэрнатыўнымі: на адно дэпутацкае месца вылучаўся адзін рэкамендаваны ўладамі кандыдат у дэпутаты. Такім чынам, выбаршчыкі не мелі ніякага дачынення да рэальнага выбару дэпутатаў, а толькі механічна апускалі выбарчыя бюлетэні ў скрыню для галасавання. Саветы, прафсаюзы, камсамол толькі на словах абаранялі інтарэсы народа. Для кожнага ўзроўню, ад райкама да ЦК, існаваў свой пералік (наменклатура) кіроўных пасад, якія праходзілі зацвярджэнне на гэтым узроўні. Сюды ўключалася ўсё кіраўніцтва дзяржавай, грамадскімі арганізацыямі, культурай, навукай.

У гэтым і палягала сутнасць і асаблівасць савецкага таталітарызму пасляваеннага часу. Гэты таталітарызм рэалізоўваўся не праз дыктатуру асабістай улады, а праз *адзяржаўленую партыю*, што пашырала сацыяльную базу таталітарызму.

**4.** ***Сельская гаспадарка ў 1965–1985 гг.*** Першыя прыкметы крызісу ў сельскай гаспадарцы СССР былі заўважаны яшчэ ў сярэдзіне 1960-х гг.: на працягу 1960–1964 гг. сярэднегадавыя тэмпы росту валавай прадукцыі сельскай гаспадаркі склалі толькі 4 %. У сакавіку 1965 г. пленум ЦК КПСС прыняў пастанову «Аб неадкладных мерах па далейшым развіцці сельскай гаспадаркі СССР». Была пастаўлена задача ўзняць калгасную і саўгасную вытворчасць.

Прадугледжваліся наступныя меры па ліквідацыі адставання ў развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці:

– змяненне сістэмы нарыхтовак сельскагаспадарчай прадукцыі. Уводзіўся цвёрды і нязменны план нарыхтовак на пяць гадоў наперад для кожнага калгаса, саўгаса, раёна, вобласці, рэспублікі;

– павялічэнне закупачных цэн на прадукцыю сельскай гаспадаркі ў сярэднім у 1,5–2 разы. Прадукцыя, здадзеная звыш плана аплачвалася з 50-працэнтнай надбаўкай ад закупачнай цаны (у выніку павышалася рэнтабельнасць сельскагаспадарчай прадукцыі, стваралася матэрыяльная зацікаўленасць калгаснікаў у яе павялічэнні);

– адмена абмежаванняў па ўтрыманні жывёлы ў асабістых гаспадарках калгаснікаў, рабочых і служачых;

– планавалася на працягу 1965–1969 гг. паставіць для патрэб сельскай гаспадаркі 1 млн. 790 тыс. трактараў, 1 млн. 100 тыс. грузавых аўтамабіляў, іншую тэхніку і абсталяванне; пабудаваць 200 рамонтных заводаў;

– прадугледжвалася праводзіць за дзяржаўны кошт работы па меліярацыі, вапнаванні кіслых глеб, паляпшэнні лугоў і пашаў;

– планавалася больш актыўна ўкараняць у сельскую гаспадарку дасягненні навукі і перадавога вопыту.

Усе гэтыя захады ў выніку станоўча адбіліся на развіцці сельскай гаспадаркі.

***Асаблівасці развіцця сельскай гаспадаркі Беларусі.*** У БССР у аграрным сектары пайшлі курсам *аграпрамысловай інтэграцыі* – аб'яднання сельскай гаспадаркі з абслугоўваючымі яе галінамі: перапрацоўчай прамысловасцю, транспартам, гандлем і г. д. Капіталаўкладанні ў сельскую гаспадарку ў 1966–1970 гг. склалі амаль 2,8 млрд. руб., што было на 13 % больш, чым за папярэднія

10 гадоў. Была пастаўлена задача стварэння *аграпрамысловага комплексу.* Пачалося будаўніцтва буйных адкормачных комплексаў у жывёлагадоўлі, стварэнне малочнатаварных фермаў, свінакомплексаў, птушкафабрык. Вялікім мінусам было тое, што на такіх вялікіх комплексах гаспадаркі немагчыма было забяспечыць жывёлу кармамі ўласнай вытворчасці. Камбікармы, фураж часта завозілі здалёк, нават з-за межаў Беларусі. Акрамя таго, такія комплексы не былі забяспечаны ачышчальнымі збудаваннямі і вельмі забруджвалі навакольнае асяроддзе.

У 1982 г., услед за прыняццем у СССР спецыяльнай Харчовай праграмы, што мелася быць рэалізаваная да 1990 г., аналагічная праграма была прынятая і ў БССР. Прадугледжвалася шляхам інтэнсіфікацыі значна павысіць вытворчасць мяса, збожжа, бульбы, малака, іншай сельскагаспадарчай прадукцыі.

Развіццё НТР адкрыла магчымасці для ўкаранення ў сельскую гаспадарку дасягненняў навукі і тэхнікі. З’явіліся новыя штучныя ўгнаенні і пачалася *хімізацыя сельскай гаспадаркі.* Для ўнясення ўгнаенняў і апрацоўкі палёў хімікатамі пачала выкарыстоўвацца сельскагаспадарчая авіяцыя. Аднак празмерная хімізацыя выклікалі абвастрэнне экалагічных праблем у краіне.

Праводзілася таксама меліярацыя забалочаных зямель, але зводзілася яна да простага асушэння, што прыводзіла да таго, што раней пераўвільготненыя глебы, найперш тарфянікі, аказваліся пераасушанымі і амаль непрыдатнымі для земляробства. Не зусім прадуманая палітыка асушэння тарфянікаў на Палессі прыводзіла нават да тарфяных бураў.

У 1985 г. плошча асушаных зямель склала 2,8 млн. га. Асушаныя землі давалі амаль ⅓ усёй прадукцыі раслінаводства і 40 % кармоў.

Разам з тым, значна палепшылася забеспячэнне сельскай гаспадаркі тэхнікай, фінансавай дапамогай з боку дзяржавы. Каб стымуляваць сельскагаспадарчую вытворчасць, падвышаліся цэны на сельскагаспадарчую прадукцыю. Аднак прадукцыі сельскай гаспадаркі, звычайных прадуктаў харчавання ўсё роўна не хапала. Харчовая праграма аказалася нявыкананай. У сельскай гаспадарцы Беларусі таксама нарасталі крызісныя з’явы.

**5. *Культурна-нацыянальнае жыццё. Адукацыя.*** Пасля адстаўкі М. С. Хрушчова ў СССР і БССР пачаўся *адыход* ад «палітычнай адлігі». Пачынаўся своеасаблівы працэс «контррэфармацыі»: у Беларусі ўзмацніўся жорсткі кантроль ЦК КПБ над грамадскай думкай, былі ўведзены чарговыя абмежаванні правоў інтэлігенцыі на свабоду творчасці.

Як водгук на адыход ад «палітычнай адлігі» і спробу рэстаўрацыі *неасталінізму* ў СССР і БССР пачаў развівацца так званы *«дысідэнцкі рух»*. Хоць дысідэнцтва ў Беларусі не прыняло такіх памераў, як у некаторых іншых рэспубліках СССР (Літве, Украіне, Расіі), усё ж яго ідэі знайшлі сваё адлюстраванне ў грамадска-палітычнай думцы рэспублікі. Беларускія дысідэнты выступалі супраць русіфікацыі нацыянальнай культуры, за пашырэнне сферы карыстання беларускай мовай, за абарону дэмакратычных правоў і свабод. Дысідэнтамі, якія стаялі на ўліку ў КДБ, былі беларускія пісьменнікі Васіль Быкаў, Аляксей Карпюк, Лідзія Вакулоўская і інш. Улады абвінавачвалі інтэлігенцыю ў «размыванні ідэйных каштоўнасцяў сацыялізму», парушэнні прынцыпу партыйнасці ў літаратуры і мастацтве. Рэзка ўзмацнілася ідэалагізацыя культурнага і навуковага жыцця.

Усе дасягненні павінны былі тлумачыцца кіроўнай роляй кампартыі, якую нібыта падтрымлівалі «шырокія народныя масы».

Развівалася сістэма адукацыі. Ствараліся новыя вышэйшыя навучальныя ўстановы. У 1965 г. быў адкрыты Віцебскі тэхналагічны інстытут лёгкай прамысловасці, у 1966 г. – Брэсцкі інжынерна-будаўнічы інстытут, у 1975 г. – Мінскі інстытут культуры. У 1969 г. на базе Гомельскага педагагічнага інстытута быў створаны Гомельскі, а ў 1977 г., на базе Гродзенскага педагагічнага інстытута, – Гродзенскі дзяржаўныя ўніверсітэты.

У другой палове 1970-х гг. у Беларусі была ўведзена ўсеагульная сярэдняя адукацыя, павялічылася колькасць сярэднеспецыяльных і вышэйшых навучальных установаў (ССНУ). Пры гэтым адукацыя, асабліва вышэйшая, была пераведзена ў асноўным на рускую мову, губляла свае нацыянальныя рысы. У сярэдзіне 1980-х гг. толькі 23,1 % школ і 19,3 % дашкольных дзіцячых устаноў працавала на беларускай мове.



*Акадэмік М. А. Барысевіч.*

Вядучым навуковым цэнтрам краіны заставалася Акадэмія навук. Значныя дасягненні беларускіх вучоных былі ў фізіцы (М. А. Барысевіч) і біялогіі (В. Ф. Купрэвіч), матэматыцы (У. П. Платонаў), хіміі, геалогіі, біялогіі, сельскагаспадарчых навуках і інш. Беларускія вучоныя займаліся распрацоўкамі і ў галіне асваення космасу.

Напэўна, найвышэйшым дасягненнем беларускіх грамадазнаўцаў стала стварэнне ўласнай энцыклапедычнай школы. З'явіліся нацыянальныя энцыклапедыі – гонар любой краіны і нацыі: «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя» у 12-ці тамах (1966–1975), «Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва» у 5-ці тамах (1984–1987) і інш.

***Літаратура і мастацтва.*** Літаратары працягвалі развіваць ваенную, партызанскую і гістарычную тэматыку. Падзеяй у культурным жыцці нацыі сталі творы Уладзіміра Караткевіча на тэмы старадаўняй гісторыі Беларусі і сучаснасці («Каласы пад сярпом тваім», «Зброя», «Нельга забыць», «Чорны замак Альшанскі»).

Расквітнеў талент Васіля Быкава, які пісаў пра ваенныя падзеі з пункту гледжання простага чалавека, удзельніка ці сучасніка Другой сусветнай вайны, без аглядкі на партыйныя рэкамендацыі і ўказанні («Жураўліны крык», «Здрада», «Трэцяя ракета», «Альпійская балада», «Сотнікаў», «Воўчая зграя» і інш.).

Тэма вайны прасочвалася ў творчасці *Івана Навуменкі* («Вецер у соснах», «Сасна пры дарозе», «Сорак трэці»), *Івана Чыгрынава*, вышэйзгаданых Алеся Адамовіча, Янкі Брыля і інш.

Дастаткова шырокую папулярнасць мелі творы Івана Шамякіна,

(найперш раманы «Атланты і карыятыды», «Вазьму твой боль») ды іншых аўтараў – празаікаў, паэтаў і драматургаў.

Распрацоўвалася так званая тэма «*Ленініяны*» («Браняпоезд «Ленін» І. Шамякіна, скульптуры З. Азгура).

З'явіліся сатырычныя камедыі («Лявоніха на арбіце», «Зацюканы апостал», «Таблетку пад язык» А. Макаёнка), творы на сучасную і агульначалавечую тэматыку («Брама неўміручасці» К. Крапівы, «Вечар», «Парог» *Аляксея Дударава* і інш.).

Кінастудыя «Беларусьфільм» з прычыны празмернай прыхільнасці да ваеннай тэматыкі ў народзе пачала жартаўліва называцца «Партызанфільм». Тут, аднак, былі створаны выдатныя фільмы і серыялы «Праз могілкі» рэжысёра *Віктара Турава*, «Руіны страляюць…», «Альпійская балада», пастаўленыя, адпаведна, *Валерыем Чацверыковым і Барысам Сцяпанавым*, ды інш..

У мастацтве таксама пераважала ваенная тэматыка. Цыклы тэматычных карцін аб вайне былі створаныя *Міхаілам Савіцкім* («Пакаранне смерцю», «Партызанская мадона», цыкл карцін «Лічбы на сэрцы» пра вязняў фашысцкіх канцлагераў), *Леанідам Шчамялёвым* («Навала. 22 чэрвеня 1941 г.», «Першы дзень міру») і інш.

Да дасягненняў беларускіх архітэктараў адносяць праекты мемарыяльных комплексаў «Хатынь» (скульптар С. Селіханаў, архітэктары *Юрый Градаў*, *Валянцін Занковіч*, *Леанід Левін*), «Брэсцкая крэпасць–герой» (скульптары *Аляксандр Кібальнікаў*, *Андрэй Бембель*, *Уладзімір Бабыль*, архітэктары У. Кароль, В. Занковіч, *Віктар Волчак* і інш.).

Увогуле, культура Беларусі ў перыяд «адлігі» і ў 1970-я – 1980-я гг. зрабіла значны крок наперад. Але трэба прызнаць, што ў таталітарным грамадстве яна знаходзіла пад значным дзяржаўным кантролем і партыйна-ідэалагічным уздзеяннем. Тут многае вырашала не толькі сістэма, але і асабістыя якасці творцы. Адны з задавальненнем служылі рэжыму, усхваляючы яго сілай свайго таленту, іншыя свой талент накіроўвалі на карысць народа, яго нацыянальна-культурнага і дзяржаўнага развіцця. Найбольш праявілася гэта з другой паловы 1980-х гг., калі ў краіне пачалася палітыка *перабудовы і галоснасці.*

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Аграпрамысловы комплекс*** – сукупнасць галін народнай гаспадаркі, якія забяспечваюць вытворчасць прадуктаў харчавання і прамысловых вырабаў з сельскагаспадарчай сыравіны, а таксама рэалізацыю іх спажыўцам.

***Дысідэнты (іншадумцы)*** – людзі, якія адстойваюць свае погляды, што радыкальна разыходзяцца з пануючай ідэалогіяй.

***Інтэнсіўны шлях*** – шлях развіцця прамысловасці, які звязаны з ростам вытворчасці на аснове паляпшэння якасных паказчыкаў, перш за ўсё ўкаранення ў вытворчасць дасягненняў навукі і тэхнікі і павелічэння прадукцыйнасці працы.

***Інтэнсіфікацыя вытворчасці*** – развіццё вытворчасці на аснове выкарыстання больш эфектыўных сродкаў вытворчасці, тэхналагічных працэсаў, перадавых метадаў арганізацыі працы, дасягненняў навукова тэхнічнага прагрэсу.

***Меліярацыя*** (лац. *melioratio* – паляпшэнне) – комплекс гідратэхнічных і гаспадарча-арганізацыйных мерапрыемстваў, накіраваных на карэннае паляпшэнне зямельных рэсурсаў з мэтай іх найбольш эфектыўнага выкарыстання.

***Савецкі народ*** – «новая гістарычная супольнасць людзей», аб узнікненні якой было заяўлена на XXIV з’ездзе КПСС у 1971 г.

***Экстэнсіўны шлях*** – шлях развіцця эканомікі і пашырэння вытворчасці за кошт прыцягнення дадатковых капіталаў і працоўных рук.

***Эпоха застою*** **–** абазначэнне перыяду «*развітога сацыялізму*» які доўжыўся з 1964 па 1986 гг. Характарызаваўся кансерватызмам у грамадскім жыцці і сферы эканомікі.

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***1965 г.*** – гаспадарчая рэформа, ініцыятарам якой быў старшыня Савета Міністраў СССР. А. М. Касыгін; пачатак пераводу прадпрыемстваў на гаспадарчы разлік.

***8 мая 1965 г.*** – прысваенне Брэсцкай крэпасці ганаровага звання «Крэпасць-герой».

***1965–1985 гг.*** – перыяд «застою» ў сацыяльна-эканамічным і палітычным развіцці СССР.

***1965–1980 гг.*** – знаходжанне на пасадзе першага сакратара ЦК КПБ П. М. Машэрава.

***1964–1982 гг.*** – знаходжанне на пасадзе Першага (потым – Генеральнага) сакратара ЦК КПСС Л. І. Брэжнева.

***1967 г.*** – Л. І. Брэжнеў заявіў аб пабудове ў СССР *развітога сацыялізму.*

***5 ліпеня 1969 г.*** – адкрыццё мемарыяльных комплексаў «*Хатынь*» (скульптар С. Селіханаў, архітэктары Ю. Градаў, В. Занковіч, Л. Левін) і «*Курган Славы*» (скульптары А. Бембель, А. Арцімовіч, архітэктары А. Стаховіч, Л. Міцкевіч, інжынер В. Лапцэвіч).

***1960-я – 1980-я гг.*** – маштабныя меліярацыйныя работы на Палессі.

***25 верасня 1971 г.*** – адкрыццё мемарыяльнага комплексу «*Брэсцкая крэпасць-герой*»(скульптары А. Кібальнікаў, А. Бембель, У. Бабыль, архітэктары У. Кароль, В. Волчак, Г. Сысоеў, В. Занковіч, Ю. Казакоў, А. Стаховіч).

***1971 г.*** – XXIV з’езд КПСС. Л. І. Брэжнеў заявіў аб узнікненні ў Савецкім Саюзе новай гістарычнай супольнасці людзей пад назвай «*савецкі народ*».

***1972 г.*** – у г. Мінску ўзведзены помнікі Якубу Коласу (скультар З. Азгур) і Янку Купалу (скульптары А. Анікейчык і Л. Гумілеўскі).

***1972 г.*** – пачатак будаўніцтва Байкала-Амурскай магістралі (БАМ).

***15 чэрвеня 1977 г.*** – пачатак будаўніцтва ў г. Мінску метрапалітэна.

***14 красавіка 1978 г.*** – прыняцце *чацвёртай Канстытуцыі Беларускай ССР.*

***27 снежня 1979 г.*** – увядзенне савецкіх войскаў у Афганістан.

***1982 г.*** – распрацоўка і прыняцце «*Харчовай праграмы*» СССР, пачатак фарміравання аграпрамысловых комплексаў (АПК).

***30 чэрвеня 1984 г.*** – адкрыццё першай лініі Мінскага метрапалітэна.

***Красавік 1985 г.*** – на Пленуме ЦК КПСС быў аб’яўлены курс на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця і дэмакратызацыю палітычнага жыцця, якія атрымаў назву *перабудовы.*

# ЛІТАРАТУРА


1. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 2. / М. У. Смяховіч [і інш.]. Мн.: Беларуская навука, 2012.
2. *Василевич Г. А.* Белорусское государство на рубеже веков. Мн.: Право и экономика, 2007.
3. *Галубовіч В. І.* Перадумовы, сутнасць і гістарычныя ўрокі гаспадарчай рэформы 1965 г. // З гісторыі эканамічных рэформаў на Беларусі. Вып. 2. Мн.: Экаперспектыва, 1999.
4. *Гиоргиадзе З. И., Геращенко Л. Ф.* Белоруссия за десять пятилеток. Мн.: Наука и техника, 1982.
5. Дэмакратычная апазыцыя Беларусі. 1956–1991. Пэрсанажы і кантэкст. – Мн.: Архіў найноўшае гісторыі, 1999.
6. *Несцяровіч М. Б.* Эканоміка Беларусі ў кантэксце развіцця савецкай і сусветнай эканомік (1951 – 1990 гг.) // Весці НАН Беларусі. Серыя гуманітарных навук. 2007. № 4.
7. *Разуваева Н. Н.* Супярэчнасці і цяжкасці сацыяльна-эканамічнага развіцця СССР у 1961–1985 гг. // Старонкі гісторыі савецкага грамадства: Факты, праблемы, людзі. Мн.: Народная асвета, 1990.
8. *Сакович В. С.* Сельское хозяйство Республики Беларусь в 1980–2007 гг.: тенденции развития. Мн.: Белорусская наука, 2008.
9. *Сасим А. М.* Промышленность Беларуси в годы «развитого социализма» (1965 – 1984). Мн.: БГЭУ, 2001.
10. *Шыбека З.* Нарыс гісторыі Беларусі (1795–2002). Мн.: Энцыклапедыкс, 2003.

# РАЗДЗЕЛ 4.
# БЕЛАРУСЬ У 1985–1990 гг.: ПАЧАТАК НАЦЫЯНАЛЬНАГА І ДЗЯРЖАЎНАГА АДРАДЖЭННЯ

1. *Палітычны і эканамічны крызіс другой паловы 1980-х гг. Крах савецкай палітычнай і эканамічнай мадэлі.*
2. *Палітыка перабудовы і Беларусь. Аварыя на Чарнобыльскай АЭС.*
3. *Стварэнне нацыянальнай дэмакратычнай апазіцыі. Вярхоўны Савет БССР XII склікання.*
4. *Абвяшчэнне дзяржаўнага суверэнітэту Беларускай ССР.*

**1.** ***Палітычны і эканамічны крызіс другой паловы 1980-х гг. Крах савецкай палітычнай і эканамічнай мадэлі.*** Савецкі Саюз да сярэдзіны 1980-х гг. змог захаваць тую сацыяльна-палітычную сістэму (з некаторымі зменамі і лакіроўкамі), якая складалася яшчэ ў 1920-я – 1930-я гг. Разам з тым, адбылося яшчэ большае падпарадкаванне саюзных рэспублік маскоўскаму цэнтру. Поўным ходам ішоў працэс русіфікацыі. БССР усё больш ператваралася ў поўную марыянетку Масквы. Суверэнітэт БССР быў другасным у адносінах да суверэнітэту СССР: усе мясцовыя органы ад партыйных да савецкіх павінны былі дубліраваць і выконваць указанні, якія ішлі «зверху». Услед за Масквой прымалася Канстытуцыя, рашэнні ЦК КПБ паўтаралі рашэнні ЦК КПСС. Галоўнай функцыяй шмат у чым бутафорскага Міністэрства замежных спраў БССР, якое ўзнікла толькі таму, што Беларусь стала членам ААН, з'яўлялася прадстаўніцтва на міжнародных форумах і галасаванне ў адпаведнасці з распараджэннямі, што паступалі з Міністэрства замежных спраў СССР.

Натуральна, гэта адбывалася таму, што беларуская савецкая

дзяржаўнасць была абмежаванай і шмат у чым існавала толькі на паперы. Але цалкам ігнараваць значэнне БССР як этапу на шляху пабудовы незалежнай беларускай дзяржавы было б няправільна. Гэта быў вельмі важны крок на шляху да незалежнасці. Існаванне БССР давала нацыянальным сілам падставы змагацца за ператварэнне дэкларатыўнай дзяржаўнасці ў рэальную, змагацца за свабоду і суверэнітэт. Атрымалася так, што лёс дапамог Беларусі скарыстацца наяўнасцю савецкай дзяржаўнасці ў барацьбе за рэальны суверэнітэт.

У сярэдзіне 1980-х гг. у эканоміцы СССР і Беларусі як часткі СССР пачалі выяўляць сябе выразныя прыкметы эканамічнага заняпаду. Адміністрацыйна-партыйнае кіраванне прамысловасцю, звышманапалізацыя вытворчасці, накіраванасць яе на выпуск ваеннай прадукцыі, ізаляванасць ад сусветнага рынку прывялі да тэхнічнага адставання шмат у якіх галінах. Да таго ж, ужо з пачатку 1970-х гг. на сусветным рынку пачалі пастаянна зніжацца цэны на нафту, і эканоміку ўжо немагчыма было ратаваць, як раней, нафтадоларамі. Спробы рэфармавання прамысловага сектара эканомікі праваліліся, як і няўклюдныя спробы рэфармавання калгасна-саўгаснай сістэмы без вырашэння аднаго з галоўных пытанняў сельскай гаспадаркі – права ўласнасці на зямлю.

Скарачэнне вытворчасці ўласнай прадукцыі, немагчымасць без нафтадолараў купляць неабходнае за мяжой прывялі да таго, што з продажу сталі знікаць тавары першай неабходнасці (пральны парашок, мыла, алей, прадукты харчавання і спажывання). Для



*М. С. Гарбачоў*

простых людзей менавіта гэта стала паказчыкам крызісу савецкай палітычнай і эканамічнай мадэлі.

Да гэтага можна дадаць высокія выдаткі на гонку ўзбраенняў, на распрацоўку праграмы «зорных войнаў» са ЗША (дзе была распрацавана САІ – стратэгічная абарончая ініцыятыва). Прыблізна ў такіх умовах у красавіку 1985 г. у СССР была абвешчана палітыка перабудовы савецкага грамадства і галоснасці, якая распачалася па ініцыятыве новага генеральнага сакратара ЦК КПСС *М. С. Гарбачова* (1985–1991 гг.), выбранага на гэтую пасаду 11 сакавіка 1985 г.

**2. *Палітыка перабудовы і Беларусь. Аварыя на Чарнобыльскай АЭС.*** Крызісныя з’явы, якія нарасталі ў эканоміцы ў сярэдзіне 1980-х гг. сведчылі пра абвастрэнне крызісу ўсёй сацыялістычнай сістэмы. Каманднa-адміністратыўнае кіраванне не адпавядала рэаліям эпохі. Відавочнай была неабходнасць мадэрнізацыі ўсіх бакоў грамадства: яго эканамічных асноваў, сацыяльнага жыцця, палітычнага ўладкавання, духоўнай сферы. Разам з тым, рэаліі былі такімі, што ва ўмовах палітычнай сістэмы, што існавала, ідэя пераўтварэнняў магла ўвасобіцца ў жыццё толькі па ініцыятыве кіроўнай партыі. Але вывесці краіну на шлях устойлівага развіцця было ўжо немагчыма тымі метадамі, якія склаліся ў гады сталінска-брэжнеўскага кіравання. Таму група партыйных рэфарматараў на чале з М. С. Гарбачовым сама паспрабавала правесці якія-небудзь змены ў палітыцы і эканоміцы, не выпускаючы са сваіх рук кіроўныя лейцы.

***Курс на паскарэнне.*** На красавіцкім 1985 г. Пленуме ЦК КПСС М. С. Гарбачовым была дадзена крытычная ацэнка эканамічнага становішча, што склалася ў краіне, падкрэслены існуючыя супярэчнасці. Стратэгічным курсам ва ўнутранай палітыцы краіны быў абвешчаны курс на *паскарэнне* сацыяльна-эканамічнага развіцця.

Але шляхі, формы, глыбіня працэсаў абнаўлення былі ўсвядомлены не адразу. Шмат што прыходзілася ўдакладняць, карэктаваць і пераглядаць ужо падчас ажыццяўлення новай палітыкі. Поўнай яснасці пра глыбіню крызісу не мела нават партыйнае кіраўніцтва. Вельмі хутка выявіліся негатыўныя наступствы раз-

горнутай па ўсёй краіне кампаніі па барацьбе з п'янствам і алкагалізмам. Уведзеная талонная сістэма жорстка абмяжоўвала магчымасць набыцця алкагольных вырабаў у крамах, у выніку прывяла да недапаступлення грошай у дзяржаўны бюджэт, знішчэння вінаграднікаў, закрыцця лікёра-гарэлачных прадпрыемстваў, звальнення людзей, спекуляцыі гарэлкай, самагонаварэння і «цукровага буму». Усё гэта адбывалася на фоне зніжэння цэн на нафту, скарачэння імпарту і вытворчасці ўласнай прадукцыі ды вялікага дэфіцыту тавараў першай неабходнасці. Стала відавочна, што прадэкляраваны курс на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця без кардынальных зменаў асуджаны на правал.

Пасля прызначэння М. С. Гарбачова на вышэйшую пасаду ў дзяржаве і абвяшчэння ім «палітыкі перабудовы» ўпершыню за часы існавання СССР з'явілася легальная магчымасць правядзення дэмакратычных змяненняў, заканадаўчага абмежавання палітычнага дыктату КПСС. Апроч таго, эканамічны і сацыяльна-палітычны крызіс у СССР быў паглыблены аварыяй на Чарнобыльскай АЭС. Рэзкае пагаршэнне ўмоў жыцця, памножанае на памяць пра сталінскія рэпрэсіі, адназначна звязвала ў грамадскай свядомасці ўсе існуючыя ў краіне недахопы з наяўнасцю і дзейнасцю КПСС.

З крытыкі палітыкі КПСС, з выказванняў пра неабходнасць яе рэфармавання і пабудовы сацыялізму «з чалавечым тварам» пачаў сваю дзейнасць і М. С. Гарбачоў. Яго рэформы ў сваёй аснове зыходзілі з неабходнасці ліквідацыі ідэалагічнага дыктату КПСС і праводзіліся ва ўмовах дэмакратызацыі ўнутрыпартыйных адносін. Вынікам такой дэмакратызацыі стала фактычная немагчымасць жорсткага кіравання з боку партыйных органаў дзяржавай і грамадствам яшчэ да таго, як адпаведны артыкул Канстытуцыі СССР быў адменены.

На нечарговым Трэцім З'ездзе народных дэпутатаў СССР у сакавіку 1990 г. быў скасаваны 6 артыкул Канстытуцыі ССР аб «кіруючай ролі» КПСС і была ўведзена пасада Прэзідэнта СССР. З'езд фактычна на безальтэрнатыўнай аснове выбраў М. С. Гарбачова Прэзідэнтам СССР.

Справа ў тым, што арганізацыя ўлады ў СССР і саюзных рэс-

публіках адрознівалася ад той формы, якая была запісаная ў іх канстытуцыях. Так, напрыклад, у Канстытуцыі БССР 1978 г., як і у папярэдніх канстытуцыях, сцвярджалася, што ўся ўлада належыць народу. «Народ ажыццяўляе дзяржаўную ўладу праз Саветы народных дэпутатаў, якія складаюць палітычную аснову Беларускай ССР. Усе іншыя дзяржаўныя органы з'яўляюцца падкантрольнымі і падсправаздачнымі Саветам народных дэпутатаў». Гэта азначала *паўнаўладдзе саветаў* у палітычным жыцці краіны, і, такім чынам, адмову ад прынцыпу падзелу ўладаў у савецкай палітычнай сістэме.

Але ў сапраўднасці саветы ў сваёй уладзе былі абмежаваныя. Уладу саветаў урэзала, а дакладней забрала яе ад саветаў, КПСС. Партыя шляхам безальтэрнатыўных выбараў праводзіла сваіх прадстаўнікоў у Саветы, а праз Саветы – і ў іншыя дзяржаўныя органы. Партыйныя арганізацыі не проста ўмешваліся ў дзейнасць дзяржаўных органаў, а кіравалі імі. Заняць кіроўную пасаду мог толькі член КПСС. Разам з тым, уся паўната ўлады знаходзілася ў руках вярхушкі КПСС – Палітбюро КПСС і цэнтральных камітэтаў кампартый саюзных рэспублік. Кіраўніком Вярхоўнага Савета мог стаць толькі той чалавек, які быў «рэкамендаваны» на гэтую пасаду вышэйшым органам КПСС, а ў рэспубліках – ЦК Кампартыі саюзнай рэспублікі. Такім чынам КПСС абыходзіла канстытуцыйныя фармулёўкі і трымала палітычную ўладу ў сваіх руках.

***Палітыка перабудовы***. На студзеньскім 1987 г. Пленуме ЦК КПСС была абвешчана палітыка *перабудовы* ўсіх сфер жыцця ў Савецкім Саюзе, а чэрвеньскі 1987 г. Пленум ЦК КПСС зацвердзіў яе кірункі. Асноўным зместам перабудовы абвяшчалася ўмацаванне сацыялістычнага ладу праз дэмакратызацыю грамадскага жыцця (*«дэмакратычны сацыялізм»*) і радыкальную эканамічную рэформу.

Дэмакратызацыя ў СССР ажыццяўлялася праз тры важныя мерапрыемствы:

1) увядзенне палітыкі *галоснасці*, пад якой разумелася права чалавека публічна выказваць свае погляды і меркаванні, свабода слова, плюралізм думак і поглядаў, адкрытасць і даступнасць для насельніцтва інфармацыі аб тым, што адбываецца ў дзяржаве і грамадстве. У СССР аднавілася рэабілітацыя ахвяр сталінскіх

рэпрэсій, адбыўся сапраўдны выбух грамадскага інтарэсу да падзей мінулага, асабліва да так званых *«белых плямаў»* гісторыі;

2) фарміраванне ў краіне *шматпартыйнасці* праз рэалізацыю правоў грамадзян на аб'яднанне і ўтварэнне розных саюзаў, рухаў, палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў. Яшчэ у пачатку 20-х гадоў XX ст. у СССР былі забаронены ўсе партыі, акрамя партыі бальшавікоў. Гэтую сітуацыю змяніў прыняты ў 1990 г. закон *«Аб грамадскіх аб'яднаннях»*, і манаполія на ўладу КПСС была ліквідавана;

3) правядзенне *альтэрнатыўных выбараў*, якія ўпершыню адбыліся ў 1989 г., у выглядзе выбараў народных дэпутатаў СССР.

Больш складанае становішча было ў эканамічнай сферы. Усведамляючы неабходнасць выхаду з крызісу і пры гэтым не жадаючы кардынальна мяняць падыходы да спосабу арганізацыі кіравання эканомікай, улады хацелі знайсці трэці шлях паміж каманднаадміністратыўнай сістэмай і рыначнай эканомікай. Выхад бачыўся ў структурнай перабудове эканомікі на прынцыпах *гаспадарчага разліку* і *самафінансавання*.

Па сутнасці, гэта была спроба *мадэрнізацыі* партыяй той грамадска-палітычнай і эканамічнай сістэмы, якую яна сама стварыла. Прытым мадэрнізацыі не радыкальнай, а такой, каб усё заставалася як раней: кіроўная роля КПСС, каманднаадміністратыўная сістэма, але каб стала добра і ўсім усё падабалася, у тым ліку, каб народу падабаўся і сам генсек М. С. Гарбачоў.

Напачатку нават рэалізацыю курса на паскарэнне сацыяльна эканамічнага развіцця, а потым і перабудовы планавалася ажыццяўляць у асноўным з дапамогай адміністратыўных мер. Грамадства павінна было проста выконваць чарговыя праграмы, якія яму будуць даводзіць зверху.

***Перабудова і Беларусь.*** У адпаведнасці са зменай падыходаў да арганізацыі эканомікі, на беларускіх прадпрыемствах актыўна пачалі ўкараняцца поўны гаспадарчы разлік і самафінансаванне. Да канца 1988 г. на гэтых прынцыпах працавалі ўся прамысловасць, аграпрамысловы комплекс, транспарт і гандаль у Беларусі. Разглядалася пытанне аб магчымасці выхаду на агульнарэспубліканскі гаспа-

дарчы разлік. Была таксама распрацавана агульнарэспубліканская комплексная праграма «*Інтэнсіфікацыя*», якая прадугледжвала хуткае ўкараненне ў вытворчасць новых перадавых тэхналогій, выпуск прадукцыі, канкурэнтназдольнай на сусветным рынку, развіццё творчай ініцыятывы працоўных і інш. Аднак прагрэсіўныя памкненні па-ранейшаму планавалася ажыццявіць камандна-адміністратыўнымі метадамі, напрыклад, увядзеннем на прадпрыемствах *дзяржаўнай прыёмкі* – спецыяльнай службы кантролю якасці прадукцыі, што выпускалася. Але дзяржпрыёмка не прынесла таго выніку, які чакалі ад яе ўвядзення, а толькі павялічыла бюракратычны апарат.

***Чарнобыльская праблема***. Эканамічнае становішча ў Беларусі рэзка пагоршылася ў сувязі з наступствамі катастрофы на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі (АЭС), якая адбылася 26 красавіка 1986 г. Нягледзячы на тое, што АЭС знаходзіцца на Украіне, больш за 70 % радыёактыўных ападкаў выпала на землях Беларусі. У выніку забруджанымі радыёнуклідамі апынуліся каля 23 % тэрыторыі рэспублікі, дзе пражывала 2 млн. 200 тыс. насельніцтва. З гаспадарчага абарачэння было выведзена 20 % сельскагаспадарчых і 15 % лясных угоддзяў краіны.

Сітуацыя ўскладнялася тым, што ўлады спачатку замоўчвалі факт аварыі, а потым – усю сур'ёзнасць яе наступстваў. Толькі 4 мая 1986 г. была вызначана 30-кіламетровая зона на мяжы з Украінай, насельніцтва якой падлягала адсяленню. Усяго з зоны забруджвання было выселена звыш за 135 тыс. чалавек, поўнасцю адселена 415 населеных пунктаў. Чарнобыльская аварыя абвастрыла і сацыяльную праблему ў Беларусі, паколькі неабходнасць першачарговага



*Чарнобыльская АЭС.*



*Чарнобыль. Зона адчужэння.*

выдзялення жылля выселеным адсоўвала ў чэргах на атрыманне жылля іншыя сем'і.

На ліквідацыю наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС Беларусі патрабавалася 235 млрд. долараў. Агульны эканамічны крызіс у СССР у канцы 1980-х гг. прывёў да таго, што з саюзнага бюджэту сродкі на гэта фактычна не выдаткоўваліся. Чарнобыльская праблема стала ўласнай праблемай Беларусі.

Такім чынам, нягледзячы на першасныя станоўчыя змены эканамічнай сітуацыі ў выніку ўвядзення гаспадарчага разліку і самафінансавання, вельмі хутка выявіліся крызісныя з'явы: адбывалася падзенне прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці, назіраліся паліўны, энергетычны, транспартны крызіс, дэфіцыт тавараў першай неабходнасці. Паказчыкамі краху камандна-бюракратычнай эканомікі сталі інфляцыя, рост унутранага і знешняга доўга, абясцэньванне грошай і рост натуральнага абмену (*бартару*). Папулісцкія рашэнні, такія як павышэнне пенсій, сацыяльных выплат, зарплаты і інш., не суправаджаліся рэальнымі рэформамі і вялі да яшчэ большай разбалансаванасці эканомікі краіны.

Выразна відаць, што крызіс існуючага тады таталітарнага палітычнага рэжыму непазбежна прывёў да крызісу ўсёй камандна-адміністратыўнай сістэмы, на якую ён абапіраўся.

**3. *Стварэнне нацыянальнай антыкамуністычнай апазіцыі. Вярхоўны Савет БССР XII склікання.*** БССР у перыяд перабудовы лічылася адной з самых кансерватыўных рэспублік Савецкага

Саюза. У той час як Масква сама ўжо заяўляла, што выступае за рэфармаванне камуністычнай сістэмы, урад Беларусі рабіў усё, каб захаваць гэтую сістэму ў некранутым выглядзе.

Тым не менш, спыніць працэс дэмакратызацыі і ў Беларусі было немагчыма. У снежні 1986 г. група беларускай інтэлігенцыі адправіла ў Маскву на імя М. С. Гарбачова зварот, які ў гістарыяграфіі атрымаў назву «Ліст 28-мі», дзе гаворка ішла пра недэмакратычную русіфікатарскую палітыку мясцовых камуністычных дзеячаў. Камісія з Масквы прыехала надзіва хутка і, пасля нядоўгай працы, растлумачыла заяўнікам і ўсім грамадзянам, што ў Беларусі, у параўнанні з іншымі рэспублікамі СССР, усё добра. Больш за тое, як прыклад правільнага правядзення ў БССР нацыянальнай палітыкі называлася выданне ў Мінску дзесяцітомнага збору твораў У. І. Леніна на беларускай мове.

Грамадская думка краіны, між тым, выказвала поўную незадаволенасць дзеяннямі мясцовых камуністычных уладаў. У Беларусі стыхійна ўзнікла грамадска-палітычная дыскусія аб магчымых шляхах развіцця краіны. Паступова сталі стварацца так званыя «нефармальныя» арганізацыі, якія мелі не абавязкова палітычны характар, але былі непадкантрольныя ўладам.

Першымі арганізацыямі, якія выступілі супраць палітыкі КПБ, былі якраз самадзейныя аб’яднанні, якія змагаліся супраць скарачэння сферы ўжывання беларускай мовы, за стварэнне ўмоў для развіцця беларускай нацыянальнай культуры. У Мінску такой арганізацыяй было нефармальнае аб’яднанне моладзі «*Талака*», створанае восенню 1985 г. як клуб аховы помнікаў даўніны. «Талака» ўдзельнічала ў рэстаўрацыйных работах і археалагічных раскопках, займалася аховай помнікаў гісторыі і архітэктуры, культурна-асветніцкай дзейнасцю, адраджэннем народных традыцый і святаў, змагалася за стварэнне беларускіх класаў і школ і інш. Актывістамі «Талакі» былі *Сяргей Вітушка*, *Вінцук Вячорка*, *Віктар Івашкевіч*, *Алесь Суша*. У Гродне ў 1986 г. было створана гісторыка-культурнае таварыства «Паходня». На чале таварыства стаяў доктар гістарычных навук *М. А. Ткачоў*. Сябры таварыства займаліся вывучэннем гістарычных падзей, жыцця і творчасці вы-



*Васіль Быкаў і Зянон Пазняк.*

датных прадстаўнікоў мінулага, прапагандай беларускіх звычаяў і традыцый, музыкі, літаратуры, фальклору, беларускай мовы і інш. Падобныя нефармальныя арганізацыі ствараліся і ў іншых гарадах Беларусі.

19 кастрычніка 1988 г. у Мінску адбыўся устаноўчы сход Беларускага гісторыка-асветнага таварыства памяці ахвяр сталінізму «Мартыралог Беларусі». На сходзе па прапанове археолага *З. С. Пазняка* быў утвораны *арганізацыйны камітэт Беларускага народнага фронту за перабудову «Адраджэнне»*. У склад аргкамітэту ўвайшлі 33 чалавекі, у тым ліку такія вядомыя асобы, як Рыгор Барадулін, Васіль Быкаў, Ніл Гілевіч, Анатоль Грыцкевіч, Міхась Чарняўскі, вышэйзгаданыя З. С. Пазняк, М. А. Ткачоў і інш. У адозве аргкамітэту «Да грамадзян Беларусі» заяўлялася, што Беларускі народны фронт (БНФ) будзе змагацца за рэальны суверэнітэт Беларусі, за падпарадкаванне эканомікі інтарэсам чалавека, непарушнасць яго правоў, за дзяржаўнасць беларускай мовы.

Улады не дазволілі правесці ўстаноўчы з’езд БНФ у Мінску. Ён адбыўся 24–25 чэрвеня 1989 г. у Вільнюсе. Старшынём БНФ быў абраны З. С. Пазняк, намеснікамі – М. А. Ткачоў і прафесар, доктар фізіка-матэматычных навук *Ю. В. Хадыка*.

БНФ набываў вялікую папулярнасць у грамадстве. Гэта была першая ў Беларусі грамадская арганізацыя, якая адкрыта пазіцыянавала сябе як апанента камуністычных уладаў. Па сутнасці, пасля стварэння БНФ у БССР пачалося станаўленне шматпартыйнай сістэмы.

***Вярхоўны Савет БССР XII склікання.*** У грамадстве рэзка павялічыўся інтарэс да гістарычнага мінулага сваёй Бацькаўшчыны, людзі абудзіліся ад скаванасці і абыякавасці. 1 снежня 1988 г. быў

прыняты закон «Аб выбарах народных дэпутатаў СССР». Яго навацыяй стала замацаванне прынцыпу *альтэрнатыўнасці* (правядзенне галасавання пры наяўнасці некалькіх кандыдатаў), чаго дагэтуль у Савецкім Саюзе не было.

27 кастрычніка 1989 г. Вярхоўны Савет БССР прыняў падобны закон і для Беларусі – «Аб выбарах народных дэпутатаў Беларускай СССР». На выбары ў Вярхоўны Савет БССР прадстаўнікі БНФ ішлі з лозунгам «Галасую за Беларусь!» і з палітычнай платформай, якая прадугледжвала патрабаванне поўнай дзяржаўнай незалежнасці Беларусі.

4 сакавіка 1990 г. у рэспубліцы адбыліся першыя альтэрнатыўныя выбары ў Вярхоўны Савет БССР і мясцовыя саветы. Нягледзячы на моцную прасавецкую і пракамуністычную агітацыю, у Вярхоўны Савет было абрана шмат дэмакратычна настроеных людзей. Дэпутаты-прадстаўнікі БНФ сфарміравалі там Апазіцыю БНФ (37 чалавек) і фракцыю БНФ (27 чалавек) на чале з З. С. Пазняком.

У дэпутацкую групу БНФ уваходзілі: Мікалай Аксаміт, Віктар Алампіеў, Сяргей Антончык, Лявон Баршчэўскі, Юрый Беленькі, Ігар Гермянчук, Вольга Галубовіч, Валянцін Голубеў, Генадзь Грушавы, Барыс Гюнтар, Леанід Дзейка, Уладзімір Заблоцкі, Лявонцій Зданевіч, Віктар Какоўка, Мікалай Крыжаноўскі, Віталь Малашка, Мікалай Маркевіч, Сяргей Навумчык, Зянон Пазняк, Сяргей Папкоў, Ігар Пырх, Пётра Садоўскі, Сяргей Слабчанка, Галіна Сямдзянава, Алег Трусаў, Павел Холад, Аляксандр Шут. Увогуле, прыхільнікаў дэмакратычных зменаў у парламенце было каля 100 чалавек з агульнай колькасці дэпутатаў 360. Яны ўтварылі так званы *Дэмакратычны дэпутацкі клуб*.

Асноўныя задачы, якія ставіла перад сабой дэпутацкая група БНФ, – скасаванне 6-га артыкула Канстытуцыі БССР аб дзяржаўнай функцыі камуністычнай партыі, абвяшчэнне поўнай праўды пра Чарнобыльскую катастрофу, узняцце пытання аб дзяржаўным суверэнітэце Беларусі і інш.

У пачатку 1990-х гг. у беларускім грамадстве выразна вылучаліся дзве плыні: прасавецкая (камуністычная) і нацыянальная (дэмакратычная). Большасць насельніцтва не выказвала адкрыта сваю ан-

тысавецкасць, людзі баяліся магчымых рэпрэсій з боку ўладаў. Разам з тым, асноўныя ідэі дэмакратаў, у прыватнасці, аб неабходнасці дэмакратызацыі грамадства, адраджэння нацыянальнай культуры і мовы, замацавання дзяржаўнай незалежнасці падтрымлівала значная частка насельніцтва. Здавалася, што ў краіне пачаўся працэс фарміравання грамадзянскай супольнасці на аснове дэмакратычных каштоўнасцяў і ідэі нацыянальнай дзяржаўнасці. Але рэальная ўлада заставалася ў руках усё тых жа прадстаўнікоў партыйна-бюракратычнага апарату.

**4.** ***Абвяшчэнне дзяржаўнага суверэнітэту Беларускай ССР.*** Дэпутацкая група БНФ з самага пачатку працы Вярхоўнага Савета патрабавала прыняць дэкларацыю аб незалежнасці Беларусі. У маі 1990 г. сойм БНФ прыняў заяву, дзе гаварылася, што дасягненне дэмакратыі, суверэнітэту рэспублікі і выратаванне нашага народу не магчымае ў складзе СССР. 30 чэрвеня – 1 ліпеня 1990 г. у Мінску прайшла канферэнцыя БНФ «Адраджэнне», прысвечаная пытанням будучыні Беларусі. 1 ліпеня на Канферэнцыі быў прыняты праект «Дэкларацыі аб незалежнасці Беларусі». Дэкларацыя ўтрымлівала дзве часткі. Першая з іх мела загаловак «Гістарычныя палажэнні». У ёй паказвалася, што суверэннасць Беларускай дзяржавы мае выток у незалежнасці Полацкага княства і Вялікага Княства Літоўскага, называліся прыклады змагання за незалежнасць краіны пад час паўстанняў 1794, 1830–1831, 1863–1864, 1905 гг., станоўча ацэньвалася ўтварэнне БНР і БССР. Разам з тым, у тэксце сцвярджалася, што «падпісанне прадстаўніком БССР Саюзнага дагавору 1922 г. не мела юрыдычнай сілы, бо гэтае рашэнне было прынятае пад дыктоўку Масквы ва ўмовах таталітарнага рэжыму і акупацыі, без правядзення рэферэндуму і ратыфікацыі рэспублікай гэтага акту». Сцвярджалася, што ўсё сказанае дае права Вярхоўнаму Савету БССР не заключаць новы саюзны дагавор і дэнансаваць дагавор 1922 г. у аднабаковым парадку.

2 ліпеня 1990 г. гэты праект па ініцыятыве дэпутатаў Апазіцыі БНФ быў прапанаваны сесіі Вярхоўнага Савета БССР для разгляду. З’яўленне ў Вярхоўным Савеце БССР такога дакумента выклікала

ў прадстаўнікоў парламенцкай большасці сапраўдны шок. Партыйныя і савецкія функцыянеры не маглі нават уявіць, як гэта можна было адважыцца выступіць з прапановай аб выхадзе Беларусі са складу СССР і заяўляць пра суверэнітэт Беларусі!

Але гэта былі ўжо не сталінскія часы. Ды і з прапановай абвяшчэння незалежнасці Беларусі і выхаду са складу СССР звярнуліся дэпутаты вышэйшага прадстаўнічага і заканадаўчага органа – Вярхоўнага Савета БССР. Вярхоўны Савет меў права разгледзець любое пытанне жыцця дзяржавы, а дэпутат ці група дэпутатаў маглі ініцыяваць любое пытанне да разгляду.

Камуністычныя ўлады Беларусі ўсяляк змагаліся нават супраць магчымага абмеркавання пытання пра поўную незалежнасць краіны. Праўда замоўчаць тое, што СССР ужо распадаецца, а дзяржаваўтваральныя памкненні яго былых рэспублік узрастаюць, было ўжо нельга. Першымі запатрабавалі ажыццяўлення свайго канстытуцыйнага права на выхад са складу СССР рэспублікі Балтыі: у сакавіку 1990 г. аб поўнай дзяржаўнай незалежнасці абвясціў парламент Літвы, а пазней - Латвіі і Эстоніі. У той жа час у Маскве стала відавочнай канфрантацыя паміж саюзным урадам М. С. Гарбачова і кіраўніцтвам РСФСР на чале з *Б. М. Ельцыным*.



*Мітынг у Мінску каля Дома Ураду, 1990 г.*

12 чэрвеня 1990 г. быў абвешчаны дзяржаўны суверэнітэт Расійскай Федэрацыі, а 16 ліпеня 1990 г. – Украіны.

У тым ліку і пад уплывам падзей, што адбываліся ў суседніх рэспубліках, рух за набыццё дзяржаўнага суверэнітэту актывізаваўся і ў Беларусі. Найперш гэтаму спрыялі дзейнасць дэмакратычнай апазіцыі ў Вярхоўным Савеце БССР, палітычных партый і народная падтрымка: сотні, а нярэдка і тысячы людзей прыходзілі штодня на плошчу перад парламентам, каб падтрымаць дэпутатаў апазіцыі ў іх дзейнасці.

*27 ліпеня 1990 г.* Вярхоўны Савет БССР прыняў *Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце*. Першы артыкул гэтага дакумента дэкляраваў, што Беларусь з'яўляецца суверэннай дзяржавай, ўсталяванай на аснове ажыццяўлення беларускай нацыяй яе неад'емнага права на самавызначэнне, дзяржаўнасці беларускай мовы, вяршэнства народа ў вызначэнні свайго лёсу. Пры гэтым ажыццяўленне пералічаных прынцыпаў планавалася ў рамках Савецкага Саюза, ператворанага ў дэмакратычную прававую дзяржаву.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Бартар*** – натуральны тавараабмен, пры якім адна рэч ці тавар мяняецца на іншы без аплаты грашыма; гандлёвая здзелка па схеме «тавар за тавар».

***Галоснасць*** – палітыка ў часы перабудовы, магчымасць адкрыта выказваць свае думкі і погляды наконт усіх пытанняў сучаснасці і гістарычнага мінулага; даступнасць для грамадства звестак пра дзейнасць органаў дзяржаўнага кіравання.

***Гаспадарчы разлік*** – метад гаспадарання, пры якім прыбыткі, якія атрымлівае прадпрыемства ад рэалізацыі сваёй прадукцыі, кампенсуюць яго выдаткі на вытворчасць гэтай прадукцыі.

***Інфляцыя*** – абясцэньванне грошай у выніку выпуску іх у абарачэнне без забеспячэння неабходнай колькасцю тавараў; падзенне пакупніцкай здольнасці грошай.

***Мадэрнізацыя*** – працэс поўнай ці частковай рэканструкцыі грамадскай сістэмы з мэтай паскарэння развіцця.

***Перабудова*** – агульная назва новага курсу савецкага партыйнага кіраўніцтва, сукупнасці палітычных і эканамічных зменаў, якія адбываліся ў СССР з 1987 па 1991 гг.

***Самафінансаванне*** – метад гаспадарання, пры якім прадпрыемства не атрымлівае фінансавых сродкаў з дзяржаўнага бюджэту, а зарабляе грошы самастойна, за кошт сваёй вытворчасці і рэалізацыі выпушчанай прадукцыі.

***Суверэнітэт*** – поўная незалежнасць дзяржавы ў пытаннях унутранай і знешняй палітыкі.

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***1985–1991 гг.*** – палітыка перабудовы ў СССР.

***26 красавіка 1986 г.*** – аварыя на Чарнобыльскай АЭС.

***1986–1990 гг.*** – першы этап эканамічнай рэформы – перавод прадпрыемстваў на поўны гаспадарчы разлік і самафінансаванне. Чаканых станоўчых вынікаў не даў.

***Чэрвень 1987 г.*** – Пленум ЦК КПСС – курс на *перабудову* грамадства і ўсталяванне *дэмакратычнага сацыялізму.*

***3 чэрвеня 1988 г.*** – публікацыя ў газеце «Літаратура і мастацтва» артыкула З. Пазняка і Я. Шмыгалёва «Курапаты – дарога смерці».

***19 кастрычніка 1988 г.*** – стварэнне Рэспубліканскага гісторыка-асветніцкага таварыства памяці ахвяр сталінскіх рэпрэсій «Мартыралог Беларусі». Утварэнне аргкамітэту Беларускага народнага фронту «Адраджэньне» (БНФ).

***30 кастрычніка 1988 г.*** – масавыя мітынгі памяці ахвяр сталінізму ў дзень памяці «Дзяды» калі Усходніх могілак у г. Мінску і каля ўрочышча Курапаты пад г. Мінскам.

***15 лютага 1989 г.*** – завяршэнне вайны ў Афганістане. Пачатак вываду савецкіх войскаў.

***26 сакавіка 1989 г.*** – выбары народных дэпутатаў СССР, якія ўпершыню праходзілі як адносна свабодныя і альтэрнатыўныя.

***24–25 чэрвеня 1989 г.*** – устаноўчы з’езд Беларускага народнага фронту «Адраджэнне» (БНФ) у г. Вільнюсе – першай альтэрнатыўнай камуністычнай сістэме палітычнай сілы ў Беларусі.

***Кастрычнік 1989 г.*** – на Архірэйскім саборы РПЦ у Маскве было прынятае рашэнне аб утварэнні Беларускага экзархата Маскоўскага патрыярхата – утварэнне Беларускага Экзархата Рускай праваслаўнай царквы.

***1989 г.*** – Вярхоўны Савет БССР ухваліў праграму ліквідацыі ў БССР вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

***26 студзеня 1990 г.*** – Вярхоўны Савет БССР прыняў закон «Аб мовах у Беларускай ССР», які ўстанавіў, што дзяржаўнай мовай Беларусі з'яўляецца беларуская мова. Разам з тым, закон прадугледжваў права свабоднага карыстання рускай мовай як мовай міжнацыянальных зносін, свабоднае развіццё і ўжыванне іншых нацыянальных моў.

***Сакавік 1990 г.*** – Трэці з'езд народных дэпутатаў СССР у Маскве. Адмена 6-га артыкула Канстытуцыі СССР (аб «кіруючай і накіроўваючай ролі» камуністычнай партыі) і ўвядзенне пасады Прэзідэнта СССР.

***4 сакавіка 1990 г.*** – выбары ў Вярхоўны Савет БССР XII склікання. Прыхільнікі дэмакратычных пераўтварэнняў утварылі ў Вярхоўным Савеце парламенцкую апазіцыю, якая была прадстаўлена Беларускім народным фронтам «Адраджэньне».

***27 ліпеня 1990 г.*** – Вярхоўны Савет Беларускай ССР прыняў «Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі».

## ЛІТАРАТУРА

1. Апазіцыя БНФ у Вярхоўным Савеце XII склікання: Дакументы, факты, каментарыі / Укл. і камент. А. В. Кур'яновіча. Смаленск: Інбелкульт, 2015.
2. *Бабосов Е. М.* Чернобыльская трагедия в ее социальных измерениях. Мн.: Право и экономика, 1996.
3. Беларусь у сацыяльна-эканамічных і грамадска-палітычных працэсах 1946–2006 гг.: Манаграфія / М. П. Касцюк [і інш.]. Мн.: Беларуская навука, 2007.
4. *Василевич Г. А.* Белорусское государство на рубеже веков. Мн.: Право и экономика, 2007.

5. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 2. / М. У. Смяховіч [і інш.]. Мн.: Беларуская навука, 2012.
6. *Лыч Г. М., Патеева З. Г.* Чернобыльская катастрофа: социально-экономические проблемы и пути их решения. Мн., 1991.
7. *Несцяровіч М. Б.* Эканоміка Беларусі ў кантэксце развіцця савецкай і сусветнай эканомік (1951–1990 гг.) // Весці НАН Беларусі. Серыя гуманітарных навук. 2007. № 4.
8. *Новік Я. К., Жданко Л. Ю.* Беларусь у перыяд правядзення рэформ: сучасныя праблемы сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і культурнага развіцця (1985 – 1995). Мн.: Беларусь, 1995.
9. *Сакович В. С.* Сельское хозяйство Республики Беларусь в 1980–2007 гг.: тенденции развития / Минск: Беларуская навука, 2008.
10. *Терешкович П.* Гражданское движение в Белоруссии: Документы и материалы (1986 – 1991). Мн.: Беларусь, 1991.
11. *Шыбека З.* Нарыс гісторыі Беларусі (1795 – 2002). Мн.: Энцыклапедыкс, 2003.

# РАЗДЗЕЛ 5.
# СТАНАЎЛЕННЕ НЕЗАЛЕЖНАЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ (1991–1995 гг.)

1. *Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё Беларусі ў 1991 г.*
2. *Умацаванне незалежніцкіх тэндэнцый: ад БССР да Рэспублікі Беларусь.*
3. *Канстытуцыя незалежнай дзяржавы: парламенцкая рэспубліка з пасадай прэзідэнта.*
4. *Змены ў палітычнай арганізацыі. Рэферэндум 14 мая 1995 г.*

**1. *Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё Беларусі ў 1991 г.*** У канцы 1980-х – пачатку 1990-х гг. выразна ўзмацніўся рух за рэальную незалежнасць практычна ва ўсіх рэспубліках СССР. Спрыяла гэтаму і палітыка савецкага кіраўніцтва, якое імкнулася не дапусціць ніякіх рэальных зменаў, пагаджаючыся толькі на некаторыя невялікія паслабленні на карысць рэспублік. Любая спроба насельніцтва адкрыта выказацца супраць існуючай палітычнай сістэмы каралася нават з прымяненнем войскаў. Так, з прымяненнем сілы і з чалавечымі ахвярамі былі разагнаны незалежніцкія мітынгі ў Тбілісі (9 красавіка 1989 г.) і Вільнюсе (11–13 студзеня 1991 г.). У выніку грамадска-палітычная сітуацыя ў СССР пастаянна абвастралася, паўстала пытанне наогул аб магчымасці існавання Савецкага Саюза.

17 сакавіка 1991 г. па ініцыятыве цэнтральных уладаў быў праведзены рэферэндум па праблеме захавання СССР. Пытанне было пастаўлена наступным чынам: «Ці лічыце Вы неабходным захаванне Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік як абноўленай федэрацыі раўнапраўных суверэнных рэспублік, у якой будуць у поўнай меры гарантавацца правы і свабоды чалавека любой нацыянальнасці?». У рэферэндуме ўзялі ўдзел толькі 9 з 15-ці саюзных рэспублік (галасаванне не адбылося ў Арменіі, Грузіі, Літве,

Латвіі, Малдове, Эстоніі). У выніку ¾ з тых, хто ўзяў удзел у галасаванні, выказаліся станоўча на карысць СССР. Але ўсім было зразумела, што адначасова быць у складзе СССР і ажыццяўляць уласны дзяржаўны суверэнітэт немагчыма. Памкненні да дзяржаўнай незалежнасці мацнелі ва ўсіх савецкіх рэспубліках.

Пасля рэферэндуму М. С. Гарбачоў пачаў непасрэдныя перамовы аб заключэнні новага саюзнага дагавора з кіраўніцтвам тых саюзных рэспублік, якія на рэферэндуме падтрымалі ідэю захавання СССР. Але палітычная сітуацыя ўскладнялася пагаршэннем эканамічнага становішча. 2 красавіка 1991 г. урад СССР павялічыў цэны на прадукты харчавання, што выклікала ў Беларусі шматтысячныя забастоўкі пратэсту. Адным з галоўных патрабаванняў забастоўшчыкаў было ўсталяванне дзяржаўнай незалежнасці Беларусі.

15 жніўня 1991 г. у цэнтральных газетах быў надрукаваны тэкст новага Саюзнага дагавора. Падпісанне дагавора павінна было адбыцца 20 жніўня 1991 г. Украіна пры гэтым заявіла, што яна не падпіша дагавор да таго часу, пакуль не будзе прынятая новая канстытуцыя краіны. Грузія яшчэ 9 сакавіка 1990 г. дэнансавала Дагавор аб утварэнні СССР ад 30 снежня 1922 г. паміж БССР, УССР, РСФСР і ЗССР. Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце мелі Арменія, Малдова, Казахстан, Таджыкістан, Туркменістан, Узбекістан. Балтыйскія дзяржавы яшчэ раней заявілі аб выхадзе з СССР і вяртацца туды не збіраліся.



*Забастоўка рабочых мінскіх прадпрыемстваў, красавік 1991 г.*

***Путч ГКЧП.*** Яшчэ большы рост даверу да дэмакратычных і нацыянальных сіл Беларусі быў звязаны з падзеямі ў Маскве 19–21 жніўня 1991 г. Падчас падрыхтоўкі новага саюзнага дагавора ў Маскве актывізаваліся кансерватыўныя сілы, якія выступалі супраць зменаў ва ўсіх сферах жыцця грамадства і за захаванне Савецкага Саюза як унітарнай дзяржавы. Група вышэйшых дзяржаўных асоб паспрабавала ізаляваць М. С. Гарбачова на ўрадавай дачы ў Фаросе і здзейсніла спробу пракамуністычнага перавароту. У ноч з 18 на 19 жніўня 1991 г. у Маскву былі ўведзеныя войскі і бранятэхніка, была аб’яўлена каменданцкая гадзіна. У асобных мясцовасцях уводзілася надзвычайнае становішча, прыпынялася дзейнасць палітычных партый і арганізацый, уводзілася цэнзура, забараняліся мітынгі і дэманстрацыі.

Путчысты звярнуліся да грамадзян СССР з заявай аб тым, што палітыка перабудовы зайшла ў тупік, М. С. Гарбачоў як-быццам больш не можа выконваць свае абавязкі «па стану здароўя», і таму яго паўнамоцтвы пераходзяць да віцэ-прэзідэнта *Г. І. Янаева*. Аб’яўлялася, што ўся паўната ўлады пераходзіць да створанага гэтымі людзьмі *Дзяржаўнага камітэта па надзвычайным становішчы*. Гэтыя падзеі ўвайшлі ў гісторыю як *путч ГКЧП* (па-руску: «*Государственный комитет по чрезвычайному положению*»).

Аднак дэмакратычныя сілы ў Расіі на чале з Б. М. Ельцыным арганізавалі сапраўдную акцыю грамадзянскага непадпарадкавання ГКЧП, паколькі відавочнымі былі сапраўдныя мэты змоўшчыкаў: пры дапамозе войскаў і КДБ падавіць дэмакратычныя рухі і аднавіць таталітарны рэжым у СССР. Сваім указам Прэзідэнт Расіі перападпарадкаваў сабе ўсе органы выканаўчай улады СССР, якія знаходзіліся на тэрыторыі Расіі, у тым ліку КДБ, МУС і Міністэрства абароны. У шмат якіх рэспубліках і гарадах прайшлі мітынгі і дэманстрацыі пратэсту супраць путчу ГКЧП. На тэрыторыі Беларусі партыйнае кіраўніцтва падтрымала путч, але дэмакратычныя сілы рэспублікі на чале з Апазіцыяй БНФ адкрыта выступілі супраць змовы і арганізавалі мітынгі пратэсту.

У Беларусі з ініцыятывы дэмакратычных дэпутатаў была склікана нечарговая сесія Вярхоўнага Савета БССР. 24–25 жніўня

1991 г. на плошчы каля Дома Урада адбываўся бесперапынны мітынг за незалежнасць.

Правал путчу значна паскорыў працэсы дэзінтэграцыі ў Савецкім Саюзе і спрычыніўся да хутчэйшага набыцця Беларуссю сапраўднага дзяржаўнага суверэнітэту. 25 жніўня 1991 г. Вярхоўны Савет БССР прыняў рашэнне аб наданні Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР статусу канстытуцыйнага закона. На тэрыторыі Беларусі, як і ўсяго Савецкага Саюза, была прыпынена дзейнасць КПСС. Законам «Аб забеспячэнні палітычнай і эканамічнай самастойнасці Беларускай ССР», прынятым у той жа дзень, усе прадпрыемствы, арганізацыі і ўстановы саюзнага падпарадкавання, размешчаныя на тэрыторыі БССР, пераводзіліся ва ўласнасць рэспублікі. Пачынаўся этап незалежнага дзяржаўнага развіцця Беларусі ў форме парламенцкай рэспублікі, калі вышэйшая дзяржаўная ўлада поўнасцю перайшла да Вярхоўнага Савета БССР.

25 жніўня 1991 г. на патрабаванне дэмакратычна настроеных дэпутатаў, ад абавязкаў старшыні Вярхоўнага Савета БССР быў вызвалены М. Дземянцей, які перад гэтым, па сутнасці, падтрымаў путчыстаў. Новым старшынёй Вярхоўнага Савета быў абраны прафесар *С. С. Шушкевіч*.

**2.** ***Умацаванне незалежніцкіх тэндэнцый: ад БССР да Рэспублікі Беларусь.*** Пасля надання Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР статусу канстытуцыйнага закона пачаўся новы перыяд беларускай гісторыі, перыяд яе існавання як незалежнай дзяржавы і прызнання яе як такой у свеце. Першай прызнаў незалежнасць нашай краіны сейм Польскай Рэспублікі – 3 верасня 1991 г.

Рух да незалежнасці Беларусі прайшоў этап пазбаўлення ад савецкай сімволікі і змены назвы дзяржавы. 19 верасня 1991 г. Вярхоўны Савет Беларусі спецыяльным законам змяніў назву дзяржавы з «Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка» на «Рэспубліка Беларусь», альбо ў скарочаных і састаўных назвах «Беларусь». У гэты ж дзень былі прыняты законы «Аб дзяржаўным сцягу Рэспублікі Беларусь» і «Аб дзяржаўным гербе Рэспублікі Беларусь».

У выніку дзяржаўнымі сімваламі сталі нацыянальныя *бела-чырвона-белы сцяг* і герб «*Пагоня*».

Перад Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь стаялі задачы па фарміраванні ўласных органаў дзяржаўнага кіравання, стварэнні Узброеных Сіл, мытнай службы, банкаўскай сістэмы Беларусі і інш. Пачатак гэтаму працэсу паклаў прыняты 25 жніўня 1991 г. закон «Аб некаторых зменах у сістэме органаў дзяржаўнага кіравання Беларускай ССР», які пераўтварыў саюзна-рэспубліканскае Міністэрства ўнутраных спраў у рэспубліканскае. У той жа дзень было прынятае рашэнне аб перападпарадкаванні Камітэта дзяржаўнай бяспекі БССР Вярхоўнаму Савету БССР. У верасні 1991 г. Савету Міністраў БССР былі падпарадкаваныя пагранічныя войскі дзяржаўнай бяспекі СССР, размешчаныя на тэрыторыі Беларусі. Пачалася праца па стварэнні беларускіх Узброеных Сілаў.

Разам з тым, саюзнае кіраўніцтва рабіла апошнія спробы стрымаць канчатковы развал СССР. На пачатку верасня 1991 г. у Маскве працаваў V з’езд народных дэпутатаў СССР, які так і не здолеў стварыць новы Вярхоўны Савет СССР, паколькі некаторыя рэспублікі накіравалі туды сваіх прадстаўнікоў толькі з правам назірання. Было відавочна, што прапанаваныя Прэзідэнтам СССР М. С. Гарбачовым прынцыпы аб’яднання ў рэспубліках сустрэлі насцярожана. Да таго ж, факт афіцыйнага прызнання 6 верасня 1991 г. незалежнасці трох балтыйскіх рэспублік яшчэ больш умацаваў цэнтрабежныя сілы ў СССР.

Кіраўнікамі Беларусі (С. С. Шушкевіч), Расіі (Б. М. Ельцын) і Украіны (*Л. М. Краўчук*) *8 снежня 1991 г.*былі падпісаны *Белавежскія* або *Віскулёўскія пагадненні* (ад назвы ўрадавай рэзідэнцыі «Віскулі» ў Белавежскай пушчы) аб утварэнні новай саюзнай супольнасці – *Садружнасці Незалежных Дзяржаваў* (СНД) са штаб-кватэрай у Мінску.

10 снежня 1991 г. Вярхоўны Савет БССР ратыфікаваў «Пагадненне аб спыненні існавання СССР і аб стварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД)». Адначасова была прынята пастанова «*Аб дэнансацыі (скасаванні) Дагавора аб утварэнні СССР ад 1922 г.*». Такім чынам наша краіна, як і іншыя былыя савецкія



*Падчас падпісання Віскулёўскіх пагадненняў 8.12.1991 г. Злева направа сядзяць: Л. М. Краўчук, С .С. Шушкевіч, В. Ф. Кебіч, Б. М. Ельцын.*

рэспублікі-заснавальніцы СССР, юрыдычна аформіла выхад з гэтага дзяржаўнага ўтварэння і стала незалежнай дзяржавай. Рашэнні аб дэнансацыі дагавора 1922 г. аб утварэнні СССР прынялі таксама Вярхоўныя Саветы Украіны і Расіі. У выніку СССР спыніў сваё існаванне як геапалітычная рэальнасць.

У выніку падпісання Белавежскіх пагадненняў Беларусь упершыню ў гісторыі была прызнаная Расіяй як самастойная незалежная дзяржава. Дарэчы, сустрэча ў Віскулях адбылася па просьбе прэзідэнта Расіі Б. М. Ельцына. Справа ў тым, што ў Расіі ў той час склалася вельмі напружаная ўнутрыпалітычная сітуацыя, якая магла прывесці да вельмі цяжкіх наступстваў, аж да грамадзянскай вайны. Гэта было таму, што ў Маскве тады знаходзіліся адразу два прэзідэнты: прэзідэнт СССР М. С. Гарбачоў, выбраны 25 сакавіка 1990 г. на з'ездзе народных дэпутатаў, і прэзідэнт Расійскай Федэрацыі Б. М. Ельцын, выбраны 12 чэрвеня 1991 г. у выніку *ўсенародных выбараў*. Спрэчка паміж імі і іх атачэннем магла перарасці ва ўзброены канфлікт, які мог зачапіць і Беларусь. Праз стварэнне СНД гэты канфлікт развязалі і тым самым стварылі маг-

чымасць для «цывілізаванага разводу» дзяржаў-заснавальніц СССР і для пачатку арганізаванага дэмантажу савецка-камуністычнай сістэмы.

Аб жаданні далучыцца да СНД амаль адразу выказалі жаданне Кыргызстан, Арменія, Казахстан. 21 снежня 1991 г. у Алма-Аце кіраўнікі 11-ці незалежных дзяржаў, былых рэспублік СССР (акрамя дзяржаў Балтыі і Грузіі), падпісалі пратакол, у якім яны выступілі ў якасці краін-заснавальніц СНД нароўні з Беларуссю, Украінай і Расіяй. 25 снежня 1991 г. М. С. Гарбачоў афіцыйна абвясціў пра сваю адстаўку з пасады прэзідэнта СССР.

У такіх складаных умовах працягвалася будаўніцтва разнастайных дзяржаўных інстытутаў, неабходных для ўстойлівага функцыянавання незалежнай беларускай дзяржавы. Найперш гэта было стварэнне ўласных Узброеных сіл і арганізацыя дзейнасці ўласнай фінансава-крэдытнай (грашовай) сістэмы.

З сакавіка 1992 г. пачало дзейнічаць Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь, а 6 мая 1992 г. Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь прыняў пастанову «Аб перападпарадкаванні Узброеных Сіл, якія дыслацыруюцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, Міністэрству абароны». Такім чынам, практычна ўсе воінскія падраздзяленні былога СССР, якія знаходзіліся на тэрыторыі нашай краіны, перайшлі ў распараджэнне Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь.

Пачалося складванне ўласнай фінансава-крэдытнай сістэмы. У краіне быў створаны Нацыянальны банк і 34 камерцыйныя банкі. Актыўна працавалі на карысць незалежнай Беларусі Міністэрства замежных спраў краіны, іншыя міністэрствы і ведамствы.

Рэспубліка Беларусь была прызнана міжнароднай супольнасцю як суверэнная дзяржава, якая была адной з краін-заснавальніц ААН. Наша краіна прыцягвала да сябе ўвагу ў свеце сваёй адкрытай унутранай і знешняй палітыкай, няўдзелам у ваенных групоўках і ўзброеных канфліктах, імкненнем стаць бяз'ядзернай нейтральнай дзяржавай.

Разам з тым, ва ўнутрыпалітычным жыцці існавалі некаторыя калізіі, вострыя супярэчнасці па пытаннях аб шляхах далейшага развіцця краіны. Атрымалася так, што пасля палітычных падзей

лета–восені 1991 г. і набыцця краінай незалежнасці, у грамадскай свядомасці складалася ўяўленне, нібыта ў краіне перамаглі нацыянальныя дэмакраты і ўлада ў краіне знаходзіцца ў іх руках.

***Рэферэндум, які не адбыўся.*** У сапраўднасці ўсё заставалася па-ранейшаму: старое кіраўніцтва засталося на сваіх пасадах, хутка прыстасаваўшыся да новых палітычных рэалій. Гэтыя людзі, не будучы самі ні нацыяналістамі, ні дэмакратамі пачалі тлумачыць аб'ектыўнае пагаршэнне жыцця ў 1991–1992 гг. распадам СССР і ўтварэннем незалежнай Беларусі. Разам з тым, адказнасць за эканамічную нестабільнасць улады спрабавалі перакласці на БНФ і іншыя дэмакратычныя партыі, хоць ніхто з прадстаўнікоў гэтых арганізацый не займаў ніякіх кіроўных пасад ва ўрадзе.

Але і дэмакратычныя сілы разумелі, што без зменаў заканадаўства і без персанальных зменаў ва ўладных структурах агульнапалітычная і агульнаэканамічная сітуацыя ў краіне будзе заставацца закансерваванай. Правесці радыкальныя і легальныя змены можна было праз датэрміновыя выбары Вярхоўнага Савета. Было прынятае рашэнне паскорыць выбары новага Вярхоўнага Савета праз рэспубліканскі рэферэндум. Неабходная колькасць галасоў выбаршчыкаў была сабрана: ініцыятыўная група па правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму 13 красавіка 1992 г. перадала ў Цэнтральную выбарчую камісію 446 601 подпіс грамадзян, якія на падставе Закона Рэспублікі Беларусь «Аб народным галасаванні (рэферэндуме) у Рэспубліцы Беларусь» унеслі прапанову аб правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму з фармулёўкай пытання: «Ці лічыце Вы неабходным правядзенне восенню 1992 г. выбараў у вышэйшы орган дзяржаўнай улады Рэспублікі Беларусь на аснове Закона «Аб выбарах народных дэпутатаў Беларусі», праект якога ўнесены апазіцыяй БНФ у Вярхоўным Савеце, і ў сувязі з гэтым датэрміновы роспуск цяперашняга Вярхоўнага Савета?»

29 кастрычніка 1992 г. Вярхоўны Савет Беларусі па надуманых прычынах адмовіў у правядзенні такога рэферэндуму, чым паспрыяў павароту ўнутрыпалітычнага жыцця краіны назад, да кансервацыі савецкіх парадкаў і захавання ўлады ў руках партыйна-савецкай наменклатуры.

Вышэйшы заканадаўчы орган паабяцаў паскорыць працу над новай Канстытуцыяй Беларусі. У парламенце па ініцыятыве выканаўчай улады разгарнулася дыскусія пра тое заставацца Беларусі парламенцкай рэспублікай ці пераходзіць на прэзідэнцкую форму кіравання краінай. Спрэчкі ішлі таксама па пытаннях эканамічнага жыцця, дзяржаўнага будаўніцтва, перспектыў узаемадачыненняў з Расійскай Федэрацыяй і інш.

Нягледзячы на ўнутрыпалітычныя праблемы, жыццё працягвалася: суверэнную Беларусь прызналі не толькі асобныя краіны, але і міжнародная супольнасць. Толькі ў 1992 г. былі ўсталяваны дыпламатычныя адносіны паміж Беларуссю і ЗША, Германіяй, Вялікабрытаніяй, Францыяй, Японіяй, Ізраілем, Польшчай і іншымі краінамі, нармалізаваны адносіны з беларускай дыяспарай, былі падпісаны найважнейшыя міжнародныя дамовы, якія гарантавалі далейшае развіццё Беларусі як мірнай дэмакратычнай дзяржавы.

**3. *Канстытуцыя незалежнай дзяржавы: парламенцкая рэспубліка з пасадай прэзідэнта.*** І пасля падзей 1991 г. у Беларусі працягвала дзейнічаць Канстытуцыя Беларускай ССР 1978 г. З яе быў выключаны артыкул аб «кіруючай і накіроўваючай ролі» камуністычнай партыі ў жыцці грамадства. 27 кастрычніка 1989 г. Вярхоўны Савет БССР унёс змены ў Канстытуцыю, у адпаведнасці з якімі Вярхоўны Савет фактычна ператвараўся ў парламент: ён стаў «вышэйшым пастаянна дзеючым органам дзяржаўнай улады», які мог прымаць да разгляду і вырашаць любое пытанне, якое знаходзілася ў веданні БССР.

Вышэйшай службовай асобай БССР паводле Канстытуцыі быў Старшыня Вярхоўнага Савета БССР, які абіраўся Вярхоўным Саветам з ліку народных дэпутатаў тайным галасаваннем тэрмінам на 5 гадоў і не больш чым на два тэрміны запар. Выканаўча-распарадчая ўлада заставалася за Саветам Міністраў БССР. Старшыня Савета Міністраў (ураду) БССР фарміраваў па даручэнні Вярхоўнага Савета склад Савета Міністраў, уносіў па гэтым пытанні ў Вярхоўны Савет адпаведныя прапановы.

Такім чынам, ужо на пачатак 1990 г. у Канстытуцыі БССР быў зафіксаваны наступны парадак дзяржаўнага ўладкавання: Беларусь – парламенцкая рэспубліка ў складзе СССР. Кіраўніком дзяржавы з'яўляўся Старшыня Вярхоўнага Савета БССР. Камуністычная партыя ўжо тады нідзе «прапісана» не была.

22 чэрвеня 1990 г. Вярхоўны Савет БССР прыняў рашэнне аб утварэнні Канстытуцыйнай камісіі, якая пачала падрыхтоўку праекта новай Канстытуцыі Беларусі. Старшынёй Канстытуцыйнай камісіі традыцыйна з'яўляўся Старшыня Вярхоўнага Савета. Таму першым яе кіраўніком быў М. І. Дземянцей, другім – С. С. Шушкевіч, і апошнім, які і падпісаў Канстытуцыю 15 сакавіка 1994 г., – *М. І. Грыб*.

Сітуацыя ўскладнялася тым, што пасля прыпынення ў жніўні 1991 г. дзейнасці КПБ – КПСС і выхаду Беларусі са складу СССР у краіне ўсталявалася своеасаблівае двоеўладдзе: у адпаведнасці з Канстытуцыяй БССР 1978 г. прадстаўнічую і заканадаўчую ўладу ўзначальваў Старшыня Вярхоўнага Савета, выканаўчую – Старшыня Савета Міністраў. Кожны з іх лічыў сваю пасаду найбольш галоўнай, але ў Канстытуцыі дакладнага вызначэння не было. У такой сітуацыі найбольш зручнай магчымасцю ўмацавання выканаўчай улады было змяненне формы кіравання – увядзенне пасады прэзідэнта як кіраўніка выканаўчай улады. Гэта было магчыма зрабіць якраз у працэсе падрыхтоўкі новай Канстытуцыі. На пасаду прэзідэнта з боку наменклатуры планаваўся Старшыня Савета Міністраў Беларусі *В. Ф. Кебіч*. Дзеля ажыццяўлення гэтага плана ў Вярхоўным Савеце была ўтворана парламенцкая фракцыя «Беларусь», у склад якой увайшлі дэпутаты, што працавалі ў структурах выканаўчай улады ці былі блізкія да іх.

Супраць гэтага, за моцную парламенцкую рэспубліку выступалі прадстаўнікі дэмакратычных сілаў, якія бачылі на прыкладзе іншых дзяржаў – былых рэспублік СССР, што пасада прэзідэнта стварала магчымасці для ўсталявання рэжыму асабістай дыктатуры. Такую пазіцыю падтрымлівалі і некаторыя дэпутаты, што не ўваходзілі ў склад апазіцыі.

Але 5 лютага 1993 г. была прынятая Пастанова Вярхоўнага Са-

вета «Аб праекце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь», паводле якой рабочай групе Канстытуцыйнай камісіі даручалася дапрацаваць праект Канстытуцыі з улікам заўваг дэпутатаў і замацаваць у ім, між іншым, палажэнні аб тым, што дзяржава базіруецца на прынцыпе раздзялення ўладаў; што Беларусь – прэзідэнцкая рэспубліка, у якой прэзідэнт з'яўляецца кіраўнікам выканаўчай улады.

Пад ціскам выканаўчай улады у Вярхоўным Савеце было арганізавана пайменнае галасаванне на працягу трох дзён (24, 25 лютага і 1 сакавіка 1994 г.) спецыяльнымі бюлетэнямі, у выніку якога быў зацверджаны праект Канстытуцыі з пасадай прэзідэнта. Праект Канстытуцыі, які пасля такіх зменаў быў недастаткова збалансаваны, вынеслі на зацвярджэнне Вярхоўнага Савета.

Новая Канстытуцыя Беларусі была прынятая *15 сакавіка 1994 г.* Беларусь абвяшчалася ўнітарнай дэмакратычнай сацыяльнай дзяржавай, якая валодае вяршэнствам і паўнатой улады на сваёй тэрыторыі.Канстытуцыя ўвяла пасаду прэзідэнта і замацавала прынцып падзелу ўлады. Прыняцце Канстытуцыі 15 сакавіка 1994 г. стала важнейшай гістарычнай падзеяй у найноўшай гісторыі Беларусі: упершыню беларускі парламент выказаў сваю палітычную волю ў такім важным пытанні без падказкі з Масквы.

23 чэрвеня 1994 г., у адпаведнасці з новай Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, адбыліся *выбары прэзідэнта Рэспублікі Беларусь*. У першым туры ніхто з прэтэндэнтаў не набраў неабходнай большасці галасоў. У другі тур галасавання прайшлі *А. Р. Лукашэнка* (каля 45 % галасоў) і вышэйзгаданы кіраўнік ураду В. Ф. Кебіч (17 %). Старшыня% БНФ З. С. Пазняк набраў каля 13 % галасоў выбаршчыкаў, С. С. Шушкевіч – 10 %. Прадстаўнік Аграрнай партыі А. І. Дубко атрымаў 6 % галасоў, сакратар Партыі камуністаў В. М. Новікаў – 4 %. У другім туры выбараў, які адбыўся 10 ліпеня 1994 г., перамог А. Р. Лукашэнка (80,3% ад тых, хто ўзяў удзел у галасаванні і 56,7% ад агульнай колькасці выбаршчыкаў), які і стаў першым прэзідэнтам Беларусі.

Першыя прэзідэнцкія выбары прайшлі даволі дэмакратычна, без вялікіх парушэнняў.

**4.** ***Змены ў палітычнай арганізацыі. Рэферэндум 14 мая 1995 г.*** Пасля прыняцця новай Канстытуцыі Беларусь атрымала ўсе падставы і магчымасці будаваць сваю незалежную дзяржаўнасць. Беларусь заставалася парламенцкай рэспублікай з пасадай прэзідэнта. Прэзідэнт з'яўляўся кіраўніком дзяржавы і выканаўчай улады. Прадстаўнічая і заканадаўчая функцыі заставаліся за Вярхоўным Саветам.

Але амаль адразу пасля прэзідэнцкіх выбараў пачало нарастаць супрацьстаянне паміж прэзідэнтам і парламентам. А. Лукашэнка, відавочна, пачаў праводзіць палітыку па ўзмацненні аднаасобнай улады прэзідэнта. Прапагандавалася, што прэзідэнцкая ўлада і ёсць адзіная дзяржаўная ўлада. Пра прынцып падзелу ўладаў гаворка ўжо не вялася. Парламент падаваўся як месца незразумелых для народа спрэчак, як орган, варожы «выбранаму народам прэзідэнту».

Насуперак папярэднім рашэнням Вярхоўнага Савета, а ў некаторых пытаннях і насуперак зафіксаваным у Канстытуцыі палажэнням, А. Лукашэнка ў красавіку 1995 г. унёс у парламент прапанову аб правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму з пытаннямі па змене дзяржаўнай сімволікі, наданні рускай мове статусу дзяржаўнай, больш шчыльнай інтэграцыі з Расіяй і атрыманні права на роспуск парламента.




*Напярэдадні рэферэндуму 1996 г.*

11 красавіка 1995 г. група дэпутатаў Апазіцыі, спрабуючы не дапусціць правядзення гэтага рэферэндуму, большасць пытанняў якога, на іх думку, супярэчыла Канстытуцыі або закону аб рэферэндуме, аб'явілі ў зале пасяджэнняў Вярхоўнага Савета галадоўку пратэсту. Гэта пэўным чынам паўплывала на астатніх дэпутатаў. Першае пытанне аб наданні рускай мове дзяржаўнага статусу роўнага з беларускай, не атрымала падтрымкі большасці. Не набралі патрэбнай колькасці галасоў і прапановы аб змене дзяржаўнай сімволікі і праве прэзідэнта распускаць парламент. Была падтрымана толькі прапанова аб эканамічнай інтэграцыі з Расіяй.

Але ў ноч з 11 на 12 красавіка 1995 г. у залу пасяджэнняў Вярхоўнага Савета, дзе знаходзіліся дэпутаты Апазіцыі, што аб'явілі галадоўку, на загад кіраўніцтва краіны былі ўведзены падраздзяленні спецназа, якія збілі апазіцыйных дэпутатаў і выдалілі іх з будынку парламента. 13 красавіка 1995 г. дэпутацкая большасць Вярхоўнага Савета, запужаная прымяненнем сілы, пагадзілася з прапановай прэзідэнта правесці 14 мая 1995 г. рэферэндум, сумясціўшы яго з выбарамі ў новы Вярхоўны Савет.

Пытанні, вынесеныя на рэферэндум гучалі наступным чынам: «1) Ці згодныя Вы з наданнем рускай мове роўнага статусу з беларускай?; 2) Ці падтрымліваеце Вы прапанову аб устанаўленні новых Дзяржаўнага сцяга і Дзяржаўнага герба?; 3) Ці падтрымліваеце Вы дзеянні Прэзідэнта, накіраваныя на эканамічную інтэграцыю з Расіяй?; 4) Ці згодныя Вы з неабходнасцю ўнясення змяненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, якія прадугледжваюць магчымасць датэрміновага спынення паўнамоцтваў Вярхоўнага Савета Прэзідэнтам у выпадках сістэматычнага або грубага парушэння Канстытуцыі?»

Такім чынам, 14 мая 1995 г. адбыўся першы рэферэндум, які ініцыяваў А. Лукашэнка. Удзел у ім, згодна з афіцыйнымі звесткамі, прыняло 64,8 % грамадзян, якія мелі права голасу. У выніку ўзмоцненай прапрэзідэнцкай агітацыі і прапаганды праз дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі арганізатары рэферэндуму атрымалі большасць галасоў па ўсіх пытаннях, што былі ўнесены ў бюлетэні для галасавання. Выбары ж новага Вярхоўнага Савета, якія

праводзіліся адначасова з рэферэндумам па адных і тых жа акругах, не адбыліся: было абрана толькі 119 дэпутатаў. Цікава і паказальна тое, што ў абсалютнай большасці выбарчых акруг выбары дэпутатаў не адбыліся з прычыны «нізкай яўкі выбаршчыкаў», а рэферэндум у тых самых акругах адбыўся, і яўка там была. Атрымлівалася, што адны і тыя ж людзі бюлетэні па галасаванні на рэферэндуме атрымлівалі, а бюлетэні па выбарах дэпутатаў Вярхоўнага Савета ім не давалі ці яны іх не бралі. Верагодна, што выканаўчая ўлада ў дадзеным выпадку свядома пайшла на зрыў выбараў у парламент.

Такім чынам, рэферэндум 14 мая 1995 г. у Рэспубліцы Беларусь, ініцыяваны прэзідэнтам, выкарыстоўваўся галоўным чынам як сродак барацьбы з палітычнымі супернікамі і апанентамі (Вярхоўны Савет Беларусі і палітычныя партыі дэмакратычнага кірунку) і для выяўлення рэакцыі насельніцтва на ўведзеныя такім чынам змяненні ва ўнутрыпалітычным жыцці краіны. Пасля падліку галасоў было заяўлена, што насельніцтва ў вялікай большасці падтрымала А. Лукашэнку. А тое, што не адбыліся выбары Вярхоўнага Савета, тлумачылася тым, што народ падтрымлівае не парламенцкую, а прэзідэнцкую форму кіравання ў Беларусі. Пасля 14 мая 1995 г. змены палітычнай сістэмы суверэннай Беларусі адбываліся найперш праз правядзенне агульнарэспубліканскіх рэферэндумаў.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Апазіцыя*** (ад лац. *oppositio* – супрацьпастаўленне, пярэчанне) – нязгода, супрацьпастаўленне адных поглядаў, палітыкі іншым; таксама агульная назва партый, арганізацый, грамадскіх рухаў і аб'яднанняў, дзейнасць і погляды якіх супрацьпастаўлены пануючай у грамадстве думцы.

***Дэнансацыя*** – паведамленне адной дзяржавы другой аб скасаванні дзеяння падпісанага паміж імі дагавора.

***Путч*** – дзяржаўны пераварот з удзелам невялікай групы змоўшчыкаў (тайная змова перавароту, якая не ажыццявілася).

***Ратыфікацыя*** – зацвярджэнне органамі вярхоўнай дзяржаўнай ула-

ды міжнароднага дагавора альбо пагаднення, пасля чаго гэты дакумент набывае юрыдычную (прававу́ю) сілу.

***Рэферэндум*** – усенароднае галасаванне па важнейшых пытаннях эканамічнага і сацыяльна-палітычнага жыцця краіны.

***Унітарная дзяржава*** – форма дзяржаўнага ўтварэння, калі краіна з'яўляецца адзінай, непадзельнай з пункту гледжання нацыянальна-дзяржаўнай арганізацыі, падзяляецца на штучна створаныя адміністрацыйныя адзінкі і не мае ў сваім складзе федэратыўных утварэнняў.

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***Кастрычнік 1990 г.*** – Вярхоўны Савет Беларускай ССР прыняў закон «Аб грамадскіх аб'яднаннях».

***Кастрычнік 1990 г.*** – прыняцце Вярхоўным Саветам Беларускай ССР пастановы «Аб пераходзе да рыначных адносін».

***3–4 красавіка 1991 г.*** – забастоўкі ў Мінску.

***17 сакавіка 1991 г.*** – рэферэндум па пытанні захавання СССР.

***19–21 жніўня 1991 г.*** – путч у г. Маскве супраць палітыкі перабудовы.

***25 жніўня 1991 г.*** – Вярхоўны Савет Беларускай ССР прыняў закон «Аб наданні статусу канстытуцыйнага закона Дэкларацыі Вярхоўнага Савета БССР аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі».

***25 жніўня 1991 г.*** – Вярхоўны Савет Беларускай ССР прыняў закон «Аб дэпартызацыі органаў дзяржаўнай улады і кіравання Беларускай ССР, дзяржаўных прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый і нацыяналізацыі ўласнасці Камуністычнай партыі Беларусі» і пастанову «Аб часовым прыпыненні дзейнасці КПБ – КПСС на тэрыторыі БССР».

***25 жніўня 1991 г.*** – Вярхоўны Савет Беларускай ССР прыняў закон «Аб забеспячэнні палітычнай і эканамічнай самастойнасці Беларускай ССР», згодна з якім усе прадпрыемствы, арганізацыі і ўстановы саюзнага падпарадкавання, што размяшчаліся на тэрыторыі рэспублікі, пераводзіліся ва ўласнасць Беларускай ССР.

***19 верасня 1991 г.*** – Вярхоўны Савет Беларускай ССР прыняў закон

«Аб назве Беларускай ССР», у адпаведнасці з якім дзяржава пачала называцца Рэспубліка Беларусь, а ў скарочаным варыянце – Беларусь. Была зацверджана новая дзяржаўная сімволіка: у якасці дзяржаўных сімвалаў былі прыняты нацыянальны бела-чырвона-белы сцяг і герб «Пагоня».

***8 снежня 1991 г.*** – Віскулёўскія (Белавежскія) пагадненні аб дэнансацыі дагавора 1922 г. аб утварэнні СССР і прыняцці рашэння аб стварэнні Садружнасці Незалежных дзяржаў (СНД).

***10 снежня 1991 г.*** – Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь ратыфікаваў «Пагадненне аб спыненні існавання СССР і аб стварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД)». Адначасова была прынятая пастанова «Аб дэнансацыі (скасаванні) Дагавора аб утварэнні СССР ад 1922 г.».

***15 сакавіка 1994 г.*** – прыняцце Вярхоўным Саветам Рэспублікі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

***23 чэрвеня 1994 г.*** – першы тур выбараў прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

***10 ліпеня 1994 г.*** – другі тур выбараў прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Прэзідэнтам краіны абраны А. Р. Лукашэнка.

***14 мая 1995 г.*** – выбары дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь і правядзенне рэспубліканскага рэферэндуму. Паводле афіцыйных звестак, за прапанову аб наданні рускай мове статусу роўнага з беларускай выказалася 83,3 % тых, хто прыняў удзел у галасаванні; за ўсталяванне новага (не нацыянальнага) узору дзяржаўнага сцяга і герба выказалася, адпаведна, 75,1 %; за падтрымку палітыкі прэзідэнта, накіраваную на эканамічную інтэграцыю з Расійскай Федэрацыяй, – 83,3 %.

## ЛІТАРАТУРА

1. Апазіцыя БНФ у Вярхоўным Савеце XII склікання: Дакументы, факты, каментарыі / Укл. і камент. А. В. Кур'яновіча. Смаленск: Інбелкульт, 2015.
2. Беларусь у сацыяльна-эканамічных і грамадска-палітычных працэсах 1946–2006 гг.: Манаграфія / М. П. Касцюк [і інш.]. Мн.: Беларуская навука, 2007.

3. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 2. / М. У. Смяховіч [і інш.]. Мн.: Беларуская навука, 2012.
4. *Голубеў В. Ф.* З гісторыі канстытуцыйнага будаўніцтва ў Беларусі канца XX – пачатку XXI ст. // Białoruskie Zeszyty Historyczne. № 30, Беласток, 2008. – С. 178–206.
5. *Василевич Г. А.* Белорусское государство на рубеже веков. Мн.: Право и экономика, 2007.
6. *Василевич Г. А.* Референдумы в Беларуси и ее путь к независимости в конце XX столетия. Мн.: Молодежное научное общество, 2001.
7. *Новік Я. К., Жданко Л. Ю.* Беларусь у перыяд правядзення рэформ: сучасныя праблемы сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і культурнага развіцця (1985–1995). Мн.: Беларусь, 1995.
8. *Шимов В. Н.* Экономическое развитие Беларуси на рубеже веков: Проблемы, итоги, перспективы. Мн.: БГЭУ, 2003.
9. *Шыбека З.* Нарыс гісторыі Беларусі (1795–2002). Мн.: Энцыклапедыкс, 2003.

# РАЗДЗЕЛ 6.
# САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСІ Ў 1990–2016 гг.

1. *Эканамічнае становішча Беларусі ў першай палове 1990-х гг. Пошук шляхоў пераходу да рынку.*
2. *Праграмы развіцця эканомікі Беларусі. Беларуская мадэль сацыяльна-эканамічнага развіцця.*
3. *Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2016–2020 гг.*
4. *Міжнароднае эканамічнае супрацоўніцтва Беларусі.*

**1.** ***Эканамічнае становішча Беларусі ў першай палове 1990-х гг. Пошук шляхоў пераходу да рынку.*** У канцы 1980-х – пачатку 1990-х гг. усе былыя саюзныя рэспублікі знаходзіліся ў глыбокім эканамічным крызісе. Спробы выхаду з крызісу і пераходу да рынкавых адносін, якія, на думку тагачасных рэфарматараў маглі выправіць гаспадарчую сітуацыю, пачаліся яшчэ падчас знаходжання Беларусі ў складзе СССР. Справа ў тым, што састаўной часткай палітыкі перабудовы 1985–1991 гг. з'яўлялася эканамічная рэформа. Сутнасць яе была ў пашырэнні самастойнасці прадпрыемстваў, перавод іх на поўны гаспадарчы разлік і самафінансаванне і дзяржзаказ, пашырэнне кааперавання, развіццё арэндных адносін, самакіравання і інш.

Але нават падчас палітыкі перабудовы ўлады імкнуліся зрабіць так, каб эканомікай працягвала кіраваць дзяржава – грамадству была прапанавана *мадэль рэгуляванага рынку*. Яна дапускала спалучэнне плана і рынку і была зафіксаваная ў пастанове Вярхоўнага Савета СССР «Аб канцэпцыі пераходу да рэгулюемай рыначнай эканомікі ў СССР» у чэрвені 1990 г. Пераход да рэгуляванай рыначнай эканомікі планавалася пачаць з 1991 г.

13 кастрычніка 1990 г. Вярхоўны Савет БССР прыняў паста-

нову «*Аб пераходзе Беларускай ССР да рынначнай эканомікі*», якой была зацверджана адпаведная праграма, распрацаваная Саветам Міністраў БССР. Праграма пераходу да рынначных адносін прадугледжвала: 1) раздзяржаўленне, прыватызацыю, дэманапалізацыю і развіццё канкурэнцыі; 2) стварэнне банкаўскай сістэмы, бюджэтнага і падаткавага механізмаў, сістэмы цэнаўтварэння; 3) стварэнне рыначнай інфраструктуры – рынку тавараў, капіталу, паслуг, працоўнай сілы і г. д.; 4) сацыяльную абарону насельніцтва ва ўмовах пераходу да рынку; 5) пераадоленне наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

Апошні пункт быў асабліва важны, паколькі праблема Чарнобыля рабілася ўсё больш праблемай толькі Беларусі: пасля распаду СССР грошы на ліквідацыю наступстваў аварыі з саюзнага бюджэту перасталі паступаць. На гэтыя мэты прадугледжвалася выдаткоўваць каля 16 % бюджэту Рэспублікі Беларусь.

Асноўнымі прынцыпамі беларускай праграмы было гарантаванне свабоды прадпрымальніцтва, свабода эканамічнага выбару, свабоднае цэнаўтварэнне, максімальная адкрытасць рынкавай сістэмы Беларусі, суверэннае права рэспублікі распрацоўваць і ажыццяўляць свае законы і нарматыўна-прававыя акты. Але рэзкае павышэнне цэнаў у красавіку 1991 г., забастоўкі працоўных і значныя палітычныя падзеі, якія адбываліся на працягу 1991 г. не дазволілі рэалізаваць гэтую праграму.

Ускладняла рэфармаванне і адсутнасць заканадаўства па шмат якіх пытаннях эканамічнага жыцця. Але ўласная заканадаўчая база так ці інакш распрацоўвалася: у 1990 г. Вярхоўны Савет Беларускай ССР прыняў закон аб уласнасці ў Беларусі, які прадугледжваў наяўнасць прыватнай, калектыўнай і дзяржаўнай уласнасці, у 1991 г. – закон «Аб сялянскай (фермерскай) гаспадарцы», у 1993 г. – закон «Аб праве ўласнасці на зямлю», які таксама прадугледжваў наяўнасць у краіне прыватнай, калектыўнай і дзяржаўнай форм уласнасці.

Аднак рэфармаванне народнай гаспадаркі адбывалася не так хутка, як планавалася, у выніку чаго ў 1991–1993 гг. у краіне рэзка абвастрыўся эканамічны крызіс. У пэўнай ступені ён быў

абумоўлены пераходным працэсам да новай сістэмы гаспадарання, структурнай перабудовай эканомікі, усталяваннем новых гаспадарчых сувязяў. У Савецкім Саюзе Беларусь выконвала ролю так званага *«зборачнага цэха»*: тут завяршаўся цыкл многіх галін прамысловай вытворчасці. З распадам СССР парушыўся і адзіны эканамічны арганізм, мэтанакіравана створаны саюзным урадам; спынілася вытворчасць некаторых прадпрыемстваў, у фінансавай сферы панавала гіперінфляцыя.

Адбываліся спробы вырашаць гаспадарчыя пытанні, у тым ліку і на міжнародным узроўні. Так, у кастрычніку 1991 г. паміж Расіяй, Беларуссю, Арменіяй, Кыргызстанам, Таджыкістанам, Туркменістанам, Узбекістанам, Украінай, Малдовай і Азербайджанам быў падпісаны дагавор аб адзінай эканамічнай прасторы. Ён прадугледжваў правядзенне ўзгодненай палітыкі ў галінах транспарту, энергетыкі, інфармацыі, развіцця прадпрымальніцтва, фінансаў, падаткаў і цэнаў, грашовай і банкаўскай сістэм, мытных правіл і тарыфаў і інш.

Асаблівасцю гаспадарчага развіцця Беларусі ў пачатку 1990-х гг. было тое, што эканоміка краіны была дастаткова моцнай, і крызісныя з’явы тут праявіліся пазней, чым у іншых рэспубліках СССР. У 1990 г. выдаткі дзяржавы на сацыяльна-культурныя мера-



*Здабыча калійнай солі ў Салігорску.*

прыемствы поўнасцю кампенсаваліся прыбыткамі, якія перавышалі выдаткі на 2,6 %. Практычна адсутнічалі беспрацоўе і інфляцыя. У 1991–1992 гг. Паводле індэкса развіцця чалавечага патэнцыялу Беларусь займала 40-е месца сярод 174-х краін свету і адносілася да групы краін з яго высокім узроўнем.

**2.** ***Праграмы развіцця эканомікі Беларусі. Беларуская мадэль сацыяльна-эканамічнага развіцця.*** Апошнім пяцігадовым планам развіцця народнай гаспадаркі БССР быў дванаццаты па ліку план на 1986–1990 гг. Праўда, ён не выконваўся, і на лічбы, зафіксаваныя ў ім, ніхто не звяртаў увагі. Менавіта на гэты час прыпаў першы этап эканамічнай рэформы – перавод прадпрыемстваў на гаспадарчы разлік і самафінансаванне. Але пераход да рынкавых адносін адбываўся стыхійна, без адпаведнай прававой рэгламентацыі. Пачалося *раздзяржаўленне* (*прыватызацыя*) – перадача матэрыяльных аб'ектаў з дзяржаўнай уласнасці ў прыватную.

Паступова фармавалася ўласная заканадаўчая база ў эканамічнай сферы. Былі прыняты законы «Аб прадпрымальніцтве», «Аб прадпрыемствах», «Аб эканамічнай неплацежаздольнасці і банкруцтве» і інш. Але пры змене формы ўласнасці, пры прыватызацыі некаторых прадпрыемстваў адбывалася шмат парушэнняў, рабавалася дзяржаўная маёмасць на карысць невялікай кучкі блізкіх да ўлады людзей, працавалі карупцыйныя схемы.

У 1992 г. выразна праявіліся праблемы ў грашова-фінансавай сферы: па-ранейшаму выкарыстоўваючы расійскі рубель у якасці плацежнага сродку, Беларусь трапіла ў поўную залежнасць ад эканамічнай сітуацыі ў Расійскай Федэрацыі. Каб абараніць сваю эканоміку і спажывецкі рынак ў Беларусі, у студзені 1992 г. была ўведзена купонная сістэма разліку пры набыцці тавараў, а ў чэрвені 1992 г. у якасці асноўнага плацежнага сродку нашай краіны былі ўведзеныя ў абарачэнне разліковыя білеты Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь. У 1994 г. разліковыя білеты Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь былі аб'яўлены адзіным плацежным сродкам на тэрыторыі краіны. Фарміраванне ўласнай фінансава-крэдытнай сістэмы Беларусі набыло незваротны характар.

Але прамысловасць працавала нездавальняльна. Прынцыповай праблемай, якая пагражала эканамічнай бяспецы Беларусі, было пастаяннае нарастанне знешняй запазычанасці. Прычым гэтая запазычанасць Беларусі расла як у адносінах да заходніх крэдытораў, так і ў адносінах да Расійскай Федэрацыі.

Цяжкае становішча ў сферы матэрыяльнай вытворчасці негатыўна адбілася на сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі ўвогуле. У сувязі з гэтым, 30 верасня 1994 г. Вярхоўны Савет Беларусі прыняў *Праграму неадкладных мер па выхаду эканомікі Рэспублікі Беларусь з крызісу*, прапанаваную прэзідэнтам А. Р. Лукашэнкам. З аднаго боку, гэтая Праграма была дастаткова радыкальная: яна прадугледжвала лібералізацыю цэнаўтварэння, аслабленне падаткаў, прыватызацыю, а з другога – строгі кантроль за прыватнай гаспадарчай дзейнасцю. Эканамічнай стратэгіяй краіны быў абвешчаны *«рыначны сацыялізм»*, а спосабам вырашэння задач – дысцыпліна на ўсіх узроўнях вытворчасці.

Праграма прадугледжвала таксама аздараўленне фінансавай і грашова-крэдытнай сістэм, нармалізацыю знешнеэканамічных адносін, стабілізацыю нацыянальнай валюты, сацыяльную падтрымку найменш абароненых слаёў насельніцтва, узмацненне



*На выставе дасягненняў беларускага машынабудавання.*

дзяржаўнага рэгулявання ў эканоміцы, што павінна было прывесці да спынення спаду вытворчасці. Рэалізацыя праграмы дазволіла ў 1994–1995 гг. у пэўнай ступені зменшыць узровень інфляцыі, знізіць дэфіцыт дзяржаўнага бюджэту, затармазіць падзенне ўзроўню жыцця народа, прыпыніць абвальны спад вытворчасці.

***Сацыяльна арыентаваная рынкавая эканоміка.*** У другой палове 1990-х гг. было заяўлена, што Беларусь у гаспадарчым развіцці пераходзіць да мадэлі сацыяльна арыентаванай рынкавай эканомікі, якая павінна будавацца па прынцыпах канстытуцыйных гарантый асабістых правоў і свабод грамадзян, свабоды прадпрымальніцтва, выбару прафесіі і месца працы, роўнасці ўсіх форм уласнасці, гарантыі яе недатыкальнасці і выкарыстання ў інтарэсах асобы і грамадства, забеспячэння ўзаемасувязі дабрабыту работніка і вынікаў яго працы, сацыяльнай абароны непрацаздольных і іншых сацыяльна няўстойлівых слаёў насельніцтва, сацыяльнага партнёрства (паміж дзяржавай, прафсаюзамі і саюзамі прадпрымальнікаў). Сацыяльная арыентацыя рынкавай эканомікі дазваляла, на думку яе стваральнікаў, з аднаго боку, захаваць сацыяльныя гарантыі для людзей, а з другога – выкарыстоўваць рынкавыя механізмы дзеля павышэння эфектыўнасці эканамічнай сістэмы, яе ўспрымальнасці да навукова-тэхнічнага прагрэсу. Дэкларавалася, што, ствараючы ўмовы для рынкавай эканомікі, дзяржава ў сваёй эканамічнай палітыцы будзе імкнуцца да дасягнення такіх прынцыповых мэтаў, як рост дабрабыту народа, высокая ступень занятасці, спрыяльнае для жыцця навакольнае асяроддзе.

У 1996 г. была распрацавана *Нацыянальная стратэгія ўстойлівага развіцця Рэспублікі Беларусь да 2010 г.* Мэтай праграмы стала пабудова *сацыяльна арыентаванай рынкавай эканомікі* на аснове:

- шырокага ўдзелу дзяржавы ў кіраванні эканомікай;
- задавальнення сацыяльных запатрабаванняў у галіне аховы здароўя, культуры, адукацыі;
- прыпынення прыватызацыі;
- адмовы ад ліквідацыі калгасаў;
- адмовы ад фарсіраваных тэмпаў пераходу да фермерскага гаспадарання на вёсцы і інш.

У якасці галоўных задач вылучаліся рост экспарту беларускіх тавараў, будаўніцтва жылля для жыхароў горада і вёскі і інш.

Штуршком для пэўнай стабілізацыі эканомікі паслужыла падпісанне вясной 1996 г. Б. М. Ельцыным і А. Р. Лукашэнкам пагаднення «*Аб задавальненні ўзаемных прэтэнзій Беларусі і Расіі*». Згодна з дакументам, беларускія пазыкі за энерганосьбіты ў памеры 1,4 млрд. амерыканскіх долараў былі спісаныя, і краіны перайшлі да так званага «*нулявога варыянта*». Аднак пры выкананні праграмных палажэнняў былі заўважаны некаторыя негатыўныя фактары. У першую чаргу, гэта аднабаковая прывязанасць эканомікі Беларусі да расійскай эканомікі. Пасля жнівеньскага 1998 г. дэфолту (фінансавага абвалу) у Расіі зменшыліся паказчыкі развіцця і ў Беларусі.

Разам з тым, у канцы 1990-х г. эканамічная сітуацыя ў краіне, у параўнанні з папярэднім перыядам, стабілізавалася, а ў 2005 г. упершыню ўзнік *прафіцыт* бюджэту.

Для стварэння ўмоў прыярытэтнага сацыяльна-эканамічнага развіцця сельскай мясцовасці і павышэння эфектыўнасці працы аграпрамысловага комплексу 25 сакавіка 2005 г. была прынята дзяржаўная *Праграма адраджэння і развіцця сяла на 2005–2010 гг.* Асноўнымі мэтамі Праграмы былі адраджэнне і развіццё сяла на аснове ўмацавання аграрнай эканомікі, павышэнне даходаў сельскага насельніцтва, узроўню сацыяльнага, бытавога і інжынернага ўладкавання сельскіх населеных пунктаў, захаванне і паляпшэнне экалогіі ў іх і рацыянальнае выкарыстоўванне інвестыцый. Планавалася забяспечыць тэхнічнае і тэхналагічнае пераабсталяванне АПК, павялічыць аб’ём валавой унутранай прадукцыі на 45 %, пабудаваць 1480 аграгарадкоў, палепшыць жыллёва-бытавыя ўмовы сельскага насельніцтва. Ставілася задача стварыць устойлівую аграрную эканоміку, якая будзе гарантаваць харчовую бяспеку краіны і падвысіць узровень жыцця сельскага насельніцтва.

Вучоныя вылучаюць сярод характэрных рысаў беларускай мадэлі эканомікі наступныя: дзяржаўнае рэгуляванне эканомікай, захаванне за дзяржавай ключавых галін прамысловасці; прыватызацыю, арыентаваную на пошук эфектыўнага ўласніка,

і павелічэнне вытворчасці; плюралізм формаў уласнасці і формаў гаспадарання; эфектыўную сацыяльную палітыку, адрасную дапамогу слабаабароненым слаям насельніцтва; шматвектарнасць знешнеэканамічнай палітыкі.

Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі прымаюцца на ўведзеных у 1996 г. Усебеларускіх народных сходах. Так, 19–20 кастрычніка 1996 г. на першым Усебеларускім народным сходзе былі прынятыя «Асноўныя напрамкі сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 1996–2000 гг.».

18 мая 2001 г. на другім Усебеларускім народным сходзе была прынятая «Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2001–2005 гг.».

2–3 сакавіка 2006 г. на трэцім Усебеларускім народным сходзе была прынятая «Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2006–2010 гг.».

6–7 снежня 2010 г. – на чацвёртым Усебеларускім народным сходзе была прынятая «Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2011–2015 гг.», дзе адзначалася, што асноўнай мэтай сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2011–2015 гг. з'яўляецца «рост дабрабыту і паляпшэнне ўмоў жыцця насельніцтва на аснове ўдасканалення сацыяльна-эканамічных адносінаў, інавацыйнага развіцця і павышэння канкурэнтаздольнасці нацыянальнай эканомікі».

Дасягненне пастаўленай мэты планавалася ажыццяўляць праз рэалізацыю наступных прыярытэтных напрамкаў: развіццё чалавечага патэнцыялу, уключаючы павышэнне ўзроўню дабрабыту; рост нараджальнасці і павелічэнне працягласці жыцця; умацаванне здароўя грамадзян і павышэнне якасці адукацыі; радыкальную мадэрнізацыю ўсіх сектараў эканомікі; стварэнне новых навукаёмістых і высокатэхналагічных вытворчасцяў; стымуляванне прадпрымальніцтва і дзелавой ініцыятывы; рост экспарту тавараў і паслуг; збалансаванасць і эфектыўнасць знешняга гандлю; развіццё імпартазамяшчальных вытворчасцяў; устойлівае развіццё рэгіёнаў; будаўніцтва якаснага і даступнага жылля; павышэнне эфектыўнасці аграпрамысловага комплексу.



*«Выраблена ў Беларусі». Плакат.*

Было заяўлена, што асноўнымі задачамі сацыяльнай палітыкі дзяржавы з'яўляюцца павышэнне ўзроўню і якасці жыцця насельніцтва, стварэнне ўмоў для развіцця чалавечага патэнцыялу на аснове павышэння эфектыўнасці функцыянавання сістэм аховы здароўя, адукацыі, культуры і іншых відаў дзейнасці, якія адносяцца да сферы паслуг.

Праграмы ў цэлым выконваліся, але на развіцці эканомікі Беларусі адмоўна адбіліся, сярод іншага, наступствы сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу пачатку XXI ст. і празмерная прывязка да расійскай эканомікі і фінансава-крэдытнай сістэмы; энергетычная і знешнегандлёвая залежнасць ад Расійскай Федэрацыі.

Звычайна вылучаюць наступныя асноўныя этапы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь:

• 1991 – першая палова 1995 гг. – перыяд трансфармацыйнага спаду;

• другая палова 1995–2000 гг. – перыяд стабілізацыі і аднаўленчага росту;

• з 2001 г. – перыяд стабільнага сацыяльна-эканамічнага развіцця.

*Важныя дзяржаўныя праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі,* якія выконваліся ці працягваюць выконвацца:

• Дзяржаўная праграма адраджэння і развіцця вёскі на 2005–2010 гг.;

• Дзяржаўная комплексная праграма развіцця рэгіёнаў, малых і сярэдніх гарадскіх пасяленняў на 2007–2010 гг.;

• Дзяржаўная праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця і комплекснага выкарыстання прыродных рэсурсаў Прыпяцкага Палесся на 2010–2015 гг. і інш.

Асноўнымі галінамі прамысловасці Беларусі на сёння з'яўляюцца машынабудаванне і металаапрацоўка, хімічная і нафтахімічная прамысловасць, электраэнергетыка, лёгкая і харчовая прамысловасць, лясная і дрэваапрацоўчая прамысловасць.

У сельскай гаспадарцы развіваюцца жывёлагадоўля, птушкагадоўля, вытворчасць збожжа, бульбы і льну.

**3. *Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2016–2020 гг.*** На пятым Усебеларускім народным сходзе, які адбыўся 22–23 чэрвеня 2016 г. у Мінску было адзначана, што рэалізацыя Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2011–2015 гг. забяспечыла ў краіне захаванне палітычнай стабільнасці, устойлівасці эканомікі і сацыяльнай абароны насельніцтва. Аднак «з-за шэрагу негатыўных знешніх і ўнутраных фактараў» асноўныя прагнозныя паказчыкі не былі дасягнутыя. Агульныя тэмпы развіцця краіны да канца пяцігодкі склаліся ніжэй за запланаваны ўзровень. Гэта запатрабавала прыняцця ўзважаных комплексных мер па пераадоленні негатыўных тэндэнцый.

Задачы на будучую пяцігодку (2016–2020 гг.) былі сфармуляваныя ў *Праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2016–2020 гг.* Адзначана, што новая пяцігадовая праграма накіраваная на фарміраванне ўмоў устойлівага развіцця краіны, на аднаўленне і забеспячэнне далейшага ўстойлівага эканамічнага росту як асновы для паспяховага жыцця будучых пакаленняў.

Галоўная абвешчаная задача на 2016–2020 гг. – павышэнне

якасці жыцця насельніцтва на аснове росту канкурэнтаздольнасці эканомікі, прыцягнення інвестыцый і інавацыйнага развіцця. Для дасягнення пастаўленых мэтаў развіццё краіны павінна грунтавацца на такіх прыярытэтах, як інвестыцыі, што стымулююць рост прадукцыйнасці працы, стварэнне новых працоўных месцаў і фарміраванне цэнтраў апераджальнага рэгіянальнага развіцця; забеспячэнне на гэтай аснове эфектыўнай занятасці людзей і развіцця чалавечага патэнцыялу; рост і дыверсіфікацыя экспарту тавараў і паслуг, забеспячэнне збалансаванасці знешняга гандлю, развіццё інфармацыйнага грамадства і шырокае ўкараненне інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій; усебаковае раскрыццё патэнцыялу моладзі і яе актыўная роля ва ўмацаванні дзяржавы.

Адзначана, што базавым фактарам эканамічнага развіцця ў наступнае пяцігоддзе будзе павышэнне эфектыўнасці кіравання на ўсіх узроўнях, у тым ліку шляхам аптымізацыі функцый дзяржапарату і структуры дзяржаўных актываў. Заахвочванне ініцыятывы і падтрымка прадпрымальніцтва маюць спрыяць стварэнню новых працоўных месцаў, росту дабрабыту грамадзян і іх самарэалізацыі ў інтарэсах беларускага грамадства.

У праграме захавалася згадка пра прынцып сацыяльнай скіраванасці эканомікі. Асноўнымі індыкатарамі ў гэтай сферы павінны стаць рост дабрабыту людзей, паляпшэнне дэмаграфічнай сітуацыі, умацаванне здароўя насельніцтва, развіццё сістэмы адраснай сацыяльнай дапамогі.

Запланавана, між іншым, павышэнне эфектыўнасці і надзейнасці функцыянавання энергасістэмы з улікам уводу ў эксплуатацыю Беларускай АЭС, забеспячэнне патрэбнасці эканомікі рэспублікі і насельніцтва ў энергарэсурсах.

У знешнеэканамічнай дзейнасці прадугледжана павышэнне эфектыўнасці нацыянальнай сістэмы стымулявання і прасоўвання экспарту, яго мытнага адміністравання; пераарыентацыя таварных патокаў на новыя перспектыўныя рынкі пры замацаванні пазіцый на традыцыйных рынках; пашырэнне гандлёва-эканамічных сувязяў з рознымі краінамі, рэгіянальнымі аб’яднаннямі і міжнароднымі эканамічнымі арганізацыямі.

**4. *Міжнароднае эканамічнае супрацоўніцтва Беларусі.*** Рэспубліка Беларусь з часу атрымання незалежнасці дэкларуе імкненне праводзіць шматвектарную палітыку. Пасля ўтварэння СНД у снежні 1991 г. самі абставіны прымусілі найперш ўсталёўваць эканамічныя кантакты з дзяржавамі – былымі рэспублікамі СССР. Найперш гэта былі Расія, Украіна, Літва, Латвія і нашая заходняя суседка – Польшча.

***Беларуска-расійская інтэграцыя.*** У эканамічнай палітыцы 1994–2016 гг. выразна праяўляецца арыентацыя на прыярытэтнае развіццё эканамічных адносін, у першую чаргу, з Расійскай Федэрацыяй. Такая палітыка знайшла сваё найбольш яскравае праяўленне пасля першых прэзідэнцкіх выбараў і рэферэндуму 1995 г., на якім, паводле афіцыйных звестак, за падтрымку палітыкі прэзідэнта, накіраваную на эканамічную інтэграцыю з Расійскай Федэрацыяй выказалася 83,3 % выбаршчыкаў, што прынялі ўдзел у рэферэндуме.

У працэсе рэалізацыі праграмы такога супрацоўніцтва з Расіяй 6 студзеня 1995 г. было падпісана беларуска-расійскае пагадненне аб стварэнні Мытнага саюза. 2 красавіка 1996 г. быў заключаны *Дагавор аб Супольнасці суверэнных дзяржаваў – Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі.* Дагавор прадэкляраваў грамадзянам абедзвюх краін роўныя правы ў атрыманні адукацыі, ахове здароўя, працаўладкаванні, аплаце працы і інш.; 2 красавіка 1997 г. падпісаны *Дагавор аб Саюзе Беларусі і Расіі*, які прадугледжваў забеспячэнне ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця краін, іх бяспекі, абараназдольнасці; 8 снежня 1999 г. – *Дагавор аб стварэнні Саюзнай дзяржавы* Беларусі і Расіі.

Асноўныя знешнепалітычныя задачы на расійскім напрамку – нарошчванне аб'ёмаў беларускага экспарту, эфектыўнае выкарыстанне патэнцыялу непасрэдных сувязяў паміж рэгіёнамі дзвюх краін, паглыбленне кааперацыі, пашырэнне беларускай тавараправоднай сеткі, прыцягненне інвестыцый.

Разам з тым, залежнасць Беларусі ад расійскіх энерганосьбітаў (і коштаў на іх), а таксама шэраг суб'ектыўных чыннікаў не спрыяюць стабільнасці нацыянальнай эканомікі. Крызіс расійскай

эканомікі, які найбольш праявіўся пасля расійска-украінскага ўзброенага канфлікту і пасля анексіі Расіяй паўвострава Крым, негатыўна адбіўся і на эканоміцы Беларусі.

Імкненне беларускіх уладаў пераарыентаваць эканоміку на еўрапейскія рынкі – найбольш яскравае таму сведчанне.

***Эканамічныя адносіны з краінамі СНД***. Галоўным кірункам міжнароднай дзейнасці Рэспублікі Беларусь з'яўляецца ўмацаванне адносін з краінамі СНД. Ключавымі гандлёвымі партнёрамі Беларусі на прасторах СНД з'яўляюцца Украіна, Казахстан, Азербайджан, Туркменістан і Малдова, на долю якіх выпадае больш за 92 % беларускага экспарту ў рэгіёне СНД (без уліку Расіі).

У 2003 г. краінамі СНД была створана арганізацыя рэгіянальнай інтэграцыі. Беларусь, Расія, Украіна і Казахстан падпісалі *Пагадненне аб фарміраванні Адзінай эканамічнай прасторы (АЭП)* з мэтай стварэння зоны свабоднага гандлю.

29 сакавіка 1996 г. Рэспубліка Беларусь падпісала Дагавор аб паглыбленні эканамічнай інтэграцыі чатырох краін («*Мытны саюз*») Рэспублікі Беларусь, Казахстана, Кыргызстана і Расійскай Федэрацыі.

1 студзеня 2012 г. – уступілі ў сілу 17 пагадненняў, якія фарміруюць дагаворна-прававую базу *Адзінай эканамічнай прасторы* Беларусі, Казахстана і Расіі – стварэнне Мытнага Саюза Рэспублікі Беларусь, Рэспублікі Казахстан і Расійскай Федэрацыі.

29 мая 2014 г. прэзідэнтамі Беларусі, Казахстана і Расіі быў падпісаны *Дагавор аб стварэнні Еўразійскага эканамічнага саюза (ЕАЭС)*. У аснову дакумента, як абвясцілі яго стваральнікі, пакладзена дагаворна-прававая база Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы, дзейныя нормы якіх былі аптымізаваныя і прыведзеныя ў адпаведнасць з правіламі Сусветнай гандлёвай арганізацыі.

ЕАЭС – міжнародная арганізацыя рэгіянальнай эканамічнай інтэграцыі, якая валодае міжнароднай правасуб'ектнасцю і заснаваная Дагаворам аб Еўразійскім эканамічным саюзе. У ЕАЭС павінна забяспечвацца свабода руху тавараў, паслуг, капіталу і працоўнай сілы, а таксама правядзенне скаардынаванай, узгодненай або адзінай палітыкі ў галінах эканомікі. Дзяржавамі-членамі

ЕАЭС з'яўляюцца Рэспубліка Арменія, Рэспубліка Беларусь, Рэспубліка Казахстан, Кыргызская Рэспубліка і Расійская Федэрацыя. ЕАЭС створаны ў мэтах усебаковай мадэрнізацыі, кааперацыі і павышэння канкурэнтаздольнасці нацыянальных эканомік і стварэння ўмоў для стабільнага развіцця ў інтарэсах павышэння жыццёвага ўзроўню насельніцтва дзяржаў-членаў.

Дэкляраваныя асноўныя прынцыпы дзейнасці ЕАЭС – супрацоўніцтва на ўзаемавыгаднай аснове для збліжэння эканомік краін-удзельніц, іх гарманічнага развіцця і ўмацавання канкурэнтаздольнасці. Праводзіцца адзіная палітыка ў галіне тарыфнага і нетарыфнага рэгулявання, транспарту і прамысловасці, каардынацыя сельскагаспадарчай палітыкі (у тым ліку ўніфікацыя патрабаванняў, звязаных з развіццём экспарту прадуктаў аграпрамысловасці). Разглядаецца пытанне паэтапнай інтэграцыі энергетычных рынкаў і каардынацыі дзейнасці ў галіне электраэнергетыкі, газу, нафты і нафтапрадуктаў.

***Эканамічныя адносіны з міжнароднымі арганізацыямі і краінамі далёкага замежжа.*** У 1992 г. Рэспубліка Беларусь уступіла ў *Міжнародны банк рэканструкцыі і развіцця (МБРР)*, *Еўрапейскі банк рэканструкцыі і развіцця (ЕБРР), Міжнародны валютны фонд*, *Міжнародную фінансавую карпарацыю (МФК).*

Умацаванню палітычных і эканамічных кантактаў Рэспублікі Беларусь з Еўрасаюзам (ЕС) пэўным чынам садзейнічалі заключаныя *Дагавор аб партнёрстве і супрацоўніцтве з ЕС* (1994 г.) і *Рамачнае гандлёвае пагадненне з ЕС* (1995 г.). У апошнія гады адносіны Беларусі з Еўрасаюзам паляпшаюцца.

У кастрычніку 2010 г. была падпісана першая ў гісторыі Рамачная праграма ААН па аказанні дапамогі ў мэтах развіцця для Рэспублікі Беларусь на перыяд з 2011 па 2015 гг. Гэта дакумент стратэгічнага планавання ўзаемадзеяння Урада Рэспублікі Беларусь з усімі спецыялізаванымі ўстановамі, фондамі і праграмамі сістэмы ААН, якія працуюць у Беларусі. Ён прадугледжвае рэалізацыю ў краіне праектаў міжнароднай тэхнічнай дапамогі на агульную суму ў 490 млн долараў ЗША.

У 2015 г. урад Беларусі сумесна з агенцтвамі сістэмы ААН рас-

працаваў і падпісаў Рамачную праграму ААН (ЮНДАФ) па аказанні дапамогі Рэспубліцы Беларусь у мэтах развіцця на 2016–2020 гг., якая з'яўляецца другім па ліку дакументам, вызначаючым сумесную стратэгію дзейнасці арганізацый сістэмы ААН у Рэспубліцы Беларусь.

У апошнія дзесяцігоддзі на крэдыты МБРР ў Беларусі была праведзена рэканструкцыя аўтамабільных дарог Мінск – Гомель, Мінск – Гродна – мяжа Рэспублікі Польшча, ажыццёўлены праекты «Развіццё сістэм водазабеспячэння і водаадвядзення», «Павышэнне энергаэфектыўнасці ў Рэспубліцы Беларусь» і інш.

Беларусь стала членам ЕБРР у 1992 г. і валодае 6002 акцыямі ЕБРР на суму 60,02 млн. еўра, што складае 0,2 % ад устаўнога капіталу ЕБРР. У 2011–2015 гг. ЕБРР інвеставаў каля 53 % ад агульнага аб'ёму інвестыцый ЕБРР у Беларусі за ўвесь перыяд членства. Сумесна з ЕБРР рэалізуюцца знакавыя інвестыцыйныя праекты ў прыватным сектары: у сферы дрэваапрацоўкі (завод «Кронаспан»), вытворчасці напояў (бровары «Хайнекен»), рухомага саставу (ААТ «Штадлер Мінск»), праграмы фінансавання ўстойлівай энергетыкі, падтрымкі малых і сярэдніх прадпрыемстваў і гандлёвага фінансавання. У дзяржаўным сектары ЕБРР рэалізуе праекты па развіцці сістэм водазабеспячэння і водаачысткі ў гарадах Віцебску, Слоніме і Баранавічах («Беларусь: экалагічны інфраструктурны праект»).

МФК, якая з'яўляецца адной з арганізацый Групы Сусветнага банка і найбуйнейшай установай у галіне глабальнага развіцця за ўвесь час супрацоўніцтва інвеставала больш за 600 млн. долараў ЗША ў 50 інвестыцыйных праектаў па развіцці прадпрыемстваў прыватнага сектара, а таксама па вылучэнні камерцыйным банкам фінансавання для наступнага крэдытавання прадпрыемстваў малога і сярэдняга бізнесу і інш.

Прыярытэтам знешняй палітыкі Беларусі на еўрапейскім вектары з'яўляецца інтэнсіфікацыя партнёрства з краінамі Еўрасаюза ў сферах узаемнага зацікаўлення: гандаль і інвестыцыі, транспарт, транзіт, трансгранічнае і рэгіянальнае супрацоўніцтва, спрашчэнне візавага рэжыму, ахова навакольнага асяроддзя.

Беларусь пашырае эканамічнае супрацоўніцтва з больш далёкімі партнёрамі: найперш гэта Аб'яднаныя Арабскія Эміраты, Аргенты-

на, Бразілія, Венесуэла, В'етнам, Егіпет, Індыя, Іран, Кітай, Куба, ПАР, Сірыя, Японія. Ёсць планы выхаду і замацавання на рынках дзяржаў, якія маюць значны патэнцыял для ўзаемакарыснага супрацоўніцтва з Беларуссю (Ангола, Балівія, Інданезія, Катар, Кот-д'Івуар, Малайзія, Нігерыя, Нікарагуа, Пакістан, Саудаўская Аравія, Тога, Філіпіны, Эквадор, Эфіопія і іншыя).

Паскарэнне працэсаў інтэграцыі Беларусі ў сусветную эканоміку з'яўляецца важнай передумовай для паспяховай сістэмнай трансфармацыі яе эканомікі і далейшага прагрэсу чалавечага патэнцыялу. Пра гэта гаварылася і ў праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2011–2015 гг. Так, адзначана, што прыярытэтам знешняй палітыкі Беларусі на еўрапейскім вектары стане інтэнсіфікацыя партнёрства з краінамі Еўрапейскага саюза ў сферах гандлю і інвестыцый, транспарту, транзіту, трансгранічнага і рэгіянальнага супрацоўніцтва, спрашчэння візавага рэжыму, аховы навакольнага асяроддзя. Пэўныя вынікі па рэалізацыі гэтай праграмы ёсць.

Важным вектарам знешнеэканамічнай дзейнасці з'яўляецца аднаўленне прысутнасці на традыцыйных рынках, у першую чаргу Расійскай Федэрацыі і ЕАЭС, рост экспарту ў Еўрапейскі саюз, засваенне і замацаванне беларускіх вытворцаў на новых нішах сусветнага рынку.

У лік найважнейшых напрамкаў знешнеэканамічнай дзейнасці ў бягучым пяцігоддзі ўваходзіць развіццё эканамічнай інтэграцыі ў рамках ЕАЭС. *Дыверсіфікацыя знешніх рынкаў* будзе ажыццяўляцца шляхам асваення рынкаў краін Еўрапейскага саюза, ЗША, Лацінскай Амерыкі, Усходняй Азіі, Бліжняга Усходу і Афрыкі, актывізацыі супрацоўніцтва з Кітаем і Індыяй.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Валавы ўнутраны прадукт (ВУП)*** – абагульнены эканамічны статыстычны паказчык; паказвае сукупны кошт усіх тавараў і паслуг, створаных у межах краіны як рэзідэнтамі, так і нерэзідэнтамі. З'яўляецца адным з базавых паказчыкаў эканамічнага развіцця краіны.

***Еўразійскі эканамічны саюз (ЕАЭС)*** – міжнароднае інтэграцыйнае

эканамічнае аб'яднанне, створанае на базе Мытнага саюза ЕўрАзЭС, які існаваў да 2014 года.

***Інтэграцыя*** – (*integratio* – аднаўленне, папаўненне), працэс і вынік узаемасувязі, узаемадзеяння, збліжэння і аб'яднання ў адзінае цэлае якіх-небудзь частак, элементаў – краін, іх эканомік, сацыяльных і палітычных структур, культур, сацыяльных і палітычных груп, партый, рухаў, арганізацый і г. д.

***Планавая эканоміка*** – характарызуецца адсутнасцю вольнага механізму фарміравання попыту і прапановы.

***Рынкавыя адносіны*** – сукупнасць эканамічных адносін паміж суб'ектамі рынка адносна перамяшчэння тавараў і грошай, якія заснаваны на ўзаемнай згодзе, эквівалентнасці і канкурэнцыі.

***Рыначная эканоміка*** – эканамічная сістэма, у якой вытворчасць і распаўсюджанне прадуктаў і паслуг выконваецца праз механізм свабоднага рынку, якім кіруе свабодная цэнавая сістэма.

***Сацыяльна арыентаваная мадэль рыначнай эканомікі*** – дапускае плюралізм форм уласнасці, большую ступень удзелу дзяржавы ў забеспячэнні эфектыўнасці эканомікі, рэгуляванні прыбыткаў насельніцтва і яго занятасці, задавальненні шэрага найбольш значных сацыяльных запатрабаванняў (адукацыя, ахова здароўя, культура і г. д.).

***Усебеларускі народны сход*** – агульны сход прадстаўнікоў беларускага ўраду, кіраўнікоў прадпрыемстваў і прадстаўнікоў іншых галінаў гаспадаркі. Адбываецца кожныя пяць гадоў, звычайна перад чарговымі прэзідэнцкімі выбарамі. На сход на безальтэрнатыўнай аснове вылучаюцца дэлегаты з усіх рэгіёнаў Беларусі. На Усебеларускіх народных сходах прымаюцца праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі. Мажлівасць склікання «рэспубліканскага сходу» замацавана ў Законе «Пра рэспубліканскія і мясцовыя сходы».

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***29 сакавіка 1996 г.*** – Рэспубліка Беларусь падпісала Дагавор аб паглыбленні эканамічнай інтэграцыі чатырох краін («Мытны саюз») Рэспублікі Беларусь, Казахстана, Кыргызстана і Расійскай Федэрацыі.

***30 верасня 1994 г.*** – Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь прынятая Праграма неадкладных мер па выхаду эканомікі Рэспублікі Беларусь з крызісу, прапанаваная прэзідэнтам А. Р. Лукашэнкам.

***2 красавіка 1997 г.*** – Дагавор аб стварэнні *Саюза Беларусі і Расіі.* Яго неад'емнай часткай стаў Статут Саюза Беларусі і Расіі, якім прадугледжваецца забеспячэнне ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі і Расіі, іх бяспекі, абароназдольнасці, узаемавыгаднага супрацоўніцтва з краінамі Еўропы і свету.

***25 снежня 1998 г.*** – у г. Маскве адбылося падпісанне прэзідэнтамі Беларусі і Расіі «*Дэкларацыі аб далейшым яднанні двух народаў*».

***8 снежня 1999 г.*** – падпісанне «*Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі*» і Праграмы дзеянняў па рэалізацыі гэтага Дагавора.

***Сакавік 2005 г.*** – прыняцце дзяржаўнай Праграмы адраджэння і развіцця сяла на 2005–2010 гг.

***1 студзеня 2012 г.*** – уступілі ў сілу 17 пагадненняў, якія фарміруюць дагаворна-прававую базу Адзінай эканамічнай прасторы Беларусі, Казахстана і Расіі – стварэнне *Мытнага Саюза* Рэспублікі Беларусь, Рэспублікі Казахстан і Расійскай Федэрацыі.

***29 мая 2014 г.*** – у г. Астане прэзідэнтамі Беларусі, Казахстана і Расіі падпісаны Дагавор аб стварэнні ЕАЭС.

## ЛІТАРАТУРА

1. Асноўныя палажэнні праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2016–2020 гг. Праект // Звязда. 10.06.2016.
2. *Василевич Г. А.* Белорусское государство на рубеже веков. Мн.: Право и экономика, 2007.
3. *Гусаков В. Г.* Основные принципы программы совершенствования агропромышленного комплекса Республики Беларусь на 2001–2005 гг. // Белорусский экономический журнал. 2001. № 2. С. 50–62.
4. *Демчук М. И., Юркевич А. Т.* Республика Беларусь: системные принципы устойчивого развития. Минск: РИВШ БГУ, 2003.
5. *Крывічаніна К. А.* Навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва Беларусі з краінамі ЕС і СНД (1991–2000 гг.). Мн.: Беларуская навука, 2014.

6. Основные направления социально-экономического развития Республики Беларусь на 1996–2000 годы. Мн., 1996.
7. *Никитенко П. Г.* Модель устойчивого социально-экономического развития Беларуси: проблемы формирования и эволюции. Мн.: Право и экономика, 2000.
8. *Сакович В. С.* Сельское хозяйство Республики Беларусь в 1980–2007 гг.: тенденции развития. Мн.: Белорусская наука, 2008.
9. *Шимов В. Н.* Экономическое развитие Беларуси на рубеже веков: Проблемы, итоги, перспективы. Мн.: БГЭУ, 2003.

# РАЗДЗЕЛ 7.
# БЕЛАРУСЬ НА МІЖНАРОДНАЙ АРЭНЕ Ў 1990 – 2016 гг.

1. *Станаўленне дзяржаўнай незалежнасці і канцэпцыя знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь.*
2. *Шматвектарнасць знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь.*
3. *Беларусь і міжнародныя арганізацыі.*
4. *Двухбаковыя і шматбаковыя адносіны Беларусі з краінамі свету.*
5. *Рэспубліка Беларусь і дыяспара.*

**1. *Станаўленне дзяржаўнай незалежнасці і канцэпцыя знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь.*** Да стварэння незалежнай Рэспублікі Беларусь само паняцце «*знешняя палітыка Беларусі*» адсутнічала, што адлюстроўвала яе поўную залежнасць ад Маскоўскага цэнтру. Нават у канстытуцыях БССР нічога не гаварылася пра знешнюю палітыку гэтай саюзнай рэспублікі. Упершыню толькі ў Канстытуцыі Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі 1978 г. было адзначана, што БССР у *знешнепалітычнай дзейнасці* «кіруецца мэтамі, задачамі і прынцыпамі, вызначанымі Канстытуцыяй СССР».

З гэтага вынікае, што Беларусь, хоць і была адной з краін-заснавальніц Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, не праводзіла, знаходзячыся ў складзе СССР уласнай, нацыянальна-дзяржаўнай знешняй палітыкі. Знешнюю палітыку СССР вызначала Масква. БССР як саюзнай рэспубліцы было дазволена толькі праводзіць «знешнепалітычную дзейнасць» – выконваць на міжнароднай арэне другасную ролю «падыгрывання» маскоўскім знешнепалітычным гульцам. Такім чынам, БССР на міжнароднай арэне да атрымання дзяржаўнай незалежнасці ажыццяўляла ў асноўным толькі дапаможную дзейнасць у ажыццяўленні *знешняй палітыкі СССР*.

На такую дзейнасць і было скіравана Міністэрства замежных

спраў (МЗС) Беларусі, утворанае 24 сакавіка 1944 г. (да 1946 г. – Народны камісарыят замежных спраў Беларускай ССР). Яно было невялікім і выконвала таксама прадстаўнічыя функцыі (найперш у ААН і некаторых іншых міжнародных арганізацыях). Але МЗС было важнай для нашай краіны ўстановай – у выніку яго дзейнасці міжнародная супольнасць ведала, што, хоць і ў складзе СССР, у свеце існуе дзяржава пад назвай Беларусь.

Упершыню пра тое, што Беларусь мае права на правядзенне ўласнай знешняй палітыкі і будзе такую палітыку ажыццяўляць было заяўлена ў вышэйзгаданай *Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР,*прынятай Вярхоўным Саветам БССР 27 ліпеня 1990 г. Дзяржаўны суверэнітэт трактаваўся ў Дэкларацыі як самастойнасць і паўната дзяржаўнай улады рэспублікі ў межах яе тэрыторыі і незалежнасць у знешніх адносінах. Было заяўлена, што мэтай БССР з’яўляецца ператварэнне яе тэрыторыі ў *бяз’ядзерную зону*, а рэспублікі – у *нейтральную дзяржаву*. Адзначалася, што БССР будзе самастойна ажыццяўляць права на саюзы з іншымі краінамі і на свабодны выхад з гэтых саюзаў.

З 25 жніўня 1991 г., пасля надання Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР статусу канстытуцыйнага закона гэтыя палажэнні сталі асноватворчымі ў распрацоўцы *канцэпцыі знешняй палітыкі дзяржавы.*

Разам з тым, на першым этапе станаўлення Беларусі як суверэннай дзяржавы і выхаду яе ў такім статусе на міжнародную арэну, былі пэўныя складанасці. Яны заключаліся ў падыходах «старых» еўрапейскіх краін і ЗША да пытання пра існаванне СССР. Справа ў тым, што і Еўропа і ЗША былі не супраць таго, каб СССР працягваў існаваць, але ўжо не як таталітарная камуністычная, а як дэмакратычная краіна. Нацыянальна-дзяржаўныя памкненні былых рэспублік СССР яны, калі і разумелі, то не падтрымлівалі, баючыся, што гэта можа стварыць ваенныя (ядзерная зброя была не толькі на тэрыторыі Расіі, але і ў Беларусі і Украіне), эканамічныя (узровень жыцця ў еўрапейскіх краінах і ЗША быў значна вышэйшы, і ліквідацыя савецкіх граніц магла адкрыць туды дарогу некантралюемай эканамічнай эміграцыі) і палітычныя (з адной краінай

працей дамаўляцца, чым з пятнаццаццю былымі рэспублікамі СССР) праблемы для Еўропы.

Большасць еўрапейскіх дзяржаў захоўвалі своеасаблівы дыпламатычны нейтралітэт у адносінах да Беларусі і пасля таго, як яна надала Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце статус канстытуцыйнага закона. Толькі Польшча ў пачатку верасня 1991 г. аб'явіла аб прызнанні Беларусі як суверэннай дзяржавы.

Але ўжо у кастрычніку 1991 г. Беларусь падпісала важныя міждзяржаўныя пагадненні са сваімі заходнімі і паўночнымі суседзямі: Дэкларацыю аб добрасуседстве, узаемадапамозе і супрацоўніцтве з Польшчай і Дэкларацыю аб прынцыпах добрасуседскіх адносін з Літвой. У гэтых дакументах краіны падкрэслілі, што непарушнасць граніц з'яўляецца важным фактарам стабільнасці ў Еўропе. У дэкларацыі з Польшчай Беларусь прызнала непарушнасць граніц, усталяваных 16 жніўня 1945 г.

Пасля ўтварэння ў снежні 1991 г. СНД і вызначэння Мінска як горада, у якім будзе размешчана штаб-кватэра Садружнасці, пачаўся перыяд міжнароднага прызнання Рэспублікі Беларусь. Сярод першых дзяржаў свету, якія прызналі незалежнасць Беларусі і ўстанавілі з ёй дыпламатычныя адносіны, былі Украіна і ЗША (27 і 28 снежня 1991 г. адпаведна). На працягу 1992 г. адбылося поўнае міжнароднае прызнанне Рэспублікі Беларусь. Сёння наша краіна падтрымлівае дыпламатычныя адносіны са 174 дзяржавамі свету і прадстаўлена замежнымі ўстановамі ў 56 дзяржавах свету.

Такім чынам, нягледзячы на аб'ектыўныя цяжкасці, Рэспубліка Беларусь пасля атрымання незалежнасці змагла пабудаваць адносіны са знешнім светам, не перапусціўшы сваіх нацыянальных інтарэсаў. Гэта дазволіла нашай краіне ўпэўнена і эфектыўна прасоўваць ды адстойваць свае знешнепалітычныя мэты і прыярытэты.

***Канцэпцыя знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь.*** Канцэпцыя знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь распрацоўвалася ў змаганні розных палітычных сіл краіны: парламента, партый (найперш БНФ і КПБ), асобных інстытутаў і грамадзян. Вядучым палітычным інстытутам, які займаўся гэтай праблемай, быў Вярхоўны Савет Беларусі. Прававой асновай падрыхтоўкі такой канцэпцыі стала

Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце БССР, а пасля 1994 г. – Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь.

У Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце змяшчаўся шэраг палажэнняў, якія датычыліся міжнароднага становішча Беларусі і яе знешнепалітычнай дзейнасці. Упершыню на такім высокім узроўні было заяўлена аб тым, што рэспубліка з'яўляецца «паўнапраўным і незалежным членам сусветнай супольнасці». Тэрыторыя рэспублікі абвяшчалася непадзельнай і недатыкальнай. Усе пытанні аб межах павінны былі вырашацца на аснове ўзаемнай згоды з пагранічнымі дзяржавамі шляхам заключэння адпаведных дагавораў, якія падлягалі ратыфікацыі Вярхоўным Саветам краіны. Дэкларавалася права на ўласныя ўзброеныя сілы, унутраныя войскі, органы дзяржаўнай бяспекі. Ставілася мэта ператварэння Беларусі ў бяз'ядзерную зону і нейтральную дзяржаву. Адзначалася, што БССР самастойна ажыццяўляе правы на добраахвотныя саюзы з іншымі дзяржавамі і свабодны выхад з гэтых саюзаў.

2 кастрычніка 1991 г. Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прыняў Заяву «*Аб прынцыпах знешнепалітычнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь*». У ёй пацвярджалася прыхільнасць краіны прынцыпам Статута ААН, Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, а таксама міжнародным абавязацельствам, якія былі прыняты Беларуссю ў адпаведнасці з падпісанымі ёй міжнароднымі дагаворамі. Адзначалася гатоўнасць Беларусі далучыцца да Заключнага акта Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе (НБСЕ), пачаць перагаворы аб знішчэнні ядзернай зброі і абвяшчэнні еўрапейскага кантынента бяз'ядзернай зонай. Прынцыпамі знешнепалітычнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь абвяшчаліся агульнапрызнаныя прынцыпы і нормы міжнароднага права.

У Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь ад 15 сакавіка 1994 г. таксама змяшчаліся палажэнні, якія вызначалі асновы беларускай знешняй палітыкі. Адзначалася, што Беларусь прызнае прыярытэт агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права і забяспечвае адпаведнасць ім уласнага заканадаўства. У арт. 8 было зафіксавана: «Не дапускаецца заключэнне міжнародных дагавораў, якія супярэчаць Канстытуцыі». У Асноўным законе краіны таксама

падкрэслівалася, што Рэспубліка Беларусь у сваёй знешняй палітыцы зыходзіць з прынцыпаў роўнасці дзяржаў, непрымянення сілы або пагрозы сілай, непарушнасці межаў, мірнага ўрэгулявання спрэчак, неўмяшання ва ўнутраныя справы і іншых агульнапрызнаных прынцыпаў і нормаў міжнароднага права. У Канстытуцыі зноў дэкларавалася мэта зрабіць Беларусь бяз’ядзернай зонай і нейтральнай дзяржавай.

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь у рэдакцыі ад 24 лістапада 1996 г. была дапоўнена палажэннем аб тым, што «Рэспубліка Беларусь у адпаведнасці з нормамі міжнароднага права можа на добраахвотнай аснове ўваходзіць у міждзяржаўныя ўтварэнні і выходзіць з іх. Не дапускаецца заключэнне міжнародных дагавораў, якія супярэчаць Канстытуцыі». Відавочна, што гэтае палажэнне было ўнесена спецыяльна для абгрунтавання «канстытуцыйнасці» інтэграцыйных працэсаў паміж Беларуссю і Расійскай Федэрацыяй, якія актывізаваліся ў той перыяд. Такім чынам у 1990–1996 гг. былі вызначаны і заяўлены асноўныя прынцыпы, мэты і задачы знешняй палітыкі незалежнай Беларусі.

Рэалізоўваліся гэтыя прынцыпы і задачы праз канцэпцыю знешнепалітычнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь. Праект дакумента з такой назвай разглядаўся ў Вярхоўным Савеце Рэспублікі Беларусь у сярэдзіне 1992–1993 гг., але нават не выносіўся на зацвярджэнне: з аднаго боку ішла барацьба паміж незалежніцкімі




*Чыгуначны вакзал у Брэсце: вароты ў Еўропу.*

і прамаскоўскімі сіламі, з другога – было зразумела, што канцэпцыя павінна была адпавядаць новай Канстытуцыі краіны, праца над якой ішла да завяршэння.

У Канстытуцыі Рэспубліцы Беларусь 1994 г. было зафіксавана, што Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь вызначае асноўныя напрамкі ўнутранай і знешняй палітыкі дзяржавы, а прэзідэнт як кіраўнік выканаўчай улады прадстаўляе дзяржаву ў адносінах з іншымі краінамі і міжнароднымі арганізацыямі. Але ў рэальнасці пасля ўвядзення інстытута прэзідэнцкай улады і абрання прэзідэнта цэнтр распрацоўкі, прыняцця і рэалізацыі знешнепалітычных рашэнняў перайшоў да яго. Паводле Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь варыянта 1996 г., прэзідэнт з'яўляецца гарантам рэалізацыі асноўных напрамкаў унутранай і знешняй палітыкі.

У дакладзе «Знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь у новым свеце», з якім А. Р. Лукашэнка выступіў у ліпені 2004 г. на нарадзе з кіраўнікамі замежных устаноў Беларусі, было падкрэслена, што асновай знешняй палітыкі Беларусі з'яўляюцца дзяржаўны суверэнітэт і незалежнасць. Вектары знешняй палітыкі Беларусі, па яго словах, – «там, дзе ляжаць яе інтарэсы».

*Асноўныя прынцыпы, мэты і задачы знешняй палітыкі* Рэспублікі Беларусь замацаваныя ў Законе «Аб зацвярджэнні Асноўных напрамкаў унутранай і знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь» ад 14 лістапада 2005 г. У адпаведнасці з ім, міжнародная актыўнасць Беларусі накіравана, у першую чаргу, на *забеспячэнне бяспекі дзяржавы і абарону нацыянальных інтарэсаў ад любых знешніх выклікаў і пагроз,* садзейнічанне фарміраванню спрыяльных умоў дзеля стабільнага эканамічнага развіцця краіны і павышэння дабрабыту грамадзян.

Важнай умовай знешняй палітыкі Беларусі з'яўляецца яе раўнапраўная інтэграцыя ў сусветную палітычную, эканамічную і культурную прастору.

**2.** ***Шматвектарнасць знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь.*** Геаграфічнае становішча Рэспублікі Беларусь, на тэрыторыі якой сыходзяцца найбольш важныя транспартныя шляхі паміж Еўропай і Азіяй, і няпростая гісторыя краіны, якая адчула на сабе

разбуральныя вынікі шматлікіх еўрапейскіх войнаў і канфліктаў, абумовілі курс на шматвектарнасць знешняй палітыкі Беларусі.

*Шматвектарнасць* знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь з'яўляецца фундаментальным прынцыпам знешнепалітычнай дзейнасці краіны. Ён заключае ў сабе развіццё збалансаваных канструктыўных адносін з партнёрамі ў розных рэгіёнах свету. На шляху наладжвання дыялогу і ўзаемакарыснага супрацоўніцтва з імі Беларусь кіруецца прынцыпамі прагматызму і паслядоўнасці, узаемнай павагі, раўнапраўя, неўмяшання ва ўнутраныя справы, адмовы ад націску і прымусу.

У сваёй знешнепалітычнай дзейнасці Беларусь прадэкляравала стратэгію «роўнай набліжанасці» да Усходу і Захаду, што павінна дазваляць найбольш эфектыўна выкарыстоўваць геапалітычнае і геастратэгічнае становішча краіны як своеасаблівага «моста паміж Еўропай і Азіяй». Дзякуючы гэтаму маецца на мэце праводзіць збалансаваную палітыку з далёкімі і блізкімі партнёрамі, пры неабходнасці выступаць у якасці краіны – палітычнага ці эканамічнага пасярэдніка. Так, Беларусь імкнецца стаць краінай-пасярэднікам для некаторых краін Азіі на іх эканамічным шляху ў Еўропу. Сталіца Беларусі стала месцам, дзе 5 верасня 2014 г. былі падпісаны пагадненні (*Мінскі пратакол*, *Мінскія пагадненні*) аб спыненні ўзброеных дзеянняў паміж Расіяй і Украінай на тэрыторыі Данецкай і Луганскай абласцей Украіны.

У ліку галоўных задач знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь на сённяшні дзень – фарміраванне на новай аснове адносін з дзяржавамі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Рэч у тым, што пасля правядзення ў 1996 г. у Рэспубліцы Беларусь рэферэндуму па змене формы кіравання дзяржавай, унясенні ў Канстытуцыю адпаведных змяненняў і пасля адмовы аб спыненні (ці прыпыненні) на тэрыторыі Беларусі практыкі смяротнага пакарання (гэта адна з абавязковых умоў для таго, каб краіна магла быць прынятай у Савет Еўропы) узровень палітычных дачыненняў Беларусі з агульнаеўрапейскімі арганізацыямі і, увогуле, з краінамі-членамі Еўрапейскага Саюза значна панізіўся. Афіцыйныя кантакты паміж краінамі Еўрапейскага Саюза і Беларуссю былі «замарожаныя», Беларусь

была пазбаўлена статусу «спецыяльна запрошанай краіны» у Савеце Еўропы.

Апошнім часам адносіны краін Еўрапейскага Саюзу і ЗША да Беларусі відавочна паляпшаюцца. Так, прынятае прынцыповае рашэнне аб павялічэнні колькасць супрацоўнікаў пасольства ЗША ў Мінску, паступова адмяняюцца санкцыі ў адносінах да беларускіх афіцыйных асоб з боку Еўрасаюза. Прычынай гэтага, хутчэй за ўсё, з'яўляецца не толькі адносная дэмакратызацыя жыцця ўнутры краіны, але і прыхільнасць Беларусі да асноўных агульнаеўрапейскіх каштоўнасцяў, агульных прынцыпаў пасляваеннага ўладкавання Еўропы, заснаваных найперш на нязменнасці пасляваенных граніц. Прынцыповая пазіцыя Беларусі, якая мае палітычна-дзяржаўны саюз з Расійскай Федэрацыяй, аб непрызнанні анексіі Расіяй Крыма, выклікала павагу і разуменне ва ўсім свеце.

*Прыярытэтнымі кірункамі знешняй палітыкі* з'яўляюцца ўзаемадачыненні з дзяржавамі-суседзямі, а таксама адносіны з дзяржавамі постсавецкай прасторы, з краінамі Еўрапейскага Саюзу, Злучанымі Штатамі Амерыкі і інш.

Гаворачы пра шматвектарнасць знешнепалітычнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь, нельга разумець яе як раскіданасць па розных напрамках. Пры неабходнасці дзяржава ўдакладняе тыя ці іншыя кірункі дзейнасці, канцэнтруе свае знешнепалітычныя намаганні на найбольш важных ў дадзены гістарычны момант і перспектыўных вектарах.

**3.** ***Беларусь і міжнародныя арганізацыі.*** На сённяшні дзень у Рэспубліцы Беларусь маюць прадстаўніцтва 15 міжнародных арганізацый. Заключаць пагадненні з імі наша краіна пачала адразу пасля атрымання поўнай незалежнасці. 1992 г. быў годам шырокага далучэння Беларусі да еўрапейскай і сусветнай супольнасці. Так, 30 студзеня 1992 г. Рэспубліка Беларусь была прынята ў члены Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе (НБСЕ). 26 лютага 1992 г. адбылося падпісанне Рэспублікай Беларусь *Заключнага акта Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе* (Хельсінкскага заключнага акта). З гэтага моманту яна не толькі

стала раўнапраўным удзельнікам хельсінкскага працэсу, але і нясе разам з іншымі дзяржавамі адказнасць за захаванне міру і бяспекі ў Еўропе. 23 мая 1992 г. Рэспубліка Беларусь, Казахстан і Украіна заключылі ў г. Лісабоне са ЗША пагадненне аб тым, што яны бяруць на сябе абавязацельства знішчыць альбо перадаць Расіі ўсе стратэгічныя ядзерныя боегалоўкі і тым самым далучыцца да дагавору 1963 г. аб непашырэнні ядзернай зброі.

У 1992 г. Беларусь вывела са сваёй тэрыторыі тактычную ядзерную зброю; 4 лютага 1993 г. у якасці *бяз'ядзернай дзяржавы* яна далучылася да Міжнароднага дагавора аб нераспаўсюджанні ядзернай зброі, а ў лістападзе 1996 г. быў цалкам завершаны вывад ракетна-ядзернай зброі з тэрыторыі краіны.

5 снежня 1994 г. на нарадзе лідараў Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (АБСЕ) у г. Будапешце быў падпісаны *Мемарандум аб гарантыях бяспекі і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі, Украіне і Казахстана.* Дакумент падпісалі ЗША, Вялікабрытанія, Расія і Беларусь.

11 студзеня 1995 г. Рэспубліка Беларусь далучылася да праграмы НАТО «*Партнёрства дзеля міру*». У 1996 г. Беларусь уступіла ў Цэнтральнаеўрапейскую ініцыятыву.

Традыцыйна Беларусь прымае ўдзел у *дзейнасці Арганізацыі Аб'яднаных Нацый*. У Рэспубліцы Беларусь функцыянуюць 11 прадстаўніцтваў праграм, агенцтваў і арганізацый сістэмы ААН. Гэта – Міжнародная арганізацыя працы, Сусветная арганізацыя аховы здароўя, Дзіцячы фонд міру і інш.

Вялікую дапамогу міжнародная супольнасць аказвае Беларусі ў справе ліквідацыі наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

**4.** ***Двухбаковыя і шматбаковыя адносіны Беларусі з краінамі свету.*** Беларусь сёння – суверэнная еўрапейская дзяржава, якая імкнецца праводзіць самастойную знешнюю палітыку і актыўна развівае супрацоўніцтва з замежнымі партнёрамі, найперш з дзяржавамі-суседзямі.

***Беларусь і краіны СНД.*** Развіццё двухбаковых адносін з краінамі СНД з'яўляецца адным з асноўных знешнепалітычных

і знешнеэканамічных прыярытэтаў Рэспублікі Беларусь. Гэтая прыярытэтнасць, паводле беларускіх уладаў, абумоўлена сукупнасцю гістарычных, эканамічных, палітычных і культурных фактараў.

Беларусь імкнецца да пабудовы ўзаемавыгадных адносін з дзяржавамі-ўдзельнікамі СНД. Пры гэтым найважнейшай сферай супрацоўніцтва з'яўляецца гандлёва-эканамічнае ўзаемадзеянне. Па выніках 2014 г. тавараабарот з краінамі СНД (без уліку Расіі) склаў 8,2 млрд. долараў ЗША.

Асноўнымі гандлёвымі партнёрамі для Беларусі на постсавецкай прасторы з'яўляюцца Украіна, Казахстан, Малдова, Туркменістан і Азербайджан, на долю якіх выпадае больш за 95 % беларускага экспарту ў рэгіёне СНД (без уліку Расіі).

Беларусь супрацоўнічае с былымі краінамі СССР таксама ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза (ЕАЭС), дагавор аб якім уступіў у сілу з 1 студзеня 2015 г.; Мытнага саюза. Удзельнічае яна і ў *Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы (АДКБ)* (Рэспубліка Беларусь падпісала Пагадненне аб калектыўнай бяспецы паміж краінамі СНД у лютым 1995 г.). Як неаднаразова заяўлена, у рамках АДКБ Рэспубліка Беларусь садзейнічае умацаванню Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы па ўсіх напрамках яе дзейнасці (палітычным, ваенным, ваенна-тэхнічным, інфармацыйным); у прыватнасці, развіццю супрацоўніцтва ў галіне барацьбы з наркатрафікам, нелегальнай міграцыяй, міжнароднай арганізаванай злачыннасцю; прадухіленню надзвычайных сітуацый; умацаванню каардынацыі дзеянняў дзяржаў-удзельніц Арганізацыі; наладжванню канструктыўнага ўзаемадзеяння АДКБ з іншымі міжнароднымі аб'яднаннямі.

***Беларусь–Расія.*** З самым буйным, паводле тэрыторыі і насельніцтва, нашым суседам, Расійскай Федэрацыяй, супрацоўніцтва будуецца на *саюзнай аснове.*

24 верасня 1993 г. было заключана беларуска-расійскае пагадненне пра вывядзенне з тэрыторыі Рэспублікі Беларусь расійскіх войскаў.

6 студзеня 1995 г. – адбылося падпісанне беларуска-расійскага пагаднення аб стварэнні *Мытнага саюза*. 21 лютага 1995 г. – быў



*А. Р. Лукашэнка*
*і Б. М. Ельцын, 1994 г.*

падпісаны *Дагавор аб дружбе, добрасуседстве і супрацоўніцтве паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй.* 2 красавіка 1996 г. быў падпісаны *Дагавор аб Супольнасці суверэнных дзяржаў* – Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі. Гэты дагавор павінен быў забяспечыць грамадзянам абедзвюх краін роўныя правы ў атрыманні адукацыі, ахове здароўя, працаўладкаванні, аплаце працы і іншых галінах.

Праз год, 2 красавіка 1997 г. у Маскве быў падпісаны *Дагавор аб Саюзе Беларусі і Расіі*, а 8 снежня 1999 г. – дагавор аб стварэнні *Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі.* Менавіта апошні дагавор быў абвешчаны прававой асновай беларуска-расійскай інтэграцыі. У адпаведнасці з яго палажэннямі, Беларусь і Расія паставілі перад сабой шэраг важных арыенціраў: «забеспячэнне мірнага і дэмакратычнага развіцця народаў дзвюх дзяржаў; стварэнне адзінай эканамічнай і мытнай прасторы; забеспячэнне ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця; правядзенне ўзгодненай знешняй палітыкі і палітыкі ў сферы абароны; фарміраванне адзінай прававой сістэмы; правядзенне ўзгодненай сацыяльнай палітыкі; забеспячэнне бяспекі і барацьба са злачыннасцю».

Кіраўніцтва Рэспублікі Беларусь зацікаўлена ў максімальнай рэалізацыі патэнцыялу стратэгічнага партнёрства ў адносінах з Расійскай Федэрацыяй як на двухбаковым узроўні, так і ў рамках Саюзнай дзяржавы ды іншых інтэграцыйных структур на постсавецкай прасторы. Цеснае супрацоўніцтва дзвюх дзяржаў, як яно

лічыць, абумоўлена геаграфічнымі, геапалітычнымі, гістарычнымі фактарамі, узаемадапаўняльнасцю эканомік, кааперацыйнымі сувязямі паміж прадпрыемствамі.

Будуючы ўзаемакарыснае супрацоўніцтва з Расіяй, Беларусь імкнецца няўхільна прытрымлівацца прынцыпу безумоўнага захавання суверэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасці дзяржаў, адказнага выканання імі сваіх міжнародных абавязкаў.

29 сакавіка 1996 г. Рэспубліка Беларусь падпісала Дагавор аб паглыбленні эканамічнай інтэграцыі чатырох краін («Мытны саюз») Рэспублікі Беларусь, Казахстана, Кыргызстана і Расійскай Федэрацыі. Дзяржавы-члены Мытнага саюза пайшлі далей па шляху інтэграцыі і ў канцы 2010 года падпісалі пакет пагадненняў, якія складаюць дагаворна-прававую базу *Адзінай эканамічнай прасторы.*

Добрыя адносіны ў Беларусі склаліся з Грузіяй, Венесуэлай. Асноўныя напрамкі развіцця міжнародных адносін – актывізацыя палітычнага і эканамічнага ўзаемадзеяння з традыцыйнымі партнёрамі (ААЭ, Аргенціна, Бразілія, Венесуэла, В’етнам, Егіпет, Індыя, Іран, Кітай, Куба, ПАР, Сірыя, Японія), наладжванне дыялогу і актыўны выхад і замацаванне на рынках дзяржаў, якія маюць значны патэнцыял для ўзаемакарыснага супрацоўніцтва (Ангола, Аўстралія, Балівія, Інданезія, Камбоджа, Катар, Калумбія, Лаос, Малайзія, Мазамбік, Манголія, Нігерыя, Нікарагуа, Пакістан, Перу, Сірыя, Судан, Шры-Ланка, Эквадор, Эфіопія і інш.).

Важным напрамкам знешнепалітычнай актыўнасці Беларусі з’яўляецца шматбаковая дыпламатыя, супрацоўніцтва ў рамках міжнародных арганізацый.

**5. *Рэспубліка Беларусь і дыяспара.*** Прынцыповае значэнне для нашай дзяржавы мае забеспячэнне абароны правоў і свабод яе грамадзян за мяжою, захаванне беларускага этнасу па-за тэрыторыяй краіны. *Дыяспара* – рассяленне, пражыванне значнай часткі этнасу па-за межамі этнічнай тэрыторыі. Беларусы рознымі шляхамі аказваліся за межамі сваёй Бацькаўшчыны: гэта і масавая эміграцыя падчас і пасля першай сусветнай вайны, масавы выезд на заробкі насельніцтва з Заходняй Беларусі ў перыяд 1921–1939 гг.,

эміграцыя падчас і пасля Другой сусветнай вайны, эміграцыя сучасная, як эканамічная, так і палітычная. Шмат беларусаў было саслана ў Расію пасля нацыянальна-вызваленчых паўстанняў XIX ст., многія ў якасці бежанцаў апынуліся на тэрыторыі Расіі пасля Першай і Другой сусветных войнаў і не вярнуліся дадому. Не ўсе вярнуліся і з тых, хто быў прымусова вывезены на працу ў Германію. Не ўсе ваеннапалонныя захацелі вярнуцца ў сталінскі Савецкі Саюз. У пасляваенныя гады сотні тысяч грамадзян Беларусі апынуліся за мяжой Бацькаўшчыны пасля далучэння Беласточчыны да Польшчы і падчас узаемнай рэпатрыяцыі палякаў з Беларусі ў Польшчу і беларусаў з Польшчы ў Беларусь, у выніку прымусовых высяленняў кулакоў і «ворагаў народа» у Сібір ды іншыя рэгіёны СССР. Нямала беларусаў апынулася на тэрыторыі былых рэспублік СССР, куды выязджалі на новабудоўлі, асваенне цалінных зямель, былі адпраўленыя па размеркаванні пасля завяршэння навучання ў тэхнікумах, інстытутах і ўніверсітэтах.

Прыхільнікі БНР, якія не вярнуліся ў Савецкую Беларусь, прадстаўнікі пасляваенная беларускай эміграцыі змаглі арганізавацца ў замежжы і захаваць сваю нацыянальна-культурную ідэнтычнасць. У розных краінах Еўропы, Амерыкі, у Аўстраліі існуюць беларускія нацыянальныя, культурніцкія, рэлігійныя арганізацыі, якія аб’ядноўваюць беларусаў, што жывуць там. Беларусы маюць свае культурныя, навуковыя і навучальныя цэнтры, цэрквы, выдавецтвы.

Найбольшая колькасць беларусаў жыве ў Расіі (1 млн. 200 тыс.), ва Украіне – 460 тыс. беларусаў, у Латвіі – 120 тыс., у Літве – 63 тыс., у Польшчы – каля 300 тыс. беларусаў. У ЗША жыве каля 650 тыс. выхадцаў з Беларусі. Прыкладна 70 тыс. беларусаў жыве ў Канадзе. Ёсць згуртаванні беларусаў і ў краінах Заходняй Еўропы – Англіі, Францыі, Італіі, Даніі, Бельгіі і інш. Беларускія згуртаванні існуюць таксама ў Аўстраліі і краінах Лацінскай Амерыкі – Аргенціне, Бразіліі, Парагваі, Уругваі і інш. Лічыцца, што ўсяго за межамі Рэспублікі Беларусь пражывае прыкладна 3–3,5 млн. беларусаў.

Значная частка беларускай эміграцыі аб’ядноўваецца вакол Рады Беларускай Народнай Рэспублікі (старшыня Рады *І. Сурвіла*), якая грунтуецца на прынцыпах незалежнасці нашай дзяржа-



*Старшыня Рады БНР*
*Івонка Сурвіла*




*Выдатны дзеяч беларускай*
*эміграцыі Янка Запруднік.*

вы. Урад БНР існуе ў эміграцыі з 1919 г. і дзейнічае ў якасці цэнтра кансалідацыі для шмат каго з беларусаў за мяжою, асабліва ў Паўночнай Амерыцы і Заходняй Еўропе.

У Беларусі пытаннямі дыяспары, акрамя Міністэрства замежных спраў, займаецца міжнародная грамадская арганізацыя «Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына«. Арганізацыя дзейнічае з 1990 г. і цяпер аб'ядноўвае арганізацыі беларускай дыяспары болей чым з 20 краін свету.

Асноўныя мэты дзейнасці РГА «ЗБС «Бацькаўшчына» наступныя: адраджэнне Беларусі як суверэннай дзяржавы, краіны-маці для ўсіх беларусаў свету, кансалідацыя беларусаў як нацыі, роўнай сярод роўных у сусветнай супольнасці, выхаванне нацыянальнай свядомасці беларусаў, клопат пра духоўнае і фізічнае захаванне беларускай нацыі; спрыянне росту павагі беларусаў да сваёй гісторыі, культуры і мовы, любові да роднай зямлі; духоўнае, арганізацыйнае, эканамічнае яднанне ў адзіную супольнасць усіх беларусаў, што жывуць па-за межамі Беларусі і на Бацькаўшчыне, захаванне і паглыбленне іх беларускасці; мацаванне дружбы з іншымі народамі, узаемнай зацікаўленасці, пазнанне гісторыі, культуры краін, дзе жывуць беларусы, выхаванне павагі да людзей іншых нацыянальнасцяў, якія жывуць з беларусамі на іх Бацькаўшчыне. Першым Прэзідэнтам ЗБС «Бацькаўшчына»

ў 1990 г. быў абраны наш выдатны пісьменнік і грамадскі дзеяч, вышэйзгаданы В. У. Быкаў. МГА «ЗБС «Бацькаўшчына» арганізоўвае з'езды беларусаў свету раз на 4 гады, пачынаючы з 1993 г. Першы з'езд беларусаў свету прайшоў 8–10 ліпеня 1993 г. у г. Мінску, шосты з'езд – 23–24 ліпеня 2013 г.

У чэрвені 2014 г. у Беларусі быў прыняты закон «Аб беларусах замежжа», якім вызначаецца дзяржаўная палітыка Рэспублікі Беларусь у галіне адносін з беларусамі замежжа і рэгулююцца ўзаемадачыненні паміж асобамі, якія пастаянна пражываюць за межамі Рэспублікі Беларусь і ідэнтыфікуюць сябе як беларусы або з'яўляюцца выхадцамі з тэрыторыі сучаснай Рэспублікі Беларусь, і іх арганізацыямі.

У законе адзначана, што дзяржаўная палітыка ў галіне адносін з беларусамі замежжа павінна садзейнічаць стварэнню ўмоў для вывучэння беларусамі замежжа беларускай мовы, нацыянальнай гісторыі і культуры; адкрыццю і дзейнасці культурных цэнтраў Рэспублікі Беларусь у краінах пражывання беларусаў замежжа; дзейнасці існуючых і стварэнню новых арганізацый культуры, навуковых арганізацый, а таксама арганізацый, якія ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць для беларусаў замежжа ў Рэспубліцы Беларусь і за яе межамі, у тым ліку забеспячэнню іх вучэбнымі праграмамі, падручнікамі, вучэбнымі і вучэбна-метадычнымі дапаможнікамі для выкладання беларускай мовы, нацыянальнай гісторыі і культуры за межамі Рэспублікі Беларусь; культурнаму і адукацыйнаму абмену паміж Рэспублікай Беларусь і грамадскімі аб'яднаннямі (арганізацыямі) беларусаў замежжа; рэалізацыі права на адукацыю ў Рэспубліцы Беларусь, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, і інш.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Грамадзянства*** – прававая прыналежнасць асобы да дзяржавы.

***Дыяспара*** **–** частка народа (этнаса), якая пражывае па-за краінай свайго паходжання, утварае згуртаваныя і ўстойлівыя этнічныя групы ў краіне пражывання.

***Еўразійскі эканамічны саюз*** *(ЕАЭС)* – міжнароднае інтэграцыйнае эканамічнае аб’яднанне, створанае на базе Мытнага саюза ЕўрАзЭС.

***Знешняя палітыка*** **–** сукупнасць адносін з іншымі дзяржавамі і міжнароднымі структурамі.

***Міжнародныя адносіны*** – сукупнасць палітычных, эканамічных, дыпламатычных, ваенных, культурных, навукова-тэхнічных сувязяў і ўзаемаадносін паміж народамі, дзяржавамі і аб’яднаннямі дзяржаў.

***Нейтральная дзяржава*** – дзяржава, знешнепалітычны курс якой характарызуецца няўдзелам ва ўзброеных канфліктах і ваенных саюзах.

***Саюз Беларусі і Расіі*** – міждзяржаўнае аб’яднанне Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі з высокай ступенню палітычнай і эканамічнай інтэграцыі, утворанае 2 красавіка 1997 г. і 25 снежня 1999 г.

***Эміграцыя*** – выезд грамадзян са сваёй Бацькаўшчыны ў іншыя краіны на пастаяннае або доўгае пражыванне па палітычных, рэлігійных, эканамічных, этнічных ці іншых прычынах, а таксама ў выпадку сацыяльных (войны, рэвалюцыі) або прыродных катаклізмаў.

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***2 красавіка 1996 г.*** – Рэспубліка Беларусь падпісала Дагавор паміж Расіяй і Беларуссю аб утварэнні Супольнасці Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі. Дагавор прадэклараваў грамадзянам абедзвюх краін роўныя правы ў атрыманні адукацыі, ахове здароўя, працаўладкаванні, аплаце працы і інш.

***Снежань 1999 г.*** – падпісанне Беларуссю і Расіяй Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы.

***2000 г.*** – стварэнне з удзелам Беларусі Еўразійскага эканамічнага супольніцтва (ЕўрАзЭС)

***2007 г.*** – падпісанне Дагавора аб стварэнні адзінай мытнай тэрыторыі і фарміраванніі Мытнага саюзу паміж Беларуссю, Расіяй і Казахстанам.

***2009 г.*** – пачатак удзелу Беларусі ў праграме «Усходняе партнёрства».

***2011 г.*** – падпісанне Беларуссю, Расіяй і Казахстанам Дэкларацыі аб еўразійскай эканамічнай інтэграцыі.

***2014 г.*** – узнік Еўразійскі эканамічны саюз (ЕАЭС) – міжнароднае інтэграцыйнае эканамічнае аб’яднанне, створанае на базе Мытнага саюза ЕўрАзЭС.

## ЛІТАРАТУРА


1. *Демчук М. И., Юркевич А. Т.* Республика Беларусь: системные принципы устойчивого развития. Мн.: РИВШ БГУ, 2003.
2. *Крывічаніна К. А.* Навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва Беларусі з краінамі ЕС і СНД (1991 –2000 гг.). Мн.: Беларуская навука, 2014.
3. *Снапковский В. Е.* История внешней политики Беларуси. Мн.: БДУ, 2013.
4. *Снапкоўскі У. Е.* Беларуская дыпламатыя ў XX ст. – асэнсаванне знешнепалітычнага вопыту БНР, БССР і Рэспублікі Беларусь // Беларускі гістарычны сшытак = Białoruskie Zeszyty Historyczne. № 16, Беласток, 2001. С. 141–151.
5. *Снапкоўскі У. Е.* Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі. У 2 ч. Ч. 2. Ад канца канца XVIII да пачатку XXI ст. Мн.: БДУ, 2004.
6. Рэспубліка Беларусь. 20 год незалежнасці: Зб. матэрыялаў Міжнар. навук.-практ. канф., Мн., 24–25 лістап. 2011 г. / Рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]. Мн.: Беларуская навука, 2012.
7. *Шимов В. Н.* Экономическое развитие Беларуси на рубеже веков: Проблемы, итоги, перспективы. Мн.: БГЭУ, 2003.

# РАЗДЗЕЛ 8.
# ІДЭАЛОГІЯ, НАВУКА І АДУКАЦЫЯ БЕЛАРУСІ Ў 1990–2016 гг. УЗАЕМАДЗЕЯННЕ ДЗЯРЖАВЫ І КАНФЕСІЙ.

*1. Ідэалогія беларускай дзяржавы.*
*2. Развіццё нацыянальнай сістэмы адукацыі.*
*3. Развіццё нацыянальнай навукі.*
*4. Узаемадзеянне дзяржавы і канфесій.*

**1. *Ідэалогія беларускай дзяржавы.*** *Ідэалогія* – сістэма ідэй, якія ўспрымаюцца і прызнаюцца грамадствам у якасці асноватворных каштоўнасных і маральных арыенціраў, вакол якіх аб’ядноўваецца грамадства, альбо значная яго частка. *Ідэалогія беларускай дзяржавы* – гэта сістэма ведаў аб гісторыі фармавання і развіцця беларускай нацыі, станаўлення і ўмацавання беларускай дзяржаўнасці, аб асноватворчых прынцыпах, на якіх трымаецца беларуская нацыя і дзяржава.

Ідэалогія дзяржавы, ці дзяржаўная ідэалогія, з’яўляецца афіцыйным вучэннем і накіравана з аднаго боку, на выхаванне насельніцтва на тых прынцыпах, якія падзяляе партыя, ці іншая група людзей, што ажыццяўляе ў дадзены момант паўнамоцтвы па кіраванню краінай; з другога боку – афіцыйная ідэалогія накіравана на абгрунтаванне правільнасці выбранага ўладнай групоўкай палітычнага, эканамічнага, культурнага і да т. п. курса і палітыкі, з дапамогай якой гэты курс ажыццяўляецца. У беларускіх рэаліях змест дзяржаўнай ідэалогіі не заўсёды супадае з паняццем *нацыянальная ідэалогія*. Разам з тым, гістарычны досвед паказвае, што ў падмурку дзяржаўнай ідэалогіі нацыянальнай дзяржавы можа ляжаць толькі *нацыянальная ідэя*.

Нацыянальная ідэалогія беларускай дзяржаўнасці базуецца

на разуменні гістарычнага паходжання і развіцця беларускага этнасу, непарушнасці права беларускага народа на ажыццяўленне ўласнай нацыянальнай дзяржаўнасці. Найвышэйшыя каштоўнасці такой ідэалогіі – дзяржаўны суверэнітэт для тытульнай нацыі, а таксама рэальная, заканадаўчая магчымасць для ўсіх жыхароў краіны рэалізоўваць свае нацыянальныя і палітычныя правы, роўнасць усіх перад законам. Прынята лічыць, што на палітычным узроўні ідэалогія набывае форму ідэалагічнай дактрыны, якая з'яўляецца светапогляднай асновай ідэалогіі дзяржавы ў канкрэтных гістарычных умовах. Наша ідэалагічная дактрына існуе ў форме беларускай нацыянальнай ідэі, асноўным зместам якой з'яўляюцца такія фундаментальныя паняцці, як агульначалавечыя хрысціянскія каштоўнасці, нацыянальна-дзяржаўная самасвядомасць, грамадзянскасць, патрыятызм.

Прававой асновай як дзяржаўнай, так і нацыянальнай ідэалогіі ў нашай краіне з'яўляецца Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь. У Прэамбуле Асноўнага закона краіны адзначаецца, што яе прымае народ Рэспублікі Беларусь «грунтуючыся на сваім неад'емным праве на самавызначэнне, абапіраючыся на шматвяковую гісторыю развіцця беларускай дзяржаўнасці…». Трэба, аднак, зазначыць, што ў арт. 4 Канстытуцыі запісана, што «дэмакратыя ў Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляецца на аснове разнастайнасці палітычных інстытутаў, ідэалогій і поглядаў».

Верагодна, што працэс афармлення ідэалогіі беларускай дзяржавы яшчэ цалкам не завяршыўся. Нацыянальная дзяржаўнасць працягвае развівацца і ўмацоўвацца: выразна відаць імкненне да падтрымкі нацыянальнага складніка беларускай дзяржаўнасці ў значнай колькасці насельніцтва і магчымасці ў кіраўніцтва дзяржавы замацаваць гэтае імкненне праз пашырэнне ўжывання беларускай мовы ў жыцці беларускай дзяржавы і беларускага грамадства, задавальненне цікавасці грамадства да ўласнай гісторыі, нацыянальнай сімволікі.

Афармленне дзяржаўнай ідэалогіі ішло паралельна з афармленнем і ўмацаваннем рэальнай беларускай дзяржаўнасці і таму адчувала прыблізна аднолькавы ўнутры- і знешнепалітычны ўціск, пе-

ражывала адны і тыя ж складанасці. Хоць унутрыпалітычнае жыццё ў краіне пасля 1991 г. праходзіла пад знакам «дэідэалагізацыі» – адмовы ад спадчыны таталітарнага грамадства і камуністычнай ідэалогіі, – у рэальнасці ўсё было больш складана, бо «разбурэнне» камуністычнай ідэалогіі ажыццяўлялі ўчарашнія яе ідэолагі, і сумніўна, што яны з задавальненнем бурылі створанае імі самімі.

Сутнасць беларускай ідэі на сёння – разуменне таго, што ўсе мы беларусы і разам упершыню рэальна ажыццяўляем сваё гістарычнае права на нацыянальную дзяржаўнасць – дзяржаўнасць у форме ўнітарнай дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавы, якая мае назву Рэспубліка Беларусь.

**2. *Развіццё нацыянальнай сістэмы адукацыі.*** Падчас знаходжання Беларусі ў складзе СССР адбылося некалькі рэформаў сістэмы адукацыі. Нельга адназначна сцвярджаць, што яны мелі выключна негатыўныя наступствы. Нярэдка агульныя вынікі былі якраз станоўчымі: ліквідавалася непісьменнасць, якасць навучання ў школах, сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установах узрастала, рыхтавалася ўсё больш спецыялістаў. Разам з тым, галоўным недахопам савецкай адукацыйнай сістэмы была яе празмерная русіфікаванасць, ідэалагізаванасць, аўтарытарнасць навучальна-выхаваўчага працэсу, падпарадкаванасць ідэі пабудовы камунізму.

Але з пачаткам перабудовы ўжо ў другой палове 1980-х гг. сталі ажыццяўляцца новыя падыходы да рэфармавання сістэмы адукацыі:

– курс на стварэнне нацыянальнай сістэмы адукацыі;

– дэмакратызацыя, павышэнне самастойнасці навучальных устаноў;

– інтэграцыя адукацыі з навукай, вытворчасцю і культурай.

Прынцып плюралізму ў адукацыі прывёў да стварэння побач з сярэднімі адукацыйнымі школамі навучальных устаноў новага тыпу – *гімназій, ліцэяў, каледжаў* і інш. Характэрная рыса гімназіі – прыярытэт гуманітарнага кампанента, г.зн. глыбокае вывучэнне моў, літаратуры, гісторыі, логікі, рыторыкі, асноў эканомікі,

філасофіі, права, рэлігіязнаўства і іншых псіхолага-педагагічных і сацыяльна-гуманітарных дысцыплін.

З набыццём незалежнасці нашай краіны задача фарміравання *нацыянальнай сістэмы адукацыі* стала запатрабаванай грамадствам. У пачатку 1990-х гг. здавалася, што ўсё для гэтага ёсць: нацыянальная дзяржава, маладое дэмакратычнае кіраўніцтва, асноўная заканадаўчая база. Яшчэ *26 студзеня 1990 г.*Вярхоўны Савет БССР XI склікання прыняў закон «*Аб мовах у Беларускай ССР*», у якой абвясціў*беларускую мову дзяржаўнай мовай рэспублікі*. Разам з тым, закон прадугледжваў права свабоднага карыстання рускай мовай як мовай нацыянальных зносін, свабоднае развіццё і ўжыванне іншых нацыянальных моў.

У верасні 1990 г. Савет Міністраў БССР прыняў *Дзяржаўную праграму развіцця беларускай мовы і іншых нацыянальных моў у Беларускай ССР*. Пачаўся паступовы пераход да навучання на беларускай мове. Цалкам перавесці навучанне на беларускую мову ў агульнаадукацыйных школах планавалася паэтапна, на працягу дзесяці гадоў. Але моўная сітуацыя рэзка змянілася пасля правядзення ініцыяванага А. Р. Лукашэнкам рэферэндуму 1995 г., у выніку якога рускай мове ў Беларусі фармальна быў нададзены статус роўнай з беларускай.

У 1990-я гг. у Беларусі пачала праводзіцца рэформа агульнаадукацыйнай школы, звязаная з *пераходам на 12-гадовы тэрмін навучання ў сярэдняй школе*. Яна прадугледжвала ў т. л. пераход да абавязковай 10-гадовай базавай школы. Сярэднюю адукацыю можна было атрымаць у апошніх, 11-м і 12-м, класах ці праз прафесійную адукацыю. Адначасова атрымаць прафесійна-тэхнічную і сярэднюю спецыяльную падрыхтоўку можна было ў *прафесійна-тэхнічных вучылішчах*.

Сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы забяспечвалі падрыхтоўку кадраў для гаспадаркі і культуры. Частка тэхнікумаў была пераўтворана ў *каледжы*, дзе адначасова ажыццяўлялася падрыхтоўка спецыялістаў сярэдняй кваліфікацыі і спецыялістаў павышанага ўзроўню.

У 1990–1991 гг. адчыніліся першыя *гімназіі і ліцэі*. Гімназіі ўзніка-

лі на базе сярэдніх школ, а ліцэі, як правіла, ствараліся пры вышэйшых навучальных установах (ВНУ). Іх задачай была падрыхтоўка найбольш здольных вучняў для паступлення і паспяховай вучобы ў ВНУ.

У 1991 г. Вярхоўны Савет Беларусі прыняў закон «*Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь»,* які вызначаў асноўныя палажэнні па арганізацыі сістэмы адукацыі ў краіне.

З другой паловы 1990-х гг. агульнаадукацыйная школа Беларусі знаходзілася ў стадыі інтэнсіўнага рэфармавання, якое прадугледжвала пераход на 10-гадовую абавязковую адукацыю, на пачатковае навучанне дзяцей з шасцігадовага ўзросту. У перыяд з 1998 па 2002 гг. ажыццявіўся пераход пачатковай школы на навучанне дзяцей з шасцігадовага ўзросту.

У працэсе разбудовы нацыянальнай сістэмы адукацыі было заўважнае імкненне зрабіць так, каб вышэйшая школа Беларусі адпавядала асноўным стандартам вышэйшай адукацыі развітых краін свету. Таму з пачатку 1990-х гг. пачаўся паўсюдны перавод на новыя формы вышэйшых навучальных устаноў. Інстытуты былі ператвораны ва ўніверсітэты і акадэміі. У ВНУ пачаўся пераход да шматузроўневай сістэмы падрыхтоўкі: бакалаўр – магістр; уводзіліся новыя вучэбныя курсы, пашырылася гуманітарызацыя вышэйшай адукацыі, пачалося больш інтэнсіўнае вывучэнне айчыннай і сусветнай гісторыі.

У 2011 г. быў прыняты «*Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі*». Кодэкс заснаваны на дзейных законах («Аб адукацыі», «Аб прафесійна-тэхнічнай адукацыі», «Аб адукацыі асоб з асаблівасцямі псіха-фізічнага развіцця (спецыяльнай адукацыі)», «Аб агульнай сярэдняй адукацыі», «Аб вышэйшай адукацыі») і накіраваны на комплекснае і сістэмнае рэгуляванне грамадскіх адносін у сферы адукацыі. Кодэкс прадугледжвае стварэнне на базе існуючых прававых інстытутаў адзінага, цэласнага механізма прававога рэгулявання адукацыйных адносін. Пры гэтым нормы Кодэкса забяспечваюць пераемнасць прававога рэгулявання адукацыйнай сферы і не прадугледжваюць канцэптуальных змяненняў гэтых адносін.

*Дзяржаўная палітыка ў сферы адукацыі* пабудавана на некалькіх

асноватворных прынцыпах. У прыватнасці, гэта *дзяржаўнае фінансаванне ўстаноў адукацыі* ўсіх узроўняў, дзяржаўная сацыяльная падтрымка навучэнцаў, студэнтаў, настаўнікаў і педагагічных работнікаў, забеспячэнне роўных магчымасцяў атрымання адукацыі ўсімі грамадзянамі.

Сістэма адукацыі Беларусі сёння складаецца з *дашкольнай адукацыі*, *агульнай сярэдняй адукацыі*,*вышэйшай адукацыі*.

*Дашкольная адукацыя* накіраваная на рознабаковае развіццё асобы дзіцяці ранняга і дашкольнага ўзросту (да 6 гадоў) у адпаведнасці з яго узроставымі і індывідуальнымі магчымасцямі, здольнасцямі і патрэбамі; фарміраванне ў яго маральных нормаў, набыццё ім сацыяльнага досведу.

У Беларусі цяпер маецца 3951 установа дашкольнай адукацыі (яслі, яслі-сады, дзіцячыя сады, санаторныя яслі-сады і дзіцячыя сады, спецыяльныя дашкольныя ўстановы, дашкольныя цэнтры развіцця дзіцяці).

*Агульная сярэдняя адукацыя* – узровень асноўнай адукацыі, накіраваныя на духоўна-маральнае і фізічнае развіццё асобы вучня, падрыхтоўку яго да паўнавартаснага жыцця ў грамадстве, авалоданне навучэнцам асновамі навук, дзяржаўнымі мовамі Рэспублікі Беларусь, навыкамі разумовай і фізічнай працы, фарміраванне маральных перакананняў, культуры паводзін, эстэтычнага густу і здаровага ладу жыцця, гатоўнасці да самастойнага жыццёвага выбару, пачатку працоўнай дзейнасці і працягу адукацыі.

Агульная сярэдняя адукацыя мае тры ступені:

• I ступень – пачатковая адукацыя (I–IV класы);

• II ступень – базавая адукацыя (V–IX класы);

• III ступень – сярэдняя адукацыя (X–XI класы, у вячэрніх школах X–XII класы, вячэрнія класы – X–XII класы).

I і II ступені агульнай сярэдняй адукацыі складаюць *агульную базавую адукацыю*; I, II і III ступені агульнай сярэдняй адукацыі складаюць *агульную сярэднюю адукацыю*.

У 2015–2016 вучэбным годзе ў Беларусі дзейнічала 3038 школ, 212 гімназій, 29 агульнаадукацыйных ліцэяў.

У агульнаадукацыйных установах абавязковымі для вывучэн-

ня з’яўляюцца дзве дзяржаўныя мовы – беларуская і руская, а таксама адна з замежных моў – англійская, нямецкая, французская, іспанская або кітайская.

У Беларусі ўстановы *вышэйшай адукацыі* могуць быць розных тыпаў: класічныя ўніверсітэты, профільныя ўніверсітэты і акадэміі, інстытуты, вышэйшыя каледжы. Сёння ў Беларусі маюцца 52 установы вышэйшай адукацыі. З іх 43 з’яўляюцца дзяржаўнымі навучальнымі ўстановамі, 9 – прыватныя, недзяржаўныя. У гэтай лічбе – 24 універсітэты, 8 акадэмій, 10 інстытутаў і адзін вышэйшы каледж. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт і Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт з’яўляюцца вядучымі вышэйшымі навучальнымі ўстановамі ў нацыянальнай сістэме адукацыі.

Феноменам у нацыянальнай сістэме адукацыі стаў *Беларускі гуманітарны ліцэй імя Якуба Коласа*, які быў заснаваны 14 студзеня 1990 г. Спачатку ліцэй існаваў як нядзельная ўстанова. З 28 лістапада 1990 г. у якасці аддзелу знаходзіўся у складзе Беларускага гуманітарнага адукацыйна-культурнага цэнтра (БГАКЦ), створанага загадам Савета Міністраў БССР. Загадам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 23 верасня 1991 г. ліцэй стаў стацыянарнай установай у складзе БГАКЦ.

З 1998 г. ліцэй пачаў існаваць самастойна як Нацыянальны гуманітарны ліцэй імя Якуба Коласа. У чэрвені 2003 г. з’явілася пастанова Савета міністраў Беларусі аб ліквідацыі ліцэя. З таго часу ліцэй спыніў сваё існаванне як дзяржаўная установа адукацыі.

Беларускі гуманітарны ліцэй працуе і сёння як грамадская ініцыятыва. Ён мае дамову аб супрацоўніцтве з дзвюма сярэднімі навучальнымі ўстановамі г. Гданьска; частка вучняў перыядычна там вучыцца, праходзіць атэстацыю і атрымлівае адпаведныя сертыфікаты. У 2015 годзе ліцэй адзначыў 25-годдзе свайго існавання. Па сутнасці, гэта адзіная ў Беларусі навучальная ўстанова, якая з моманту свайго стварэння працуе толькі на беларускай мове.

У Беларусі ўсе ўстановы вышэйшай адукацыі, як дзяржаўныя, так і прыватныя, падпарадкоўваюцца Міністэрству адукацыі. Форма навучання можа быць дзённай, вячэрняй або завочнай. Усе выпускнікі вышэйшых навучальных устаноў розных формаў уласнасці

атрымліваюць дыплом дзяржаўнага ўзору. Маладым спецыялістам, якія атрымалі вышэйшую адукацыю за кошт сродкаў бюджэту на дзённай форме навучання, гарантуецца працаўладкаванне па атрыманай спецыяльнасці.

Падрыхтоўка навуковых і навукова-педагагічных кадраў вядзецца ў аспірантуры, дактарантуры ВНУ і навуковых арганізацый Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. У краіне існуе разгалінаваная сетка ўстаноў адукацыі сістэмы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў

Рэспубліка Беларусь – член Лісабонскай Канвенцыі з 1997 г. Уступленне ў Лісабонскую Канвенцыю дало Беларусі магчымасць больш эфектыўна вырашаць праблему прызнання дыпломаў беларускіх ВНУ за мяжой, паспрыяла развіццю міжнароднага супрацоўніцтва, прыцягненню на вучобу ў Беларусь замежных студэнтаў з некаторых краін.

З 15 мая 2015 г. Рэспубліка Беларусь – удзельніца Балонскага працэсу, яна належыць Еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі.

**3. *Развіццё нацыянальнай навукі.*** У 1990-я гады беларуская навука, як ў сістэме ВНУ, так і акадэмічная, знаходзілася ў вельмі складаным эканамічным становішчы. У дзяржавы і прадпрыемстваў проста не было грошай на правядзенне навуковых даследаванняў і на аплату працы вучоных. Фінансаванне навукі з дзяржаўнага бюджэту паменшылася ў чатыры разы, у параўнанні з сярэдзінай 1980-х гг. У выніку зменшыўся прыток моладзі ў навуку і, наадварот, павялічылася колькасць вучоных, якія змянілі месца працы ці пераехалі за мяжу, у тыя краіны, дзе яны маглі працягваць займацца навуковай дзейнасцю. Гэтыя працэсы ў грамадстве атрымалі назву «*уцечка мазгоў*».

Каб выправіць становішча ў навуковай сферы краіны, Вярхоўным Саветам Беларусі ў 1993 г. быў прыняты *Закон «Аб асновах дзяржаўнай навукова-тэхнічнай палітыкі»,* згодна з якім каардынацыя фундаментальных навуковых даследаванняў была ўскладзена на Акадэмію навук Беларусі. У выніку рэалізацыі гэтага закона было некалькі палепшана фінансаванне навукі, з’явіліся



*Нацыянальная акадэмія навук Беларусі,*
*галоўны будынак у Мінску.*

новыя праграмы навуковых даследаванняў. Разам з тым, перад незалежнай Беларуссю стаяла задача стварэння ўласнай сістэмы падрыхтоўкі вышэйшых навуковых кадраў, больш шчыльнай сувязі акадэмічнай навукі з вытворчасцю, першачарговай распрацоўкі прыярытэтных для Беларусі навуковых накірункаў, каб дапамагчы краіне ў стабілізацыі эканамічнага жыцця.

У 1997 г. Акадэмія навук Беларусі была ператорана ў *Нацыянальную акадэмію навук* (НАН) са статусам вышэйшай дзяржаўнай навуковай арганізацыі, адказнай за каардынацыю і правядзенне фундаментальных навуковых даследаванняў.

5 сакавіка 2002 г. выйшаў дэкрэт прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «*Аб удасканаленні дзяржаўнага кіравання ў сферы навукі*». Была створана сістэма дзяржаўнага кіравання навукай, якая складаецца з Камітэта па навуцы і тэхналогіях пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, Вышэйшай атэстацыйнай камісіі (ВАК) і Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

У выніку ўзмацнілася арганізацыя дзяржаўнага кіравання сферай навукі, была створана нацыянальная сістэма падрыхтоўкі навуковых і навукова-педагагічных кадраў. Асаблівая ўвага стала надавацца распрацоўцы прыярытэтных навуковых кірункаў, якія

садзейнічаюць развіццю навукова-тэхнічнага прагрэсу. Менавіта так працуюць інстытуты хіміі новых матэрыялаў, малекулярнай і атамнай фізікі, аб'яднаны інстытут праблем інфарматыкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. У Акадэміі навук заснаваны адзін з лепшых на постсавецкай прасторы Цэнтр святлодыёдных і оптаэлектронных тэхналогій, навукова-вытворчыя аб'яднанні «Хімічныя прадукты і тэхналогіі», «Хімічны сінтэз і біятэхналогіі» і інш. У Інстытуце парашковай металургіі праводзяцца даследаванні і распрацоўкі новых матэрыялаў ў галіне парашковай металургіі і керамікі, кампазітных, нанаразмерных і звышцвёрдых матэрыялаў.

У краіне паспяхова працуюць новыя навуковыя ўстановы: інстытуты праблем выкарыстання прыродных рэсурсаў і экалогіі, радыёбіялогіі, сацыялогіі, малекулярнай і атамнай фізікі, прыкладной оптыкі і тэхналогіі металаў і інш. На базе Інстытута ядзернай энергетыкі створаны Аб'яднаны інстытут энергетычных і ядзерных даследаванняў «Сосны», у склад якога ўвайшлі Інстытут праблем энергетыкі, Інстытут радыяцыйных фізіка-хімічных праблем і Інстытут радыёэкалагічных праблем. Асноўныя напрамкі дзейнасці Аб'яднагага Інстытута – навуковае суправаджэнне развіцця атамнай энергетыкі ў Рэспубліцы Беларусь; даследаванні і распрацоўкі ў галіне ядзернай энергетыкі, ядзерных і радыяцыйных тэхналогій; даследаванні і распрацоўкі ў галіне абыходжання з радыёактыўнымі адыходамі і адпрацаваным ядзерным палівам; фундаментальныя і прыкладныя даследаванні ў галіне ядзернай фізікі, фізікі элементарных частак, фізікі высокіх энергій.

Ёсць дасягненні і ў гуманітарнай сферы. Так, у Інстытуце гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі праводзяцца фундаментальныя і прыкладныя навуковыя даследаванні па гісторыі, археалогіі і антрапалогіі; арганізуюцца археалагічныя раскопкі. Супрацоўнікі інстытута выканалі працы па даследаванні гісторыі рэгіёнаў Нацыянальнага парка «Белавежская пушча» і Нацыянальнага парка «Прыпяцкі», заснавалі серыю публікацый «Беларусь праз прызму рэгіянальнай гісторыі», дзе ўжо выйшлі кнігі прысвечаныя гістарычнаму мінуламу Ашмян, Бярозы, Калінкавічаў і інш. Спецыяльна створаныя навуковыя калектывы выконваюць

дзяржаўныя навуковыя праграмы па гісторыі беларускай нацыі, дзяржаўнасці і культуры.

У *Цэнтры даследаванняў беларускай культуры мовы і літаратуры* займаюцца даследаваннем этнакультурных працэсаў на тэрыторыі Беларусі; міжэтнічных сувязяў беларусаў, рускіх, украінцаў і іншых народаў у галіне матэрыяльнай і духоўнай культуры, вывучэннем сістэмы беларускай мовы на розных этапах яе развіцця, даследаваннем літаратурнай спадчыны Беларусі, у т.л. рыхтуюць акадэмічныя выданні твораў класікаў беларускай літаратуры, літаратурных помнікаў.

З начнымі навуковымі дасягненнямі беларускіх гуманітарыяў сталі такія ўнікальныя выданні, як шасцітомная «Энцыклапедыя гісторыі Беларусі», энцыклапедыя «Вялікае Княства Літоўскае» ў 3-х тамах, «Нацыянальны атлас Беларусі», «Вялікі гістарычны атлас Беларусі» і інш.

Перспектыўнымі напрамкамі навуковага развіцця ў Беларусі сталі *біятэхналогіі, нанатэхналогіі, космас*. Сярод вынікаў інавацыйнага развіцця – распрацоўка суперкамп'ютара «СКІФ» і стварэнне Парка высокіх тэхналогій (ПВТ), прызначанага для ўкаранення інфармацыйных гэхналогій і экспарту праграмнага забеспячэння за межы краіны. СКІФ – праект па распрацоўцы і серыйнай вытворчасці высокапрадукцыйных вылічальных сістэм і стварэнні на іх аснове прыкладных праграмна-апаратных комплексаў. Гэты праект фінансаваўся за кошт бюджэтаў Расіі і Беларусі. Падчас яго рэалізацыі былі створаны суперкамп'ютэры СКІФ К-500 і СКІФ К-1000. СКІФ К-1000, усталяваны ў Аб'яднаным інстытуце праблем інфарматыкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, выкарыстоўваецца буйнымі прадпрыемствамі-экспарцёрамі: МАЗам, БелАЗам, Беларускім трактарным заводам, Заводам карданных валаў.

*Рэспубліка Беларусь стала касмічнай дзяржавай.* 22 чэрвеня 2012 г. з касмадрома «Байканур» адбыўся запуск беларускага касмічнага апарата дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі БелКА (Беларускі касмічны апарат). З яго дапамогай будзе адбывацца кантроль за землекарыстаннем і сельскагаспадарчай вытворчасцю,

праводзіцца вызначэнне плошчаў, перспектыўных для пошуку карысных выкапняў, абнаўленне тапаграфічных карт, кантроль надзвычайных сітуацый, экалагічны кантроль навакольнага асяроддзя і інш.

У 2011 г. у Рэспубліцы Беларусь была прынятая дзяржаўная праграма па стварэнні шматфункцыянальных *беспілотных авіяцыйных комплексаў* (БАК). За чатыры гады была наладжана вытворчасць айчынных беспілотных апаратаў . Цяпер у фізіка-тэхнічным інстытуце Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі пачалі серыйны выпуск беспілотнай авіяцыі з радыусам дзеяння каля 300 км. Беспілотныя авіяцыйныя комплексы пачалі рэальна выцясняць традыцыйную авіяцыю пры рашэнні задач маніторынгу мясцовасці і аб’ектаў. Такія сучасныя тэхналогіі дазваляюць спажыўцам атрымліваць аператыўную інфармацыю ў рэжыме рэальнага часу. Больш за тое, беспілотная авіяцыя значна таннейшая ў эксплуатацыі і абслугоўванні, не патрабуе інфраструктуры аэрадромаў і не мае абмежаванняў на выкарыстанне ў экстрэмальных умовах.Апошняя мадыфікацыя БАКа мае назву «Бусел М-50», і працуе ён у паветры да 2,5 гадзін, з радыусам дзеяння 50 км.

Акрамя таго, распрацаваны выпуск комплексаў экалагічнага маніторынгу на базе дырыжабля (БАК ЭМ). Даўжыня яго расцягнутай сферы складае каля 10 м з дыяметрам да 3 м. Беспілотны дырыжабль напоўнены геліем і здольны пры ўмове знаходжання ў па-



*Беларускі беспілотнік.*

ветры ў штыль і хуткасці ветру да 3,7 м/с працаваць да 11 гадзін. БАК ЭМ валодае цэлым шэрагам пераваг: хуткасць палёту складае ад 0 да 40 км/г, а пры ёй значна палягчаецца задача назірання за мясцовасцю з густой раслiннасцю, скрозь кроны дрэў і хмызнякі. Можна разгледзець аб'екты ў драбнюткіх дэталях і сфарміраваць выразную карцінку. Ён спажывае вельмі мала энергіі, дзякуючы чаму можа даўжэй выконваць пастаўленыя задачы.

Значныя дасягненні ёсць у медыцыне, у прыватнасці ў галіне *трансплантaлогіі*. Створаны эксперыментальныя ўзоры лазераў, прызначаныя для лячэння хвароб вачэй, якія не саступаюць лепшым сусветным аналагам.

У 2007 г. адбыўся *I з'езд вучоных Беларусі*, на якім былі падведзены вынікі развіцця навукі і вызначаны яе задачы на перспектыву.

**4. *Узаемадзеянне дзяржавы і канфесій.*** Беларусь гістарычна склалася як поліэтнічная (з перавагай беларускага этнасу) і поліканфесійная краіна. Былі перыяды, калі тут ў якасці «асноўнай» канфесіі ўсталёўвалася то праваслаўе, то каталіцызм, то пратэстантызм, у часы камуністычнага рэжыму нават панаваў «ваяўнічы атэізм». Канфесійная сітуацыя ў Беларусі, як правіла, адлюстроўвала ўсе праблемы сацыяльна-палітычнага жыцця. Канфесіі часта самі аказвалі непасрэдна ці апасродкавана ўплыў на ўнутраную і знешнюю палітыку краіны. Улады, у сваю чаргу, імкнуліся схіліць царкву ці касцёл на свой бок, выкарыстоўвалі супярэчнасці паміж канфесіямі для правядзення сваёй палітыкі.

Самай распаўсюджанай рэлігіяй у рэспубліцы з'яўляецца *хрысціянства*. Хрысціяне Беларусі вызнаюць праваслаўе, каталіцызм, уніяцтва, пратэстантызм. Сярод іншых рэлігій найбольш распаўсюджаны *юдаізм* і *іслам*.

Узаемадзеянне канфесій і беларускай дзяржавы пасля ліквідацыі камуністычнай сістэмы рэзка змянілася. Адносіны рэлігіі і дзяржавы, правы грамадзян Беларусі рэгулююцца Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь і Законам Рэспублікі Беларусь «*Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях*» ад 31 кастрычніка 2002 г. У адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, «рэлігіі і ве-

равызнанні роўныя перад законам» (артыкул 16), і «кожны мае права самастойна вызначаць свае адносіны да рэлігіі, асабіста або сумесна з іншымі вызнаваць любую рэлігію або не вызнаваць ніякай…» (артыкул 31).

Трэба прызнаць аднак, што пры ўсёй дэкларыраванай роўнасці канфесій перавага з боку дзяржавы аддаецца *праваслаўнай царкве*. Так, у законе Рэспублікі Беларусь «Аб свабодзе веравызнання і рэлігійных арганізацыях» адзначаецца, што ён прыняты з улікам: права кожнага на свабоду веравызнання, а таксама на роўнасць перад законам незалежна ад адносін да рэлігіі; роўнасці рэлігій перад законам; *прызнання вядучай ролі праваслаўнай царквы ў гістарычным станаўленні і развіцці духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа*; духоўнай, культурнай і гістарычнай ролі каталіцкай царквы на тэрыторыі Беларусі; неаддзельнасці ад агульнай гісторыі народа Беларусі евангеліцка-лютэранскай царквы, іудаізму і ісламу; неабходнасці садзейнічання дасягненню ўзаемнага разумення, цярпімасці і павагі рэлігійных пачуццяў грамадзян у пытаннях свабоды веравызнання.

Усяго ў Беларусі налічваецца 25 рэлігійных канфесій, агульная колькасць рэлігійных абшчын на пачатак 2015 г. склала больш як 3,4 тыс. Сярод іх праваслаўныя абшчыны, рымска-каталіцкія, пяцідзясятніцкія (хрысціяне веры евангельскай), баптысцкія, адвентыстаў сёмага дня, лютэранскія, іўдзейскія, мусульманскія і інш.

*Беларуская Праваслаўная Царква* (другая афіцыйная назва – Беларускі Экзархат Маскоўскага Патрыярхату) – кананічнае царкоўна-адміністрацыйнае аб'яднанне праваслаўных епархій ў межах Беларусі. У краіне маюцца наступныя праваслаўныя епархіі: Бабруйская і Быхаўская, Брэсцкая і Кобрынская, Віцебская і Аршанская, Гомельская і Жлобінская, Гродзенская і Ваўкавыская, Магілёўская і Мсціслаўская, Мінская і Слуцкая, Навагрудская і Лідская, Пінская і Лунінецкая, Тураўская і Мазырская.

Такім чынам, Беларуская праваслаўная царква не з'яўляецца царквой нацыянальнай, а ёсць толькі рэгіянальнай часткай Рускай праваслаўнай царквы (РПЦ), і, натуральна, што праводзіць яна канфесійную палітыку, якая выпрацоўваецца не ў Мінску, а ў Маскве.

Разам з тым, кіраўніцтва Беларусі імкнецца стварыць такія ўмовы, каб усе канфесіі на тэрыторыі Беларусі працавалі на карысць беларускай дзяржавы і беларускай дзяржаўнасці. 22 верасня 2016 г. на сустрэчы з Сінодам Беларускай праваслаўнай царквы А. Р. Лукашэнка адзначыў, што, працягваючы ўмацоўваць дзяржаўнасць і незалежнасць Беларусі, важна абапірацца на царкву: «Асабліва падкрэслю канструктыўную пазіцыю духавенства адносна сучасных палітычных падзей, якія адбываюцца ў нашай краіне. Гэта чарговы раз даказвае вашу зацікаўленасць у беларускай дзяржаве, якая дынамічна развіваецца».

У 1989 г. праваслаўнай царкве былі перададзены жаночыя манастыры Спаса-Ефрасіннеўскі ў Полацку і Нараджэння Багародзіцы ў Гродне. 1 верасня 1989 г. аднавіліся заняткі ў Мінскай духоўнай семінарыі, якая, як і раней, памясцілася ў Жыровіцкім Успенскім манастыры. Створаны духоўныя вучылішчы ў Віцебску і Слоніме, Інстытут тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірыла пры Беларускім дзяржаўным ўніверсітэце, рэгенцкая школа пры Мінскім духоўным вучылішчы і школа царкоўных званароў пры Мінскім епархіяльным упраўленні.

У Беларусі з кожным годам павялічваецца колькасць вернікаў, расце колькасць храмаў. Пастаянна развіваецца сетка навучальных устаноў, у якіх прадстаўнікі розных канфесій могуць атрымаць рэлігійную адукацыю.

*Рымска-каталіцкая царква.* Паводле стану на 1 студзеня 2012 г., у Рэспубліцы Беларусь налічвалася 479 каталіцкіх парафій. У краіне дзейнічаюць 9 рымска-каталіцкіх місій і 9 манаскіх супольнасцяў, 451 касцёл. Для падрыхтоўкі каталіцкіх святароў для Беларусі ў 1990 г. створана Вышэйшая духоўная семінарыя Гродзенскай дыяцэзіі, з 2001 г. працуе Пінская духоўная семінарыя. Каталікі складаюць, паводле наяўных звестак, 14,5 % насельніцтва Беларусі (звыш 1,4 млн. чал.).

Кіроўнымі структурамі рымска-каталіцкай царквы ў Беларусі з'яўляюцца Мінска-Магілёўская, Гродзенская, Віцебская і Пінская дыяцэзіі.

Вышэйшым кіруючым органам рымска-каталіцкай царквы ў Беларусі з'яўляецца Канферэнцыя каталіцкіх біскупаў.

*Беларуская ўніяцкая (грэка-каталіцкая царква)* – аб'яднанне ўніяцкіх епархій ў Беларусі. Узнікла ў выніку Брэсцкай уніі 1596 г. Першая ўніяцкая абшчына была зарэгістравана ў Мінску ў 1990 г. Паводле стану на чэрвень 2009 г., Беларуская грэка-каталіцкая царква мела 20 парафій (зарэгістраваных з іх – 15).

*Пратэстанцкія абшчыны.* Пратэстанцкія рэлігійныя арганізацыі Беларусі налічваюць больш як 1 тыс. рэлігійных абшчын, 21 аб'яднанне, 22 місіі. Гістарычна традыцыйным на тэрыторыі рэспублікі з'яўляецца лютэранства, якое налічвае 27 абшчын. Найбольш шматлікія сярод пратэстанцкіх напрамкаў – аб'яднанні хрысціян веры евангельскай, евангельскіх хрысціян-баптыстаў, адвентыстаў сёмага дня. Прэсвітэраў, прапаведнікаў і рэгентаў для іх рыхтуюць у двух вышэйшых і двух сярэдніх навучальных установах евангельскіх хрысціян-баптыстаў і хрысціян веры евангельскай.

Пратэстанцкія абшчыны, як правіла, нешматлікія (20–25 чалавек), выняткі складаюць абшчыны ў буйных населеных пунктах.

*Іўдзейскія абшчыны.* З 1990-х гг. пачало аднаўляцца рэлігійнае жыццё іудзеяў у Рэспубліцы Беларусь. Сёння зарэгістравана больш як 50 іудзейскіх абшчын. У 1993 г. было арганізавана Іудзейскае рэлігійнае аб'яднанне ў Рэспубліцы Беларусь. Дзейнічае ў Мінску духоўнае вучылішча (*ешыбот*), больш за 15 нядзельных школ, яўрэйскія класы ў сярэдніх школах. Значнай падзеяй ў жыцці беларускіх яўрэяў стала стварэнне ў 1998 г. Цэнтра яўрэйскай культуры.

*Мусульманскія абшчыны.* У Рэспубліцы Беларусь дзейнічаюць 25 мусульманскіх рэлігійных абшчын. Найбольшая колькасць зарэгістравана ў Гродзенскай вобласці – 8 абшчын. Яны ўваходзяць у склад створанага ў 1994 г. Мусульманскага рэлігійнага аб'яднання Рэспублікі Беларусь, кіроўным органам якога з'яўляецца муфціят на чале з *муфціем.* З 1991 г. дзейнічае культурна-асветнае беларускае аб'яднанне татар «*Аль-Кітаб*». У краіне дзейнічаюць 6 мячэцяў.

Дзяржава падтрымлівае канструктыўныя ініцыятывы прадстаўнікоў розных рэлігій. У той жа час, вядзецца работа па прадухіленні дзейнасці «дэструктыўных рэлігійных сектаў».

# АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Балонскі працэс*** – працэс зближэння і гарманізацыі сістэм адукацыі краін Еўропы з мэтай стварэння адзінай адукацыйнай прасторы вышэйшай адукацыі, які быў аформлены ў 1999 г.

***Дзяржаўная навукова-тэхнічная палітыка*** – неад'емная частка сацыяльна-эканамічнай палітыкі Рэспублікі Беларусь, якая ўключае асноўныя мэты, прынцыпы, напрамкі і спосабы ўздзеяння дзяржавы на суб'екты навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці, парадак паміж суб'ектамі навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці.

***Ідэалогія беларускай дзяржавы*** – сукупнасць ідэй і ідэалаў, якія адлюстроўваюць нацыянальна-гістарычныя традыцыі і каштоўнасці беларускага народа, адпавядаюць мэтам і асаблівасцям развіцця беларускага грамадства.

***Інавацыя*** – новаўвядзенне (англ.: *innovation*) – укаранёнае новаўвядзенне, якое забяспечвае якасны рост эфектыўнасці працэсаў або прадукцыі, запатрабаванае рынкам.

***Індустрыяльнае грамадства*** – грамадства, для якога характэрныя падзел працы, спецыялізацыя вытворчасці і яе аўтаматызацыя, арыентацыя вытворчасці на рынак, навукова-тэхнічная рэвалюцыя, урбанізацыя.

***Інфармацыйнае грамадства*** – грамадства, у якім інфармацыя становіцца галоўным эканамічным рэсурсам, а інфармацыйны сектар выходзіць на першае месца па тэмпах развіцця, паводле ліку занятых, паводле долі капіталаўкладанняў.

***Канфесійная палітыка*** – дзейнасць дзяржавы, яе ўладных структур у сферы дачыненняў з рэлігійнымі канфесіямі як сацыяльнымі інстытутамі, а таксама ўзаемадачыненні з групамі насельніцтва ці асобамі, якія спавядаюць тую ці іншую рэлігію.

***Нанатэхналогія*** – вобласць фундаментальнай і прыкладной навукі і тэхнікі, якая мае справу з сукупнасцю тэарэтычнага абгрунтавання, практычных метадаў даследавання, аналізу і сінтэзу, а таксама метадаў вытворчасці і прымянення прадуктаў з зададзенай атамнай структурай шляхам кантраляванага маніпулявання асобнымі атамамі і малекуламі.

# НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***1991 г.*** – Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прыняў закон «Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь».

***1992 г.*** – Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прыняў закон «Аб свабодзе веравызнання і рэлігійных арганізацыях» (першая рэдакцыя, змены былі ўнесены 27 чэрвеня 2002 г.).

***1993 г.*** – Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прыняў Закон «Аб асновах дзяржаўнай навукова-тэхнічнай палітыкі».

***1999 г.*** – урад Рэспублікі Беларусь прыняў Праграму развіцця нацыянальнай сістэмы адукацыі до 2010 г.

***2011 г.*** – Прыняты «Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі».

# ЛІТАРАТУРА


1. *Василевич Г. А.* Белорусское государство на рубеже веков. Мн.: Право и экономика, 2007.
2. *Верашчагіна А. У., Гурко А. В.* Гісторыя канфесій на Беларусі ў другой палове XX стагоддзя. Мн.: ІСПД, 1999.
3. Вклад ученых академии наук Беларуси в ликвидацию последствий аварии на Чернобыльской АЭС. 1986–1996 гг. : документы и материалы / Сост.: Н. В. Токарев. – Мн.: Беларуская навука, 2016.
4. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 2. М. У. Смяховіч [і інш.]. Мн.: Беларуская навука, 2012.
5. *Демчук М. И., Юркевич А. Т.* Республика Беларусь: системные принципы устойчивого развития. Мн.: РИВШ, БГУ, 2003.
6. *Крывічаніна К. А.* Навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва Беларусі з краінамі ЕС і СНД (1991–2000 гг.). Мн.: Беларуская навука, 2014.
7. *Крывашэй Д. А.* Дзяржаўная культурная палітыка ў Беларусі (1991–2010 гг.). Мн.: Беларуская навука, 2014.
8. *Мельник В. А.* Основы идеологии белорусского государства: учеб. пособие. Мн.: Вышэйшая школа, 2011.
9. Основы идеологии белорусского государства: учеб. пособие / под общ. ред. Г. А. Василевича, Я. С. Яскевич. Мн.: РИВШ, 2004.
10. *Слука А. Г.* Национальная идея. Мн.: РИВШ, 2009.

# РАЗДЗЕЛ 9.
# КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ Ў 1990–2016 гг.

*1. Культура ва ўмовах дзяржаўнага суверэнітэту.*
*2. Новы этап у развіцці беларускай літаратуры.*
*3. Музычнае мастацтва, тэатр і кіно.*
*4. Выяўленчае мастацтва. Архітэктура.*
*5. Ахова гісторыка-культурнай спадчыны. Народная творчасць.*

**1. *Культура ва ўмовах дзяржаўнага суверэнітэту.*** Новы этап у развіцці беларускай культуры пачаўся пасля прыняцця Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай ССР і надання ёй статусу канстытуцыйнага закона. У Канстытуцыі Беларусі, прынятай 15 сакавіка 1994 г. адзначалася, што дзяржава адказная за захаванне гісторыка-культурнай спадчыны, свабоднае развіццё культур усіх нацыянальных супольнасцей, якія жывуць у краіне.

Тэрміны «культура Беларусі» і «беларуская культура» блізкія, але нераўназначныя. Паняцце «культура Беларусі» больш шырокае і ўключае ў сябе культуру ўсіх этнасаў, што пражывалі і пражываюць на тэрыторыі нашай краіны; тэрмін «беларуская культура» адлюстроўвае развіццё, мінулы і цяперашні стан культуры тытульнага этнасу Рэспублікі Беларусь, культуру беларускага народа. Прынята, вывучаючы культуру Беларусі, не вылучаць асобна культуру беларусаў з масіву ўсіх дасягненняў у галіне культуры ў нашай краіне. Пры сучасных рэаліях, калі ва ўмовах «дзяржаўнага двумоўя» асноўныя дзяржаўныя інстытуты, амаль уся сістэма адукацыі, сродкі масавай інфармацыі працуюць на рускай мове, можа ўзнікнуць сітуацыя падмены некаторых сегментаў беларускай культуры рускімі ці рускамоўнымі адпаведнікамі. Пытанне пра тое, што, якія з'явы і творы можна лічыць праявамі беларускай культуры, ці могуць творы на рускай мове прадстаўляць беларускую культуру, з'яўляюцца дыскусійнымі.

Дыскусію абвастрыла прысуджэнне ў 2016 г. Нобелеўскай прэміі ў галіне літаратуры беларускай пісьменніцы, якая піша на рускай мове, *Святлане Алексіевіч*.

Несумненна, што культура з'яўляецца неад'емнай часткай суверэнітэту дзяржавы. Відавочна і тое, што асноўным маркерам беларускай нацыі з'яўляецца беларуская мова. Але зразумела і тое, што любы культурны шэдэўр, створаны беларусам, незалежна ад таго, на якой мове ён створаны, з'яўляецца ўнёскам у культуру Беларусі.

***Заканадаўства аб культуры.*** Толькі пасля атрымання Беларуссю дзяржаўнай незалежнасці пачало развівацца нацыянальнае заканадаўства ў сферы культуры. З'явіліся законы «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь», «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны», «Аб бібліятэчнай справе», «Аб музеях і музейным фондзе». У 2016 г. досвед заканадаўчай практыкі ў галіне культуры быў абагульнены ў Кодэксе Рэспублікі Беларусь «*Аб культуры*». *У* мэтах захавання культурных каштоўнасцяў, развіцця арганізацый культуры і забеспячэння агульнадаступнасці культурных здабыткаў, Кодэксам устаноўлены прававыя, арганізацыйныя, эканамічныя і сацыяльныя асновы культурнай дзейнасці і рэгулююцца праваадносіны ў наступных сферах: захаванне і развіццё культурных каштоўнасцяў, ахова гісторыка-культурнай і археалагічнай спадчыны; бібліятэчная і музейная справа; кінематаграфічная дзейнасць; народныя мастацкія рамёствы, дзейнасць калектываў мастацкай самадзейнасці; правядзенне культурных мерапрыемстваў, арганізацыя культурнага адпачынку насельніцтва; узнагароды ў сферы культуры. Кодэксам прадугледжана стварэнне на базе існуючых прававых інстытутаў адзінага механізму рэгулявання адносін у сферы культуры.

Самае складанае ў беларускім нацыянальна-культурным пытанні – моўнае. Як ужо згадвалася, яшчэ Вярхоўны Савет XI склікання прыняў 26 студзеня 1990 г. закон «*Аб мовах у Беларускай ССР*», які абвясціў беларускую мову дзяржаўнай мовай БССР, а 20 верасня 1990 г. Савет Міністраў БССР прыняў дзяржаўную праграму развіцця беларускай мовы і іншых нацыянальных моў у Беларускай

ССР, дзе беларуская мова была вызначана ў якасці адзінай дзяржаўнай. У законе прадугледжвалася свабоднае карыстанне рускай мовай, свабоднае развіццё і ўжыванне іншых нацыянальных моў. Дзяржаўны статус беларускай мовы быў замацаваны і ў Канстытуцыі Беларусі 1994 г. Беларуская мова шырока распаўсюджвалася ў грамадстве, у сферы адукацыі, у працы дзяржаўных устаноў. Але 14 мая 1995 г. на агульнарэспубліканскі рэферэндум было вынесена пытанне аб наданні у Беларусі рускай мове статусу роўнага з беларускай. Пасля гэтай падзеі сфера карыстання беларускай мовай пастаянна зніжалася і, як вынік, дзяржава ізноў вымушана рабіць захады па падтрымцы статусу беларускай мовы ў грамадстве.




*Сучасны плакат-карыкатура.*

У 2011–2015 гг. у краіне дзейнічала дзяржаўная праграма «Культура Беларусі». Накіравана яна была на вырашэнне актуальных праблем культурнага развіцця Рэспублікі Беларусь. Сярод дасягненняў апошніх гадоў у сферы культуры неабходна адзначыць рэканструкцыю будынка Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь, адкрыццё для наведнікаў адрэстаўраванага замкавага комплексу XVI–XX стст. у г. п. Мір і палацава-паркавага ансамбля XVI–XVIII стст. у г. Нясвіжы, пачатак аднаўлення палаца князёў Сапегаў




*Плакат у цяперашнім Мінску.*



Слуцкі пояс.

у Ружанах і інш. Паспяхова завяршылася дзяржаўная праграма адраджэння тэхналогій і традыцый вырабу слуцкіх паясоў і развіцця вытворчасці нацыянальнай сувенірнай прадукцыі *«Слуцкія паясы»* на 2012–2015 гг.

Дзяржава ўсё больш звяртае ўвагу на стан беларускай культуры. 2012 г. у Беларусі быў абвешчаны *Годам кнігі*, 2016 г. – *Годам культуры*. Ідзе падрыхтоўка да святкавання 500-годдзя беларускага кнігадрукавання ў 2017 г. Так, пачалося ажыццяўленне праграмы *«Кніжная спадчына Францыска Скарыны»* – факсімільнае выданне поўнага збору твораў беларускага і ўсходнееўрапейскага першадрукара. Выдавецкі праект прымеркаваны да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання.

Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 4 сакавіка 2016 г. зацверджана дзяржаўная праграма «Культура Беларусі» на 2016–2020 гг.

Яна ўключае чатыры падпраграмы: «Спадчына», «Мастацтва і творчасць», «Архівы Беларусі» і «Беларусы ў свеце». Перспектыўнымі праектамі вызначана *стварэнне Нацыянальнай электроннай бібліятэкі Беларусі*, рэалізацыя мерапрыемстваў па захаванні гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі, у тым ліку: завяршэнне першай чаргі рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ у касцёле Божага Цела ў г. Нясвіжы, завяршэнне рэстаўрацыі помніка архітэктуры XVIII ст. Свята-Пакроўскага манастыра ў г. Талачыне. Прадугледжана прадстаўленне ў Рэпрэзентатыўны спіс ЮНЕСКА нематэрыяльнай спадчыны дасье»*Святкаванне ў гонар іконы*

*Божай Маці Будслаўскай»*, арганізацыя культурных праектаў, накіраваных на адраджэнне культурных традыцый старадаўніх гістарычных гарадоў і памятных мясцін Беларусі, у тым ліку абраду «*Калядныя цары» ў в. Семежава Капыльскага раёна і* інш.

**2. *Новы этап у развіцці беларускай літаратуры.*** Штогод, пачынаючы з 1994 г., у Беларусі адзначаецца *дзень беларускага пісьменства*, які стаў значнай падзеяй культурнага жыцця Беларусі. Дзень беларускага пісьменства праводзіцца штогод у першую нядзелю верасня. Канцэпцыя свята прадугледжвае паказ адзінства беларускага друкаванага слова з гісторыяй і культурай беларускага народа, адлюстраванне гістарычнага шляху пісьменства і друку ў Беларусі. Традыцыйна Дзень беларускага пісьменства праходзіць у гарадах, якія з'яўляюцца гістарычнымі цэнтрамі культуры, навукі, літаратуры і кнігадрукавання. Упершыню святочныя мерапрыемствы адбыліся ў 1994 г. у старажытнай сталіцы Беларусі г. Полацку. У 2017 г. сталіцай свята, прымеркаванага да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання, зноў стане старажытны Полацк – родны горад беларускага асветніка і першадрукара Францыска Скарыны.

Адмоўным фактарам літаратурнага жыцця краіны апошніх дзесяцігоддзяў з'яўляецца падзел пісьменніцкай супольнасці на дзве афіцыйныя арганізацыі: *Саюз беларускіх пісьменнікаў (СБП) і Саюз пісьменнікаў Беларусі (СПБ).* Калі першы саюз з'яўляецца грамадскай арганізацыяй, то другі, пэўным чынам уключаны ў агульную дзяржаўную структуру, усебакова падтрымліваецца дзяржавай. У *Саюз беларускіх пісьменнікаў* уваходзяць такія знакамітыя літаратары, як Святлана Алексіевіч, Уладзімір Арлоў, Анатоль Вярцінскі, Алесь Разанаў, Сяргей Законнікаў, Васіль Зуёнак, Віктар Казько, Генрых Далідовіч, Вольга Іпатава, Уладзімір Някляеў і інш.

Беларускія пісьменнікі імкнуцца ў сваіх творах адлюстроўваць складаныя палітычныя і сацыяльна-эканамічныя працэсы, якія адбываюцца ў Беларусі і свеце. Важнымі тэмамі з'яўляюцца пытанні ацэнак далёкага і нядаўняга гістарычнага мінулага, пошукі каранёў беларускай дзяржаўнасці, імкненне далучыцца сваёй творчасцю да афармлення *беларускай нацыянальнай ідэі.*



*Васіль Быкаў*

Гэтыя праблемы выразна гучаць у творах Васіля Быкава («Доўгая дарога дадому», «Сцюжа», «Сцяна», «Афганец», «Воўчая яма»), Рыгора Барадуліна («Евангелле ад мамы», «Лісты ў Хельсінкі», «Дуліна ад Барадуліна»), Ніла Гілевіча ( «Вечны матыў», «…І плямы на табе няма», «На флейце самоты»), Генадзя Бураўкіна («Жураўліная пара», «Лісты да запатрабавання»), Вячаслава Адамчыка («Голас крыві брата твайго»), у творах Уладзіміра Някляева, Алеся Разанава, Янкі Брыля і іншых беларускіх паэтаў, празаікаў і драматургаў.

Пра мінулае нашай Бацькаўшчыны з'явіліся выдатныя кнігі Леаніда Дайнекі («Жалезныя жалуды», «Назаві сына Канстанцінам»), Уладзіміра Арлова («Краіна Беларусь», «Ордэн Белай Мышы», «Паўстанцы», «Сны імператара»), Кастуся Тарасава («Памяць пра легенды: Постаці беларускай мінуўшчыны», «Тры жыцці княгіні Рагнеды», «Апошняе каханне князя Міндоўга»), Вітаўта Чаропкі («Імя ў летапісе», «Уладары Вялікага княства», «Лёсы ў гісторыі»).

Папулярнасцю карыстаюцца творы Адама Глобуса, Альгерда Бахарэвіча, Андрэя Федарэнкі, Алеся Наварыча, Леаніда Дранько-Майсюка, Людмілы Рублеўскай, Андрэя Хадановіча і многіх іншых.

Як ужо казалася, беларуская пісьменніца *Святлана Аляксандраўна Алексіевіч* у 2015 г. стала *лаўрэатам Нобелеўскай прэміі па літаратуры*. Гэтая падзея – сусветнае прызнанне значнасці беларускай літаратуры ў свеце, важнасці тых праблем, якія ўздымае ў сваёй


*Рыгор Барадулін.*

творчасці пісьменніца. С. Алексіевіч, якая называе сябе вучаніцай А. Адамовіча і В. Быкава, атрымала Нобелеўскую прэмію з адзнакай «за шматгалосую творчасць – помнік пакутам і мужнасці ў наш час». Пісьменніца працуе ў галіне дакументальнага рэпартажу, напісання літаратурнага тэксту на аснове дакументальных сведчанняў людзей-сучаснікаў падзей, што апісваюцца. Ёсць меркаванне, што С. Алексіевіч стварыла новы сучасны літаратурны жанр. Тэмы, якія брала для даследавання пісьменніца, злабадзённыя; тыя, якія часта замоўчваліся камуністычным рэжымам: аб разбурэнні беларускай вёскі («Я з'ехаў з вёскі», не апублікавана), аб праблеме «жанчына – вайна» («У вайны не жаночае аблічча»), пра савецкую агрэсію ў Афганістане («Цынкавыя хлопчыкі»), аварыю на Чарнобыльскай АЭС («Чарнобыльская малітва») і інш. «Чарнобыльская малітва» напісана на аснове ўспамінаў ліквідатараў аварыі на ЧАЭС і людзей-перасяленцаў з Чарнобыльскай зоны. Кніга расказвае пра адначасовае разгортванне дзвюх катастроф: тэхнагеннай і сацыяльнай, калі «сышоў пад ваду велізарны сацыялістычны мацярык».

Алексіевіч адкрыта паказвала шматлікія хібы савецкага рэжыму, сведчыла пра іх вуснамі сваіх герояў, пісала пра злачынствы «чырвонай імперыі» – таму яе творчасць не ўспрымалася і не прымалася ўладамі і прыхільнікамі савецкасці і камуністычнасці; супраць аўтара арганізоўваліся «грамадскія абмеркаванні», узбуджаліся судовыя справы.



*Кароль Швецыі Карл XVI Густаў уручае Нобелеўскую прэмію Святлане Алексіевіч, 10.12.2015 г., Стакгольм.*

Апошняя вялікая праца С. Алексіевіч «Час second-hand (Канец чырвонага чалавека)» (2013 г.) закранае маштабныя гістарычныя тэмы: Вялікую Айчынную вайну, Афганістан, Чарнобыль, час «перабудовы» і развал «чырвонай імперыі». Аўтар не толькі гаворыць пра феномен узнікнення і існаванне *гома-саветыкус*, савецкага чалавека, але і фактычна абвінавачвае рэжым у стварэнні грамадства савецкага тыпу.

У апошнія гады беларуская літаратура панесла цяжкія страты. Пайшлі з жыцця народныя пісьменнікі і паэты Беларусі Р. Барадулін, В. Быкаў, Я. Брыль, Н. Гілевіч, І. Навуменка, І. Шамякін; не стала В. Адамчыка, Г. Бураўкіна, К. Тарасава, іншых выдатных прадстаўнікоў беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі.

**3. *Музычнае мастацтва, тэатр і кіно.*** У беларускім *музычным мастацтве ў* апошнія гады пераважала нацыянальная тэматыка. Многія творцы імкнуліся захаваць нацыянальныя традыцыі, адначасова развіваючы папулярныя ў свеце стылі і напрамкі. Вядучым жанрам музычнага мастацтва Беларусі застаецца сімфонія (Дз. Смольскі, В. Войцік, Ул. Дамарацкі, С. Бельцюкоў, У. Дарохін, К. Цесакоў). За гады незалежнасці папулярнасць сімфанічных

жанраў нават узрасла, пашырылася колькасць новых твораў буйной формы: сімфоніі У. Дарохіна («Францыск Скарына: жыццё і бессмяротнасць») Я. Паплаўскага («Вечнае святло»), містэрыя для баса і аркестра «Францыск» А. Літвіноўскага, 4-я сімфонія «Курапаты» К. Цесакова і інш.

Вялікую папулярнасць набылі балет «Жарсці» («Рагнеда») А. Мздзівані і В. Елізар’ева, аднаактавы балет «Кругаверць» А. Залётнева па матывах беларускіх народных балад, опера А. Бандарэнкі «Князь Наваградскі» і інш.

Сярод прафесійных музычных калектываў можна вылучыць Прэзідэнцкі аркестр Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр, Дзяржаўную акадэмічную харавую капэлу імя Р. Шырмы, Нацыянальны акадэмічны народны хор Рэспублікі Беларусь імя Г. І. Цітовіча.

Нацыянальным акадэмічным канцэртным аркестрам Беларусі сімфанічнай і эстраднай музыкі пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга ў 2015 г. праведзены такія традыцыйныя праекты, як «Гістарычныя канцэрты ў старажытных гарадах Беларусі»: «Чачэрскія сустрэчы-2015», «Навагрудак-2015», «Музычныя пейзажы Хойніцкай зямлі», «Мірскі замак-2015», «Музы Нясвіжа», «Тураў-2015», XIV Беларускі фестываль мастацтваў імя народнага артыста Беларусі М. Чуркіна «Мсціслаў-2015», свята камернай музыкі «Вяртанне Паўночных Афін», прысвечанае 250-годдзю Міхаіла Клеафаса Агінскага, у в. Залессе Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці – ў аднаўленай сядзібе кампазітара, канцэрты «Музычныя скарбы Агінскіх» і інш.

***Беларуская эстрада.*** Музычнае мастацтва эстрады Беларусі мае шматвектарную накіраванасць і пазіцыянуе сябе ў розных жанрах і стылявых напрамках. Асноўнымі задачамі дзейнасці майстроўбеларускай эстрады з’яўляюцца захаванне, развіццё і распаўсюджванне беларускай нацыянальнай культуры, стварэнне ўмоў для эстэтычнага выхавання і развіцця творчага патэнцыялу моладзі. Прыярытэтныя напрамкі развіцця музычнага мастацтва эстрады найбольш ярка праявіліся ў фестывальным руху, у рамках якога былі прадстаўлены папулярная, джазавая і рок-музыка.



*Уладзімір Мулявін, стваральнік легендарных «Песняроў». Фота Ю. Іванова.*

Найбольш вядомыя беларускія выканаўцы Ядвіга Паплаўская, Аляксандр Ціхановіч, Ірына Дарафеева, Алёна Ланская, Пётр Ялфімаў, Тэа і інш.; ансамблі «Сябры», «Песняры», «Беларускія песняры», «Купалінка», «Неруш» і г.д.

Захаванню, развіццю і распаўсюджванню беларускай культуры спрыяе Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі ў г. Маладзечна. У рамках фестывалю прадстаўлены новыя творчыя праекты – канцэрт народнай музыкі «Мелодыі роднай зямлі» з удзелам ансамбляў народнай музыкі «Бяседа», «Свята», фольк-групы «Неруш».

У Беларусі развіваецца сучаснае музычнае мастацтва, у тым ліку рок і фольк-рок музыка. Найбольш папулярнымі калектывамі з'яўляюцца «Крамбамбуля», «J:Морс», «N.R.M.», «Без білета» і інш. Традыцыі легендарных «Песняроў» працягваюць у сваёй творчасці гурты «другой хвалі айчыннага фольк-мадэрну – «Палац, «UR'IA», «Kriwi», «Altanka», «Ліцьвіны», «Стары Ольса», дуэт «Аляксандра і Канстанцін». Матэрыялам для стварэння рэпертуару ім служыць беларускі песенны фальклор, апрацаваны ў адпаведнасці з сучаснымі тэндэнцыямі музыкі. У аранжыроўках выкарыстоўваліся аўтэнтычныя беларускія інструменты.

Значны ўнёсак у развіццё беларуска фольк-року зрабіла этнатрыа «Троіца», у музыцы якога гарманічна спалучаюцца беларускія народныя мелодыі і стылістка world-music з элементамі музычнай культуры і інструментарыя народаў свету. Вялікую ролю ў развіцці беларускай альтэрнатыўнай і рок-музыкі, адыгрывае фесты-

валь «Басовішча», які з 1990 г. рэгулярна праводзіцца Беларускім аб'яднаннем студэнтаў (БАС) каля мястэчка Гарадок на Беласточчыне (Польшча).

У Беларусі штогод праходзяць фестывалі, якія прадстаўляюць розныя напрамкі і жанры музычнага мастацтва: «Беларуская музычная восень», «Мінская вясна», «Залаты шлягер», «Музы Нясвіжа» і інш. Культурным брэндам Беларусі стаў Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску», удзел у якім прымаюць папулярныя артысты з розных краін свету. Адбылося сусветнае прызнанне гэтага фестывалю: ён стаў членам Сусветнай асацыяцыі фестываляў.

***Тэатральнае мастацтва.*** Набыццё Беларуссю незалежнасці дало імпульс нацыянальнаму самасцвярджэнню і ў тэатральнай сферы. Пачалі адкрывацца новыя тэатры: Слонімскі беларускі драматычны тэатр (1990 г.), Мазырскі драматычны тэатр імя Івана Мележа (1990 г.), Мінскі абласны тэатр лялек «Батлейка» (1990 г.), Мінскі абласны драматычны тэатр у Маладзечне (1991 г.) і інш.

Сёння ў Рэспубліцы Беларусь дзейнічаюць 52 дзяржаўныя тэатральна-відовішчныя арганізацыі. Сярод іх: 28 тэатраў (18 драматычных тэатраў, 1 музычны, 7 лялечных, 1 юнага гледача, 1 тэатр оперы і балета), 22 канцэртныя арганізацыі і 2 цыркі.

На высокім узроўні працуюць Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы (калектыў тэатра першым у краіне ў 1993 г. атрымаў статус і званне Нацыянальнага), Дзяржаўны акадэмічны тэатр імя Якуба Коласа ў Віцебску, Нацыянальны акадэмічны тэатр оперы і балета, Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя М. Горкага, Дзяржаўны музычны тэатр, Беларускі рэспубліканскі тэатр юнага гледача, Беларускі дзяржаўны тэатр лялек, абласныя драматычныя і лялечныя тэатры.

Аснову рэпертуару беларускіх тэатраў складае драматургія беларускіх аўтараў, творы рускіх аўтараў, замежная класіка. Сучасная беларуская драматургія адлюстравала цікавасць да гістарычнай тэматыкі, фальклорных сюжэтаў.Падзеямі ў тэатральным жыцці Беларусі сталі пастаноўкі «Пінскай шляхты», «Тутэйшых», спектакля *Мікалая Пінігіна* «Пан Тадэвуш» у Нацыянальным акадэмічным

тэатры імя Янкі Купалы, «Паўлінкі» ў Гомельскім абласным драматычным тэатры, «Прымакоў» у Мазырскім драматычным тэатры імя Івана Мележа. М. Кавальчык стварыў маштабны мюзікл «Соф'я Гальшанская» на сцэне Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра.

Дынамічна развіваецца беларускі лялечны тэатр, які выкарыстоўвае ў сваёй дзейнасці выразныя сродкі драмы, оперы, балета, эстрады, клаўнады, кіно, тэлебачання і імкнецца да так званага стылю татальнага «сінтэтычнага» тэатра.

У 2014 г. адбылося шмат цікавых прэм'ер у дзяржаўных тэатрах Беларусі: оперы «Рыгалета» Дж. Вэрдзі і «Пікавая дама» П. Чайкоўскага, балеты «Жар-птушка» І. Стравінскага і «Лаўрэнсія» А. Крэйна – у Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета Рэспублікі Беларусь; «Тата» Д. Багаслаўскага, «Дон Жуан» Ж.-Б. Мальера – у Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы; «Пясняр» В. Дранько-Майсюка, «Хітрыкі Ханумы» А. Цагарэлі, «Віва, камедыя» Р. Піпа – у Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя М. Горкага; «Рамэа і Джульета» У. Шэкспіра, «Дыліжанс» Гі дэ Мапасана – у Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Я. Коласа; «Дэман» паводле М. Лермантава – у Гродзенскім абласным тэатры лялек; «Мір вам, людзі» паводле Шолам-Алейхема – у Беларускім дзяржаўным акадэмічным музычным тэатры; канцэртная праграма «Авертайм» – у Маладзёжным тэатры эстрады.

Прэміяй прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» за ўвасабленне нацыянальна-гістарычнай тэматыкі была адзначана пастаноўка балета «Вітаўт» Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь, музыку да якога стварыў сучасны беларускі кампазітар В. Кузняцоў

У 2015 г. былі пастаўлены 120 прэм'ерных спектакляў, у тым ліку 30 па п'есах беларускіх аўтараў. Найбольшы водгук гледачоў атрымалі оперы «Царская нявеста» М. Рымскага-Корсакава, «Кармэн» Ж. Бізэ, балет «Маленькі прынц» Я. Глебава Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь; спектаклі «Чайка» А. Чэхава, «Другая Сусветная» па песнях

М. Мермана (да 70-годдзя Вялікай Перамогі) Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы; «Не пакідай мяне» А. Дударава, «Афінскія вечары» П. Гладзіліна, «Шукаем тэнара» К. Людвіга Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа; «Вечнасць на дваіх» У. Арлова і Я. Робіса, «Дванаццатая ноч» У. Шэкспіра Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага і інш.

Высокі прафесійны ўзровень сцэнічнага ўвасаблення разнастайнай класічнай і сучаснай драматургіі праявіўся ў пастаноўках А. Ляляўскага («Птушкі» – Беларускі дзяржаўны тэатр лялек), М. Пінігіна («Чайка» – Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы), С. Кавальчыка («Дванаццатая ноч» – Нацыянальны акадэмічны тэатр імя М. Горкага), І. Сакаева («Сон у летнюю ноч» – Беларускі дзяржаўны маладзёжны тэатр), Т. Траяновіч («Ілюзіі» – Цэнтр эксперыментальнай рэжысуры і Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў) і інш.

Сёння ў беларускіх тэатрах плённа працуюць рэжысёры і інш. – прадстаўнікі розных пакаленняў, творчых кірункаў і мастацкіх стыляў.

У беларускай тэатральнай культуры працуе значны састаў прафесійна дасведчаных драматургаў розных пакаленняў (А. Дudaраў, А. Дзялендзік, Г. Марчук, А. Папова, П. Васючэнка, А. Курэйчык, Д. Балыка, П. Пражко, С. Гіргель, К. Сцешык, К. Расолька, Д. Багаслаўскі, Н. Слашчова і інш.), высокакваліфікаваных рэжысёраў таксама розных пакаленняў і творчых напрамкаў (М. Абрамаў, К. Аверкава , В. Анісенка, С. Кавальчык, Р. Баравік, Н. Башава, В. Грыгалюнас, В. Ераньковa, В. Катавіцкі, Л. Манакова, М. Пінігін, У. Савіцкі, А. Яфрэмаў, Ю. Лізянгевіч, Б. Луцэнка, , П. Харланчук, Я. Карняг, Д. Нупрэйчык, І. Базан, М. Сохар, В. Сявец, Т. Траяновіч, Р. Цыркін і інш.). Наяўнасць у сучасным беларускім тэатры значнай колькасці прафесійных рэжысёраў дае вялікія і рэальныя надзеі на далейшае развіццё і ўзбагачэнне сцэнічнага мастацтва Беларусі.

Прыкметнай з’явай тэатральнага жыцця стаў Міжнародны тэатральны фестываль «Белая вежа», які штогод праводзіцца

ў Брэсце, а таксама Міжнародны маладзёжны тэатральны форум «M@rt.кантакт» у Магілёве.

Галоўная ідэя тэатральнай творчасці ў сучаснай Беларусі – напамін пра годнасць чалавека, нацыі, адраджэння паняцця гуманізму, гонару за сваю Айчыну і нацыю.

***Беларускае кіно.*** Аснову кінавытворчасці Беларусі складае дзяржаўная кінастудыя «Беларусьфільм». Але паступова ідзе разгрупаванне на больш дробныя студыі. Адным з першых незалежных утварэнняў у сферы кіно стала кіна-відэастудыя «Таццяна» (старшыня праўлення Т. Логінава). На рахунку гэтай студыі ігравая карціна «Пейзаж з трыма купальшчыцамі (рэжысёр В. Рубінчык) і больш за 15 дакументальных фільмаў. У перыяд 1991–1999 гг. студыя выступіла ініцыятарам пяці міжнародных фестываляў жаночага кіно і міжнароднага праваабарончага кіно ў 1998 г.

Існаванне незалежных студый садзейнічала жанравай разнастайнасці беларускага кіно, станаўленню незалежнага прадзюсарскага кіно. У якасці прадзюсараў выступілі знакамітыя беларускія рэжысёры М. Пташук (Беларуская незалежная студыя), В. Нікіфараў (студыя «Кадр 2»), В. Рыбараў (студыя «Ард-фільм»), В. Дашук (студыя «Спадар Д») і інш. Адным з першых беларускіх фільмаў новага часу стала трагікамедыя «Кааператыў «Палітбюро», або Будзе доўгім развітанне» (1992 г., рэжысёр М. Пташук).

У 1996 г. кінастудыя «Беларусьфільм» атрымала статус нацыянальнай. Студыя больш стала займацца дакументальным і анімацыйным кіно. Плённа працавала творчае аб'яднанне дакументальнага і навукова-папулярнага кіно «Летапіс», Майстэрня мультыплікацыйных фільмаў. Найбольш вядомыя фільмы апошніх гадоў: «На чорных лядах» (1995 г., В. Панамароў), «Птушкі без гнёздаў» (1996 г., В. Дудзін), «У жніўні 44-га» (М. Пташук, 2001 г.), «Анастасія Слуцкая» (Ю. Ялхоў, 2003 г.), «У чэрвені 41-га» (А. Франскевіч-Лайе, 2008 г.), «Дняпроўскі рубеж» (Д. Скварцоў, 2009 г.), «Брэсцкая крэпасць» (А. Кот, 2010 г.), «Белыя росы. Вяртанне», (А. Бутар, 2014 г.) «Кіндэрвілейскі прывід» (А. Турава, 2014), «Цудавостраў, ці Палескія рабінзоны» ( С. Сычоў, 2014) і інш.

Фільм «У тумане» ўкраінскага рэжысёра Сяргея Лазніцы, зня-

ты па аднайменнай аповесці Васіля Быкава ўдзельнічаў у асноўнай конкурснай праграме 65-га Канскага кінафестываля ў 2012 г. і ўганараваны спецыяльным прызам журы Міжнароднай федэрацыі кінапрэсы FIPRESCI.

У Беларусі штогод праходзіць Міжнародны кінафестываль «Лістапад» і Міжнародны фестываль анімацыйнага кіно «Анімаёўка».

**4. *Выяўленчае мастацтва.*** Беларускае выяўленчае мастацтва – гэта творы станкавага, сцэнаграфічнага, дэкаратыўна-прыкладнога, манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, а таксама сучасныя формы мастацкіх практык. Сацыяльна-палітычныя ўмовы незалежнай Беларусі дазволілі мастакам разняволіцца ў творчым выяўленні, пашырыць тэматыку сваёй дзейнасці.

Адным з самых папулярных жанраў стаў гістарычны: «Пагоня на Грунвальд» В. Борздага, «Партрэт вялікага канцлера Льва Сапегі» А. Марачкіна. Шмат увагі гістарычнай тэматыцы надавалі ў сваёй творчасці мастакі – члены творчай суполкі «Пагоня» (Я. Кулік, А. Марачкін, Г. Скрыпнічэнка і інш.).

У апошнія гады мастацкае жыццё краіны ў галіне выяўленчага мастацтва і дызайну было дастаткова насычаным. Знакавай падзеяй 2014 г. стаў выставачны праект «Дзесяць стагоддзяў мастацтва Беларусі» ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь. Мэта выстаўкі – паказаць мастацтва Беларусі як няспынны ў часе працэс, інтэграваны ў сусветную мастацкую прастору.



*Мастак Аляксей Марачкін. Фота М. Гаравога.*

Многія з мастакоў звяртаецца да экалагічнай тэматыкі, перш за ўсё да Чарнобыльскай катастрофы (Г. Вашчанка «Мой дом – мая боль», В. Барабанцава «Зона», В. Шкаруба «Дзічок» і інш.).

Самабытную мастацкую

школу Беларусі прадстаўляюць сучасныя мастакі Беларусі А. Марачкін («Маці Божая ахвяр Чарнобыля», «Палеская мадонна», «Плошча»), М. Селяшчук («Метамарфозы», «Люблю цябе сустракаць», «Травы Палесся»), Г. Вашчанка («Зорка палын», «Іардань на Палессі»), А. Бараноўскі («Спадчына. Мірскі замак», «Вызвалены Мінск», «Каложа»), а таксама Арлен Кашкурэвіч, Г. Паплаўскі, З. Літвінава, К. Качан, В. Каралёў, Р. Сітніца, С. Цімохаў, А. Карповіч, А. Кішчанка, Н. Марчанка, А. Суша, Л. Шчамялёў, В. Шматаў, У. Цэслер і інш. Шырока вядомая нават за межамі Беларусі айчынная школа графікі (М. Купава, В. Шаранговіч, А. Кашкурэвіч, П. Татарнікаў і інш.).

***Архітэктура.*** Сучасная архітэктура Беларусі грунтуецца на развіцці нацыянальных традыцый, увасобленых у лепшых узорах беларускага культавага, палацава-паркавага і грамадзянскага дойлідства XI–XX стст. Разам з тым сучасная архітэктура Беларусі вылучаецца крэатыўнасцю, інавацыйнасцю тэхналогій, спалучае інтэлектуальныя канструкцыі і найноўшыя матэрыялы. Моцнае уздзеянне на сучасную архітэктуру зрабіў *постмадэрнізм*, у якім знайшло увасабленне спалучэнне рэалістычнага і авангарднага кірункаў. Першы звязаны з развіццём нацыянальных традыцый, аснова другога – рэтраспектывізм. Новыя аб’екты набылі больш выразныя сілуэтныя кампазіцыі. Як сродак мастацкай выразнасці важную ролю адыгрываюць колер і святло. Паскоранымі тэмпамі ішло фарміраванне агульнагарадскіх цэнтраў.

З 1990-х гг. павялічылася колькасць збудаванняў, мастацкая выразнасць якіх дасягаецца і канструкцыяй, і выкарыстаннем сучасных матэрыялаў. У такіх пабудовах падкрэсліваецца структура нясучых элементаў, вонкавыя сцены маюць частковае і суцэльнае шкленне: будынак аўтавакзала «Маскоўскі« (архітэктар М. Навумаў, інжынер Л. Валчэцкі, знесены ў 2015 г.), будынак чыгуначнага вакзала (В. Крамарэнка, М. Вінаградаў, І. Вінаградаў) у Мінску; лядовыя палацы ў Мінску (арх. Ю. Патапаў, І. Боўт, А. Шафрановіч), Віцебску (архітэктары І. Боўт, А. Шафрановіч), Гродне (архітэктары М. Жучко, У. Еўдакімаў, А. Пархута, А. Тараненка), Гомелі (архітэктары І. Боўт, С. Міцько з удзелам Л. Смольскай, Н. Шамелавай, А. Грачова) і інш.

У сучаснай архітэктуры маюць месца матывы мадэрну: праект карчмы для музейна-вытворчага комплексу «Дудуткі« (у Пухавіцкім раёне; архітэктары А. Базевіч, С. Сергачоў), жылыя дамы па вул. Леванеўскага (архітэктар А. Янушка) у Брэсце, на Лагойскім тракце ў Мінску (архітэктары П. Кракалёў, Л. Карначык).

Рэтраспектыўная тэндэнцыя ў сучаснай архітэктуры выяўляецца ў культавым дойлідстве: гатычныя матывы ў будове каталіцкіх храмаў, візантыйскія – у праваслаўных.

У галіне манументальнага мастацтва завершаны работы па стварэнню і ўстаноўцы скульптурнай кампазіцыі «Брама памяці» на тэрыторыі мемарыяльнага комплексу «Трасцянец» (скульптар К. Касцючэнка).

**5. *Ахова гісторыка-культурнай спадчыны.*** Сярод дасягненняў у сферы культуры неабходна адзначыць фарміраванне і публікацыю *Дзяржаўнага спіса гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь*, які ўключае каля 5 тысяч аб’ектаў, стварэнне *Банка звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь*. У 2015 г.



*Мірскі замак пасля рэстаўрацыі.*

выйшаў указ прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб удасканаленні аховы археалагічных аб'ектаў і археалагічных артэфактаў», якім вызначаны комплекс мер, накіраваных на стварэнне дадатковых умоў для захавання археалагічнай спадчыны Беларусі, а таксама на прадухіленне дзейнасці «чорных капальнікаў».

Ажыццяўляецца дзяржаўная праграма *«Замкі Беларусі»* на 2012–2018 гг. У 2015 г. рэстаўрацыйна-аднаўленчыя работы на многіх знакавых аб'ектах рэспублікі, сярод якіх: Спаса-Праабражэнская царква ў Полацку і Свята-Пакроўскі манастыр у Талачыне, палац Друцкіх-Любецкіх у Шчучыне, Стары замак у Гродне, у палацава-паркавым ансамблі Румянцавых-Паскевічаў Паскевічаў у Гомелі, Косаўскі і Ружанскі палацы, палацава-паркавы ансамбль у в. Жылічы Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці і інш.

У спіс сусветнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА ўключаны чатыры аб'екты,што знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі, – *Белавежская пушча, Мірскі і Нясвіжскі замкі, геадэзічная дуга Струве.*

У 2009 г. унікальны беларускі народны абрад *«Калядныя цары»*, які існуе толькі ў вёсцы Семежава Капыльскага раёна Мінскай вобласці, таксама быў уключаны ў Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА.

***Народная творчасць.*** Народная творчасць (фальклор, народныя музыка, танец, дойлідства, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, аматарскае мастацтва і інш.) – падмурак нацыянальнай культуры і мастацтва. З мэтай зберажэння лакальных традыцый і аўтэнтычнага фальклору, папулярызацыі самабытнай народнай культуры у рэгіёнах краіны праводзяцца важныя культурныя мерапрыемствы: Міжнародны фестываль народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік» у Паставах, Міжнародны фестываль песні і музыкі Падняпроўя «Дняпроўскія галасы» ў Дуброўне, свята беларускай музыкі «Чачэрскія сустрэчы», свята беларускага мастацтва «Музычныя краявіды Хойніцкай зямлі», «Кліч Палесся» ў Ляскавічах Петрыкаўскага раёна, фестываль фальклорнага мастацтва «Берагіня» ў г. п. Акцябрскі, Міжнароднае свята традыцыйнай культуры «Браслаўскія зарніцы» і Браслаўская харавая асамблея ў Браславе ды інш.

У апошнія дзесяцігоддзі у гарадах, раённых цэнтрах і вёсках Беларусі ідзе актыўны працэс стварэння і дзейнасці дамоў і цэнтраў рамёстваў. Яны дазваляюць падтрымаць традыцыйную культуру, часам адрадзіць рэдкія, забытыя, самабытныя віды і формы народнай творчасці: характэрных і традыцыйных узораў ткацтва, вышыўкі, дрэвaапрацоўкі, ганчарства, пляцення, роспісу, кавальства, выцінанкі і інш.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Гісторыка-культурныя каштоўнасці*** – культурныя каштоўнасці, якія маюць адметныя духоўныя, мастацкія і (або) дакументальныя вартасці і якім нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці.

***Культура*** – дзейнасць, накіраваная на задавальненне духоўных патрэбнасцяў грамадства, станаўленне і развіццё чалавека, а таксама створаная для гэтых мэт сукупнасць культурных каштоўнасцяў.

***Культурныя каштоўнасці*** – створаныя (пераўтвораныя) чалавекам або цесна звязаныя з яго дзейнасцю матэрыяльныя аб’екты і нематэрыяльныя праявы творчасці чалавека, якія маюць гістарычнае, мастацкае, навуковае або іншае значэнне.

***Мастацкая творчасць*** – стварэнне твораў мастацкай літаратуры і мастацтва, іх выкананняў і (або) іх выкананне.

***Постмадэрнізм*** (франц. *postmodernisme* – пасля мадэрнізму) – тэрмін, які вызначае структурна падобныя з’явы ў сусветным грамадстве і культуры другой паловы XX ст., ён ужываецца ў дачыненні да комплексу стыляў у мастацтве.

***Постмадэрн*** – стан сучаснай культуры, які ўключае ў сябе дапостмадэрнісцкае мастацтва, а таксама масавую культуру гэтай эпохі.

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***26 студзеня 1990 г.*** – Вярхоўны Савет БССР XI склікання прыняў закон *«Аб мовах у Беларускай ССР»,* які абвясціў беларускую мову дзяржаўнай мовай БССР.

***14 мая 1995 г.*** – рэферэндум, паводле якога ў Беларусі рускай мове быў нададзены роўны статус з дзяржаўнай беларускай.

***1 верасня 2010 г.*** – уступіў у дзеянне закон «Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі», прыняты 23 ліпеня 2008 г.

***2012 г.*** – у Беларусі быў абвешчаны Годам кнігі.

***2016 г.*** – у Беларусі быў абвешчаны Годам культуры.

***2016 г.*** – увайшоў у дзеянне Кодэкс Рэспублікі Беларусь «Аб культуры».

## ЛІТАРАТУРА


1. Беларуская культура – 2015: стан, тэндэнцыі і перспектывы развіцця. Мн.: Інбелкульт, 2016.
2. *Верашчагіна А. У., Гурко А. В.* Гісторыя канфесій на Беларусі ў другой палове XX стагоддзя. Мн.: ІСПД, 1999.
3. *Верашчагіна А. У., Гурко А. В.* Гісторыя канфесій у Беларусі: мінулае і сучаснасць : дапаможнік для настаўнікаў. Мн.: Тэхналогія, 2000.
4. *Зайцава Л. М. і інш.* Гісторыя кінамастацтва Беларусі. У 4 т. Т. 4. 1986–2003 гг. Мн.: Беларуская навука, 2004.
5. *Захарына Ю. Ю.* Сучасная архітэктура Беларусі: эвалюцыя мастацкіх вобразаў у сусветным кантэксце. – Мн.: Беларуская навука, 2014.
6. *Крывашэй Д. А.* Дзяржаўная культурная палітыка ў Беларусі (1991–2010 гг.). Мн.: Беларуская навука, 2014.
7. Культура Беларусі: 20 год развіцця: 1991–2011. Мн.: Інстытут культуры Беларусі, 2012.
8. Культура беларускага замежжа. Ч. 1, 2. Мн.: Навука і тэхніка, 1993. Ч. 3. Мн.: Беларуская навука, 1998.
9. *Мельник В. А.* Основы идеологии белорусского государства: учеб. пособие. Мн.: Вышэйшая школа, 2011.
10. *Мікуліч Т. М.* Мова і этнічная самасвядомасць. Мн.: Навука і тэхніка, 1996.

# РАЗДЗЕЛ 10.
# ЭВАЛЮЦЫЯ ПАЛІТЫЧНАЙ СІСТЭМЫ БЕЛАРУСІ Ў 1990–2016 гг. КАНСТЫТУЦЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА.

1. *Падрыхтоўка Канстытуцыі незалежнай Беларусі.*
2. *Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 г. і асновы арганізацыі дзяржаўнага кіравання ў Беларусі.*
3. *Рэферэндум 1996 г, змены ў Канстытуцыі Беларусі і ўмацаванне прэзідэнцкай формы праўлення.*

**1.** ***Падрыхтоўка Канстытуцыі незалежнай Беларусі.*** На пачатак 1990 г. у Канстытуцыі БССР быў зафіксаваны наступны парадак дзяржаўнага ўладкавання: Беларусь – парламенцкая рэспубліка ў складзе СССР. Кіраўнік дзяржавы – Старшыня Вярхоўнага Савета БССР.

У сакавіку 1990 г. адбыліся выбары ў Вярхоўны Савет БССР XII склікання, які пачаў займацца і пытаннямі канстытуцыйнага будаўніцтва. Адметнасцю гэтага вышэйшага органа заканадаўчай улады ў Беларусі было тое, што ўпершыню ў гісторыі краіны там была сфарміравана апазіцыйная фракцыя Беларускага народнага фронту (БНФ), якая адкрыта і паслядоўна выступала за дзяржаўную незалежнасць Беларусі.

20 ліпеня 1990 г. у Вярхоўным Савеце БССР была створана Канстытуцыйная камісія на чале са старшынёй Вярхоўнага Савета М. І. Дземянцеем. У склад камісіі ўвайшлі 74 чалавекі (62 дэпутаты і 12 экспертаў). Асноўнымі для Канстытуцыйнай камісіі сталі пытанні дзяржаўнага суверэнітэту і палітычнай арганізацыі грамадства.

Для напісання праекта Канстытуцыі 30 кастрычніка 1990 г. была створана Рабочая група, у якую напачатку ўвайшло 12 членаў

Канстытуцыйнай камісіі. На першым этапе працы рабочай групы ўзнікла сітуацыя, калі яна не магла прыйсці да агульнай думкі па галоўных палажэннях, на якіх павінен быць заснаваны новы Асноўны закон краіны: палітычны лад, адносіны да СССР і КПСС, пасады прэзідэнта, адносна функцый і колькаснага складу парламента, арганізацыі мясцовага самакіравання.

Рабочая група падзялілася на «дэмакратаў» і «кансерватараў» і адлюстроўвала, такім чынам, той палітычны расклад, які быў у Вярхоўным Савеце. Параіўшыся, члены Рабочай групы Канстытуцыйнай камісіі вырашылі стварыць са свайго складу дзве рабочыя падгрупы: адну на чале з В. І. Шаладонавым (група «А») і другую на чале з В. І. Ганчаром (група «Б»), і даручылі кожнай з іх пісьмова сфармуляваць сваё бачанне асноўных палажэнняў новай Канстытуцыі з мэтай іх потым абмеркаваць і вынесці ўзгодненыя прапановы на пасяджэнне Канстытуцыйнай камісіі. У групу «Б», між іншым, уваходзілі дэпутаты Апазіцыі БНФ і Дэмклуба Я. М. Глушкевіч, В. Ф. Голубеў, Л. У. Зданевіч, А. Р. Лукашэнка. Актыўна працаваць абедзве групы пачалі з лістапада 1990 г., калі атрымалі непасрэднае даручэнне Канстытуцыйнай камісіі.

Пазней па ініцыятыве В. І. Шаладонава абедзве рабочыя групы правялі сумеснае пасяджэнне для таго, каб вызначыць прынцыповыя адрозненні ў падыходах да новай Канстытуцыі дзяржавы. Пры абмеркаванні высветлілася, што абедзве групы стаяць на пазіцыі падрыхтоўкі Канстытуцыі незалежнай дзяржавы, якая паводле свайго палітычнага ўладкавання павінна быць парламенцкай рэспублікай без пасады прэзідэнта. Было прынята рашэнне аб далейшай працы ў складзе адзінай Рабочай групы Канстытуцыйнай камісіі.

Спіс членаў Канстытуцыйнай камісіі і экспертаў, якія пастаянна ўдзельнічалі ў распрацоўцы праекта Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і з’яўляліся, па-сутнасці, яе аўтарамі, наступны: Шаладонаў В. І., Бараўцоў В. А., Васілевіч Р. А, Галаўко А. А., Глушкевіч Я. М., Голубеў В. Ф., Кучынскі У. А., Леўшуноў С. Я., Семянкоў В. І., Тоўсцік М. А., Чудакоў М. Ф., Чыгір В. Ф., Шабайлаў В. І., Юркевіч М. Р., Юхо І. А.

Значны штуршок для паскарэння працы над праектам новай Канстытуцыі Беларусі далі падзеі, звязаныя са спробай дзяржаўнага перавароту ў Маскве 19–20 жніўня 1991 г. Праўда, паўплывалі маскоўскія падзеі двума спосабамі: калі адразу пасля паражэння путчыстаў было прынята некалькі важных законаў на карысць незалежнасці, то потым дзейнасць Вярхоўнага Савета ўсё больш падпарадкоўвалася акрыялай камуністычнай наменклатуры.

Важнейшай падзеяй было прыняцце 25 жніўня 1991 г. Закона Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі «Аб наданні статусу канстытуцыйнага закона Дэкларацыі Вярхоўнага Савета Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі». У гэтым законе ўстанаўлівалася, што «у выпадках, калі артыкулы дзейнай Канстытуцыі (Асноўнага Закона) Беларускай ССР уваходзяць у пярэчанне з палажэннямі Дэкларацыі Вярхоўнага Савета Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, кіравацца Дэкларацыяй, як канстытуцыйным законам Беларускай ССР». Канстытуцыйнай камісіі даручалася прывесці тэкст праекта Канстытуцыі ў адпаведнасць з палажэннямі Дэкларацыі Вярхоўнага Савета Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі.

Але адразу пасля падзення ў жніўні 1991 г. таталітарнага рэжыму ў Беларусі пачала складвацца аўтарытарная сістэма ўлады. Партыйна-дзяржаўная наменклатура перастуктурызавалася і, адмовіўшыся ад камуністычнай ідэалогіі, пачала выкарыстоўваць знешнія атрыбуты дэмакратыі ў сваіх карпаратыўных інтарэсах. У Вярхоўным Савеце, у Савеце Міністраў і ЦК КПБ ішла дыскусія аб тым, ці патрэбна ўводзіць у Беларусі пасаду прэзідэнта. Гэта было, па сутнасці, абмеркаванне таго, як магчыма (і ці магчыма) атрымаць (ці ўтрымаць) з дапамогай пасады прэзідэнта ўладу ў дзяржаве.

Пасля прыпынення ў жніўні 1991 г. дзейнасці КПБ – КПСС і выхаду Беларусі са складу СССР у краіне ўсталявалася свое-

асаблівае двоеўладдзе: у адпаведнасці з Канстытуцыяй БССР 1978 г., прадстаўнічую і заканадаўчую ўладу ўзначальваў Старшыня Вярхоўнага Савета, выканаўчую – Старшыня Савета Міністраў. Кожны з іх лічыў сваю пасаду найбольш галоўнай, але ў Канстытуцыі дакладнага вызначэння першынства не было. У такой сітуацыі найбольш зручнай магчымасцю ўмацавання выканаўчай улады было змяненне формы праўлення – увядзенне інстытута прэзідэнцтва – кіраўніка выканаўчай улады. Гэта было магчыма зрабіць якраз у працэсе падрыхтоўкі новай Канстытуцыі. На пасаду прэзідэнта з боку наменклатуры планаваўся Старшыня Савета Міністраў Беларусі В. Ф. Кебіч. Дзеля ажыццяўлення гэтага плана ў Вярхоўным Савеце была ўтворана парламенцкая фракцыя «Беларусь», у склад якой увайшлі дэпутаты, што працавалі ў структурах выканаўчай улады ці былі блізкія да іх.

На паводзіны наменклатуры кансалідацыйны ўплыў аказала ініцыятыва дэмакратычных сіл аб правядзенні восенню 1992 г. рэферэндуму аб нечарговых выбарах у Вярхоўны Савет Беларусі. Каб неяк абгрунтаваць адмову грамадзянам Беларусі ў правядзенні рэферэндуму, Вярхоўны Савет заявіў, што ён ставіць сваёй задачай прыняцце не пазней, чым у 1993 г. Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Палітычная ініцыятыва цяпер была на баку парламенцкай большасці, лідарам якой быў В. Ф. Кебіч. Каб увесці ў праект Канстытуцыі пасаду прэзідэнта, пад ціскам выканаўчай улады было прынятае рашэнне аб правядзенні галасавання па асобных палажэннях праекта Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь шляхам падачы дэпутатамі імянных бюлетэняў.

У Вярхоўным Савеце было арганізавана пайменнае галасаванне на працягу трох дзён (24, 25 лютага і 1 сакавіка 1994 г.) спецыяльнымі бюлетэнямі (11 старонак тэксту ў кожным). У выдаваным дэпутатам пад роспіс бюлетэні для галасавання ўтрымліваліся тры пытанні: 1. Ці прымаеце Вы главу 3 «Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь»?; 2. Ці прымаеце Вы главу 4 «Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь»?; 3. Ці прымаеце Вы раздзел V «Мясцовае кіраванне і самакіраванне»? На дэпутатаў, асабліва тых, якія працавалі ў структурах выканаўчай улады, аказваўся беспрэцэдэнтны ўціск для таго, каб яны прынялі

ўдзел у галасаванні. Галасаванне такім блокам і прывяло да ўхвалення раздзела пра прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, чаго і дамагалася выканаўчая ўлада. Практычна толькі дэпутаты Апазіцыі БНФ не ўдзельнічалі ў гэтым галасаванні, выказваючы сваю нязгоду як з увядзеннем пасады прэзідэнта, так і з метадамі, якія для гэтага прымяняла дэпутацкая большасць.

Канстытуцыя Беларусі з пасадай прэзідэнта была прынятая *15 сакавіка 1994 г.* Разам з тым, неабходна адзначыць, што нягледзячы ні на што, прыняцце Канстытуцыі суверэннай Рэспублікі Беларусі стала важнейшай гістарычнай падзеяй: упершыню беларускі парламент выказаў сваю палітычную волю ў такім важным пытанні без падказкі з Масквы.

**2.** ***Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 г. і асновы арганізацыі дзяржаўнага кіравання ў Беларусі.*** 15 сакавіка 1994 г. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь была прынятя Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь. Паводле Канстытуцыі, Рэспубліка Беларусь з'яўляецца *ўнітарнай дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавай*, якая валодае вяршэнствам і паўнатой улады на сваёй тэрыторыі. Канстытуцыяй была ўведзена ў Беларусі пасада прэзідэнта.

Упершыню ў гісторыі Беларусі на канстытуцыйным узроўні правы чалавека, свабоды і гарантыі іх рэалізацыі былі названы вышэйшай каштоўнасцю і мэтай грамадства і дзяржавы.

Прыняўшы ў 1994 г. новую Канстытуцыю, Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь замацаваў у ёй прынцып падзелу ўладаў і фактычна адмовіўся ад манапольнага права на ўладу. У артыкуле 6 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і ў самой структуры Канстытуцыі (Раздзел IV. Заканадаўчая, выканаўчая і судовая ўлада) быў замацаваны прынцып падзелу ўладаў. Больш за тое, у Асноўным законе сцвярджалася: «Дзяржава грунтуецца на прынцыпе раздзялення ўлад: заканадаўчай, выканаўчай і судовай. Дзяржаўныя органы ў межах сваіх паўнамоцтваў самастойныя: яны ўзаемадзейнічаюць паміж сабой, стрымліваюць і ўраўнаважваюць адзін аднаго».

Вярхоўны Савет абвяшчаўся «*найвышэйшым прадстаўнічым*

*пастаянна дзеючым і адзіным заканадаўчым органам дзяржаўнай улады Рэспублікі Беларусь»*. *Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь з'яўляўся кіраўніком дзяржавы і выканаўчай улады.* Кіраўнік дзяржавы абіраўся непасрэдна народам тэрмінам на 5 гадоў. Адна і тая ж асоба магла абірацца на пасаду Прэзідэнта не больш як на два тэрміны. Згодна з Канстытуцыяй 1994 г., Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь з'яўляўся Галоўнакамандуючым Узброенымі Сіламі Рэспублікі Беларусь, здзяйсняў кіраўніцтва сістэмай органаў выканаўчай улады і інш.

23 чэрвеня 1994 г., у адпаведнасці з новай Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, адбыліся выбары прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. У першым туры ніхто з прэтэндэнтаў не набраў неабходнай большасці галасоў. У другі тур галасавання прайшлі А. Р. Лукашэнка (каля 45 % галасоў) і В. Ф. Кебіч (17 %). Кіраўнік БНФ З. С. Пазняк набраў каля 13 % галасоў выбаршчыкаў, С. С. Шушкевіч – 10 %, А. І. Дубко – 6 %, В. М. Новікаў – 4 %. У другім туры выбараў, які адбыўся 10 ліпеня 1994 г. перамог А. Р. Лукашэнка, які і стаў першым прэзідэнтам Беларусі (80,3 % ад тых, хто ўзяў удзел у галасаванні і 56,7 % ад агульнай колькасці выбаршчыкаў).

Нягледзячы на тое, што Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 г. давала прэзідэнту значныя паўнамоцтвы, у ёй утрымліваўся таксама сур'ёзны механізм «стрымлівання і процівагаў». Так, да прэрагатываў парламента адносілася прызначэнне Генеральнага пракурора, кіраўнікоў Вярхоўнага, Вышэйшага гаспадарчага і Канстытуцыйнага судоў, Кантрольнай палаты, праўлення Нацыянальнага банка, Цэнтральнай выбарчай камісіі. Менавіта Вярхоўны Савет, зыходзячы з тэксту Асноўнага закона, павінен быў вызначаць асноўныя напрамкі ўнутранай і знешняй палітыкі, ваенную дактрыну.

Такім чынам, у адносінах да Асноўнага закона Беларусі 1994 г. можна гаварыць пра канцэпцыю «моцны» прэзідэнт – «моцны» парламент. Сіла парламента, сярод іншага, заключалася яшчэ ў тым, што ён меў права адхіліць прэзідэнта ад пасады ў выпадку парушэння апошнім Канстытуцыі альбо здзяйснення злачынства. Прэзідэнт жа не меў права распусціць парламент. Важнейшай акалічнасцю

было тое, што для ўзбуджэння працэдуры адлучэння прэзідэнта ад пасады было дастаткова 70 подпісаў дэпутатаў Вярхоўнага Савета. Пытанне аб парушэнні прэзідэнтам Канстытуцыі павінна было разглядацца Канстытуцыйным судом. У выпадку «станоўчага» заключэння суда паўнамоцтвы прэзідэнта лічыліся прыпыненымі да вынясення канчатковага рашэння Вярхоўным Саветам большасцю ў дзве трэці дэпутатаў».

Менавіта гэтыя палажэнні, як стала відаць пазней, сталі асновай супрацьстаяння паміж выканаўчай і заканадаўчай уладай.

Супрацьстаянне прэзідэнта і Вярхоўнага Савета абвастрылася пасля прыняцця парламентам у 1995 г. законаў «Аб Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь» і «Аб Вярхоўным Савеце Рэспублікі Беларусь». І ў Канстытуцыі, і ў законе «Аб Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь» дакладна распісвалася магчымасць адстаўкі прэзідэнта і галоўную ролю ў працэдуры адстаўкі адыгрываў Вярхоўны Савет. Магчымасць роспуску Вярхоўнага Савета ні ў Канстытуцыі, ні ў законе не прадугледжвалася.

*Надалей змены канстытуцыйнага ладу ў Беларусі пасля абрання першага прэзідэнта праводзіліся з дапамогай рэферэндумаў.*

**3. *Рэферэндум 1996 г. і ўмацаванне прэзідэнцкай формы праўлення.*** Такім чынам, паводле Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г., прадстаўнічая і заканадаўчая ўлада знаходзілася ў Вярхоўнага Савета, Прэзідэнт быў кіраўніком дзяржавы і выканаўчай улады. Беларусь, па сутнасці, заставалася парламенцкай рэспублікай з пасадай прэзідэнта. Такая сітуацыя не задавальняла А. Р. Лукашэнку і яго каманду. Прэзідэнт спрабаваў знізіць ролю парламента ў жыцці краіны і ўзяць на свой бок асноўныя кіроўныя функцыі.

Але фактарам стрымання ў ажыццяўленні такіх спроб была наяўнасць самастойнага, незалежнага ні ад заканадаўчай, ні ад выканаўчай улады, Канстытуцыйнага Суда. Так, 9 лютага 1996 г. было прынята пасланне Канстытуцыйнага Суда «Аб стане канстытуцыйнай законнасці ў Рэспубліцы Беларусь у 1995 годзе», якое было адрасавана адначасова і прэзідэнту і Вярхоўнаму Савету. Асноўным тэзісам паслання было тое, што ў краіне быў парушаны

прынцып падзелу ўладаў, і найчасцей парушальнікам Канстытуцыі быў прэзідэнт. Кіраўнік дзяржавы 29 снежня 1995 г. нават выдаў распараджэнне «Аб выкананні нормаў і ўказаў Прэзідэнта». Мелася на ўвазе нават тыя, якія пярэчылі іншым законам ці Канстытуцыі.

Такім чынам, у краіне ўзнік канстытуцыйны крызіс. Вярхоўны Савет і Канстытуцыйны Суд бачылі выйсце з яго ў дакладным выкананні палажэнняў Асноўнага закона краіны ўсімі бакамі палітычнага працэсу. А. Р. Лукашэнка і яго каманда – ва ўсталяванні такога парадку, калі ўсе распараджэнні, загады і ўказы прэзідэнта, нават калі яны пярэчаць Асноўнаму закону дзяржавы, павінны безумоўна выконвацца прадстаўнікамі ўсіх галін улады. Такому «парадку» пярэчыла логіка і сам змест Канстытуцыі.

Таму ў ліпені 1996 г. А. Р. Лукашэнка заявіў аб магчымасці правядзення рэферэндуму па ўнясенні зменаў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, а 7 жніўня 1996 г. афіцыйна праінфармаваў Вярхоўны Савет аб тым, што ён выступае з ініцыятывай аб правядзенні рэферэндуму па шэрагу пытанняў грамадска-палітычнага жыцця і па новай рэдакцыі Канстытуцыі.

27 жніўня 1996 г. была прынятая Пастанова Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь «Аб правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму ў Рэспубліцы Беларусь». Прэзідыум Вярхоўнага Савета, вывучыўшы прадстаўленыя ад імя прэзідэнта дакументы, пастанавіў уключыць у бюлетэнь для галасавання тры пытанні, прапанаваныя прэзідэнтам: – Перанесці Дзень незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дзень Рэспублікі) з 27 ліпеня на 3 ліпеня; – «Ці выступаеце Вы за свабодную, без абмежаванняў, куплю і продаж зямлі?»; – «Ці падтрымліваеце Вы скасаванне смяротнага пакарання ў Рэспубліцы Беларусь?».

Канстытуцыйнае пытанне, якое было сфармулявана «Прыняць Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь 1994 года са зменамі і дапаўненнямі (новая рэдакцыя Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь), прапанаванымі Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь» было вырашана разглядзець у Вярхоўным Савеце пасля прадстаўлення прэзідэнтам тэксту Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, які выносіўся на рэферэндум.

Прэзідэнцкі праект новай рэдакцыі Канстытуцыі быў апублі-

каваны ў канцы жніўня 1996 г. Праект прадугледжваў змяненне формы кіравання – *пераход ад прэзідэнцкай рэспублікі да прэзідэнцкага праўлення з некаторымі элементамі парламентарызму.* Прэзідэнт станавіўся «толькі» кіраўніком дзяржавы. Ажыццяўленне выканаўчай улады ўскладвалася на ўрад – Савет Міністраў, які быў падсправаздачны прэзідэнту і адказны перад парламентам.

6 верасня 1996 г. А. Р. Лукашэнка выступіў у Вярхоўным Савеце з абгрунтаваннем неабходнасці ўнясення зменаў у дзейную Канстытуцыю Беларусі. Але і тут выразна было відаць, што прэзідэнт выносіў на галасаванне грамадзянам краіны не папраўкі да Канстытуцыі 1994 г., а новы варыянт Асноўнага закона. Кідалася ў вочы, што, паводле новай рэдакцыі Канстытуцыі, прэзідэнт канцэнтраваў у сваіх руках усю паўнату выканаўчай улады і, акрамя таго, надзяляўся істотнымі заканадаўчымі паўнамоцтвамі: ён атрымліваў права выдаваць дэкрэты, якія былі роўныя паводле сваёй моцы з законамі. Прэзідэнту надавалася права прызначаць і распускаць Урад, прызначаць суддзяў Вярхоўнага і Вышэйшага гаспадарчага судоў, Старшыню і палову суддзяў Канстытуцыйнага суда, кіраўніцтва Нацыянальнага банка, Генеральнага пракурора са згоды Савета Рэспублікі, а вызваляць іх з пасады ён мог аднаасобна.

Такім чынам, новая рэдакцыя Канстытуцыі стварала дзяржаўную мадэль, у якой Прэзідэнт, не ўваходзячы ў сістэму раздзялення ўладаў, а ўзвышаючыся над імі, карыстаўся самымі вялікімі прэрагатывамі. Пры гэтым вызваліць Кіраўніка дзяржавы ад пасады было значна цяжэй, чым распусціць парламент. Прэзідэнт атрымліваў вырашальную ролю ў фарміраванні парламента, Канстытуцыйнага суда і інш.

Вярхоўны Савет вынес на рэферэндум і свае пытанні. У Пастанове Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 6 верасня 1996 г. гаварылася:

«1. Правесці ў Рэспубліцы Беларусь 24 лістапада 1996 г. рэспубліканскі рэферэндум.

2. Уключыць у бюлетэнь для тайнага галасавання на рэспубліканскім рэферэндуме наступныя пытанні:

а) якія ініцыіруе Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь:

2.1. Перанесці Дзень незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дзень Рэспублікі) на 3 ліпеня – дзень вызвалення Беларусі ад гітлераўскіх захопнікаў у Вялікай Айчыннай вайне.

«За» ці «супраць»?

2.2. Прыняць Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь 1994 года са зменамі і дапаўненнямі (новая рэдакцыя Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь), прапанаванымі Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка.

«За» ці «супраць»?

2.3. Ці выступаеце Вы за свабодную, без абмежаванняў, куплю і продаж зямлі?

«За» ці «супраць»?

2.4. Ці падтрымліваеце Вы скасаванне смяротнага пакарання ў Рэспубліцы Беларусь?

«За» ці «супраць»?

б) якія ініцыіруюцца дэпутатамі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь:

2.5. Прыняць Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь 1994 года са зменамі і дапаўненнямі, прапанаванымі дэпутатамі фракцый камуністаў і аграрыяў.

«За» ці «супраць»?

2.6. Ці выступаеце Вы за тое, каб кіраўнікі мясцовых органаў выканаўчай улады выбіраліся непасрэдна жыхарамі адпаведнай адміністратыўна-тэрытарыяльнай адзінкі?

«За» ці «супраць»?

2.7. Ці пагаджаецеся Вы, што фінансаванне ўсіх галін улады павінна ажыццяўляцца толькі галосна і толькі з дзяржаўнага бюджэту?

«За» ці «супраць»?».

Пытанні, прадугледжаныя пунктамі 2.1, 2.2, 2.5 і 2.6 выносіліся на абавязковы рэферэндум, а прадугледжаныя пунктамі 2.3, 2.4, 2,7 – на кансультатыўны.

Адносна прапанаванага А. Р. Лукашэнкам варыянта Канстытуцыі 4 лістапада 1996 г. крытычна выказаўся Старшыня Канстытуцыйнага суда Рэспублікі Беларусь прафесар В. Г. Ціхіня. Канстытуцый-

ны суд пастанавіў, што адказ на рэферэндуме па канстытуцыйным пытанні можа насіць толькі кансультатыўны характар. Нягледзячы на тое, што, у адпаведнасці з дзейнай Канстытуцыяй, рашэнні Канстытуцыйнага суда з'яўляюцца канчатковымі і абскарджанню не падлягаюць, прэзідэнт выдаў два ўказы, якімі адмяніў заключэнне Канстытуцыйнага Суда. У гэтых указах было заяўлена, што на рэферэндуме рашэнні па пытаннях Канстытуцыі маюць абавязковы характар, з'яўляюцца канчатковымі і ўступаюць у сілу праз 10 дзён пасля галасавання. 19–20 кастрычніка 1996 г. у Мінску адбыўся Першы Усебеларускі народны сход. А. Р. Лукашэнка выступіў там з дакладам «Толькі народ мае права вырашаць свой лёс», у якім актыўна прапагандаваўся рэферэндум па змене Канстытуцыі. На сходзе былі прыняты «Асноўныя напрамкі сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 1996–2000 гг.».

Улічваючы нарастанне палітычнага супрацьстаяння ў беларускім грамадстве, Канстытуцыйны суд прыняў зварот да ўдзельнікаў Усебеларускага народнага сходу з перасцярогай, што прыняцце ім «якіх-небудзь рашэнняў па пытаннях, якія ўваходзяць у кампетэнцыю Вярхоўнага Савета, будзе ні чым іншым, як грубым парушэннем Канстытуцыі».

19 кастрычніка 1996 г. у Мінску адбыўся Нацыянальны Кангрэс дэмакратычных сіл Беларусі «За дэмакратыю, супраць дыктатуры», удзельнікі якога прынялі рэзалюцыю супраць змены Асноўнага закона дзяржавы.

Супрацьстаянне паміж прыхільнікамі прэзідэнта і абаронцамі канстытуцыйнага ладу ўзмацнялася. З той прычыны, што пры падрыхтоўцы рэферэндуму былі дапушчаны шматлікія парушэнні заканадаўства, якія выключаюць «свабоднае воевыяўленне народа», 18 лістапада 1996 г. падаў у адстаўку прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь *М. М. Чыгір*. У знак пратэсту супраць правядзення рэферэндуму ў адстаўку падалі таксама міністр працы А. В. Сасноў і намеснік міністра замежных спраў А. А. Саннікаў.

Да таго ж, дэпутаты Вярхоўнага Савета пачалі збіраць подпісы для разгляду пытання аб вынясення імпічменту прэзідэнту. 19 лістапада 1996 г. адпаведная заява з 73 подпісамі дэпутатаў была пе-

рададзена ў Канстытуцыйны суд, які ў гэты ж дзень распачаў справу аб парушэнні прэзідэнтам Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Дапамагчы пераадолець канстытуцыйны крызіс у Беларусі імкнулася кіраўніцтва Расійскай Федэрацыі. 21 лістапада 1996 г. у Мінск прыбыла дэлегацыя ў складзе Старшыні Савета Міністраў Расіі В. С. Чарнамырдзіна, Старшыні Дзяржаўнай Думы Расіі Я. С. Строева і Старшыні Савета Федэрацыі Расіі Г. М. Селязнёва. У ноч з 21 на 22 лістапада адбылася сустрэча вышэйзгаданых асоб з прэзідэнтам Беларусі А. Р. Лукашэнкам, Старшынём Вярхоўнага Савета Беларусі С. Г. Шарэцкім і Старшынём Канстытуцыйнага суда Рэспублікі Беларусь В. Г. Ціхіням.

У выніку кансультацый і перамоў адбылося падпісанне «Пагаднення аб грамадска-палітычнай сітуацыі і канстытуцыйнай рэформе ў Рэспубліцы Беларусь». Прэзідэнт, у адпаведнасці з пагадненнем, адмяняў свае ўказы аб абавязковым характары вынікаў галасавання на рэферэндуме па праекце Канстытуцыі.

Рэферэндум адбыўся 24 лістапада 1996 г. На яго было вынесена 7 пытанняў: чатыры – прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь (аб прыняцці Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. са змяненнямі і дапаўненнямі; аб магчымасці свабоднай куплі і продажу зямлі; аб магчымасці адмены ў Беларусі смяротнага пакарання; аб пераносе Дня Незалежнасці Беларусі з 27 на 3 ліпеня) і тры – Вярхоўным Саветам (аб праекце новай рэдакцыі Канстытуцыі 1994 г. прапанаваным дэпутатамі фракцый камуністаў і аграрыяў; аб фінансаванні ўсіх органаў улады толькі з дзяржаўнай казны і галосна; аб прамых выбарах кіраўніцтва мясцовых выканаўчых органаў улады). У галасаванні прынялі ўдзел 84,1 % правамоцных грамадзян Беларусі. За прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. са змяненнямі і дапаўненнямі, прапанаванай прэзідэнтам, паводле афіцыйных звестак, прагаласавала больш за 5 млн. чалавек, або 70,4 % выбаршчыкаў.

За варыянт Канстытуцыі, прапанаваны дэпутатамі фракцый камуністаў і аграрыяў прагаласавала 7,9 % выбаршчыкаў. Была падтрымана прапанова прэзідэнта аб пераносе Дня незалежнасці Рэспублікі Беларусь з 27 ліпеня на 3 ліпеня – дзень вызвалення г. Мінска ад нямецка-фашыскіх захопнікаў (88,2 % выбаршчыкаў). Большасць

удзельнікаў галасавання, паводле падлікаў Цэнтральнай выбарчай камісіі, выказалася супраць свабоднага, без абмежаванняў, куплі і продажу зямлі (82,9 %) і супраць адмены ў Рэспубліцы Беларусь смяротнага пакарання (80,4 %). Ні адна з прапаноў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусі не набрала неабходнай колькасці галасоў.

Галоўнай асаблівасцю новага варыянта Канстытуцыі з'явілася *ўвядзенне прэзідэнцкай формы праўлення замест парламенцкай*. У адпаведнасці з новай рэдакцыяй Канстытуцыі значна пашырылася кола правоў прэзідэнта: ён не з'яўляецца кіраўніком урада, прызначае ўсіх вышэйшых службовых асоб, фарміруе ўрад, падпісвае законы і выдае дэкрэты, якія маюць сілу закона, валодае правам распускаць абедзве палаты Нацыянальнага сходу. У *Нацыянальны сход* быў перайменаваны парламент Беларусі. Ён з'яўляецца прадстаўнічым і заканадаўчым органам улады і складаецца з дзвюх палат: *Палаты прадстаўнікоў* і *Савета Рэспублікі*. Выканаўчая ўлада належыць Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь.

На рэферэндуме 24 лістапада 1996 г. сістэма дзяржаўнай улады, зафіксаваная ў Канстытуцыі, была зменена. Беларусь стала прэзідэнцкай дзяржавай. 28 лістапада 1996 г. Прэзідэнт падпісаў новую рэдакцыю Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

9 верасня 2001 г. А. Р. Лукашэнка быў пераабраны прэзідэнтам Беларусі на другі тэрмін і паводле Канстытуцыі не мог балатавацца на пасаду прэзідэнта на наступных выбарах.

17 кастрычніка 2004 г. адбыўся рэферэндум, на які было вынесена пытанне: *«Ці дазваляеце Вы першаму Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь Лукашэнку А. Р. удзельнічаць у якасці кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь у выбарах і ці прымаеце частку першую артыкула 81 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь у наступнай рэдакцыі: «Прэзідэнт выбіраецца на пяць гадоў непасрэдна народам Рэспублікі Беларусь на падставе ўсеагульнага, свабоднага, роўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні»*. У выніку з артыкула 81 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь былі выключаныя словы «Адна і тая ж асоба можа быць Прэзідэнтам не больш двух тэрмінаў» і А. Р. Лукашэнка атрымаў права балатавацца на выбарах 2006 г. на пасаду Прэзідэнта Беларусі.

Па выніках рэферэндуму і на падставе новай папраўкі ў Асноўны закон дзяржавы А. Р. Лукашэнка абіраўся на пасаду прэзідэнта на выбарах 19 сакавіка 2006 г., 19 снежня 2010 г. і 11 кастрычніка 2015 г.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Выканаўчая ўлада*** – адна з галін улады, асноўная задача якой – непасрэднае кіраванне краінай на падставе заканадаўства, створанага заканадаўчай уладай.

***Вярхоўны Савет*** – найвышэйшы прадстаўнічы і заканадаўчы орган улады ў БССР (з 1991 г. Рэспублікі Беларусь) да 1996 г. У 1996 г. замест Вярхоўнага Савета быў створаны Нацыянальны сход РБ – двухпалатны парламент.

***Грамадзянская супольнасць*** – тып узаемаадносін паміж дзяржавай і грамадствам, пры якім правы грамадзян абаронены законам, і ўлада перадае частку сваіх функцый мясцовым органам самакіравання. Кожнаму грамадзяніну гарантуюцца свабода поглядаў і ўдзел у вырашэнні дзяржаўных спраў.

***Дзяржаўны бюджэт*** – грашовыя сродкі і расходы дзяржавы.

***Імпічмент*** – працэдура судовага абвінавачвання аж да кіраўніка дзяржавы з наступным зняццем з пасады.

***Канстытуцыя*** – асноўны закон краіны.

***Унітарная дзяржава*** – форма дзяржаўнага ўтварэння, пры якой тэрыторыя дзяржавы не мае ў сваім складзе федэратыўных адзінак (рэспублік, штатаў і да т. п.), а падзяляецца на адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі).

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***19–20 кастрычніка 1996 г.*** – Першы Усебеларускі народны сход.

***24 лістапада 1996 г.*** – другі рэспубліканскі рэферэндум.

***28 лістапада 1996 г.*** – увядзенне ў дзеянне Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. з дапаўненнямі, прынятымі ў выніку рэферэндуму 24 лістапада 1996 г.

***18 мая 2001 г.*** – Другі Усебеларускі народны сход.

***9 верасня 2001 г.*** – другія выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

***17 кастрычніка 2004 г.*** – рэферэндум аб змяненні часткі першай артыкула 81 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь у наступнай рэдакцыі: «Прэзідэнт выбіраецца на пяць гадоў непасрэдна народам Рэспублікі Беларусь на падставе ўсеагульнага, свабоднага, роўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні».

***2–3 сакавіка 2006 г.*** – Трэці Усебеларускі народны сход.

***19 сакавіка 2006 г.*** – трэція выбары прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

***6–7 снежня 2010 г.*** – Чацвёрты Усебеларускі народны сход

***19 снежня 2010 г.*** – чацвёртыя выбары прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

***11 кастрычніка 2015 г.*** – пятыя выбары прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

***22–23 чэрвеня 2016 г.*** – Пяты Усебеларускі народны сход.

## ЛІТАРАТУРА

1. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 2. / М. У. Смяховіч [і інш.]. Мн.,: Беларуская навука, 2012.
2. *Василевич Г. А.* Белорусское государство на рубеже веков. Мн.: Право и экономика, 2007.
3. *Василевич Г. А.* Референдумы в Беларуси и ее путь к независимости в конце XX столетия. Мн.: Молодежное научное общество, 2001.
4. *Голубев В. Ф., Хадыка А. Ю.* Профсоюзы Беларуси: трансформация и перспективы / В. Ф. Голубев, А. Ю. Хадыка. – Мн.: Фонд имени Фридриха Эберта, 2003.
5. *Голубеў В. Ф.* З гісторыі канстытуцыйнага будаўніцтва ў Беларусі канца XX – пачатку XXI ст. // Białoruskie Zeszyty Historyczne. № 30, Беласток, 2008. – С. 178–206.
6. Конституция Республики Беларусь 1994 года: (с изменениями и дополнениями, принятыми на республиканских референдумах 24 ноября 1996 г. и 17 октября 2004 г.). – Мн.: Амалфея, 2010
7. *Курьянович А. В.* Конституция независимой Беларуси: разработка, проекты, принятие. Мн.: Тесей, 2011.
8. *Роўда У.* Палітычная сістэма Рэспублікі Беларусь: вучэбны дапаможнік. Вільня: ЕГУ, 2011.

# ЗМЕСТ

Раздзел 1. Беларусь у перыяд пасляваеннага аднаўлення (1945–1955 гг.) .......... 3

1. Вынікі Другой сусветнай вайны для Беларусі: тэрытарыяльныя, эканамічныя і людскія страты .......... 3
2. Пасляваеннае аднаўленне прамысловасці. Крыніцы гаспадарчага аднаўлення. .......... 4
3. Аграрная палітыка ў 1945–1955 гг. Калектывізацыя ў заходніх абласцях Беларусі. .......... 8
4. Сацыяльная палітыка, грамадска-палітычнае жыццё і культура. .......... 11
5. Беларусь на міжнароднай арэне. .......... 21

Раздзел 2. Беларусь ў часы палітычнай «адлігі» і навукова-тэхнічнай рэвалюцыі (1953–1964 гг.). .......... 26

1. Змены ў грамадска-палітычным жыцці. .......... 26
2. Сацыяльна-эканамічнае развіццё ў 1953–1964 гг. .......... 30
3. Лібералізацыя ў сферы культуры. .......... 36
4. Знешняя палітыка. Міжнароднае становішча Беларусі .......... 38

Раздзел 3. Эканамічнае, палітычнае і культурнае развіццё БССР у 1965–1985 гг. .......... 45

1. Змена палітычнага курса. Пераход ад лібералізму да кансерватызму. .......... 45
2. Эканамічная рэформа А. М. Касыгіна 1965 г.: сутнасць, асаблівасці правядзення ў БССР .......... 46
3. Наспяванне крызісу. Палітычны і эканамічны «застой» .......... 50
4. Сельская гаспадарка ў 1965–1985 гг. .......... 55
5. Культурна-нацыянальнае жыццё. Адукацыя. .......... 57

Раздзел 4. Беларусь у 1985–1990 гг.: пачатак нацыянальнага і дзяржаўнага адраджэння .......... 63

1. Палітычны і эканамічны крызіс другой паловы 1980-х гг. Крах савецкай палітычнай і эканамічнай мадэлі .......... 63
2. Палітыка перабудовы і Беларусь. Аварыя на Чарнобыльскай АЭС .......... 65

3. Стварэнне нацыянальнай дэмакратычнай апазіцыі. Вярхоўны Савет БССР XII склікання. 70
4. Абвяшчэнне дзяржаўнага суверэнітэту Беларускай ССР. 74

Раздзел 5. Станаўленне незалежнай Рэспублікі Беларусь (1991–1995 гг.) 80

1. Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё Беларусі ў 1991 г. 80
2. Умацаванне незалежніцкіх тэндэнцый: ад БССР да Рэспублікі Беларусь 83
3. Канстытуцыя незалежнай дзяржавы: парламенцкая рэспубліка з пасадай прэзідэнта. 88
4. Змены ў палітычнай арганізацыі. Рэферэндум 14 мая 1995 г. 91

Раздзел 6. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў 1990–2016 гг. 97

1. Эканамічнае становішча Беларусі ў першай палове 1990-х гг. Пошук шляхоў пераходу да рынку 97
2. Праграмы развіцця эканомікі Беларусі. Беларуская мадэль сацыяльна-эканамічнага развіцця 100
3. Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2016–2020 гг. 106
4. Міжнароднае эканамічнае супрацоўніцтва Беларусі 108

Раздзел 7. Беларусь на міжнароднай арэне ў 1990 – 2016 гг. 116

1. Станаўленне дзяржаўнай незалежнасці і канцэпцыя знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь 116
2. Шматвектарнасць знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь 121
3. Беларусь і міжнародныя арганізацыі 123
4. Двухбаковыя і шматбаковыя адносіны Беларусі з краінамі свету 124
5. Рэспубліка Беларусь і дыяспара 127

Раздзел 8. Ідэалогія, навука і адукацыя Беларусі ў 1990–2016 гг. Узаемадзеянне дзяржавы і канфесій 133

1. Ідэалогія беларускай дзяржавы. 133
2. Развіццё нацыянальнай сістэмы адукацыі. 135

3. Развіццё нацыянальнай навукі ........................................ 140
4. Узаемадзеянне дзяржавы і канфесій. ........................................ 145

Раздзел 9. Культура Беларусі ў 1990–2016 гг. ........................................ 151

1. Культура ва ўмовах дзяржаўнага суверэнітэту ........................................ 151
2. Новы этап у развіцці беларускай літаратуры ........................................ 155
3. Музычнае мастацтва, тэатр і кіно ........................................ 158
4. Выяўленчае мастацтва. Архітэктура ........................................ 165
5. Ахова гісторыка-культурнай спадчыны.
Народная творчасць ........................................ 167

Раздзел 10. Эвалюцыя палітычнай сістэмы Беларусі
ў 1990–2016 гг. Канстытуцыйнае будаўніцтва. ........................................ 171

1. Падрыхтоўка Канстытуцыі незалежнай Беларусі. ........................................ 171
2. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 г. і асновы
арганізацыі дзяржаўнага кіравання ў Беларусі. ........................................ 175
3. Рэферэндум 1996 г, змены ў Канстытуцыі Беларусі
і ўмацаванне прэзідэнцкай формы праўлення ........................................ 177